Праваабарончы цэнтр «Вясна»

# Агляд-хроніка
## парушэньняў правоў чалавека ў Беларусі ў 2010 годзе

**Менск**
**2011**

**Агляд-Хроніка парушэньняў правоў чалавека ў Беларусі ў 2010 годзе**

Кніга падрыхтавана на падставе кароткіх аглядаў у галіне правоў чалавека ў Беларусі за кожны месяц 2010 году. Напачатку даецца агульны аналіз грамадзка-палітычнай сітуацыі ў краіне за вызначаны тэрмін, асьвятляюцца важныя падзеі і рэакцыя міжнароднай супольнасьці на іх. Далей прыводзяцца некаторыя канкрэтныя факты парушэньняў правоў чалавека, на прыкладзе якіх можна прасачыць пэўную гісторыю змаганьня прадстаўнікоў беларускай дэмакратычнай грамадзкасьці за асноўныя правы і свабоды.

Сярод асноўных парушэньняў — палітычна матываваны крымінальны і адміністрацыйны перасьлед, папіраньне свабоды слова, забарона мірных сходаў, адмаўленьне ў праве на асацыяцыю.

У агляд- 2010 таксама ўключаны дадаткі — гэта заявы Праваабарончага цэнтру «Вясна», а таксама міжнародныя дакументы, датычныя парушэньняў правоў у Беларусі.

У кнізе зьмешчаны фотаздымкі з інтэрнэт-крыніцаў
photo.bymedia.net, belapan.by, nn.by, svaboda.org, spring96.org і інш.

# Зьмест

**Прадмова** .......... 7

**Агляд-хроніка парушэньняў правоў чалавека ў Беларусі, студзень 2010 году** .......... **19**
1. Палітычна матываваны крымінальны перасьлед .......... 21
2. Адміністрацыйныя затрыманьні і пакараньні грамадзка-палітычных актывістаў .......... 22
3. Парушэньне прынцыпу свабоды слова і распаўсюду інфармацыі .......... 23
4. Сьмяротнае пакараньне .......... 24
5. Парушэньне права на свабоду асацыяцыяў .......... 24
6. Дыскрымінацыя і перасьлед грамадзка-палітычных актывістаў .......... 25
7. Парушэньні права на свабоду сумленьня .......... 26
8. Парушэньне права на свабоду мірных сходаў .......... 27
9. Парушэньні выбарчых правоў грамадзянаў .......... 28

**Агляд-хроніка парушэньняў правоў чалавека ў Беларусі, люты 2010 году** .......... **29**
1. Палітычна матываваны крымінальны перасьлед .......... 32
2. Адміністрацыйныя затрыманьні і пакараньні грамадзка-палітычных актывістаў .......... 33
3. Парушэньне прынцыпу свабоды слова і распаўсюду інфармацыі .......... 34
4. Парушэньне права на свабоду мірных сходаў .......... 36
5. Парушэньне права на свабоду асацыяцыяў .......... 36
6. Гвалт і іншыя віды жорсткага абыходжаньня .......... 38
7. Парушэньні права на свабоду сумленьня .......... 39
8. Сьмяротнае пакараньне .......... 40

**Агляд-хроніка парушэньняў правоў чалавека ў Беларусі, сакавік 2010 году** .......... **41**
1. Сьмяротнае пакараньне .......... 45
2. Адміністрацыйныя затрыманьні і пакараньні грамадзка-палітычных актывістаў .......... 46
3. Парушэньне прынцыпу свабоды слова і распаўсюду інфармацыі .......... 47
4. Палітычна матываваны крымінальны перасьлед .......... 48
5. Парушэньне права на свабоду мірных сходаў .......... 48
6. Парушэньне права на свабоду асацыяцыяў .......... 49
7. Парушэньні права на свабоду сумленьня .......... 50
8. Звальненьні і адлічэньні па палітычных матывах .......... 50
9. Парушэньні выбарчых правоў грамадзянаў .......... 51

**Агляд-хроніка парушэньняў правоў чалавека ў Беларусі, красавік 2010 году** .......... **52**
1. Парушэньні выбарчых правоў грамадзянаў .......... 54
2. Адміністрацыйныя затрыманьні і пакараньні грамадзка-палітычных актывістаў .......... 56
3. Парушэньне прынцыпу свабоды слова і распаўсюду інфармацыі .......... 57
4. Палітычна матываваны крымінальны перасьлед .......... 59
5. Перасьлед дэмакратычных актывістаў і праваабаронцаў .......... 61
6. Парушэньне права на свабоду асацыяцыяў .......... 62
7. Дзейнасьць сьпецслужбаў .......... 62

**Агляд-хроніка парушэньняў правоў чалавека ў Беларусі, травень 2010 году.....64**
1. Сьмяротнае пакараньне.....66
2. Палітычна матываваны крымінальны перасьлед.....67
3. Адміністрацыйныя затрыманьні і пакараньні грамадзка-палітычных актывістаў.....69
4. Парушэньне прынцыпу свабоды слова і распаўсюду інфармацыі.....70
5. Парушэньне права на свабоду мірных сходаў.....71
6. Катаваньні і іншыя формы жорсткага бесчалавечнага абыходжаньня.....73
7. Парушэньне права на свабоду асацыяцыяў.....73
8. Звальненьні з працы па палітычных матывах.....74
9. Парушэньні права на свабоду сумленьня.....75

**Агляд-хроніка парушэньняў правоў чалавека ў Беларусі, чэрвень 2010 году.....76**
1. Адміністрацыйныя затрыманьні і пакараньні грамадзка-палітычных актывістаў.....78
2. Сьмяротнае пакараньне.....78
3. Палітычна матываваны крымінальны перасьлед.....79
4. Умовы ўтрыманьня ў месцах зьняволеньня.....80
5. Парушэньне прынцыпу свабоды слова і распаўсюду інфармацыі.....81
6. Катаваньні і іншыя віды жорсткага бесчалавечнага абыходжаньня.....83
7. Парушэньне права на свабоду асацыяцыяў.....84
8. Звальненьні і адлічэньні па палітычных матывах.....84

**Агляд-хроніка парушэньняў правоў чалавека ў Беларусі, ліпень-жнівень 2010 году.....85**
1. Адміністрацыйныя затрыманьні і пакараньні грамадзка-палітычных актывістаў.....86
2. Парушэньне прынцыпу свабоды слова і распаўсюду інфармацыі.....87
3. Парушэньне права на свабоду мірных сходаў.....88
4. Палітычна матываваны крымінальны перасьлед.....89
5. Перасьлед дэмакратычных актывістаў.....90
6. Парушэньне права на свабоду асацыяцыяў.....91
7. Парушэньне права на свабоду сумленьня.....92
8. Катаваньні і іншыя формы жорсткага абыходжаньня.....93
9. Дэпартацыя.....94
10. Сьмяротнае пакараньне.....94

**Агляд-хроніка парушэньняў правоў чалавека ў Беларусі, верасень 2010 году.....95**
1. Адміністрацыйныя затрыманьні і пакараньні ўдзельнікаў мірных акцыяў.....98
2. Палітычна матываваныя крымінальныя справы.....99
3. Перасьлед грамадзка-палітычных актывістаў.....99
4. Парушэньне прынцыпу свабоды слова і распаўсюду інфармацыі.....100
5. Парушэньне права на свабоду асацыяцыяў.....102
6. Парушэньне права на свабоду мірных сходаў.....103
7. Сьмяротнае пакараньне.....105
8. Парушэньне права на свабоду сумленьня.....106

**Агляд-хроніка парушэньняў правоў чалавека ў Беларусі, кастрычнік 2010 году ... 107**
1. Парушэньне права на свабоду асацыяцыяў ... 109
2. Палітычна матываваныя крымінальныя справы ... 111
3. Перасьлед грамадзкіх актывістаў ... 112
4. Парушэньне прынцыпу свабоды слова і распаўсюду інфармацыі ... 113
5. Парушэньне права на свабоду мірных сходаў ... 114
6. Адміністрацыйныя затрыманьні і пакараньні грамадзка-палітычных актывістаў ... 115
7. Парушэньні права на свабоду сумленьня ... 116
8. Сьмяротнае пакараньне ... 116
9. Парушэньні выбарчых правоў грамадзянаў ... 117
10. Умовы ўтрыманьня ў месцах зьняволеньня ... 118
11. Звальненьні і адлічэньні з вучобы па палітычных матывах ... 118
12. Парушэньні працоўных правоў грамадзянаў ... 119

**Агляд-хроніка парушэньняў правоў чалавека ў Беларусі, лістапад 2010 году ... 120**
1. Парушэньне права на свабоду асацыяцыяў ... 121
2. Палітычна матываваныя крымінальныя справы ... 122
3. Перасьлед грамадзкіх актывістаў ... 124
4. Парушэньне прынцыпу свабоды слова і распаўсюду інфармацыі ... 124
5. Парушэньне права на свабоду мірных сходаў ... 125
6. Адміністрацыйныя затрыманьні і пакараньні грамадзка-палітычных актывістаў ... 126
7. Сьмяротнае пакараньне ... 127
8. Парушэньні выбарчых правоў грамадзянаў ... 128
9. Умовы ўтрыманьня ў месцах зьняволеньня ... 129
10. Звальненьні і адлічэньні з вучобы па палітычных матывах ... 129

**Агляд-хроніка парушэньняў правоў чалавека ў Беларусі, сьнежань 2010 году ... 131**
1. Парушэньне права на свабоду асацыяцыяў ... 136
2. Палітычна матываваныя крымінальныя справы ... 137
3. Парушэньне прынцыпу свабоды слова і распаўсюду інфармацыі ... 138
4. Парушэньне права на свабоду мірных сходаў ... 139
5. Адміністрацыйныя затрыманьні і пакараньні грамадзка-палітычных актывістаў ... 140
6. Сьмяротнае пакараньне ... 141
7. Умовы ўтрыманьня ў месцах зьняволеньня ... 142
8. Звальненьні і адлічэньні з вучобы па палітычных матывах ... 142
9. Парушэньні права на свабоду перасоўваньня ... 143

**Дадаткі ... 144**
1. Заявы ПЦ «Вясна ... 140
Праваабарончы цэнтр «Вясна» патрабуе спыненьня крымінальнай справы супраць Івана Міхайлава ... 144
Праваабарончы цэнтр «Вясна» патрабуе неадкладнага вызваленьня Івана Міхайлава і тэрміновага прыняцьця парламентам Закону «Аб альтэрнатыўнай службе» ... 147
Праваабаронцы заклікаюць улады забясьпечыць права на справядлівы суд у справе Аўтуховіча і Асіпенкі ... 148

«Вясна» выказвае занепакоенасьць жорсткімі ўмовамі ўтрыманьня палітзьняволеных на Кубе ........ 148
У Беларусі прыведзены ў выкананьне сьмяротныя прысуды ........ 150
Вывешваньне бел-чырвона-белага сьцяга не зьяўляецца падставай для крымінальнага перасьледу ........ 152
Заява Праваабарончага цэнтру «Вясна» ........ 153
Заява праваабаронцаў па справе Аўтуховіча ........ 154
Сілавы разгон і затрыманьні ўдзельнікаў гей-прайду ў Менску зьяўляюцца парушэньнем права на свабоду мірных сходаў і праявай дыскрымінацыі ........ 157
Праваабарончыя арганізацыі асуджаюць вынясеньне двух сьмяротных прысудаў у Беларусі ........ 158
Сумесная заява Міжнароднай Федэрацыі за правы чалавека (FIDH) і Праваабарончага цэнтру «Вясна» ........ 160
FIDH і Праваабарончы цэнтр «Вясна» патрабуюць ад уладаў Беларусі неадкладна аказаць неабходную медыцынскую дапамогу Мікалаю Аўтуховічу ........ 164
Перасьлед незалежных галасоў павінен быць спынены. Сьмерць Алега Бябеніна павінна быць расьсьледавана ........ 165
Заява праваабаронцаў з нагоды пачатку кампаніі па маніторынгу выбараў Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь ........ 167
Неабходна спыніць перасьлед моладзевых актывістаў! ........ 168
Беларускія праваабаронцы выступілі з заявай ........ 170
2. Іншыя дакументы ........ 171
Праваабарончы цэнтр «Вясна» выказвае занепакоенасьць сітуацыяй з асуджаным прадпрымальнікам Андрэем Бандарэнкам ........ 173
ПЦ «Вясна» пратэстуе супраць кампаніі тэрору ў адносінах да іншадумцаў і палітычных апанентаў ........ 174
Рэзалюцыя II Беларускага праваабарончага форуму «Становішча з правамі чалавека ў Беларусі застаецца недапушчальна кепскім і патрабуе сістэмных захадаў па выпраўленьні» ........ 177
Ацэнка падзеяў, зьвязаных з выбарамі прэзідэнта: пазіцыя Праваабарончага цэнтру «Вясна» ........ 181
Заява № 1 доўгатэрміновай Міжнароднай назіральнай місіі Камітэту міжнароднага кантролю за сітуацыяй з правамі чалавека ў Беларусі ........ 195
Заява Місіі № 3 «Аб становішчы праваабаронцаў і журналістаў у Рэспубліцы Беларусь па стану на 13 студзеня 2011 году» ........ 197
3. Міжнародныя рэзалюцыі ........ 198
Аналітычная запіска праваабаронцаў аб умовах перавозкі, судовага разьбіральніцтва і ўтрыманьня затрыманых удзельнікаў акцыі пратэсту 19 сьнежня .. 200
Рэзалюцыя Еўрапейскага Парламенту ад 10 сакавіка 2010 аб становішчы грамадзянскай супольнасьці й нацыянальных меншасьцяў у Беларусі ........ 205
Парламенцкая асамблея Рады Еўропы прыпыняе кантакты з уладамі Беларусі ........ 209
МІЖНАРОДНАЯ МІСІЯ ПА НАЗІРАНЬНІ ЗА ВЫБАРАМІ. Рэспубліка Беларусь — Прэзідэнцкія выбары, 19 сьнежня 2010 году. ПАПЯРЭДНІЯ ВЫСНОВЫ І ЗАКЛЮЧЭНЬНІ ........ 210
Рэзалюцыя Еўрапейскага парламенту адносна сітуацыі ў Беларусі ........ 213
4. Адміністрацыйны перасьлед ........ 216
Рэзалюцыя Парламенцкай Асамблеі Рады Еўропы (ПАРЭ) па сітуацыі ў Беларусі пасьля прэзідэнцкіх выбараў ........ 220
Поўны тэкст заключэньня Савету ЕС па Беларусі ........ 224
Тэрміновы зварот — Абсерваторыя ........ 226
5. Сьпіс фігурантаў па крымінальных справах ........ 275

# Прадмова

2010 год у жыцьці краіны выдаўся надзвычай напружаным і дынамічным. У студзені ў Беларусі пачалася кампанія выбараў у мясцовыя саветы (самі выбары былі прызначаныя на 25 красавіка). Яна была цікавай тым, што гэта была першая выбарчая кампанія, якая праходзіла пасьля прыняцьця паправак у выбарчае заканадаўства. Надзвычай важна было прааналізаваць і на практыцы ўбачыць якім чынам гэтыя зьмены паўплывалі на большую дэмакратычнасьць і празрыстасьць выбарчага заканадаўства, з улікам таго, што ў канцы году намячалася правядзеньне прэзідэнцкіх выбараў.

Улады працягвалі праводзіць апрабаваную ў 2009 годзе тактыку кропкавага стрымліваньня грамадзянскай ды палітычнай актыўнасьці. Так, новы 2010 год пачаўся з эскалацыі канфлікту ўладаў з непрызнаньнем Саюзу палякаў у Беларусі, які цягнуўся ўжо ня першы год. Улады шляхам рэпрэсіяў і перасьледу актывістаў арганізацыі паставілі за мэту канчаткова пазбавіць яе ўплыву. Была ўзбуджаная крымінальная справа супраць рэгіянальнай актывісткі арганізацыі, дырэктаркі Івянецкага Польскага дому Тэрэзы Собаль. А ў лютым праз суд Польскі дом у Івянцы перайшоў да праўладнага Саюзу палякаў у Беларусі. Усё кіраўніцтва ды некалькі актывістаў «непаслухмянага» Саюзу палякаў у Беларусі былі адміністрацыйна пакараныя. І толькі ўмяшальніцтва ўладаў Польшчы замарозіла гэты канфлікт.

З мінулага 2009 году працягвала разгортвацца крымінальная справа супраць ваўкавыскага прадпрымальніка Мікалая Аўтуховіча і ягоных калегаў. Праваабаронцы лічылі зьняволеньне М.Аўтуховіча, які спрабаваў змагацца з карупцыяй на мясцовым узроўні, палітычна матываваным.

У студзені за «хуліганства» да штрафу ў памеры 250 базавых велічыняў быў асуджаны грамадзкі актывіст Юры Казак, які абліў фарбай помнік Уладзіміру Леніну на цэнтральнай плошчы Навагрудку. Акцыя была зьдзейсьненая ў знак пратэсту супраць камуністычнай спадчыны ў Беларусі, якая працягваецца культывавацца беларускім рэжымам.

Яшчэ 5 месяцаў у 2010 годзе, да канца траўня, мусіў адбываць зьняволеньне за парушэньне парадку адбыцьця пакараньня адзін з

удзельнікаў «справы 14-ці» моладзевы актывіст Арцём Дубскі. Праваабарончая арганізацыя «Amnesty international» прызнала яго вязьнем сумленьня.

У войску знаходзіліся «палітычныя прызыўнікі» , гвалтам забраныя ў войска дзеля палітычных перакананьняў і актыўнасьці ў моладзевых дэмакратычных арганізацыях Франак Вячорка, Андрэй Цянюта, Зьміцер Хведарук.

А 10 студзеня была ўзбуджаная крымінальная справа супраць віцебскага грамадзкага актывіста Сяргея Каваленкі за вывешваньне на вяршаліне цэнтральнай ёлкі Віцебску забароненага ўладамі нацыянальнага бел-чырвона-белага сьцягу. Пры затрыманьні ён быў моцна зьбіты міліцыянтамі. Праз шэсьць дзён зьняволеньня С.Каваленка быў выпушчаны пад падпіску аб нявыезьдзе. І ў траўні 2010 году Кастрычніцкі райсуд Віцебску вынес С. Каваленку прысуд — тры гады абмежаваньня волі без накіраваньня ў папраўчую ўстанову адкрытага тыпу.

Гэтаксама ў 2010 годзе перасьледваліся маладыя людзі, якія адмаўляліся служыць у войску па рэлігійных матывах. Так, са сьнежня 2009 году ў Жодзінскім СІЗА працягваў утрымлівацца вернік аднотой з пратэстанцкіх абшчынаў Іван Міхайлаў, якога абвінавачвалі па арт.435 Крымінальнага Кодэксу РБ («ухіленьне ад прызыву ў войска»). 1 лютага 2010 году ён быў асуджаны да 3-х месяцаў арышту. «Amnesty International» прызнала І.Міхайлава «вязьнем сумленьня». Напрыканцы 2009 году быў асуджаны да буйнага штрафу таксама сьведка еговы гомелец Дзьмітры Смык. У сьнежні 2009 году абласны суд падцьвердзіў ягоны прысуд і толькі ў сакавіку 2010 году Вярхоўны суд апратэставаў рашэньне гомельскага абласнога суду і вярнуў справу на новы разгляд.

Працягваўся перасьлед грамадзкіх актывістаў і праз адміністрацыйнае пакараньне. Так, некалькі грамадзкіх актывістаў у Віцебску (В.Раманенка, А.Галавань, Т.Сурган) былі беспадстаўна арыштаваныя і асуджаныя да штрафаў і адміністрацыйнага зьняволеньня. Гэта можна патлумачыць як помсту праваахоўных органаў за вывешаны іншым віцебскім грамадзкім актывістам С.Каваленкам нацыянальны сьцяг.

Працягвалася тактыка ўладаў па адмове ў рэгістрацыі новых няўрадавых арганізацыяў, палітычных партыяў, па забароне маса-

вых мерапрыемстваў і па нерэгістрацыі новых СМІ. Так, 3 лютага быў асуджаны на 10 сутак адміністрацыйнага арышту Іван Шульга, сябра грамадзкай арганізацыі «Беларуская асацыяцыя журналістаў». Ён быў затрыманы ў Менску пры спробе міліцыі ўварвацца ў кватэру, дзе на той час знаходзілася прадстаўніцтва незарэгістраванага ўладамі беларускамоўнага спадарожнікавага тэлеканалу Белсат. У лютым 8 незалежных выданьняў мелі адмовы ў рэгістрацыі. Гэтаксама адмовілі ў рэгістрацыі грамадзкаму аб'яднаньню «Берасьцейская вясна» і партыі Беларуская хрысьціянская дэмакратыя.

Люты 2010 году быў адметны пасьлядоўна жорсткім разгонам міліцыяй некалькіх публічных акцыяў, якія праходзілі ў Менску 8, 14 і 16 лютага. Затрыманых зьбівалі пры затрыманьні, перавозцы ў РУУС і нават у РУУСе. Журналістам перашкаджалі здымаць затрыманьні. У выніку беларускія праваабарончыя арганізацыі пайшлі на беспрэцэндэнтны крок, зьвярнуўшыся да сілавых структураў з прапановаю правесьці перамовы па тэме жорсткага абыходжаньня міліцыянтаў з удзельнікамі мірных акцыяў, а таксама наконт неабгрунтаваных рэпрэсіяў супраць актывістаў Саюзу палякаў у Беларусі. Праваабаронцамі была прынятая адпаведная заява. З кіраўнікоў МУСу, КДБ і пракуратуры на перамовы ніхто не зьявіўся, але крок праваабаронцаў паўплываў на зьмяншэньне гвалту над мірнымі дэманстрантамі ў наступныя некалькі месяцаў.

У лютым за «напад на міліцыянта» на шэсьць месяцаў арышту таксама быў асуджаны грамадзкі актывіст з Віцебску Алег Сурган, якога раней міліцыянты неаднаразова затрымлівалі ў горадзе за вывешваньне нацыянальных бел-чырвона-белых сьцягоў. Падчас аднаго з такіх затрыманьняў А.Сурган быў моцна зьбіты. Калі ж ён падаў скаргу на дзеяньні міліцыянта, той у сваю чаргу напісаў сустрэчную скаргу, якая і была задаволеная судом. Праваабаронцы ацанілі гэты прысуд як палітычна матываваны, а А.Сургана прызналі палітычным зьняволеным.

У лютым месяцы гэтаксама пачаўся мэтавы перасьлед незалежных беларускіх журналістак. Выкарыстаўшы гэтак званую «паляўнічую» справу і адпаведную заяву аб паклёпе генерала КДБ Івана Каржа, у якасьці сьведак былі дапытаныя намесьніца галоўнага рэдактара «Народнай волі» Марына Коктыш і шэф-рэдактар «Народнай волі» Сьвятлана Калінкіна. У журналістак быў праведзены вобшук

і канфіскаваныя кампутары. У сакавіку справа набрала абароты і вобшукі з канфіскацыяй кампутарнай тэхнікі і носьбітаў інфармацыі прайшлі ў офісе сайта «Хартыя-97», дзе працавала журналістка Натальля Радзіна і ў яе на кватэры, а таксама на прыватных кватэрах журналістак Ірыны Халіп і Марыны Коктыш. Зразумела, што такім чынам улады аказвалі на незалежных журналістак псіхалагічны ціск. Паўстала пагроза іхняга пераводу са стану сьведак у стан абвінавачаных.

Нечаканы ўдар атрымала пратэстанцкая царква «Новае жыцьцё», канфлікт якой дзеля царкоўнага будынку з менскімі гарадзкімі ўладамі цягнуўся ўжо не адзін год. Абшчына была аштрафаваная за «шкоду навакольнаму асяроддзю» на суму роўную 90 тысяч даляраў.

У сакавіку 2010 году беларускія ўлады паказалі, наколькі непасьлядоўнай была абвешчаная імі новая палітыка «лібералізацыі». Праваабаронцы праз родных даведаліся, што былі выкананыя два сьмяротныя прысуды, і гэта нягледзячы на неаднаразовыя звароты міжнароднай супольнасьці і беларускіх праваабаронцаў з патрабаваньнем устрымацца ад выкананьня сьмяротнага пакараньня. Была праігнараваная таксама просьба Камітэту ААН па правах чалавека не прыводзіць прысуды ў выкананьне да разгляду скаргаў асуджаных у Камітэце. Міжнародныя арганізацыі (Рада Еўропы, Еўрапарламент і Парламенцкая Асамблея АБСЕ) былі ўражаныя жорсткасьцю беларускіх уладаў і выказалі сваё абурэньне і шкадаваньне. Камітэт ААН па правах чалавека абвінаваціў беларускія ўлады ў парушэньні міжнародных абавязальніцтваў.

У рэзалюцыі Еўрапарламенту за 10 сакавіка выказвалася трывога ў тым, што ў Беларусі і надалей працягвалі парушацца асноўныя правы і свабоды беларускіх грамадзянаў. Еўрапарламентары папярэджвалі афіцыйны Менск аб тым, што далейшыя парушэньні правоў чалавека могуць прывесьці да спыненьня дыялогу Еўрасаюзу з Беларусьсю.

Улады пасьлядоўна перашкаджалі правядзеньню масавых мірных акцыяў. Падчас падрыхтоўкі да Дня волі 25 сакавіка была затрыманая гукаўзмацняльная апаратура, некаторыя грамадзкія актывісты былі прэвентыўна затрыманыя.

У красавіку 2010 году адбыліся выбары ў мясцовыя саветы. Улічваючы мізэрнае значэньне мясцовых саветаў у сістэме існуючай улады, кампанія не выклікала заўважнай грамадзкай актыўнасьці.

Тым ня менш, праваабарончыя арганізацыі, якія праводзілі грамадзянскую кампанію «Праваабаронцы за свабодныя выбары» па маніторынгу за выбарамі, прыйшлі да высновы, што істотных зьменаў у правядзеньні выбараў, нягледзячы на зьмены ў выбарчае заканадаўства, не адбылося. Уладамі не былі ўлічаныя рэкамендацыі па ўдасканаленьні выбарчага заканадаўства як збоку беларускіх палітычных партыяў і НДА, так і збоку БДІПЧ АБСЕ. Праваабаронцамі былі зафіксаваныя масавыя парушэньні дэмакратычных стандартаў правядзеньня выбараў.

У зьвязку з удзелам у выбарах у мясцовыя саветы ўлады распачалі крымінальны перасьлед па абвінавачваньні «ў махлярстве» грамадзкага актывіста з Мастоў, былога дэпутата ў мясцовыя саветы Алеся Зарэмбюка. У выніку ён мусіў прасіць палітычнага прытулку ў Польшчы. Некалькі рэгіянальных грамадзкіх актывістаў былі пазбаўленыя працы.

У канцы красавіка адбыўсяператрус на офісе ў наваполацкага праваабаронцы Зьміцера Салаўёва. Былі канфіскаваныя кампутар, дыскі, бюлетэні і бел-чырвона-белыя сьцягі. Яго падазравалі ў дачыненьні да нанясеньня фашыстоўскай сімволікі на сьцены будынкаў, хаця сам З.Салаўёў неаднаразова зьвяртаўся ў пракуратуру з патрабаваньнем узбудзіць крымінальную справу па гэтых фактах. З.Салаўёў зьвязаў гэты вобшук з надыходзячай прэзідэнцкай выбарчай кампаніяй.

Напачатку траўня 2010 году ў Жэневе на сесіі Савету правоў чалавека ААН, у рамках правядзеньня Ўніверсальнага перыядычнага агляду была разгледжаная справаздача аб становішчы з правамі чалавека ў Беларусі. Беларускія праваабаронцы падрыхтавалі альтэрнатыўную справаздачу, дзе выказалі 47 рэкамендацыяў для беларускага ўраду па паляпшэньні сітуацыі з правамі чалавека ў краіне. З вынікамі аналізу сітуацыі з правамі чалавека, зробленага праваабаронцамі, напярэдадні былі азнаёмленыя амбасадары краінаў Еўрасаюзу, а таксама прадстаўнікі МЗС Беларусі і Адміністрацыі прэзідэнта. Тым ня менш, прадстаўнікі беларускага ўраду падчас разгляду УПА заявілі, што ў краіне існуе свабода аб’яднаньняў, для грамадзянскай супольнасьці створаныя спрыяльныя ўмовы працы, і што сродкі масавай інфармацыі ў Беларусі зьяўляюцца незалежнымі. Прадстаўнікі беларускіх праваабарончых арганізацыяў і FIDH выказалі глыбокае расчараваньне з прычыны таго, што беларускія ўлады праігнаравалі абсалютную большасьць рэкамендацыяў, вы-

казаных іншымі дэлегацыямі і беларускімі праваабаронцамі, якія ахопліваюць асноўныя недахопы ў галіне правоў чалавека ў Беларусі.

6 траўня Вярхоўны Суд Беларусі вынес прысуд па крымінальнай справе Мікалая Аўтуховіча. Вялікая ўвага міжнароднай супольнасьці, а таксама беларускіх праваабаронцаў змусілі Вярхоўны суд адмовіцца ад большай часткі абвінавачваньняў, такіх як — наўмыснае зьнішчэньне альбо пашкоджаньне маёмасьці і падрыхтоўка тэрарыстычнага акту. Паводле гэтых правінаў пракуратура патрабавала для М.Аўтуховіча 20 гадоў зьняволеньня.

У выніку трое абвінавачаных былі асуджаныя за незаконныя дзеяньні ў адносінах да агнястрэльнай зброі, боепрыпасаў і выбуховых рэчываў. М. Аўтуховіч атрымаў 5 год і два месяцы калоніі ўзмоцненага рэжыму, У. Асіпенка і А. Ларын — па тры гады зьняволеньня. Міхаіл Казлоў быў асуджаны на два гады пазбаўленьня волі. Беларускія праваабронцы прызналі гэты крымінальны працэс палітычна матываваным.

14 траўня чарговыя жыхары Горадні Алег Грышкаўцоў і Андрэй Бурдыка былі прыгавораныя ў Беларусі да сьмяротнага пакараньня. Беларускія праваабаронцы выступілі з асуджэньнем гэтых прысудаў, а таксама адзначылі, што яны былі абвешчаныя літаральна праз два дні пасьля суровай і ўсеагульнай крытыкі, якая прагучала ў адрас Беларусі падчас прадстаўленьня Ўніверсальнага перыядычнага агляду, менавіта па пытаньні існаваньня сьмяротнага пакараньня ў Беларусі.

Будучая прэзідэнцкая выбарчая кампанія сапраўды стала адчувальнай у траўні 2010 году, калі 18-19 траўня па ўсёй Беларусі прайшлі вобшукі і допыты дзясяткаў актывістаў грамадзянскай ініцыятывы «Гавары праўду!». Лідэр кампаніі паэт Уладзімір Някляеў і ягоныя памочнікі Сяргей Вазьняк і Андрэй Дзьмітрыеў былі арыштаваныя на трое сутак, затым выпушчаныя пад падпіску аб нявыезьдзе.

27 траўня Праваабарончы цэнтр «Вясна» сумесна з Міжнароднай Федэрацыяй правоў чалавека (FIDH) выступіў з заявою, зьвязанай з ацэнкай агульнай сітуацыі. Праваабаронцы сьцьвердзілі: няпростае становішча з правамі чалавека ў краіне пачало ўскладняцца, «рэпрэсіі да актыўных групаў грамадзянскай супольнасьці Беларусі набылі планавы характар».

Пра тое ж было заяўлена на сумеснай прэс-канферэнцыі праваабаронцаў 8 чэрвеня 2010 году, прысьвечанай аналізу

сітуацыі з правамі чалавека ў краіне за першае паўгоддзе бягучага году. Прадстаўнікі Праваабарончага цэнтру «Вясна» і Беларускага Хельсінскага камітэту адзначылі, што за гэты час ніякіх пазітыўных зьменаў, датычных выкананьня правоў чалавека, у краіне не адбылося, а з набліжэньнем прэзідэнцкіх выбараў сітуацыя становіцца яшчэ больш складанай. Праваабаронцы заявілі пра неабходнасьць тэрміновай лібералізацыі нацыянальнага заканадаўства ў галіне грамадзянскіх і палітычных правоў.

У чэрвені 2010 году міністэрства інфармацыі шчодра раздавала папярэджаньні незалежным газетам, пагражаючы такім чынам ім закрыцьцём. Так, папярэджаньні атрымалі «Народная Воля», «Новы час» (двойчы) і «Товарищ». Праваахоўныя органы напрацягу ўсяго лета жорстка перапынялі правядзеньне грамадзкіх акцыяў, нават такіх бяскрыўдных, як велапрабег у гонар беларускага паэта Максіма Багдановіча, які спрабавалі арганізаваць актывісты Моладзі БНФ. Падчас затрыманьня аднаго з удзельнікаў велапрабегу З.Пармону супрацоўнікі міліцыі зламалі ключыцу.

Гэтаксама ўладамі ўпарта не рэгістраваліся новыя праваабарончыя арганізацыі. Так, у чэрвені была прыпыненая рэгістрацыя праваабарончай арганізацыі «Берасьцейская вясна», а 20 жніўня берасьцейскім праваабаронцам было адмоўлена ў рэгістрацыі ўжо ў **дзясяты** раз. Узьніклі праблемы ў працы Магілёўскага праваабарончага цэнтру.

У наступныя летнія месяцы ўлады працягвалі перасьлед незалежных СМІ і журналістаў. Так, у Вілейцы была ўзбуджаная крымінальная справа з прычыны паклёпу ў каментарах на мясцовым незалежным сайце vialejka.org. «Наша Ніва» атрымала ад міністэрства інфармацыі два чарговыя папярэджаньні. Гэтаксама крымінальная справа была ўсчатая супраць рэдактара незалежнага бюлетэню «Бойкі Клецк» Сяргея Панамарова за крытыку мясцовых уладаў. У выніку, калі справа была ўжо перададзеная ў суд, С.Панамароў быў вымушаны эміграваць.

16 жніўня быў арыштаваны, нібыта за прадастаўленьне падробленай даведкі аб заробку, беларускі паэт і выдавец Міхась Башура. Сапраўдная прычына ягонага арышту была ў тым, што ён, як выдавец, шчыльна супрацоўнічаў з грамадзянскай кампаніяй «Гавары праўду!». Такім чынам улады паказалі, што яны не спынілі асаблівую ўвагу да грамадзкіх актывістаў і надалей гатовыя да ўсялякіх правакацыяў супраць іх.

Інфармацыйную сітуацыю ў краіне ўзрушылі паказ некалькіх дакументальных фільмаў, рэзка крытыкуючых пазіцыю А.Лукашэнкі, які адбыўся па расійскім тэлеканале НТВ, а таксама ўзмацненьне крытыкі А.Лукашэнкі па іншых расійскіх інфармацыйных каналах. Ён абвінавачваўся ў карупцыі і перасьледзе палітычных апанентаў. «Інфармацыйная вайна» супраць А.Лукашэнкі была яўна інспіраваная крамлёўскімі ўладамі. Тое, што гэта адбылося напярэдадні прэзідэнцкіх выбараў у Беларусі, паказвала, што ўпершыню за ўвесь час знаходжаньня ва ўладзе, А.Лукашэнка страціў падтрымку Крамля.

У верасьні беларускімі праваабаронцамі быў прадстаўлены маніторынг па разьвіцьці сітуацыі з правамі чалавека ў Беларусі з лістапада 2008 г. па верасень 2010 г. У ім аўтары сфармулявалі крытэрыі вымярэньня прагрэсу — адносна незалежных СМІ, свабоды сходаў, свабоды аб’яднаньняў і становішча грамадзянскай супольнасьці, па якіх можна ацэньваць разьвіцьцё сітуацыі ў Беларусі. Асноўным крытэрам ацэнкі сітуацыі была абвешчаная сістэмнасьць зьменаў, замацаваных на ўзроўні заканадаўства. Улічваючы, што такіх зьменаў за вызначаны перыяд заўважна не было, праваабаронцы заявілі пра адсутнасьць прагрэсу ў галіне правоў чалавека і кансервацыю аўтарытарнага рэжыму, не гатовага да трансфармацыі. Праваабаронцы канстатавалі: не зьмяніўшы рэпрэсіўнае заканадаўства, датычнае грамадзянскіх свабодаў і правоў, рэжым у любы момант мог ужыць рэпрэсіўную машыну сілавых структураў супраць дэмакратычнай грамадзянскай супольнасьці. Асабліва верагодным такі сцэнар падзеяў мог адбыцца падчас прэзідэнцкай выбарчай кампаніі.

14 верасьня Палата прадстаўнікоў абвясьціла аб прызначэньні выбараў прэзідэнта Беларусі на 19 сьнежня. Улічваючы тое, што практычна ўся рэальная ўлада ў краіне засяроджаная ў руках прэзідэнта, гэтыя выбары мелі надзвычай важнае значэньне для далейшага лёсу краіны на наступныя пяць гадоў. Вылучэньне А.Лукашэнкі ў чацьвёрты раз на пасаду прэзідэнта не выклікала сумненьня, што тычыцца альтэрнатыўных дэмакратычных кандыдатаў, дык тут не было ніякай яснасьці. Праваабаронцы ж заявілі пра ўдзел у маніторынгу прэзідэнцкіх выбараў і абвясьцілі грамадзянскую кампанію «Праваабаронцы за свабодныя выбары».

У гэты самы дзень Магілёўскі абласны суд прыгаварыў гомельца Ігара Мяліка да сьмяротнага пакараньня.

З адзінаццаці прэтэндэнтаў на кандыдаты ў прэзідэнты, якія здалі больш за сто тысяч подпісаў, пасьля праверкі гэтых подпісаў напачатку лістапада былі зарэгістраваныя 10 з іх. І хаця этапы выбарчай кампаніі, якія датычыліся рэгістрацыі ініцыятыўных груп кандыдатаў, а таксама збору подпісаў за іх вылучэньне праходзілі ў адносна спакойнай абстаноўцы, фармаваньне выбарчых камісіяў адбывалася ў недэмакратычным рэжыме, і толькі 0,25% прадстаўнікоў дэмакратычных партыяў здолелі патрапіць ва ўчастковыя выбарчыя камісіі. Такім чынам, магчымыя фальсіфікацыі падчас падліку галасоў і вынік выбараў былі ўжо закладзеныя ў далейшую хаду выбарчай кампаніі.

Апроч гэтага, назіральнікі былі пазбаўленыя магчымасьці назіраць за працэсам праверкі сапраўднасьці подпісаў, сабраных у падтрымку прэтэндэнтаў. Выклікала сумненьне магчымасьць усіх дзесяці кандыдатаў у прэзідэнты сабраць неабходную для рэгістрацыі колькасьць галасоў. Але выканаўчыя ўлады, якія рэальна кіруюць ЦВК, вырашылі паказаць «небывалы ўзровень дэмакратыі» і разыграць сцэнар вядомага выбаршчыкам А.Лукашэнкі і адносна малавядомых дзевяці іншых кандыдатаў. Такі сцэнар, пры ўмове «кіруемага» падліку галасоў, на думку праўладных сцэнарыстаў, не даваў нікому з апазіцыйных кандыдатаў ніякіх шанцаў на перамогу.

У сваю чаргу, сцэнары дэмакратычнай апазіцыі падчас прэзідэнцкіх выбараў у 2001 і 2006 гадах, накіраваныя на вылучэньне адзінага кандыдата, не прывялі да перамогі і таму зараз не падтрымліваліся значнай часткаю дэмакратычнага актыву, скіраванай на падтрымку і вылучэньне толькі сваіх прэтэндэнтаў. Таму сярод беларускіх дэмакратычных палітыкаў у гэтую прэзідэнцкую кампанію не было вялікай ахвоты зноў ісьці па шляху вылучэньня адзінага дэмакратычнага кандыдата. Меркантыльныя і тактычныя інтарэсы ўзялі верх над стратэгічнымі. Нявызначанасьць у пытаньні палітычнай падтрымкі Захаду каго-небудзь аднаго з апазіцыйных палітыкаў прывяла да таго, што ў выбарах адмовіўся ўдзельнічаць найбольш вядомы з мінулых выбараў палітык Аляксандр Мілінкевіч. Астатнія апазіцыйныя кандыдаты, якія вырашылі браць удзел у выбарах, пайшлі на выбары асобнымі калонамі.

Раздробленасьць дэмакратычных сілаў задавальняла аўтарытарныя ўлады. Нават пры негатыўнай ацэнцы вынікаў выбараў з бо-

ку міжнародных назіральнікаў, частка еўрапейскіх палітыкаў была гатовая і надалей толькі ўзмацняць палітычнае ды эканамічнае супрацоўніцтва з беларускім рэжымам. Такое разьвіцьцё падзеяў у будучым зноў жа задавальняла беларускія ўлады і хаця рабіла сітуацыю з рэпрэсіямі супраць грамадзкіх ды палітычных актывістаў і парушэньнямі грамадзянскіх ды палітычных свабодаў у краіне не такой вострай, але адсоўвала дэмакратычныя сілы Беларусі на палітычны маргінэз. Беларускім дэмакратычным сілам пры такім сцэнары «лібералізацыі» краіны адводзілася роля масоўкі.

Тым ня менш, агітацыйная кампанія ўсіх дзевяці альтэрнатыўных кандыдатаў урэшце разбудзіла актыўнасьць беларускага грамадзтва. Гэта праявілася за некалькі тыдняў перад выбарамі, калі на сустрэчы з кандыдатамі ў розных рэгіёнах Беларусі пачалі прыходзіць сотні выбаршчыкаў. У сваю чаргу ўлады праз адміністрацыю ВНУ, школаў, ды іншых дзяржаўных установаў пачалі ледзь ня гвалтам заганяць людзей на датэрміновае галасаваньне. У ім узялі ўдзел 23% ад агульнай колькасьці выбаршчыкаў. У незалежных назіральнікаў і ў кандыдатаў у прэзідэнты такія маніпуляцыі выклікалі справядлівыя падозраньні пра магчымую фальсіфікацыю бюлетэняў папярэдняга галасаваньня.

Разнавектарныя намаганьні альтэрнатыўных кандыдатаў у прэзідэнты ўрэшце сышліся ў адную кропку, у адзін заклік: у сувязі з няроўнымі ўмовамі ўдзелу ў выбарах А.Лукашэнкі і ўсіх астатніх кандыдатаў у прэзідэнты, у сувязі з выкарыстаньнем А.Лукашэнкам адміністрацыйнага рэсурсу, у сувязі з кантролем выканаўчых уладаў выбарчых камісіяў, выбаршчыкі запрашаліся ў дзень галасаваньня 19 сьнежня на Кастрычніцкую плошчу з мэтаю выказаць свой пратэст супраць фальсіфікацыяў вынікаў выбараў. Гэты заклік падтрымалі васьмёра з дзесяці кандыдатаў у прэзідэнты.

Улады захваляваліся. З папярэджаньнем не хадзіць на плошчу выступілі як чыноўнікі высокага рангу: міністр унутраных спраў, генеральны пракурор, кіраўнік КДБ, так і сам А.Лукашэнка. Але апаненты існуючага прэзідэнта не саступалі. І вось псіхалагічнае супрацьстаяньне дасягнула свайго апагею ў дзень выбараў.

За гадзіну да заканчэньня выбараў невядомымі прадстаўнікамі сілавых структураў пры спробе прайсьці з свайго офісу на Кастрычніцкую плошчу, быў жорстка зьбіты кандыдат у прэзідэнты

Уладзімір Някляеў. Ён быў дастаўлены ў бальніцу хуткай дапамогі. Тым ня менш, нягледзячы на пагрозы, на 12-градусны мароз, ад 20-ці да 40-ка тысячаў беларускіх грамадзянаў пасьля заканчэньня галасаваньня прыйшлі на Кастрычніцкую плошчу. Гучная музыка з вулічных гукаўзмацняльнікаў заглушала прамовы выступоўцаў. Затым дэманстранты пайшлі да Дому ўраду, дзе дэманстрацыя была жорстка разагнаная амонам ды іншымі сілавымі аддзеламі. Падчас разгону дэманстрацыі і пасьля яго было затрымана больш за 700 удзельнікаў акцыі. Многія былі зьбітыя падчас разгону акцыі і ўжо пасьля ў машынах. Таксама пацярпелі некалькі кандыдатаў у прэзідэнты, сярод іх — Андрэй Саньнікаў, Віталь Рымашэўскі, Рыгор Костусеў, Мікола Статкевіч.

19 студзеня ўвойдзе ў гісторыю беларускага народу як «крывавая нядзеля». Зусім непадалёк, на прывакзальнай плошчы, сто пяць гадоў таму, 18 кастрычніка 1905 году па тайным загадзе менскага губернатара Паўла Курлова за патрабаваньне вызваліць палітычных зьняволеных і за антыцарскія лозунгі была расстраляная мірная дэманстрацыя. Загінула каля 80-ці чалавек і каля трохсот было паранена. Пракуратура ўзбудзіла крымінальную справу. Але расьследваньне прыйшло да высновы, што губернатар Курлоў «меў права прыняць рашучыя меры». Затым у адместку было два пакушэньні на Паўла Курлова і ён толькі цудам застаўся жывым.

19 сьнежня перакрэсьліла ўсе спадзяваньні аптымістаў на паступовую лібералізацыю і дэмакратызацыю беларускага рэжыму. Аўтарытарная ўлада сказала — не. І закруцілася бяздушнае кола рэпрэсіяў. Дзясяткі грамадзкіх актывістаў ды простых удзельнікаў акцыі пратэсту патрапілі ў СІЗО КДБ і МУС. Іх абвінавацілі ў «масавых беспарадках». Ім пагражае шматгадовае (да 15-ці гадоў) зьняволеньне. Болей за 700 дэманстрантаў прайшлі праз судовы канвеер і былі асуджаныя ў адміністрацыйным парадку, па краіне пракацілася хваля вобшукаў і допытаў, колькасьць якіх перавяліла за дзьве сотні адных і другіх. Вобшукі і допыты гэтаксама закранулі журналістаў і праваабаронцаў. Такога маштабу парушэньняў правоў чалавека ў краіне ў новай гісторыі яшчэ не было.

19 сьнежня дзясяткі тысячаў беларускіх грамадзянаў таксама сказалі сваё рашучае — **не** выбарчым фальсіфікацыям і чацьвёртаму запар тэрміну бязьзьменнаму прэзідэнту. І жорсткія рэпрэсіі ў

дачыненьні да сваіх палітычных апанентаў — гэта лепшы доказ таго, што ўлады іх пачулі.

Так скончыўся 2010 год. Не заўсёды пацярпелыя зьяўляюцца прайграўшымі. І не заўсёды той, хто выйграў, становіцца пераможцам.

*Алесь Бяляцкі*

# Агляд-хроніка парушэньняў правоў чалавека ў Беларусі, студзень 2010 году

У студзені ў Беларусі стартавала кампанія выбараў дэпутатаў мясцовых саветаў. Згодна з Указам Прэзідэнта № 21 ад 18.01.2010 году, выбары дэпутатаў мясцовых Саветаў 26 скліканьня Рэспублікі Беларусь прызначаны на 25 красавіка. Варта адзначыць, што гэта першая выбарчая кампанія, падчас якой на практыцы былі выпрабаваныя новыя палажэньні, унесеныя напярэдадні ў Выбарчы кодэкс. Адразу пасьля абвяшчэньня Ўказу аб прызначэньні выбараў, правядзеньне маніторынгу выбарчага працэсу пачалі па ўсёй краіне беларускія праваабаронцы ў межах кампаніі «Праваабаронцы за свабодныя выбары». Адной з пастаўленых мэтаў маніторынгу быў аналіз таго, як на практыцы рэалізуюцца новыя палажэньні выбарчага заканадаўства. Згодна з новаўведзенымі палажэньнямі ў Выбарчы кодэкс, суб'екты, якія вылучалі сваіх прадстаўнікоў у склад камісіі, у выпадках іх неўключэньня набылі права абскарджваць у судзе рашэньні органаў, якія ўтварылі камісію. Шэраг грамадзка-палітычных актывістаў з розных гарадоў Беларусі накіравалі скаргі ў суд па факце іх неўключэньня ў тэрытарыяльныя камісіі.

З абвастрэньня сітуацыі пачаўся год для актывістаў непрызнанага беларускімі ўладамі Саюзу палякаў у Беларусі на чале з Анжалікай Борыс. Супрацьстаяньне паміж гэтай арганізацыяй польскай нацыянальнай меншасьці і беларускімі ўладамі цягнецца ня першы год. Яшчэ напрыканцы 2009 году паведамлялася аб узмацненьні ціску на актывістаў СПБ і ўзбуджэньні крымінальнай справы па ч. 2 арт. 210 Крымінальнага кодэксу РБ — злоўжываньне службовымі паўнамоцтвамі супраць старшыні Івянецкага Польскага Дому (аднаго з трох дамоў, які застаўся пад кантролем непрызнанага ўладамі СПБ) Тэрэзы Собаль. 21 студзеня ў Івянцы ўлады арганізавалі сход, на якім меркавалася абраць новае кіраўніцтва Польскага Дому. У той дзень міліцыянты затрымалі каля 43 чалавек, якія накіроўваліся ў Івянец, каб падтрымаць непрызнаны ўладамі СПБ. (...) Тым часам, на сходзе

жыхароў Івянца прадстаўнікоў польскай нацыянальнай меншасьці ў Польскім Доме за пераабраньне Тэрэзы Собаль прагаласавалі амаль адзінагалосна. (...)

Гучны розгалас у СМІ ў студзені мела справа настаўнікаў. 15 студзеня начальніца ўпраўленьня адукацыі Менскага аблвыканкаму Таіса Данілевіч выклікала да сябе шасцёх настаўнікаў, якія зьяўляліся сябрамі розных палітычных партый, і ў катэгарычнай форме запатрабавала ад іх ці спыніць сяброўства ў партыях, ці звольніцца з працы па ўласным жаданьні. На думку чыноўніцы, яны ня маюць права працаваць у школах. Прааабаронцы дапамаглі настаўнікам зьвярнуцца ў пракуратуру са скаргай на незаконныя дзеяньні начальніка ўпраўленьня адукацыі Менскага аблвыканкаму, паколькі яна груба парушыла законныя канстытуцыйныя правы грамадзянаў.

У студзені праваабаронцы працягвалі адстойваць праз суды (...) права на свабоду мірных сходаў, што зьвязана з адмовамі мясцовых уладаў на заяўкі аб правядзеньні каля 18 інфармацыйных акцыяў, прымеркаваных да 10 сьнежня — гадавіны прыняцьця Ўсеагульнай дэкларацыі правоў чалавека. Суд Бярозаўскага раёну прызнаў адмову мясцовага райвыканкаму ў пікеце правамернай і адмовіў бярозаўскім праваабаронцам Сяргею Русецкаму і Васілю Азаранку ў задавальненьні іску. Гэтае судовае рашэньне было абскарджана праваабаронцамі. Касацыйныя скаргі на рашэньні судоў першай інстанцыі таксама накіравалі 25 студзеня смаргонскі праваабаронца Алесь Дзергачоў і 26 студзеня барысаўскія праваабаронцы Марына Статкевіч і Алег Мацкевіч.

У (...) 2010 годзе ў Беларусі заставалася актуальнай праблема існаваньня сьмяротнага пакараньня. У студзені 2009 году пры падтрымцы «Міжнароднай Амністыі» Праваабарончы цэнтр «Вясна» і Беларускі Хельсінскі камітэт ініцыявалі кампанію «Праваабаронцы супраць сьмяротнага пакараньня». Прадстаўленьне аб'ектыўнай інфармацыі, вядзеньне вольнай і адкрытай грамадзкай дыскусіі па сутнасьці праблемы сьмяротнага пакараньня — такая канцэпцыя была абрана праваабаронцамі ў працы з насельніцтвам. Адмена сьмяротнага пакараньня альбо ўвядзеньне мараторыя зьяўляецца адной з умоваў Еўрасаюзу для нармалізацыі адносінаў з Беларусьсю, а таксама неабходнай умовай для вяртаньня нашай краіне статусу сьпецыяльна запрошанай у ПАСЕ. Такім чынам, прадстаўнікі ўладаў вымушаны былі

пачаць выказвацца на гэтую тэму. У студзені інтэрнэт-партал Tut.by зрабіў шэраг публікацый, у якіх пра сьмяротнае пакараньне разважалі прафесары Акадэміі МУС Эла Саркісава і Анатоль Шаркоў, намесьнік начальніка ўпраўленьня Дэпартаменту выкананьня пакараньняў МУС Сяргей Працэнка, старшыня Пастаяннай камісіі Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Беларусі па заканадаўству і судова-прававых пытаньнях Мікалай Самасейка. Яны пагадзіліся з тым, што Беларусь (...) мусіць адысьці ад сьмяротнага пакараньня.

Міжнародная праваабарончая арганізацыя «Human Rights Watch» апублікавала штогадовую справаздачу аб стане выкананьня правоў чалавека ў сьвеце. Адносна Беларусі адзначаецца пагаршэньне сітуацыі з правамі чалавека за апошні год.

28 студзеня стала вядома, што ўтрыманьне пад вартай ваўкавыскіх прадпрымальнікаў Уладзіміра Асіпенкі і Мікалая Аўтуховіча падоўжанае яшчэ на месяц — да 28 лютага. Па словах дачкі Асіпенкі Людмілы, санкцыю на падаўжэньне тэрмінаў даў суддзя Вярхоўнага суду А.Цяцюхін.

# 1. Палітычна матываваны крымінальны перасьлед

10 студзеня пракурор падпісаў пастанову пра ўтрыманьне на два месяцы ў Віцебскім сьледчым ізалятары грамадзкага актывіста Сяргея Каваленкі, затрыманага 7 студзеня за вывешваньне на вершаліне галоўнай ёлкі Віцебску бел-чырвона-белага сьцягу. Супраць актывіста распачалі крымінальную справу паводле ч. 2 арт. 339 Крымінальнага кодэксу («хуліганства»). 13 студзеня нечакана арыштаванага выпусьцілі са сьледчага ізалятару пад падпіску аб нявыезьдзе. 19 студзеня С. Каваленку правялі псіхіятрычную экспертызу, на якую яго накіравала сьледчая Аксана Муравіцкая — у межах сьледзтва па крымінальнай справе. Пра вынікі псіхіятрычнай экспертызы абвінавачанаму не паведамілі, аднак з матэрыялаў сьледзтва С.Каваленку стала вядома, што абвінавачваньні супраць яго перакваліфікаваныя з ч. 2 на ч. 1 арт. 339 КК, і дададзены арт. 363 КК — аказаньне супраціву супрацоўнікам міліцыі.

11 студзеня суддзя Наваградскага раённага суду Валеры Цынкевіч прызнаў актывіста Беларускай хрысьціянскай дэмакратыі Юрася Казака вінаватым у зьдзяйсьненьні злачынства, прадугледжанага ч.1 арт. 339 КК РБ («хуліганства») і прысудзіў яго да выплаты штрафу ў памеры 250 базавых велічыняў (8 млн 750 тыс. руб). Нагадаем, што 7 лістапада Ю. Казак абліў зялёнай фарбай помнік Уладзіміру Леніну на цэнтральнай плошчы Наваградку. Як зазначыў актывіст на судзе, ягонай мэтай было не зьнішчэньне бюсту, а прыцягненьне ўвагі да праблемы злачыннай камуністычнай спадчыны ў Беларусі.

5 студзеня супрацоўнікі Івянецкага РАУС узбудзілі крымінальную справу паводле ч. 2 арт. 210 КК РБ супраць кіраўніцы Польскага Дому ў Івянцы Тэрэзы Собаль, якая зьяўляецца сябрам непрызнанага ўладамі Саюзу палякаў у Беларусі. Жанчыну абвінавачваюць ва злоўжываньні службовымі паўнамоцтвамі, якое палягае на тым, што ў 2004 годзе паводле загаду тагачаснага кіраўніка Саюзу палякаў Тадэвуша Кручкоўскага, Польскі Дом у Івянцы атрымаў матэрыяльную дапамогу і не сплаціў падаткаў. Старшыня галоўнай рады Саюзу палякаў Андрэй Пачобут лічыць, што дзеяньні ўладаў у дачыненьні да Т. Собаль маюць правакацыйны характар.

# 2. Адміністрацыйныя затрыманьні і пакараньні грамадзка-палітычных актывістаў

5 студзеня Віцебскі раённы суд аштрафаваў паводле арт. 23.39 КаАП РБ на 2 базавыя велічыні старшыню віцебскай абласной суполкі БНФ Кастуся Смолікава. Падставай паслужыў факт усталяваньня 29 кастрычніка віцебскімі актывістамі 5 памятных крыжоў у лесе каля вёскі Паляі, дзе ў сталінскія часы расстрэльвалі ахвяраў камуністычнага рэжыму. К.Смолікаў вырашыў папярэдзіць пра ўстаноўку крыжоў старшыню мясцовага Варонаўскага сельскага выканкаму Юрыя Восіпава і прапанаваў правесьці разам імпрэзу па ўшанаваньні памяці ахвяраў, але ў адказ пачуў пагрозы. Чыноўнік зьвярнуўся ў раённую пракуратуру, якая распачала адміністрацыйную справу за самаўпраўства супраць К.Смолікава.

9 студзеня ў Віцебску быў затрыманы актывіст «Маладой Беларусі» Тарас Сурган. Невядомыя людзі ў цывільным гвалтоўна запіхнулі яго ў машыну, калі той выйшаў з кватэры, каб выкінуць сьмецьце. Сябры і сваякі Т.Сургана зьвязваюць гэты інцыдэнт са справай ягонага паплечніка Сяргея Каваленкі, які вывесіў на вершаліне галоўнай ёлкі Віцебску бел-чырвона-белы сьцяг. У Чыгуначным РАУСе Т.Сургана абвінавацілі ў нецэнзурнай лаянцы і ўзбудзілі адміністрацыйную справу паводле артыкулу 17.1 — «дробнае хуліганства».

# 3. Парушэньне прынцыпу свабоды слова і распаўсюду інфармацыі

Міністэрства інфармацыі зноў адмовіла недзяржаўнай газеце «Магілёўскі час» у рэгістрацыі. Гэтым разам чыноўнікі выявілі, што памяшканьне, у якім знаходзіцца юрыдычны адрас выданьня, не адпавядае патрабаваньням заканадаўства. Першы раз газету адмовіліся рэгістраваць, бо ў яе галоўнага рэдактара не было вышэйшай адукацыі. Другі раз — дзеля адсутнасьці ў рэгістрацыйным пакеце копіі дамовы заснавальніка з юрыдычнай асобай, на якую ўскладаліся функцыі рэдакцыі газеты. Газета «Магілёўскі час» выходзіла як незарэгістраванае грамадзка-палітычнае выданьне з 2007 году накладам 299 асобнікаў. Спробы зарэгістраваць газету ідуць ад 10 верасьня 2009 году.

Міністэрства юстыцыі выставіла адразу некалькі прэтэнзіяў да Беларускай асацыяцыі журналістаў — датычна сяброўскага пасьведчаньня, статусу Цэнтру прававой абароны СМІ і наогул мэтаў і задач БАЖ. Загад падпісаў 13 студзеня намесьнік міністра Аляксандр Сіманаў. Кіраўніцтва БАЖ заявіла, што абавязкова будзе абскарджваць папярэджаньне, якое лічаць неабгрунтаваным.

19 студзеня журналісту недзяржаўнай рэгіянальнай газеты «Борисовские новости» Анатолю Мазгову, які зьбіраў інфармацыю для традыцыйнай рубрыкі «Барысаў: лічбы і факты» на працягу аднаго дня адмовіліся прадаставіць інфармацыю ў трох дзяржаўных установах. Адная з іх — загадчыца раённага ЗАГСу Тамара Красоўская, не прадаставіла інфармацыю пра колькасьць шлюбаў і разводаў

за тыдзень, матывуючы тым, што гэтыя зьвесткі яна ўжо дала дзяржаўнай мясцовай газеце і рэгіянальнаму тэлеканалу, і прапанавала пашукаць іх на сайце райвыканкаму. 21 студзеня галоўны рэдактар «Борисовских новостей» А. Букас накіраваў скаргу ў мясцовую пракуратуру, у якой просіць правесьці праверку і папярэдзіць вінаватых аб адказнасьці за парушэньне заканадаўства аб СМІ.

## 4. Сьмяротнае пакараньне

Актывісты кампаніі «Праваабаронцы супраць сьмяротнага пакараньня ў Беларусі» атрымалі з Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь адказ на свой зварот, разам з якім была перададзена петыцыя з заклікам адмяніць гэты від пакараньня. Як паведаміў у адказе старшыня Пастаяннай камісіі па нацыянальнай бясьпецы Палаты прадстаўнікоў Віктар Гумінскі: «Беларусь непасрэдна падышла да таго, каб пачаць падрабязна, празрыста і шырока абмяркоўваць у грамадзтве пытаньне аб адмене пакараньня сьмерцю. А для гэтага нам, дэпутатам, неабходны дыялог з народам. Ён можа праходзіць у розных формах. Але мы найперш вывучым магчымасьць правядзеньня парламенцкіх слуханьняў па гэтай тэме. Думаю, яны дазволяць аб'ектыўна ацаніць сітуацыю і гатоўнасьць грамадзтва па-новаму зірнуць на гэту праблему». У той жа час у сваім адказе В. Гумінскі ізноў спасылаецца на рэферэндум 1996 году і лічыць, што дэпутаты ня маюць права ігнараваць ягоныя вынікі.

## 5. Парушэньне права на свабоду асацыяцыяў

14 студзеня заснавальнікі Асацыяцыі грамадзкіх арганізацыяў «Асамблеі НДА» ў трэці раз падалі ў Мінюст дакументы на рэгістрацыю. Так, яшчэ ў 2002 годзе рэгістравальны орган атрымаў пакет дакументаў ад аб'яднаньня, аднак для вынясеньня адмоўнага рашэньня ў справе нерэгістрацыі Асамблеі Мінюсту спатрэбілася паўтары гады. У 2009 годзе Міністэрства юстыцыі адмовіла Асамблеі

НДА больш аператыўна. У прыватнасьці, чыноўнікі адзначылі, што мэты арганізацыяў-заснавальнікаў не супадаюць са статутнымі мэтамі Асамблеі. Другая прычына адмовы — устаноўчая дамова аб стварэньні асацыяцыі зьяўляецца несапраўднай, паколькі кіраўнікі арганізацыяў-заснавальнікаў Асамблеі падпісалі яе нібыта бяз згоды кіруючых органаў сваіх аб’яднаньняў. Трэцяя — «назва АКГА «Асамблея НДА» не адпавядае патрабаваньням заканадаўства, паколькі ня ўтрымлівае ўказаньня на прадмет дзейнасьці яе сяброў».

У канцы студзеня Міністэрства юстыцыі адмовіла ў рэгістрацыі Беларускага прафсаюзу «Разам». Падставай Мінюст указаў наяўнасьць шэрагу парушэньняў у сьпісах заснавальнікаў аб’яднаньня, выяўленых нібыта падчас праверкі . Старшыня прафсаюзу Ірына Яскевіч заявіла БелаПАН, што дадзеныя сьцьвярджэньні міністэрства «не адпавядаюць рэчаіснасьці». І. Яскевіч заявіла аб намеры працягнуць спробы рэгістрацыі.

# 6. Дыскрымінацыя і перасьлед грамадзка-палітычных актывістаў

21 студзеня ў судзе г. Жодзіна адбылася папярэдняя сустрэча бакоў, задзейнічаных у канфлікце: праваабаронцаў Лапіцкіх, якія працягваюць змаганьне за права навучаць свайго сына на беларускай мове, і прадстаўнікоў мясцовай улады. Дата пачатку слуханьняў прызначаная на 8 лютага. Сёлета Жодзінскі гарвыканкам прыняў чарговае (другое за апошнія 4 гады) рашэньне аб спыненьні навучаньня Янкі Лапіцкага ў Жодзінскай гімназіі № 1 і прымусовым пераводзе яго на расейскамоўнае навучаньне, абгрунтаваўшы гэта неабходнасьцю «рацыянальнага выкарыстаньня бюджэтных сродкаў».

26 студзеня суд Ленінскага раёну Берасьця адмовіў актывісту «Маладога Фронту» Яўгену Скрабцу ў разглядзе скаргі на незаконныя дзеяньні прызыўной камісіі падчас восеньскага прызыву на тэрміновую службу ў войска. Суддзя Карпава А.Ю. матывавала адмову тым, што ў належны тэрмін суд не атрымаў запатрабаваных папераў. Гэта ня першая спроба суду ўхіліцца ад разгляду скаргі палітпрызыўніка Я.Скрабца: напрыканцы кастрычніка 2009 году

тая ж суддзя адмовіла Я.Скрабцу ў разглядзе скаргі на падставе таго, што скарга павінна быць разгледжаная ў міжгарнізонным вайсковым судзе. Пазьней гэтае рашэньне было адменена.

# 7. Парушэньні права на свабоду сумленьня

12 студзеня Менскі гарадзкі камітэт прыродных рэсурсаў і аховы навакольнага асяроддзя аштрафаваў царкву «Новае жыцьцё» на 262 млн 798 тыс. 725 рублёў (91 900 USD). У сьнежні 2009 году на пад'ездах да аўтамабільнай стаянкі каля царквы супрацоўнікі камітэту бралі пробы грунту на ўтрыманьне нафтапрадуктаў. Паводле словаў юрыста царквы Сяргея Луканіна, гэты вялізны штраф накладзены як быццам бы за «забруджваньне навакольнага асяроддзя» згодна з артыкулам 15.11 Кодэксу аб адміністрацыйных правапарушэньнях. Чыноўнікі папярэдзілі абшчыну, што ў выпадку нявыплаты штрафу пададуць у Гаспадарчы суд Менску пазоў аб прымусовым спагнаньні гэтай сумы.

Ад 20 сьнежня 2009 году ў Жодзінскім СІЗА ўтрымліваецца 21-гадовы вернік габрэйска-месіянскай супольнасьці Іван Міхайлаў, якога абвінавачваюць па арт.435 Крымінальнага Кодэксу РБ («ухіленьне ад прызыву ў войска). Сам І.Міхайлаў ухілістам сябе ня лічыць, бо быў гатовы прайсьці альтэрнатыўную ці рэзервовую службу, аднак прызыўная камісія адмовіла яму ў такой магчымасьці. Крымінальная справа была перададзеная ў суд Менскага раёну 31 сьнежня 2009 году, а першае паседжаньне адбылося 29 студзеня 2010 году. У судзе высьветлілася, што І. Міхайлаў старэйшы ў шматдзетнай сям'і і дапамагае бацькам, бо сям'я знаходзіцца ў цяжкім матэрыяльным становішчы. Бацькі на гэты момант з сямі дзяцей выхоўваюць пяцёра. Сярод іх ёсьць як школьнікі, так і тыя, хто вучыцца ў ВНУ на платнай аснове. Сьведкі, якіх запрасілі з месца працы, а таксама з ваенкамату, вельмі станоўча характарызавалі І.Міхайлава. За «ўхіленьне ад прызыву» Івану Міхайлаву пагражае паўгады турмы. Між тым права грамадзянаў на альтэрнатыўную службу, закон аб якой у Беларусі адсутнічае, вынікае з арт. 57 Канстытуцыі Рэспублікі Беларусь.

# 8. Парушэньне права на свабоду мірных сходаў

22 студзеня суд Ленінскага раёну гораду Берасьця пакінуў без задавальненьня скаргу Сяргея Вакуленкі на рашэньне гарвыканкаму не дазволіць яму пікет, прымеркаваны да Дня правоў чалавека 10 сьнежня каля кінатэатру «Беларусь». Суд пагадзіўся з матывацыяй адмовы, што дзеля правядзеньня масавых мерапрыемстваў у Берасьці вызначанае адзінае месца — стадыён «Лакаматыў» у пустынным сектары прыватнай аднапавярховай забудовы.

Магілёўскія ўлады не дазволілі грамадзкім актывістам і гісторыкам правесьці ў гарадзкой ратушы круглы стол, прысьвечаны 433-й гадавіне наданьня Магілёву Магдэбурскага права. 25 студзеня з пісьмовай просьбай выдзеліць залу паседжаньняў у ратушы зьвярнуліся арганізатары мерапрыемства — прадстаўнікі няўрадавай арганізацыі «Сацыяльна-культурная ўстанова «Стратэгія разьвіцьця і міру». Між тым, за «круглым сталом», які меўся адбыцца, гісторыкі і грамадзкія актывісты зьбіраліся падыскутаваць на тэму гарадзкога самакіраваньня.

# 9. Парушэньні выбарчых правоў грамадзянаў

28 студзеня палітолаг Юрый Чавусаў падаў у Менскі гарадзкі суд скаргу на рашэньне прэзідыума Менскага гарадзкога Савету дэпутатаў і Менскага гарадзкога выканаўчага камітэту аб адхіленьні яго кандыдатуры на ўваход у склад Менскай гарадзкой выбарчай камісіі ад грамадзкага аб’яднаньня БНФ «Адраджэньне». Сам Ю. Чавусаў лічыць, што яго кандыдатуру адхілілі па палітычных прычынах, бо ў афармленьні ўсіх дакументаў ніякіх хібаў не было.

29 студзеня ў суд Барысаўскага раёну была пададзена скарга на рашэньне прэзідыуму Барысаўскага раённага Савету дэпутатаў, Барысаўскага раённага выканаўчага камітэту па фармаваньні раённай тэрытарыяльнай выбарчай камісіі. Падаўцы скаргі просяць абавязаць

прэзідыум Барысаўскага раённага Савету дэпутатаў, Барысаўскі раённы выканаўчы камітэт прыняць новае рашэньне пра фармаваньне раённай тэрытарыяльнай выбарчай камісіі з уключэньнем у яе Марыны Статкевіч, як прадстаўніка грамадзянаў, якія валодаюць выбарчым правам, і што пражываюць на адпаведнай тэрыторыі. Праваабаронца М.Статкевіч не была ўключана ў выбарчую камісію без ніякіх сур'ёзных тлумачэньняў.

# Агляд-хроніка парушэньняў правоў чалавека ў Беларусі, люты 2010 году

У лютым канфлікт паміж прызнаным і непрызнаным беларускімі ўладамі Саюзамі палякаў у Беларусі набыў міжнародны характар і прывёў да дыпламатычнага скандалу паміж Беларусьсю і Польшчай. 17 лютага суд Валожынскага раёну абавязаў дырэктарку Івянецкага Польскага дому Тэрэзу Собаль вызваліць будынак і перадаць яго кіраўніцтву мясцовай арганізацыі праўладнага Саюзу палякаў. У дні, калі праходзілі судовыя слуханьні справы па канфіскацыі Дому польскага ў Івянцы, адбываліся масавыя затрыманьні грамадзкіх актывістаў, а кіраўнікам СПБ суды вынесьлі адміністрацыйныя пакараньні па абвінавачаньні ў несанкцыянаванай акцыі салідарнасьці, якая адбылася 10 лютага ў Горадні. У сувязі з гэтымі падзеямі ў Варшаве была скліканая тэрміновая нарада ў МЗС Польшчы. Было прынятае рашэньне, што асобы, датычныя да рэпрэсіяў супраць беларускіх палякаў, ня будуць мець дазволу на ўезд на тэрыторыю Польшчы.

Амбасада Польшчы зьвярнула ўвагу беларускіх СМІ на неадпаведнасьць зьвестак, пададзеных некаторымі беларускімі тэлеканаламі. «З вялікай занепакоенасьцю і шкадаваньнем мы ўспрымаем антыпольскую прапагандысцкую кампанію, прапанаваную Беларускім дзяржаўным тэлебачаньнем, і ацэньваем яе як дрэнны курс у дыялогу паміж нашымі дзяржавамі», — адзначыў Павел Марчук, першы сакратар амбасады Рэспублікі Польшча. Напрыканцы лютага Еўрапейскі інвестыцыйны банк прыняў рашэньне аб спыненьні выдзяленьня крэдытаў Беларусі ў сувязі з ціскам на Саюз палякаў. «Крэдыты ЕІБ зьяўляюцца адзінай магчымасьцю фінансавага ціску Еўрасаюзу на беларускія ўлады», — заявіла ў інтэрв’ю польскаму выданьню «Gazeta Wyborcza» віцэ-прэзідэнт банку Марта Гаенцка. Як паведаміў Польскаму прэсаваму агенцтву (PAP) кіраўнік канцэлярыі польскага прэзідэнта Ўладзіслаў Стасяк, у сярэдзіне лютага Лех Качыньскі накіраваў ліст А. Лукашэнку ў справе сітуацыі вакол

СПБ, у якім зьвяртаецца да прэзідэнта Беларусі з просьбай «асабіста зацікавіцца сітуацыяй польскай меншасьці ў Беларусі». Прэзідэнт Польшчы выказаў «поўную салідарнасьць» з СПБ на чале з Анжалікай Борыс ды заклікаў увесь Еўрасаюз да салідарнасьці ў гэтай справе. Ён адзначыў, што Польшча цяпер абараняе ня толькі правы польскай меншасьці, але і правы чалавека ўвогуле, правы апазіцыі.

Каб урэгуляваць пытаньне з польскай меншасьцю ў Беларусі, вырашана стварыць групу беларуска-польскіх экспертаў. Пра гэта вусна дамовіліся міністар замежных справаў Польшчы Радаслаў Сікорскі з прэзідэнтам А.Лукашэнкам падчас сустрэчы ў Кіеве. Дэбаты ў Еўрапарламеньце адбыліся 24 лютага ў Брусэлі. Дэпутаты ад найбуйнейшых еўрапейскіх партыяў асудзілі перасьлед польскай меншасьці ў Беларусі і запатрабавалі ад менскіх уладаў адпавядаць дэмакратычным стандартам. Галасаваньне па рэзалюцыі перанесьлі на сакавік.

У лютым у Менску былі жорстка падаўленыя тры дэмакратычныя акцыі. 8 лютага менскія сьпецназаўцы разагналі акцыю салідарнасьці з арыштаванымі ваўкавыскімі прадпрымальнікамі Мікалаем Аўтуховічам і Ўладзімірам Асіпенкам. Па сьведчаньні ўдзельніка акцыі лідэра кампаніі «Еўрапейская Беларусь» Яўгена Афнагеля, «ужо тры-чатыры месяцы такога жорсткага абыходжаньня ён ня бачыў». Некаторых зьбівалі, калі цягнулі ў аўтобус, камусьці разьбілі акуляры. У Цэнтральным РУУС сталіцы затрыманых актывістаў двума радамі паставілі ў калідоры тварам да сьцяны. Так яны стаялі каля дзьвюх гадзінаў, пакуль іх пачалі адпускаць. Тых, хто ўпершыню трапіў у пастарунак, павялі на дактыласкапію, зьнялі на фота і відэакамеру. Журналісты, якія прыйшлі асьвятляць акцыю салідарнасьці, чарговы раз не змаглі выконваць свае прафесійныя абавязкі. Перашкоды чынілі ўжо апрабаваным раней спосабам невядомыя людзі ў цывільным, якія шчыльным колам захіналі дэманстрантаў ад журналістаў і закрывалі рукамі камеры апаратараў.

Разгонам і затрыманьнямі скончылася традыцыйная моладзевая акцыя ў Дзень Сьвятога Валянціна 14 лютага. У выніку ў пастарунак трапіла каля трыццаці сябраў моладзевага дэмакратычнага руху. Адлічаная з юрфаку БДУ за грамадзкую дзейнасьць маладафронтаўка Тацяна Шапуцька атрымала лёгкую чэрапна-мазгавую траўму — такі дыягназ ёй паставілі ў 10-ым клінічным шпіталі.

У выніку правядзеньня традыцыйнага Дня салідарнасьці з сем’ямі зьніклых і палітвязьнямі 16 лютага ў Цэнтральны РУУС Менску трапілі 19 чалавек, сярод іх апынулася і фотакарэспандэнтка «Нашай Нівы» Юлія Дарашкевіч. Праз тры гадзіны ўсіх затрыманых вызвалілі без складаньня адміністрацыйных пратаколаў.

У сувязі з узмацненьнем рэпрэсій праваабарончыя арганізацыі Беларусі заявілі аб намеры правядзеньня перамоваў з сілавымі структурамі з мэтай пошуку шляхоў для нармалізацыі дзейнасьці праваахоўных органаў пры забесьпячэньні правапарадку падчас правядзеньня мірных сходаў. Ініцыятарамі перагаворнага працэсу выступілі Асьветніцкая ўстанова «Цэнтр прававой трансфармацыі», Праваабарончы цэнтр «Вясна», Камітэт «Салідарнасьць», Беларускі Хельсінскі камітэт, Беларускі Дом правоў чалавека, Цэнтр па правах чалавека і «Прававая дапамога насельніцтву». У калектыўным звароце праваабаронцаў адзначана, што неабходнасьць перагаворнага працэсу абвешчана ў неадкладным парадку і абумоўлена дзеяньнямі супрацоўнікаў праваахоўных органаў пры правядзеньні мірных сходаў 8, 14 і 16 лютага, а таксама сітуацыяй вакол «Саюзу палякаў у Беларусі». Сустрэча была прызначаная на 19 лютага ў гатэлі «Еўропа». Для назіраньня за перагаворным працэсам, забесьпячэньня адкрытасьці і інфармаваньня грамадзкасьці арганізацыйным камітэтам былі запрошаны прадстаўнікі дыпламатычных місій, офіса АБСЕ ў Менску, Прадстаўніцтва Еўракамісіі, журналісты. Міліцыя і КДБ на перамовы не прыйшлі. Акрамя таго ў апошні момант адміністрацыя гатэлю скасавала дамову, спаслаўшыся на тое, што памяшканьне арэндавала «дэлегацыя з Бразіліі».

11 лютага праваабаронцы прэзентавалі даклад для працэдуры Ўніверсальнага перыядычнага агляду Беларусі ў межах Савету ААН па правах чалавека. Універсальны перыядычны агляд (УПА), да якога рыхтуецца Беларусь, — гэта механізм Савету па правах чалавека, у рамках якога Савет праводзіць рэгулярныя агляды па выкананьні 192 дзяржавамі-членамі ААН абавязацельстваў і абавязкаў у галіне правоў чалавека. Сама працэдура ўзьнікла ў выніку рэфармаваньня ААН: з’яўленьня Савету па правах чалавека і ліквідацыі інстытуту сьпецдакладчыка па правах чалавека па краінах. Рэспубліка Беларусь сёлета будзе ўпершыню праходзіць такую працэдуру. У падрыхтоўцы альтэрнатыўнага агляду прымалі ўдзел Беларускі Хельсінскі камітэт,

Беларуская асацыяцыя журналістаў, Праваабарончы цэнтр «Вясна», Асамблея НДА і Міжнародная федэрацыя правоў чалавека. У кастрычніку мінулага году ён быў накіраваны ў Савет ААН.

# 1. Палітычна матываваны крымінальны перасьлед

11 лютага маладафронтавец з Берасьця Іван Стасюк атрымаў пракурорскае папярэджаньне за дзейнасьць ад імя незарэгістраванай арганізацыі. У ім значыцца, што матэрыялы аб дзейнасьці актывіста паступілі ў пракуратуру з УКДБ Берасьцейскай вобласьці. З прадстаўленай інфармацыі і з раздруковак матэрыялаў сайтаў «Малады Фронт» і «Радыё Рацыя» была зроблена выснова, што актывіст прымае ўдзел у дзейнасьці незарэгістраванай арганізацыі. (...)

19 лютага Кастрычніцкі суд Віцебску прызнаў рэгіянальнага актывіста БХД і «Маладой Беларусі»Алега Сургана вінаватым у нападзе на міліцыянта (арт. 364 КК — гвалт ці пагроза гвалту ў дачыненьні да супрацоўніка міліцыі) і пакараў на шэсьць месяцаў арышту і на 2,5 мільёны рублёў кампенсацыі, якія ён мусіць сплаціць нібыта пацярпеламу лейтэнанту Дудкевічу. Між тым, па словах актывіста, менавіта яго зьбівалі ў міліцэйскай машыне, калі везьлі ў пастарунак. Пасьля таго, як А.Сурган зьвярнуўся са скаргай на дзеяньні міліцыянта ў пракуратуру, Дудкевіч заявіў пра напад. На судзе ў сваім апошнім слове А.Сурган заявіў: крымінальны перасьлед выкліканы тым фактам, што ён вывесіў у горадзе бел-чырвона-белы сьцяг, аднак той пратакол некуды зьнік і ў справе не фігуруе.

24 лютага ў Валожынскім РАУС у межах сьледзтва па крымінальнай справе былі дапытаныя дырэктарка Івянецкага Польскага дому Тэрэза Собаль і бухгалтарка Рамуальда Мірон. Актывістка апазіцыйнага Саюзу палякаў на Беларусі Т. Собаль выступае падазраванай у крымінальнай справе аб злоўжываньні службовым становішчам (ч.2 арт. 210 КК РБ). Справа, узбуджаная 05.01.10 г., грунтуецца на тым, што напрыканцы 2004 году Т.Собаль атрымала заахвочваньне ад кіраўніцтва СПБ з Горадні ў памеры 600 тысяч беларускіх рублёў. Сьледчы прапанаваў ёй спыніць крымінальную справу ў сувязі са

сканчэньнем тэрміну даўніны. Яна адмовілася, бо лічыць, што справа мусіць быць спынена з-за адсутнасьці складу злачынства. Тэрмін сьледзтва працягнуты да 18 сакавіка.

# 2. Адміністрацыйныя затрыманьні і пакараньні грамадзка-палітычных актывістаў

15 лютага ў Горадні і Валожыне былі пакараныя кіраўнікі апазіцыйнага Саюзу палякаў у Беларусі. Кіраўніцу СПБ Анжаліку Борыс суд аштрафаваў на 30 б.в. (1 млн 50 тыс. руб). На пяць сутак арыштаваныя намесьнік старшыні Мечыслаў Яскевіч, старшыня Рады Андрэй Пачобут і прэс-сакратар Ігар Банцар. Суд прызнаў іх удзельнікамі несанкцыянаванага мітынгу, які адбыўся 10 лютага ў Горадні ў падтрымку івянецкіх палякаў. За кратамі І. Банцар усе пяць дзён праводзіў галадоўку, а А. Пачобута супрацоўнікі міліцыі не адпусьцілі, каб ён змог забраць жонку з радзільні.

Актывіст аргкамітэту па стварэньні партыі «Беларуская Хрысьціянская Дэмакратыя» Алесь Галавань быў завочна асуджаны на 7 сутак адміністрацыйнага арышту, што вынікае з пастановы суду, якую ён атрымаў па пошце. Разам з іншым актывістам БХД Валерам Раманенка ён быў затрыманы ў Віцебску 15 студзеня, у іх канфіскавалі бел-чырвона-белыя сьцягі. Маладых людзей абвінавацілі ў тым, што яны нібыта «знаходзіліся ў грамадзкім месцы ў нецьвярозым стане». А.Галавань і В.Раманенка правялі за кратамі трое сутак да суду, а на працэсе запатрабавалі адвакатаў. У выніку, суд перанесьлі. Цяпер жа высьветлілася, што ён прайшоў у адсутнасьць А.Галаваня.

24 лютага адміністрацыйная камісія Фрунзенскага раёну Менску пакарала актывістку аргкамітэту па стварэньні партыі «БХД» Ірыну Губскую штрафам у памеры 5 б.в. (175 тыс. руб.). Дзяўчыну затрымалі ў ноч з 15 на 16 лютага падчас правядзеньня акцыі ў падтрымку нефармальнага СПБ пад кіраўніцтвам Анжалікі Борыс. Тады ў цэнтры Менску на будынках станцыі метрапалітэну «Плошча Леніна», Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэту і Менгарвыканкаму зьявіліся бел-чырвона-белыя налепкі з надпісам Wolna Bialorus («Вольная Бела-

русь»). Адміністрацыйная камісія прызнала І. Губскую вінаватай у парушэньні правілаў добраўпарадкаваньня і ўтрыманьня населеных пунктаў.

# 3. Парушэньне прынцыпу свабоды слова і распаўсюду інфармацыі

3 лютага ў Менску супрацоўнікі міліцыі і людзі ў цывільным учынілі спробу ўварвацца ў кватэру, якую здымае прадстаўнік незалежнага тэлеканалу «Белсат». У той час у кватэры знаходзіліся беларускія журналісты. 4 лютага суддзя Аксана Рэлява Савецкага райсуду Менску пакарала незалежнага журналіста Івана Шульгу па абвінавачаньні ў дробным хуліганстве (арт. 17.1 КаАП) на 10 сутак адміністрацыйнага арышту. Пры гэтым першая частка слуханьняў прайшла ў закрытым рэжыме, а суддзя адхіліла хадайніцтва адваката выклікаць у суд сьведку. Сябра БАЖ быў затрыманы напярэдадні пры міліцэйскім штурме кватэры. Журналіст адмовіўся дапамагаць міліцыянтам і крыкнуў праз дзьверы, каб іх не адчынялі. І.Шульгу адвезьлі ў Савецкі РУУС на алкагольную экспертызу, якая не падцьвердзілася. Тады затрыманага абвінавацілі ў тым, што падчас размовы ён нібыта абражаў міліцыянтаў і нават ударыў нагой аднаго з іх.

11 лютага карэспандэнту недзяржаўнага інфармагенцтва БелаПАН Анатолю Гатоўчыцу і незалежнаму журналісту Алегу Ражкову не дазволілі ўвайсьці ў памяшканьне Савецкага райсуду Гомелю дзеля наяўнасьці пры іх тэле- і фотаапаратуры. Інцыдэнт здарыўся перад пачаткам адкрытага судовага паседжаньня па справе прызыўніка Яўгена Якавенкі, які нібыта ўхіляўся ад службы ў войску.

15 лютага БАЖ накіраваў чарговы ліст міністру ўнутраных спраў Анатолю Куляшову, у якім дамагаецца адказу наконт перашкодаў журналістам у працы. «На прэсавай канферэнцыі 28 студзеня Вы паабяцалі разабрацца, чаму грамадзкае аб’яднаньне не атрымала адказу на свой зварот з нагоды парушэньня правоў журналістаў невядомымі асобамі ў цывільным у часе вулічных акцый восеньню 2009 году», — нагадваюць журналісты.

17 лютага супрацоўнікі міліцыі Ленінскага РУУС Менску правялі вобшук на працоўным месцы сябра БАЖ, намесьніцы галоўнага рэдактара газеты «Народная воля» Марыны Коктыш. Быў канфіскаваны сістэмны блок яе кампутара. Журналістку таксама выклікалі ў Ленінскі РУУС на допыт у якасьці сьведкі па так званай «паляўнічай» справе, у межах якой шэраг службовых асобаў структуры Міністэрства ўнутраных спраў падазраюцца ў перавышэньні сваіх паўнамоцтваў. Крымінальная справа заведзена паводле ч.2 арт.188 (паклёп, які ўтрымліваецца ў СМІ).

26 лютага быў праведзены вобшук на кватэры шэф-рэдактара газеты «Народная воля» Сьвятланы Калінкінай. Сьледчы Савецкага РУУС сталіцы Камінскі прад'явіў пратакол, з якога вынікала, што расшукваюцца тыя, хто зьняважыў былога кіраўніка ўпраўленьня КДБ па Гомельскай вобласьці. У выніку ў журналісткі незалежнага выданьня канфіскавалі кампутары яе і сына, флэшкі і телефонны нататнік. Пры гэтым, як сьцьвярджае С. Калінкіна, міліцыянты не далі ёй магчымасьці зьвязацца ні з адвакатам, ні з галоўным рэдактарам сваёй газеты, ні з прадстаўнікамі БАЖ — адразу загадалі выключыць тэлефон. Шэф-рэдактарка «Народнай волі» зьвязвае вобшук не з «паляўнічай справай», а з жаданьнем праваахоўных органаў запалохаць незалежную прэсу.

20 лютага заснавальнік недзяржаўнай газеты «Наш дом» — прыватнае ўнітарнае гандлёвае прадпрыемства «Віцебскі корунд» — паскардзілася ў Вышэйшы Гаспадарчы Суд на Міністэрства інфармацыі, якое пакінула без разгляду дакументы аб рэгістрацыі выданьня. У скарзе ў суд прадпрыемства патрабуе прызнаць дзеяньні Мініфармацыі незаконнымі, бо Міністэрства мусіла альбо зарэгістраваць СМІ, альбо афіцыйна адмовіць у рэгістрацыі, а не вяртаць дакументы.

Такім чынам, адмовы ў рэгістрацыі (альбо вяртаньне дакументаў на рэгістрацыю) у гэтым месяцы мелі (па зьвестках БАЖ) як мінімум 8 выданьняў: «Наш дом» (Віцебск), «Магілёўскі час» (Магілёў), «Солигорск плюс» (Салігорск, Менская вобл.), «Новая газета Бобруйска» (Бабруйск, Магілёўская вобласьць), «Мар'інагорская» (Мар'іна Горка, Менская вобл.), «Прэфект плюс» (Глыбокае, Віцебская вобласьць), «Химик. Два города» (Наваполацк) і яшчэ 1 выданьне, заснавальнікі якога не пажадалі пакуль быць згаданымі ў прэсе.

# 4. Парушэньне права на свабоду мірных сходаў

Берасьцейскі абласны суд не задаволіў касацыйную скаргу пеньсіянера Паўла Казлова на рашэньне Ленінскага райсуду Берасьця, які прызнаў адмову гарвыканкаму ў пікеце ў цэнтры гораду законнай. Суд спаслаўся на рашэньне гарвыканкаму аб выдзяленьні адзінага месца для масавых мерапрыемстваў — стадыёну «Лакаматыў», які знаходзіцца на ўскрайку гораду. Аднак П.Казлоў лічыць бессэнсоўным праводзіць акцыю, скіраваную супраць раўнадушша чыноўнікаў, у бязьлюдным месцы. Падставай для пікету паслужыла тое, што ўжо чацьвёрты год пеньсіянер намагаецца вярнуць незаконнаануляваную ліцэньзію на правядзеньне аўтатэхнічных эксьпертызаў. Міністэрства юстыцыі пазбавіла яго ліцэньзіі на ацэнку аўтамабіляў пасьля таго, як, па просьбе суду, Казлоў, якасны эксьперт з 40-гадовым стажам, зрабіў эксьпертызу па дарожна-транспартным здарэньні з удзелам супрацоўніка ДАІ не на карысьць апошняга. За гэтыя гады ён напісаў звыш 50 скаргаў і адкрытае пісьмо прэзідэнту. Але ўсе інстанцыі паставіліся да скаргаў пакрыўджанага пеньсіянера чыста фармальна.

# 5. Парушэньне права на свабоду асацыяцыяў

3 лютага Саюз беларускіх пісьменьнікаў выступіў з заявай аб перасьледзе сяброў аб'яднаньня. Заява прынята Радай СБП аднагалосна. Гэта зьвязана з тым, што ўсе сябры СБП, якія працуюць у дзяржаўных бюджэтных установах, былі выкліканыя да кіраўніцтва. Пад пагрозай звальненьня ва ўльтыматыўнай форме ім было прапанавана выйсьці з Саюзу беларускіх пісьменьнікаў. Як высьветлілася, кіраўніцтва атрымала ліст з Адміністрацыі прэзідэнта, названы так: «Дэструктыўная арганізацыя, сяброўства ў якой несумяшчальна з працай у дзяржаўных установах і ведамствах». Між тым, грамадзкае аб'яднаньне «Саюз беларускіх пісьменьнікаў» зарэгістравана ў Міністэрстве юстыцыі

і ў ягоных шэрагах Народныя паэты Беларусі Ніл Гілевіч і Рыгор Барадулін, дзясяткі іншых слынных літаратараў. Прыкладна 3 месяцы таму СБП прайшоў адпаведную чыстку ў Мінюсьце. На запыт міністэрства старшыня СБП Алесь Пашкевіч падаў у ведамства агульны сьпіс сябраў арганізацыі, у якім былі пазначаны прозьвішчы, псеўданімы, месца жыхарства, год уступленьня, жанр, у якім працуе літаратар. Мінюст запатрабаваў падаць зьвесткі пра месца працы. Гэты запыт А. Пашкевіч ня стаў выконваць, але (...) месцы працы пісьменьнікаў былі выяўленыя іншым чынам.

18 лютага Вярхоўны Суд Беларусі адмовіў заснавальнікам праваабарончага грамадзкага аб'яднаньня «Берасьцейская Вясна» ў задавальненьні касацыйнай скаргі, якая тычылася адмовы ў дзяржрэгістрацыі аб'яднаньня. Галоўнае ўпраўленьне юстыцыі Берасьцейскага абласнога выканкаму давала адтэрміноўку заяўнікам для выпраўленьня недакладнасьцяў, аднак супрацоўнікі аддзелу ня ўказвалі на тыя моманты, якія ў далейшым паслужылі прычынай адмовы — прадастаўленьне копіі квітка аб аплаце пошліны за рэгістрацыю замест арыгіналу. Такім чынам, праваабаронцы прыйшлі да высновы, што ўлады не зацікаўленыя ў дзейнасьці рэгіянальнай праваабарончай арганізацыі. З 2004 году гэта была ўжо 5 спроба рэгістрацыі «Берасьцейскай Вясны».

18 лютага Вярхоўны Суд адмовіў заснавальнікам партыі Беларуская Хрысьціянская Дэмакратыя, якія патрабавалі прызнаць незаконным рашэньне чыноўнікаў не рэгістраваць партыю. Акрамя таго сустаршыням БХД Паўлу Севярынцу і Віталю Рымашэўскаму, а таксама адказнаму сакратару Дзянісу Садоўскаму адмовілі ў магчымасьці заслухаць абвяшчэньне прысуду. У залу пусьцілі толькі часовага паверанага ў справах ЗША ў Беларусі Майкла Скэнлана, прадстаўніка амбасады Нямеччыны Эрнста Крэса і карэспандэнтку «Радыё Свабода» Любоў Лунёву. Сустаршыні БХД, у сваю чаргу, заявілі пра беспрэцэдэнтны ціск на заснавальнікаў партыі, якіх разнастайнымі пагрозамі вымушалі адмовіцца ад сваіх подпісаў у дакументах аб заснаваньні партыі.

Лідэр Беларускага незалежнага прафсаюзу Сяргей Антусевіч зьвярнуўся ў пракуратуру па факту ціску на рабочых прадпрыемства «Гродна Азот» з боку адміністрацыі. Пад пагрозай звальненьня кіраўнікі цэхаў пачалі патрабаваць ад рабочых, каб тыя пакінулі

шэрагі незалежнага прафсаюзу. С. Антусевіч кажа, што ў цяперашніх эканамічных абставінах улады баяцца незалежных прафсаюзаў, якія могуць ня толькі тлумачыць рабочым прычыны цяжкай сітуацыі, але і выводзіць іх на вуліцу.

28 лютага «Малады фронт» чарговы раз падаў у Мінюст дакументы на рэгістрацыю грамадзкага аб'яднаньня «Малады фронт». Ва ўстаноўчым зьезьдзе, які адбыўся ў Менску месяц таму, 30 студзеня, прынялі ўдзел 86 дэлегатаў. Гэта ўжо шостая з 2000 году спроба легалізаваць дзейнасьць Маладога Фронту ў Беларусі. У 2007 годзе арганізацыя была афіцыйна зарэгістраваная ў Чэхіі і з таго часу мае статус міжнароднага моладзевага грамадзкага аб'яднаньня. Лідэр МФ Зьміцер Дашкевіч лічыць, што чым больш яны будуць рабіць спробаў рэгістрацыі, тым цяжэй будзе праваахоўным органам перасьледаваць актывістаў па гэтым артыкуле. Таксама ён падкрэсьліў, што калі аб'яднаньне зноў не зарэгіструюць, «Малады фронт» будзе праводзіць устаноўчыя зьезды раз у квартал.

# 6. Гвалт і іншыя віды жорсткага абыходжаньня

Шасьцёра актывістаў грамадзянскай кампаніі «Еўрапейская Беларусь» накіравалі скаргі на дзеяньні супрацоўнікаў міліцыі ў пракуратуру Цэнтральнага раёну сталіцы. Яўген Афнагель, Максім Вінярскі, Павал Юхневіч, Ірына Пятрова, Паліна Кур'яновіч, Паліна Дзякава і Юля Глушыцкая прыводзяць факты затрыманьня і зьбіцьця іх падчас правядзеньня дэмакратычных акцый 8-га і 16-га лютага. Актывісты зьвяртаюць увагу на парушэньне іх канстытуцыйнага права на свабоду мірных сходаў, парушэньне забароны на катаваньні, жорсткае і прыніжаючае чалавечую годнасьць абыходжаньне.

# 7. Парушэньні права на свабоду сумленьня

1 лютага суд Менскага раёну абвінаваціў прызыўніка Івана Міхайлава ва ўхіленьні ад службы і прысудзіў да трох месяцаў арышту. Між тым вернік з рэлігійных перакананьняў адмовіўся праходзіць тэрміновую вайсковую службу і дамагаўся, каб яму прызначылі грамадзянскую службу. Яму адмовілі ў службе ў рэзерве.15 сьнежня 2009 году Іван Міхайлаў быў арыштаваны і зьмешчаны ў сьледчы ізалятар у Жодзіне. У суд Менскага раёну дастаўляўся пад канвоем, у кайданках. Сузаснавальнік Партыі БХД Аляксей Шэйн заявіў, што такі прысуд Івану Міхайлаву — гэта «грубае парушэньне закону пра свабоду веравызнаньня».

11 лютага суддзя Савецкага райсуду Гомелю Алена Дзічкоўская пакарала прызыўніка Яўгена Якавенку штрафам у памеры 5 б.в. (175 тыс. руб) на падставе пратаколу гарадзкога ваенкамату. Яго абвінавацілі ва ўхіленьні ад вайсковай службы, між тым прызыўнік адмаўляецца служыць у войску дзеля рэлігійных перакананьняў. 2 лютага ён ужо ў трэці раз накіраваў у адпаведныя дзяржаўныя структуры просьбу даць яму магчымасьць прайсьці альтэрнатыўную службу, але адказу так і не атрымаў.

26 лютага суддзя Маскоўскага раёну Менску Алена Шылько паводле пазову камітэту аховы прыроды Менгарвыканкаму аштрафавала царкву «Новае жыцьцё». Згодна з пастановай суду, царква павінна кампенсаваць нібыта нанесеную ёю шкоду навакольнаму асяроддзю ў памеры 263 мільёны рублёў, а таксама заплаціць за гэта штраф 8 мільёнаў 750 тысяч рублёў. Юрыст царквы «Новае жыцьцё» Сяргей Луканін адзначае, што камітэт аховы прыроды Менгарвыканкаму бяз ведама царквы і бяз сьведак зрабіў пробы грунту на прылеглай да яе будынку тэрыторыі. Аналіз паказаў падвышанае ўтрыманьне нафтапрадуктаў. Довады С.Луканіна, што да набыцьця царквой будынку былога кароўніка побач знаходзілася несанкцыянаваная гарадзкая сьметніца, у тым ліку старых аўтамабіляў, суддзя таксама не ўзяла пад увагу. Царква ня ў стане выплаціць такі вялізарны штраф.

# 8. Сьмяротнае пакараньне

У Беларусі застаецца актуальнай праблема існаваньня сьмяротнага пакараньня. 22 лютага ў Палаце прадстаўнікоў Нацыянальнага Сходу РБ адбылося запланаванае першае паседжаньне працоўнай групы па праблеме сьмяротнага пакараньня. Па словах кіраўніка групы старшыні Пастаяннай камісіі па заканадаўстве і судова-прававых пытаньнях Палаты прадстаўнікоў Мікалая Самасейкі, Беларусь будзе шукаць уласны спосаб вырашэньня пытаньня аб адмене сьмяротнага пакараньня, што прадыктавана геапалітычным становішчам краіны. На паседжаньні быў разгледжаны праект плана дзейнасьці працоўнай групы на бліжэйшыя паўгады. За гэты час яны маюць намер правесьці паглыблены аналіз статыстыкі, судовай і правапрымяняльнай практыкі суседніх дзяржаваў — Расіі і Ўкраіны, наведаць месцы пазбаўленьня волі, дзе адбываюць пакараньне асуджаныя да пажыцьцёвага зьняволеньня. М.Самасейка паведаміў, што дасягнутая папярэдняя дамоўленасьць аб правядзеньні ў Менску міжнароднага семінару па тэматыцы ўжываньня сьмяротнай кары з удзелам дэпутатаў ПАРЭ.

# Агляд-хроніка парушэньняў правоў чалавека ў Беларусі, сакавік 2010 году

Сітуацыя з правамі чалавека ў Беларусі ў сакавіку наглядна прадэманстравала, наколькі кіраўніцтва краіны не гатова ісьці па шляху дэмакратычных рэформаў. Сярод найбольш значных падзеяў сакавіка — прывядзеньне ў выкананьне двух сьмяротных прысудаў, што, на думку праваабаронцаў, зьдзейсьнена сьвядома насуперак патрабаваньням нацыянальнага заканадаўства і міжнародных абавязацельстваў, ратыфікаваных нашай краінай. З заявай, якая асуджае дзеяньні ўладаў, 23 сакавіка выступілі (...) Праваабарончы цэнтр «Вясна», «Беларускі Хельсінскі Камітэт», міжнародныя арганізацыі «Amnesty International», Камітэт па правах чалавека ААН, Савет Еўропы, Еўрапарламент і Парламенцкая Асамблея АБСЕ. Сусьветная грамадзкасьць абураная, што пакараньне зьдзейсьнена на фоне перамоваў аб увядзеньні мараторыя на сьмяротную кару, якія адбываюцца паміж уладамі Беларусі і Саветам Еўропы. «Беларускія ўлады прывялі прысуды ў выкананьне, ігнаруючы ўсе заклікі да міласэрнасьці і ведаючы, што ўжываньне вышэйшай меры пакараньня з'яўляецца непераадольнай перашкодай для палітычнага дыялогу з ПАСЕ і Еўрапарламентам, — гаворыцца ў заяве. — Рашэньне аб пакараньні Андрэя Жука і Васіля Юзэпчука было прынята пры поўным ігнараваньні таго факту, што Камітэт ААН па правах чалавека прыняў да разгляду іх скаргі і зьвярнуўся да беларускіх уладаў з просьбай не прыводзіць прысуды ў выкананьне».

9 сакавіка Праваабарончы цэнтр «Вясна» прэзентаваў «Агляд-хроніку парушэньняў правоў чалавека ў Беларусі ў 2009 годзе». (...) Між іншым адзначаецца, што мінулы год ня стаў для нашай краіны вырашальным у пытаньні адмены ці ўвядзеньня мараторыя на сьмяротнае пакараньне, і Беларусь па-ранейшаму застаецца адзінай дзяржавай на еўрапейскім кантыненьце і постсавецкай прасторы, дзе выносяцца і прыводзяцца ў выкананьне сьмяротныя прысуды.

Як станоўчы момант праваабаронцы адзначылі намер уладаў прыняць закон аб альтэрнатыўнай службе. Дагэтуль адсутнасьць такога

закону давала магчымасьць перасьледаваць людзей, якія не жадалі служыць з прычыны сваіх рэлігійных перакананьняў. Апошнія падзеі адлюстравалі заўважныя зрухі ў гэтым накірунку. Так, 10 сакавіка з жодзінскай турмы быў датэрмінова вызвалены грамадзкі актывіст, вернік царквы месіянскіх габрэяў Ян Міхайлаў. Гэта адбылося ў выніку разгляду касацыйнай скаргі асуджанага: напярэдадні 9 сакавіка калегія Менскага абласнога суду прызнала незаконным рашэньне суду першай інстанцыі, згодна з якім вернік быў пакараны на 3 месяцы арышту за ўхіленьне ад вайсковай службы. Справа накіраваная на перагляд, а асуджаны апынуўся на волі пад падпіскай аб нявыезьдзе. Між тым, тэрмін зьняволеньня Яна Міхайлава мусіў скончыцца 15 сакавіка, такім чынам ён адсядзеў амаль увесь вызначаны судом тэрмін пакараньня. 12 сакавіка Гомельскі абласны суд адмяніў рашэньне Савецкага райсуду, і цяпер крымінальная справа сябра БХД Яўгена Якавенкі, якога абвінавачваюць у няяўцы ў ваенкамат па позьве, будзе перагледжана. 15 сакавіка прэзідыум Гомельскага абласнога суду адмяніў пакараньне, вынесенае верніку суполкі «Сьведкі Яговы» Зьмітру Смыку папярэдняй інстанцыяй за нібыта ўхіленьне ад вайсковай службы. Па скарзе верніка Вярхоўны суд вынес пратэст на пакараньне штрафам у памеры 100 базавых велічыняў (3,5 мільёны рублёў).

25 сакавіка прайшла традыцыйная дэмакратычная акцыя Дзень Волі, прымеркаваная да чарговай гадавіны абвяшчэньня Беларускай Народнай Рэспублікі. Сёлетняя акцыя прайшла даволі спакойна, нягледзячы на нязгоду з тым, што Менскі гарвыканкам зноў вызначыў іншы маршрут шэсьця і ў чарговы раз адправіў усіх удзельнікаў з Акадэміі навук — месца збору — на плошчу Бангалор, у малалюдны парк Дружбы народаў. У 18 гадзінаў высьветлілася, што па дарозе да месца правядзеньня дазволенага мерапрыемства, тым ня менш была затрыманая і адвезеная ў РУУС Цэнтральнага раёну сталіцы гукаўзмацняльная апаратура. Супрацоўнікі міліцыі патлумачылі арганізатарам акцыі, што нібыта валодаюць дакладнай інфармацыяй пра знаходжаньне на месцы збору грамадзянаў Расійскай Федэрацыі, кшталту тых, хто арганізаваў выбух 3 ліпеня 2008 году ў Менску, таму магчыма будзе зьдзейсьнена спроба сарваць сьвяткаваньне Дня Волі, падрыхтаваўшы выбуховыя прыстасаваньні. Да таго ж яшчэ ўдзень пачаліся прэвентыўныя затрыманьні патэнцыйных удзельнікаў санк-

цыянаванага мерапрыемства, як у сталіцы, так і ў рэгіёнах. На прывакзальнай плошчы супрацоўнікамі міліцыі быў затрыманы кіраўнік арганізацыі «Правы альянс» Юрась Карэтнікаў, каля ўласнай кватэры была спроба затрыманьня моладзевага актывіста Яўгена Афнагеля. У асіповіцкага актывіста руху БНФ «Адраджэньне» Ігара Сімбірова па абвінавачаньні ў крадзяжы сьледчы крымінальнай міліцыі і супрацоўнік раённай пракуратуры правяліператрус. У пастарунку бабруйскага чыгуначнага вакзалу дапыталі сяброў незарэгістраванай партыі «Беларуская хрысьціянская дэмакратыя» Таісію Кабанчук, Ігара Казімірчыка, Яўгена Вішнякова і Максіма Чарняка. Прычына — нібыта перавозка наркотыкаў. Напярэдадні акцыі ў кіраўніка «Моладзі БНФ» Андруся Крэчкі без складаньня пратаколу было канфіскавана 20 бел-чырвона-белых сьцягоў памерам два на адзін метр і 500 папяровых сьцяжкоў з сімволікай гэтай структуры і гербам «Пагоня». Між тым Дзень Волі адбыўся. У акцыі прынялі ўдзел каля дзьвюх тысячаў чалавек, выступоўцы казалі праз мегафон. Пасьля кароткага мітынгу маладыя ўдзельнікі групамі спрабавалі рушыць у бок Нацыянальнай бібліятэкі і ў бок плошчы Якуба Коласа, але дарогу ім перагарадзіў спецназ. (...)

У сакавіку ўлады Беларусі ўзмацнілі ціск на свабоду слова, многія незалежныя журналісты трапілі пад перасьлед. 16 сакавіка адразу некалькі ператрусаў адбылося ў працоўных памяшканьнях і прыватных кватэрах беларускіх журналістаў. Вобшукі прайшлі ў офісе сайта «Хартыя-97» (пранікненьне туды адбылося з ужываньнем сілы, а журналістку Натальлю Радзіну адзін з міліцыянтаў ударыў у твар), у прыватнай кватэры журналісткі Ірыны Халіп, на працоўным месцы шэф-рэдактаркі «Народнай Волі» Сьвятланы Калінкінай, у прыватнай кватэры намесьніцы рэдактара «Народнай Волі» Марыны Коктыш, а таксама ў кватэры, дзе жыве Натальля Радзіна. Ва ўсіх выпадках міліцыянты забіралі носьбіты інфармацыі — кампутары, дыскі, USB-назапашвальнікі, карты памяці фотаапаратаў. Як вынікала з прад'яўленых міліцыянтамі дакументаў, ператрусы праводзіліся ў межах расьсьледаваньня крымінальнай справы, распачатай 31.12.2009 паводле ч. 2 арт. 188 КК РБ па факце паклёпу на былога начальніка УКДБ па Гомельскай вобласьці Івана Каржа.

У сувязі з ціскам, аказваемым на журналістаў, Беларуская асацыяцыя журналістаў зьвярнулася з адкрытым лістом да Генераль-

нага пракурора Беларусі. У той жа час міністр унутраных справаў Анатоль Куляшоў праігнараваў просьбу на сустрэчу з кіраўніцтвам ГА «БАЖ» з нагоды парушэньня правоў журналістаў невядомымі асобамі ў цывільным у часе вулічных акцыяў восеньню 2009 году. У пісьмовым адказе на лютаўскі зварот старшыні аб'яднаньня Жанны Літвіной да сп-ра Куляшова гаворыцца, што міністр ня бачыць неабходнасьці сустракацца з прадстаўнікамі журналісцкай арганізацыі, паколькі «ўзаемадзеяньне супрацоўнікаў органаў унутраных справаў і журналістаў рэгламентавана законам РБ «Аб сродках масавай інфармацыі».

22 сакавіка Вярхоўны Суд Рэспублікі Беларусь адхіліў скаргу ГА «Беларуская асацыяцыя журналістаў» на папярэджаньне Міністэрства юстыцыі ў поўным аб'ёме. Такое рашэньне аб'явіў суддзя Анатоль Церах. Паколькі папярэджаньне пакінулі ў сіле, актуальнымі засталіся ўсе пералічаныя ў ім прадпісаньні Мінюста. У іх ліку патрабаваньне на працягу месяца сабраць усе выдадзеныя раней пасьведчаньні (бэйджы) сябра ГА «БАЖ» са словам «прэса» і «забясьпечыць далейшую немагчымасьць карыстаньня імі». Таксама міністэрства лічыць, што дзейнасьць Цэнтра прававой абароны СМІ пры ГА «БАЖ» непрадугледжана статутам арганізацыі.

Двойчы за месяц (17 і 25 сакавіка) супрацоўнікі міліцыі канфіскоўвалі наклады недзяржаўнай газеты «Наш дом», якую выдае аднайменная грамадзянская ініцыятыва. Акрамя таго 25 сакавіка на мяжы з Расіяй міліцыянты затрымалі машыну з 10 тысячамі асобнікаў газеты «Витебский курьер», якія вёз дырэктар прыватнага гандлёвага прадпрыемства «Віцебскі Корунд» Віктар Рамнёў. Выданьне зарэгістравана ў Расіі і друкуецца ў Смаленску. На В. Рамнёва быў складзены пратакол па ч. 2 арт. 22. 9 КаАП (распаўсюд перыядычных выданьняў без выходных дадзеных) і яго адразу ж павезьлі ў суд, дзе аштрафавалі на 35 базавых велічыняў. Праваабаронцу і журналіста Валерыя Шчукіна, які вёз на сваім аўтамабілі 24 тысячы асобнікаў газеты «Наш дом», спынілі непадалёк ад Гомелю. На яго таксама быў складзены аналагічны пратакол. На наступны дзень В. Шчукін быў аштрафаваны судом на 30 базавых велічыняў (больш як на мільён рублёў).

25 сакавіка скончыўся этап рэгістрацыі кандыдатаў у дэпутаты мясцовых Саветаў дэпутатаў 26-га скліканьня. Кампанія «Праваабаронцы за свабодныя выбары» правяла маніторынг гэтага этапу і прэзентава-

ла кароткі аналіз і высновы па яго выніках. У параўнаньні з мясцовымі выбарамі 2007 г., колькасьць адмоваў у рэгістрацыі ініцыятыўных груп скарацілася з больш за 100 у 2007 г. да 23 у 2010 г. Парушэньне прынцыпу «свабоднага ўдзелу ў выбарах» з'яўлялася асноўнай падставай для адмовы ў рэгістрацыі ініцыятыўных груп на ўсіх папярэдніх выбарах; ня стала выключэньнем і выбарчая кампанія 2010 г. Адзначаецца, што мясцовыя органы ўлады ў большасьці прынялі адпаведныя рашэньні, у якіх максімальна абмежавалі магчымасьць збору подпісаў у шматлюдных месцах, часта такімі месцамі былі вызначаны пляцоўкі, аддаленыя ад цэнтраў населеных пунктаў і руху транспарту, ці іншыя месцы, якія рэдка наведваюцца выбаршчыкамі.Такія рашэньні выканаўчых і распарадчых органаў улады прывялі да таго, што большасьць прэтэндэнтаў не выкарыстоўвалі такую форму збору подпісаў, сканцэнтраваўшыся выключна на іншых.

10 сакавіка Еўрапарламент ухваліў рэзалюцыю, у якой асудзіў афіцыйны Менск за рэпрэсіі ў дачыненьні да неафіцыйнага Саюзу палякаў. У дакуменьце няма заклiку да аднаўленьня санкцыяў супраць Менску, але ёсьць пагроза, што далейшыя парушэньні правоў чалавека могуць прывесьці да спыненьня палітыкі дыялогу Еўрасаюзу з Беларусьсю. Еўрадэпутаты сярод іншага заклікалі беларускія ўлады зарэгістраваць Саюз палякаў Беларусі на чале з Анжалікай Борыс і перадаць арганізацыі яе ўласнасьць. Таксама ў рэзалюцыі выказваецца патрабаваньне вызваліць з турмаў палітычных актывістаў Андрэя Бандарэнку, Івана Міхайлава і Арцёма Дубскага, зарэгістраваць Праваабарончы цэнтр «Вясна» і Партыю БХД, якім шмат разоў было адмоўлена дзейнічаць легальна.

11 сакавіка дзяржсакратар Хілары Клінтан прадставіла штогадовы даклад Дзярждэпартаменту ЗША аб сітуацыі з захаваньнем правоў чалавека ў сьвеце. У разьдзеле, прысьвечаным Беларусі, утрымліваецца даволі жорсткая крытыка дзяржаўнай палітыкі ў гэтай галіне.

# 1. Сьмяротнае пакараньне

Па выніках веснавой сесіі ў Нью-Ёрку Камітэт ААН па правах чалавека распаўсюдзіў прэс-рэліз, у якім адзначана, што ўрад Беларусі

праігнараваў просьбу Камітэту адкласьці выкананьне сьмяротнага пакараньня да заканчэньня разгляду справаў двух беларускіх грамадзянаў Васіля Юзэпчука і Андрэя Жука, чым скандальна парушыў свае міжнародныя абавязацельствы, якія вынікаюць з Факультатыўнага пратаколу і Пакту аб грамадзянскіх і палітычных правах, падпісанага краінай. На думку юрыста-праваабаронцы Рамана Кісьляка, які падрыхтаваў для Камітэту ААН пакет дакументаў адносна двух асуджаных да сьмяротнага пакараньня, Рэспубліка Беларусь кінула выклік Камітэту па правах чалавека, міжнароднай супольнасьці ў плане выкананьня сваіх абавязацельстваў. (…)

## 2. Адміністрацыйныя затрыманьні і пакараньні грамадзка-палітычных актывістаў

3 сакавіка ў сталічным метрапалітэне быў затрыманы сябра Беларускай Хрысьціянскай Дэмакратыі са Смалявічаў Андрусь Кашэўскі, распаўсюднік незалежнай газеты «Народная Воля». Актывіста даставілі ў Ленінскі райсуд Менску, дзе суддзя Навіцкая пакарала А. Кашэўскага адразу па двух складзеных міліцыянтамі адміністрацыйных пратаколах: арыштам тэрмінам на 15 сутак па арт. 17.1 КаАП і штрафам у памеры 20 б.в. (700 тыс. руб.) за непадпарадкаваньне супрацоўнікам праваахоўных органаў па арт. 23.4 КаАП. Увес час арышту ў Цэнтры ізаляцыі правапарушальнікаў на Акрэсціна актывіст галадаваў.

25 сакавіка суд Валожынскага раёну пакараў лідэра АГП Анатоля Лябедзьку за непадпарадкаваньне супрацоўнікам міліцыі (арт. 23.4 КаАП) адміністрацыйным штрафам у памеры 30 базавых велічыняў. Палітык быў затрыманы ў Валожыне 15 лютага перад будынкам вайсковай часткі, дзе праходзіў суд па справе актывісткі апальнага Саюзу палякаў Тэрэзы Собаль.

# 3. Парушэньне прынцыпу свабоды слова і распаўсюду інфармацыі

1 сакавіка стала вядома, што Мінінфармацыі трэці раз адмовілася зарэгістраваць новае недзяржаўнае выданьне агульнапалітычнай тэматыкі — «Химик. Два города». Спачатку міністэрства не задаволіла кваліфікацыя галоўнага рэдактара, потым — заяўленая тэматыка, яшчэ пазьней — памяшканьне, у якім зьбіраліся разьмясьціць рэдакцыю.

2 сакавіка шэф-рэдактарка «Народнай Волі» Сьвятлана Калінкіна падала скаргу ў пракуратуру Савецкага раёну Менску на дзеяньні міліцыянтаў, якія 26 лютага правяліператрус у яе прыватнай кватэры. І сама журналістка, і юрысты, з якімі яна раілася, мяркуюць, што ператрус быў зьдзейсьнены з шэрагам парушэньняў: візіцёры не назвалі сябе, ператрус праводзілі адразу некалькі асобаў, журналістцы не далі патэлефанаваць і загадалі адразу ж адключыць усе тэлефоны.

10 сакавіка судовыя выканаўцы пабывалі ў офісе недзяржаўнай газеты «Борисовские новости» і апісалі рэдакцыйную канапу, кніжную шафу і кулер для вады. Рэдакцыя «Борисовских новостей» мусіць разьлічыцца з рэдактаркай дзяржаўнай раённай газеты «Адзінства» Верай Пратасевіч, якая яшчэ ў канцы 2009 году адсудзіла ў «БН» каля 2 мільёнаў. Падставай для судовага разбору стаў апублікаваны артыкул пеньсіянера Валерыя Ніцкага «Кодэкс сумленьня па-барысаўску», у якім ён ушчуваў барысаўскія ўлады за стварэньне несумленных умоваў канкурэнцыі паміж дзяржаўнай і недзяржаўнай прэсай.

11 сакавіка стала вядома, што Міністэрства інфармацыі вынесла выдаўцу недзяржаўнай газеты «Комсомольская правда» в Белоруссии» ЗАТ «БелКП-ПРЕСС» другое за год папярэджаньне. Прычына такога рашэньня рэдакцыяй і міністэрствам не агучваецца і не каментуецца.

15 сакавіка Ленінскі райсуд Горадні пакараў сябра БАЖ Аляксандра Дзянісава штрафам у памеры 2 базавыя велічыні (70 тысяч рублёў). Суддзя Ксенія Стасюкевіч палічыла, што Аляксандр Дзянісаў займаўся журналісцкай дзейнасьцю, ня маючы на тое адпаведнага дазволу, чым парушыў артыкул 23.39 КаАП РБ «Самаўпраўства». Між тым сюжэт пра вывучэньне прадмета «Гродназнаўства» ў сярэдняй школе № 28 журналіст рабіў з дазволу адміністрацыі навучальнай установы.

18 сакавіка «Маладыя еўрапейскія фэдэралісты» (JEF) і іх партнёры правялі ў розных гарадах сьвету традыцыйную вулічную акцыю за свабоду слова пад назовам «Дайце голас людзям Беларусі». Акцыя прымеркаваная да чацьвертай гадавіны «спрэчных прэзідэнцкіх выбараў у Беларусі». Знакамітым гарадзкім статуям маладыя фэдэралісты сімвалічна завязалі рты, што сьведчыць пра парушэньне асноўных правоў чалавека ў Беларусі. У Беларусі акцыю падтрымалі актывісты «Еўрапейскай Беларусі». Пратэстуючы супраць атакі на незалежных журналістаў, беларускім скульптурам таксама завязалі рты. Аналагічная акцыя прайшла ва ўкраінскім Луцку.

25 сакавіка суддзя Ленінскага райсуду Горадні Ксенія Стасюкевіч пакарала мясцовага намесьніка старшыні «Маладога Фронту» Алеся Кіркевіча штрафам у памеры 35 б.в. (1млн 225 тыс. руб) за распаўсюд газеты «Хрысьціянская абарона».

## 4. Палітычна матываваны крымінальны перасьлед

19 сакавіка гомельскаму актывісту партыі «Беларуская хрысьціянская дэмакратыя» Яўгену Якавенку, які патрабуе альтэрнатыўнай службы, сьледчая Цэнтральнага РАУС Вольга Шупікава ўручыла пастанову аб узбуджэньні крымінальнай справы за ўхіленьне ад прызыву на вайсковую службу. Між тым 12 сакавіка абласны суд задаволіў касацыйную скаргу Я.Якавенкі і адмяніў адміністрацыйны штраф, вынесены яму з падачы гарадзкога ваенкамату Савецкім раённым судом, і накіраваў справу на новы разгляд.

## 5. Парушэньне права на свабоду мірных сходаў

4 сакавіка сталічны гатэль «Crowne Plaza» нечакана адмовіў у арэньдзе памяшканьня для правядзеньня запланаванага мерапры-

емства — круглага стала па пытаньнях нацыянальнай бясьпекі. Прычыну адмовы адміністрацыя гатэлю не патлумачыла.

24 сакавіка суд Ленінскага раёну Менску пакараў праваабаронцаў «Вясны» Алеся Бяляцкага, Ірыну Тоўсьцік і Валянціна Стэфановіча за правядзеньне несанкцыянаванага пікету (арт. 23.34 КаАП) штрафам у памеры 0, 5 базавай велічыні. Абвінавачаныя скарысталіся новаўвядзеньнямі ў адміністрацыйны кодэкс, а менавіта пунктам 6 арт. 6.4 КаАП, згодна з якім выносіцца мінімальна прадугледжанае артыкулам пакараньне. Напярэдадні праваабаронцы выйшлі з расьцяжкай «Не — сьмяротнаму пакараньню» да будынку адміністрацыі прэзідэнта ў сувязі з прывядзеньнем у выкананьне двух сьмяротных прысудаў. Праз некалькі хвілінаў ахоўнікі выклікалі міліцыю. Ноч да суду затрыманыя правялі за кратамі.

# 6. Парушэньне права на свабоду асацыяцыяў

2 сакавіка Міністэрства юстыцыі ў трэці раз адмовіла ў рэгістрацыі заснавальнікам «Асамблеі няўрадавых дэмакратычных аб’яднаньняў». Як вынікае з афіцыйных папераў, падставы для нерэгістрацыі аб’яднаньня амаль аналагічныя папярэднім. Кіраўнік Рабочай групы Асамблеі Сяргей Мацкевіч падкрэсьлівае, што гэтым разам Мінюст, не хаваючыся, выразна і некалькі разоў падкрэсьліў сваю пазіцыю: «Дэмакратычным арганізацыям аб’ядноўвацца ў асацыяцыі нельга. Атрымліваецца, мы пазбаўленыя такога права ў Беларусі».

4 сакавіка Вярхоўны суд пакінуў у сіле рашэньне Гарадзенскага абласнога суду адносна нерэгістрацыі слонімскай арганізацыі «Залаты леў». Касацыйная інстанцыя палічыла дзеяньні чыноўнікаў галоўнага ўпраўленьня юстыцыі Гарадзенскага аблвыканкаму законнымі.

11 сакавіка калегія па грамадзянскіх справах Менскага абласнога суду адмовіла ў задавальненьні касацыйнай скаргі на рашэньне Валожынскага раённага суду і пакінула яго ў сіле. Такім чынам, Польскі дом у Івянцы канчаткова забраны ў апазіцыйнага Саюзу палякаў на чале з Анжалікай Борыс і перададзены кіраўніцтву Івянецкага аддзелу праўладнага Саюзу палякаў на чале са Станіславам Сямашкам.

30 сакавіка Вярхоўны суд Рэспублікі Беларусь адмовіў Руху «Маладая Беларусь» у задавальненьні скаргі на дзеяньні Міністэрства юстыцыі, якое адмовіла Руху ў рэгістрацыі грамадзкага аб’яднаньня.

# 7. Парушэньні права на свабоду сумленьня

26 сакавіка Менскі гарадзкі суд не задаволіў скаргу царквы «Новае жыцьцё» на пастанову суду Маскоўскага раёну, які аштрафаваў абшчыну за забруджваньне навакольнага асяроддзя на 8 млн 750 тыс. рублёў. Таксама, згодна падлікам Камітэту прыродных рэсурсаў і аховы навакольнага асяроддзя, вернікі мусяць сплаціць 263 млн рублёў нанесенай прыродзе шкоды. Такім чынам, агульная сума грашовых санкцыяў супраць пратэстанцкай абшчыны складае 271 млн 548 тыс. 725 руб. (каля 100 тыс.$ ЗША). Паводле юрыста царквы Сяргея Луканіна, довады царквы на незаконныя дзеяньні супрацоўнікаў экалагічнага ведамства суддзі не ўлічылі, яны ня сталі высьвятляць ступень віны вернікаў у забруджваньні навакольнага асяроддзя.

# 8. Звальненьні і адлічэньні па палітычных матывах

26 сакавіка суд Маскоўскага раёну Менску не задаволіў скаргі прэс-сакратаркі «Маладога Фронту» Тацяны Шапуцька да рэктарату Белдзяржуніверсітэту на незаконнае адлічэньне з юрфаку за ўдзел у форуме «Усходняга партнёрства» 16-18 лістапада 2009 году. Падчас судовага працэсу моладзевая актывістка даказвала, што пакараньне не адпавядала маштабу правапарушэньня, якое праявілася ў тым, што яна без дазволу дэканата выехала на некалькі дзён за мяжу. Аднак суддзя палічыў выкладзеныя аргументы фармальна не пераканаўчымі і цалкам прыняў супрацьлеглы бок.

# 9. Парушэньні выбарчых правоў грамадзянаў

25 сакавіка Гомельскі актывіст БХД Аляксандр Шарыпаў атрымаў кандыдацкае пасьведчаньне ў дэпутаты Гомельскага абласнога і гарадскога саветаў, а назаўтра яго папярэдзілі аб непрацягненьні па заканчэньні 3 мая працоўнага кантракту. А. Шарыпаву, які працуе вядучым інжынерам прыватнага прадпрыемства «Гомелькаапдругрэсурсы», паведамілі, што рашэньне прымала вышэйстаячае кіраўніцтва — «Гомельаблспажыўсаюз».

# Агляд-хроніка парушэньняў правоў чалавека ў Беларусі, красавік 2010 году

Асноўная падзея красавіка — выбары ў мясцовыя Саветы дэпутатаў. Паводле інфармацыі старшыні Цэнтарвыбаркаму Лідзіі Ярмошынай, 25 красавіка было абрана 21293 дэпутатаў мясцовых саветаў. Сярод абраных — 9 прадстаўнікоў дэмакратычных партыяў. Гэта 3 сябры партыі БХД, 5 сяброў партыі «Справядлівы сьвет» і адзін сябра БСДП (Грамада).

Удзельнікі маніторынгу «Праваабаронцы за свабодныя выбары» пільна адсочвалі ўсе этапы выбарчай кампаніі і прыйшлі да высновы, што ў цэлым выбарчая кампанія прайшла ў тым жа духу, што і мінулыя кампаніі. Істотных якасных зьменаў на карысьць дэмакратызацыі практыкі правядзеньня выбараў не адбылося. Як і падчас папярэдніх выбарчых кампаній былі зафіксаваныя сур'ёзныя сістэмныя адступленьні ад дэмакратычных стандартаў, за якія беларускія ўлады раней неаднаразова падвяргаліся крытыцы. Такім чынам, рэкамендацыі па дэмакратызацыі выбарчага працэсу, якія даваліся БДІПЧ АБСЕ, не страцілі актуальнасьці. Але таксама было адзначана, што зьмены, унесеныя ў Выбарчы кодэкс напярэдадні, у пэўнай меры садзейнічалі набліжэньню нацыянальнага выбарчага заканадаўства да дэмакратычных стандартаў. У першую чаргу гэта датычыцца адмены жорсткіх абмежаваньняў у працэдуры вылучэньня і рэгістрацыі кандыдатаў у дэпутаты.

У канцы красавіка завяршыўся судовы разгляд справы, узбуджанай супраць ваўкавыскіх прадпрымальнікаў Мікалая Аўтуховіча і Уладзіміра Асіпенкі. Акрамя іх абвінавачанымі па справе выступаюць былы падпалкоўнік міліцыі Міхаіл Казлоў і Аляксандр Ларын. Разгляд справы пачаўся ў Вярхоўным Судзе яшчэ 10 сакавіка і доўжыўся больш за месяц. 20 красавіка пасьля судовых спрэчак абвінавачаныя выступілі з апошнім словам. Пракурор Эльдар Сафараў запатрабаваў прысудзіць М.Аўтуховіча да 20 гадоў калоніі ўзмоцненага рэжыму з канфіскацыяй маёмасьці, У.Асіпенку і А.Ларына — да 11 гадоў пазбаўленьня волі ў

калоніі ўзмоцненага рэжыму, М.Казлова — 3 гады калоніі агульнага рэжыму бяз права займаць кіраўнічыя пасады. М. Аўтуховіч і У. Асіпенка сваёй віны не прызналі і сьцярджаюць, што іх перасьледуюць за антыкарупцыйную дзейнасьць. Абодва знаходзяцца пад вартай з 8 лютага 2009 году. Іх абвінавачваюць у падрыхтоўцы тэракту супраць высокапастаўленых дзяржаўных чыноўнікаў і ў падпале дому міліцыянта. Прысуд у справе прагучыць 6 траўня.

Нагадаем, Мікалай Аўтуховіч, Уладзімір Аспіенка і Юрый Лявонаў былі затрыманыя 8 лютага 2009 году. Праз 10 дзён ім прад'явілі абвінавачаньні па арт. 218 Крымінальнага кодэксу РБ (наўмыснае зьнішчэньне альбо пашкоджаньне маёмасьці). 20 лістапада У.Асіпенку і М.Аўтуховічу было прад'яўлена абвінавачаньне ў падрыхтоўцы тэрарыстычнага акту. Ю.Лявонава на пачатку жніўня вызвалілі з-пад варты, а 24 верасьня з яго зьнялі ўсе абвінавачаньні.

Працягваўся наступ на незалежныя СМІ. Падчас прэс-канферэнцыі, якая прайшла ў Менску 29 красавіка, журналісткі незалежных сродкаў масавай інфармацыі Сьвятлана Калінкіна, Марына Коктыш, Натальля Радзіна і Ірына Халіп распавялі, што ціск сьпецслужбаў у дачыненьні да іх не спыняецца. Напярэдадні ўсе яны былі дапытаныя ў РУУС Першамайскага раёну сталіцы ў якасьці сьведкаў у рамках расьсьледаваньня крымінальнай справы, заведзенай пракуратурай Гомельскай вобласьці па факту зьяўленьня ў інтэрнэце паклёпу на былога начальніка Ўпраўленьня КДБ па Гомельскай вобласьці Івана Каржа. Канфіскаваныя раней кампутары, а таксама носьбіты інфармацыі і надалей застануцца ў сьледчых органах. Па словах рэдактаркі сайту «Хартыі'97» Н. Радзінай, падчас экспертызы 8-мі канфіскаваных у яе кампутараў інфармацыі, якая б ганьбіла былога начальніка КДБ па Гомельскай вобласьці знойдзена не было, аднак было знойдзена больш за 3 тысячы файлаў са словамі «дыктатура», «Еўрапарламент» і «Ежы Бузэк»і ўзбуджана яшчэ адна крымінальная справа. Перасьлед з боку органаў унутраных справаў, пракуратуры і дзяржбясьпекі ўсе журналісткі зьвязваюць са сваёй прафесійнай дзейнасьцю. Намесьнік старшыні Беларускай асацыяцыі журналістаў Андрэй Бастунец падкрэсьліў, што падобныя дзеяньні сьледчых органаў праводзяцца ў адносінах да нават не абвінавачваемых, не падазраваных, а сьведкаў.

29 красавіка ў Страсбургу прайшлі пазачарговыя дэбаты па Беларусі. Іх вынікам стала прыняцьце Парламенцкай Асамблеяй

Савета Еўропы (ПАСЕ) рэзалюцыі, у якой выказваецца шкадаваньне ў сувязі з «недастатковай палітычнай воляй беларускіх уладаў разьдзяліць каштоўнасьці Савету Еўропы». У прыватнасьці, у дакуменьце гаворыцца, што ў краіне ў атмасьферы сакрэтнасьці былі прыведзены ў выкананьне два сьмяротныя прысуды, калі скаргі асуджаных разглядаў Камітэт ААН па правах чалавека. Адзначаюцца таксама выпадкі парушэньня ў Беларусі правоў польскай нацыянальнай меншасьці, ціск на незалежныя СМІ, апазіцыйныя структуры, трэці сектар і адсутнасьць міжнародных назіральнікаў на выбарах у мясцовыя саветы. З гэтых прычынаў Парламенцкая асамблея Савету Еўропы вырашыла замарозіць кантакты з афіцыйным Менскам на высокім узроўні.

Паводле рэйтынгу амерыканскай праваабарончай арганізацыяй «Freedom House» Беларусь займае 189-е месца са 196 краінаў і традыцыйна знаходзіцца ў канцы сьпісу, як краіна з несвабоднай прэсай.

З 6 па 8 красавіка ў Ерэване праходзіў 37-ы кангрэс Міжнароднага Форуму па Правах Чалавека FIDH (The International Federation for Human Rights). Для ўдзелу ў форуме ў Арменію прыбылі 300 дэлегатаў з розных краін сьвету, у ліку якіх былі і беларускія праваабаронцы Алесь Бяляцкі і Валянцін Стэфановіч. Падчас кангрэсу кіраўнік Праваабарончага цэнтру «Вясна» Алесь Бяляцкі ў выніку таемнага галасаваньня быў ужо ў другі раз абраны віцэ-прэзідэнтам Міжнароднай федэрацыі правоў чалавека.

# 1. Парушэньні выбарчых правоў грамадзянаў

2 красавіка кандыдат у дэпутаты Бешанковіцкага райсавету Георгі Станкевіч атрымаў папярэджаньне ад раённай выбарчай камісіі за нібыта некарэктныя выказваньні на адрас дзейных дэпутатаў райсавету ў сваім радыёвыступе перад выбарцамі. З гэтай прычыны трансьляваць ягоны выступ не дазволілі.

6 красавіка кандыдат у дэпутаты па Бераставіцкай выбарчай акрузе №18, сябра партыі БСДП «Грамада» Алег Рамашкевіч зьвярнуўся са скаргай у ЦВК на дзеяньні супрацоўнікаў абласнога гарадзенскага

радыё, якія адцэнзуравалі ягоны выступ і зьмянілі час выхаду ў эфір. У выніку тэкст быў скарочаны амаль на дзьве хвіліны, з яго былі выразаныя шэраг важнейшых выказваньняў, якія фармавалі ўвесь сэнс выступу. Кандыдат прасіў выявіць і пакараць віноўных і даць магчымасьць паўторна выступіць на абласным радыё. Між тым самога А.Рамашкевіча 30 красавіка суд пакараў штрафам у памеры 25 базавых велічынь (875 тыс. руб.) па абвінавачаньні ў расклейваньні падчас выбарчай кампаніі агітацыйных улётак у неадпаведных месцах. Варта дадаць, што за мандат дэпутата па згаданай выбарчай акрузе апроч А.Рамашкевіча балатаваліся дзейны старшыня Гарадзенскага аблсавету Аркадзь Карпуць, старшыня Бераставіцкага раённага Савету і начальнік Бераставіцкіх электрычных сетак.

25 красавіка высьветлілася, што 4 кандыдаты ў дэпутаты Чысьцінскага сельскага Савету дэпутатаў (Мірошнікаў С. М., Курыловіч Г.А., Ульчыц А. М. і Бажко С.А.) адначасова зьяўляюцца сябрамі ўчастковых выбарчых камісій, што супярэчыць выбарчаму заканадаўству. Заява ў пракуратуру Маладзечанскага раёну адносна гэтага парушэньня была ўручана ў 15 гадзін 20 хвілін 25.04.2010 г., па заканчэньні 7 гадзінаў галасаваньня ў дзень асноўнага галасаваньня і датэрміновага галасаваньня на працягу 5-ці дзён. З гэтай прычыны выбары на пэўных участках павінны быць прызнаны не адбыўшыміся, а рашэньні пра рэгістрацыю дадзеных кандыдатаў у дэпутаты павінны быць адмененыя. Аднак па словах старшыні ЦВК Л.Ярмошынай, дадзеныя асобы былі выведзеныя са складу выбарчых камісій і ня ўдзельнічалі ў падліку вынікаў галасаваньня. Такім чынам, парушальнікі выбарчага заканадаўства сталі дэпутатамі.

26 красавіка суд Маскоўскага раёну Менску прызнаў старшыню рады прадпрымальнікаў рынку «Ждановічы» Алеся Таўстыку вінаватым па арт. 17.1 КаАП («дробнае хуліганства») і прысудзіў штраф у памеры 5 базавых велічыняў (175 тыс. руб). Актывіст прадпрымальніцкага руху быў затрыманы ўвечары 24 красавіка на выбарчым участку № 27 Сухараўскай выбарчай акругі № 30 падчас назіраньня за ходам датэрміновага галасаваньня. Ён зьяўляўся даверанай асобай кандыдата ў Менскі гарадскі Савет дэпутатаў, актывіста «Руху «За Свабоду» Алеся Лагвінца і быў абвінавачаны ў парушэньні грамадзкага парадку. Да суду А.Таўстыка ўтрымліваўся ў Цэнтры ізаляцыі правапарушальнікаў на Акрэсьціна.

29 красавіка шасьцёра дэмакратычных кандыдатаў у Магілёўскі абласны савет: Мікалай Расюк, Юры Новікаў, Аляксандар Сілкоў, Юры Стукалаў, Ларыса Шукайла і Тамара Маскалёва падалі скаргі ў абласную тэрытарыяльную камісію, у якіх патрабуюць прызнаць у сваіх акругах выбары неадбытымі. Гэта выклікана тым, што ва ўчастковых камісіях не было ніводнага іх прадстаўніка, таксама не было магчымасьці распаўсюджваць па акругах свае агітацыйныя матэрыялы. Акрамя таго, у незалежных назіральнікаў не было магчымасьці бачыць, як ажыцьцяўлялася працэдура падліку галасоў.

## 2. Адміністрацыйныя затрыманьні і пакараньні грамадзка-палітычных актывістаў

5 красавіка суд Ленінскага раёну Менску пакараў арт. 23.34 КаАП («Парушэньне парадку арганізацыі і правядзеньня масавага мерапрыемства) кіраўніка «Моладзі БНФ» Андруся Крэчку штрафам у памеры 20-ці базавых велічыняў (700 тыс. руб). Падставай паслужыла затрыманьне 16 красавіка, у Дзень беларускай салідарнасьці, удзельнікаў пікету ў падтрымку зьняволеных М. Аўтуховіча і Ў. Асіпенкі. Несанкцыянаваная вулічная акцыя адбылася каля будынку Вярхоўнага суду падчас судовага працэсу над ваўкавыскімі прадпрымальнікамі. Па аналагічным абвінавачаньні таксама ў красавіку былі прыцягнутыя да адміністрацыйнай адказнасьці ў выглядзе штрафу іншыя ўдзельнікі пікету салідарнасьці. Алег Ладуцька («Еўрапейская Беларусь») атрымаў 20 б.в.. У двух выпадках суд улічыў пункт 6.5 КаАП і вынес абвінавачаным Артуру Фінькевічу («Маладая Беларусь») і Яўгену Афнагелю («Еўрапейская Беларусь») найменшае пакараньне — штраф у памеры 0,5 б.в.

20 красавіка ў Кастрычніцкім раённым судзе Віцебску мусіў пачацца разгляд крымінальнай справы, узбуджанай супраць грамадзкага актывіста Сяргея Каваленкі за вывешваньне ў студзені бел-чырвона-белага сьцягу на цэнтральнай гарадзкой навагодняй ёлцы. Разгляд справы быў адкладзены, бо перад пачаткам працэсу абвінавачаны ўзьняў бел-чырвона-белы сьцяг і перад будынкам суду. За ўдзел у не-

санкцыянаванай акцыі ён быў затрыманы міліцынтамі разам з малодшым братам Віталём і актывістам «Маладой Беларусі» Тарасам Сурганам.

21 красавіка Кастрычніцкі райсуд Віцебску прызнаў братоў Каваленак вінаватымі ў парушэньні арт. 23.34 КаАП («Парушэньне парадку арганізацыі і правядзеньня масавых мерапрыемстваў») і пакараў адміністрацыйным арыштам С. Каваленку на 7 сутак, В. Каваленку на 6 сутак і штрафам у памеры 2 б.в. за дробнае хуліганства — нібыта В.Каваленка спраўляў патрэбу ў грамадзкім месцы. 23 красавіка суд пакараў Т. Сургана арыштам на 9 сутак.

28 красавіка Цэнтральны райсуд Менску пакараў Андрэя Кузьмінскага, Міхаіла Наскова і Аляксея Атрошчанку па арт. 23.34 КаАП штрафам у памеры 0,5 б.в. за правядзеньне несанкцыянаванай акцыі. Напярэдадні актывісты выйшлі на Кастрычніцкую плошчу з расьцяжкамі «Патрабуем выдачы Бакіева кіргізскаму народу» і «Не — дыктатарам ва ўсім сьвеце». Пры сабе ў іх быў бел-чырвона-белы сьцяг. Праз некалькі хвілінаў міліцыянты іх затрымалі і даставілі ў Цэнтральны РУУС Менску, дзе склалі адміністрацыйныя пратаколы. Ноч да суду затрыманыя правялі ў Цэнтры ізаляцыі правапарушальнікаў па вул. Акрэсьціна.

## 3. Парушэньне прынцыпу свабоды слова і распаўсюду інфармацыі

1 красавіка Шчучынскія міліцыянты сканфіскавалі каля 450 асобнікаў часопісу «Magazyn Polski na Uchodźstwie», які выпускаюць паплечнікі Анжалікі Борыс з апазіцыйнага Саюзу палякаў. Намесьнік арганізацыі Мечыслаў Яскевіч і кіраўніца таварыства ветэранаў Арміі Краёвай і Другой сусьветнай вайны Вераніка Себасьцьяновіч былі затрыманыя на шашы Горадня — Менск за Шчучынам.

У красавіку неаднаразова затрымліваўся асабісты аўтамабіль дырэктара прыватнага ўнітарнага гандлёвага прадпрыемства «Витебский корунд», заснавальніка газет «Витебский курьер» і «Наш дом» Віктара Рамнёва. 1-га красавіка віцебскія міліцыянты знайшлі і сканфіскавалі 53 асобнікі «Витебского курьера», склаўшы прата-

кол па ч. 2 арт. 22.9 КаАП («Распаўсюд перыядычных выданьняў без выходных дадзеных»), нягледзячы на тое, што яны пазначаныя на апошняй старонцы кожнага нумару. 8 красавіка аўтамабіль В. Рамнёва супрацоўнікі ДАІ спынілі па дарозе са Смаленскай друкарні. У Горацкім РАУС у яго канфіскавалі наклад выданьня — амаль 10 тысяч асобнікаў і склалі чарговы адміністрацыйны пратакол па тым жа артыкуле. У сакавіку В. Рамнёў ужо быў аштрафаваны на буйную суму за распаўсюд недзяржаўных выданьняў. Міліцыянты кваліфікуюць як «распаўсюд» перавозку газет з Расіі і кажуць, што паколькі выданьне зарэгістравана ў Расіі і друкуецца ў Смаленску, патрэбны асобны дазвол.

Газеце «Сильные новости Гомеля» адмовілі ў рэгістрацыі. Адпаведны загад (№ 43 ад 1 красавіка 2010 г.) падпісаў міністр Алег Праляскоўскі. Ён абгрунтоўвае адмову тым, што ўказаныя ў заяве аб рэгістрацыі зьвесткі пра стаж галоўнага рэдактара будучага выданьня несапраўдныя, і што яго кваліфікацыя не адпавядае патрабаваньням даведніка «Пасады служачых работнікаў перыядычнага друку». У якасьці будучага галоўнага рэдактару новага выданьня ў дакументах фігуравала гомельская журналістка, сябра ГА «БАЖ» Таццяна Бублікава. Дырэктар УП «Друкаванае слова» Пётр Кузьняцоў перакананы: «Адмова ў рэгістрацыі выданьня — гэта забарона на прафесію журналіста. Чалавек ня можа набыць рэдактарскі стаж 5 гадоў, калі яму не дазваляюць узначаліць газету».

18 красавіка ў Стамбуле (Турцыя) Агульны сход Еўрапейскай федэрацыі журналістаў прыняў тэрміновую рэзалюцыю па свабодзе прэсы ў Беларусі. У ёй еўрапейская журналісцкая супольнасьць выказала салідарнасьць са сваімі беларускімі калегамі, а таксама заклікала ўлады Беларусі спыніць дыскрымінацыю незалежных СМІ, забясьпечыць поўны доступ да інфармацыі і прывесьці нацыянальнае заканадаўства ў галіне СМІ ў адпаведнасьць з міжнароднымі стандартамі.

22 красавіка кіраўніцтва БАЖ атрымала адказ з пракуратуры Гомельскай вобласці на свой зварот адносна праведзеных у журналістаў шэрагу ператрусаў і допытаў. У лісьце за подпісам намесьніка абласнога пракурора гаворыцца, што ў расьсьледаваньні справы аб паклёпе на былога кіраўніка УКДБ Гомельскай вобласьці Івана Каржа парушэньняў заканадаўства ня выяўлена, і падставаў для прыняць-

ця захадаў пракурорскага рэагаваньня няма. Адкрыты ліст Генеральнаму пракурору РБ Рыгору Васілевічу, у якім БАЖ расцэньвае дзеяньні сьледчых як «грубае ўмяшальніцтва ў свабоду журналісцкай дзейнасьці», арганізацыя накіравала ў пачатку сакавіка. Генеральная пракуратура пераадрасавала зварот «для разгляду па сутнасьці» ў пракуратуру Гомельскай вобласьці, пракурору Валянціну Шаеву — таму самаму, які санкцыянаваў правядзеньнеператрусаў у некаторых журналістаў.

19 красавіка суддзя Бешанковіцкага райсуду Вольга Белавус прызнала школьнага настаўніка нямецкай мовы, сябра БХД, які балатаваўся кандыдатам у дэпутаты райсавету Георгія Станкевіча віноўным у парушэньні арт. 22.9 КаАП («Парушэньне заканадаўства аб друку і іншых сродках масавай інфармацыі») і пакарала штрафам у памеры 20 б. в. (700 тыс. руб). Адміністрацыйны пратакол за незаконны распаўсюд самвыдатаўскай газеты «Крывінка» міліцыянты склалі яшчэ 8 красавіка. Між тым, газету накладам 299 асобнікаў Г.Станкевіч выдае і распаўсюджвае ўжо пяты год, і прэтэньзіяў да яго не было, пакуль не пачалася выбарчая кампанія.

# 4. Палітычна матываваны крымінальны перасьлед

2 красавіка супрацоўнікі міліцыі Першамайскага раёну сталіцы дапыталі ў якасьці сьведкі моладзевага актывіста Руслана Мацьвеева ў межах крымінальнай справы за палітычныя графіці. Сьледчы аддзелу дазнаньня Сьмірноў спачатку цікавіўся ягоным удзелам у моладзевых структурах, а потым высьвятляў, чым займаўся Р.Мацьвееў уначы з 11 на 12 сакавіка, калі на платах і будынку Першамайскага суду былі нанесеныя надпісы палітычнага зьместу. У актывіста ўзялі адбіткі пальцаў, сьліну для аналізу ДНК і прапанавалі прайсьці дэтэктар хлусьні.

16 красавіка на выезьдзе з Ашмянаў супрацоўнікамі ДАІ міліцыі быў затрыманы каардынатар Руху «За Свабоду» па Гарадзенскай вобласьці Алесь Зарэмбюк. У гэты час у ягоным доме і доме ягоных бацькоў у Мастах адбыліся ператрусы, праведзеныя ў межах

крымінальнай справы, якая была ўзбуджана супраць актывіста па абвінавачаньні ў махлярстве. Нібыта палітык узяў у некага пазыку і не аддаў. Сам Алесь Зарэмбюк зьвязвае ўсё гэта са сваім удзелам у мясцовых выбарах. Раней ён ужо быў у КДБ, дзе яго спрабавалі абвінаваціць у нелегальным гандлі візамі. Да гэтага гаворка ішла пра гандаль наркотыкамі і згвалтаваньні.

У красавіку працягваліся суды па крымінальных справах, узбуджаных за ўхіленьне ад службы ў войску. У судзе Менскага раёну разглядалася справа верніка габрэйска-месіянскай суполкі «Новы Запавет» Яна Міхайлава, які з рэлігійных меркаваньняў адмаўляецца служыць у войску. На паседжаньні 28 красавіка пракурор Пастухова палічыла, што Міхайлаў парушыў арт. 435 КК РБ і запатрабавала пакараць яго штрафам у памеры 200 базавых велічыняў. Працяг суду ў траўні. Нагадаю, што па гэтым артыкуле Я.Міхайлаў ужо быў асуджаны да трох месяцаў арышту і амаль адседзеў увесь тэрмін, але быў вызвалены ў сувязі з адменай прысуду касацыйнай інстанцыяй. «Міжнародная Амністыя» прызнала яго вязьнем сумленьня.

26 красавіка ў судзе Цэнтральнага раёну Гомелю адбыўся разгляд крымінальнай справы актывіста партыі БХД Яўгена Якавенкі. Былі выслуханыя тлумачэньні па сутнасьці прад'яўленага абвінавачаньня. Суд не зьвярнуў увагу на той факт, што Я.Якавенка ўжо быў апраўданы па аналагічным абвінавачваньні ў адміністрацыйным працэсе, а таксама на заяву прызыўніка аб неаднаразовым патрабаваньні альтэрнатыўнай грамадзянскай службы. Задаволена хадайніцтва адваката і Я.Якавенкі аб выкліку дадатковых сьведак па справе. Наступнае судовае паседжаньне прызначана на 12 траўня.

У канцы красавіка Генпракуратура распачала крымінальную справу, зьвязаную з каментарамі да артыкулу пра аўганцаў, які быў перадрукаваны на сайце «Хартыі'97» з газеты «Советская Белоруссия». У ім прадстаўнік афіцыйнай арганізацыі ветэранаў-«афганцаў»ганьбаваў ваўкавыскага прадпрымальніка, «афганца» Мікалая Аўтуховіча. Пад артыкулам зьявілася больш за сотню каментароў, непрыхільных да прадстаўніка афіцыёзу. Тым ня менш, сьведкамі па справе чамусьці праходзяць толькі былыя «афганцы», вядомыя сваімі апазіцыйнымі дэмакратычнымі поглядамі Алег Воўчак і Аляксандр Камароўскі.

# 5. Перасьлед дэмакратычных актывістаў і праваабаронцаў

14 красавіка палітпрызыўнік Франак Вячорка быў датэрмінова дэмабілізаваны з войску. Праз 15 месяцаў службы яго камісавалі па стану здароўя, падцьвердзіўшы такім чынам неабгрунтаванасьць прызыву актывіста БНФ у войска. Па словах Ф.Вячоркі, ён будзе дабівацца вызваленьня іншых палітпрызыўнікоў, якія былі мабілізаваныя з парушэньнем заканадаўства і працягваюць службу. Але і ў сваёй справе ён не зьбіраецца ставіць кропку. У заключным дыягназе лекары напісалі, нібыта хвароба сэрца набытая ім у войску. Ф.Вячорка лічыць, што ў такім выпадку ў яго ёсьць усе падставы зьвярнуцца ў суд, каб прыцягнуць да адказнасьці тых лекараў, якія фальсіфікавалі дыягназы, і сябраў прызыўной камісіі, якая яго забірала. Таксама Ф.Вячорка зьбіраецца патрабаваць кампенсацыі ад вайскоўцаў і медыкаў, якія не прынялі мераў па стане яго здароўя раней і камісавалі толькі праз 15 месяцаў.

30 красавіка ў офісе наваполацкага праваабаронцы Зьміцера Салаўёва супрацоўнікі аддзелу па вышуковай працы аддзелу крымінальнага вышуку Наваполацкага ГАУС правяліператрус. Сьледчыя дзеяньні, санкцыянаваныя пракурорам гораду, адбываліся ў межах крымінальнай справы, узбуджанай па арт. 341 КК РБ — «Апаганьваньне будынкаў і псаваньне маёмасьці» па факту нанясеньня на сьценах гораду фашыстоўскіх надпісаў. У выніку ператрусу канфіскаваныя сістэмны блок кампутару, дыскі, шмат розных друкаваных выданьняў і бел-чырвона-белыя сьцягі. І гэта, нягледзячы на тое, што самім З.Салаўёвым за апошнія два гады было напісана некалькі скаргаў у пракуратуру з прычыны дзейнасьці неанацыстаў у Наваполацку. Падобны ператрус адбываўся ў офісе З.Салаўёва перад прэзідэнцкімі выбарамі ў 2006 годзе. Канфіскаваная тады аргтэхніка так і не была вернутая.

# 6. Парушэньне права на свабоду асацыяцыяў

22 красавіка ў Вярхоўным судзе Беларусі пачаўся разгляд скаргі заснавальнікаў Асамблеі НДА адносна адказу Мінюсту аб адмове ў рэгістрацыі. Адбыліся выступы абодвух бакоў і прадстаўнікоў грамадзкасьці. Прадстаўнікі міністэрства зноў паўтарылі свой аргумент адносна таго, што ў асацыяцыю могуць аб'ядноўвацца толькі арганізацыі з аднолькавымі прадметамі дзейнасьці. «Аднак гэта супярэчыць наяўнай практыцы рэгістрацыі асацыяцыяў у Беларусі, — упэўнены юрыст Юрый Чавусаў. — І, відавочна, гэты аргумент незаконны, паколькі пазбаўляе Асамблею магчымасьці зарэгістравацца ўвогуле». Судовае паседжаньне працягнецца 4 траўня. Суддзя Вярхоўнага суду Ігар Мільто запатрабаваў у Мінюсту дакументы, пададзеныя Асамблеяй НДА на рэгістрацыю. Нагадаю, месяц таму Міністэрства юстыцыі ў трэці раз адмовіла Асамблеі няўрадавых дэмакратычных аб'яднаньняў у рэгістрацыі.

# 7. Дзейнасьць сьпецслужбаў

7 красавіка студэнтцы журфаку БДУ Марыне Яўсейчык патэлефанаваў незнаёмы мужчына і, прадставіўшыся супрацоўнікам дзяржбясьпекі Зьміцерам, настойліва прапанаваў прыйсьці назаўтра ва ўпраўленьне КДБ для гутаркі. На пярэчаньні Марыны адказаў, што хоча апытаць яе па справе выбуху ў Менску 4 ліпеня 2008 году. Раніцай 8 красавіка той жа голас пацікавіўся, ці зьбіраецца дзяўчына на сустрэчу. Марына ня ведала як сябе паводзіць у падобнай сітуацыі і змушана пагадзілася на сустрэчу. Гутарка доўжылася амаль тры гадзіны. Тэма размовы паступова мянялася, пасьля супрацоўнік КГБ дастаў ноўтбук і паказаў відэазапіс са зьезду беларусаў сьвету «Бацькаўшчына», дзе была Марына. У выніку ён прапанаваў М. Яўсейчык дапамогу ў вырашэньні розных магчымых праблемаў у абмен на супрацоўніцтва. Дзяўчына пад псіхалагічным ціскам падпісала паперу. «Пры гэтым я разумела, што не хачу і ня буду з імі супрацоўнічаць, мне трэба было толькі своечасова патрапіць на

аўтобус і хутчэй забыць пра гэтую непрыемную сустрэчу,» — распавядала Марына.

23 красавіка беларускаму карэспандэнту агенцтва Associated Press Юрасю Карманаву патэлефанаваў невядомы, які назваўся супрацоўнікам КДБ Алегам Анатольевічам і запрасіў журналіста на размову з нагоды яго нядаўняй паездкі ў Кыргызстан. Ю. Карманаў знаходзіўся ў Бішкеку па заданьні маскоўскай рэдакцыі AP з 8 да 19 красавіка, асьвятляючы дзяржаўны пераварот у Кыргызстане. Журналіст адмовіўся ісьці на якія-кольвек «гутаркі» без афіцыйнай позвы.

# Агляд-хроніка парушэньняў правоў чалавека ў Беларусі, травень 2010 году

У траўні ў Беларусі завяршыліся судовыя працэсы па чатырох палітычна матываваных крымінальных справах, вынесеныя два новыя сьмяротныя прысуды, разагнаныя некалькі мірных акцыяў, у тым ліку актывістаў руху сексуальных меншасьцяў. У выніку сутычкі з міліцыянтамі моладзевы актывіст Зьміцер Пармон трапіў у шпіталь са зламанай ключыцай. Адміністрацыйны перасьлед у гэты час абмежаваўся ў асноўным прысуджэньнем штрафаў розных памераў, але было вынесена і некалькі арыштаў.

18-19 мая па ўсёй Беларусі пракацілася хваля ператрусаў і затрыманьняў актывістаў грамадзянскай ініцыятывы «Гавары праўду!». Лідэр кампаніі паэт Уладзімір Някляеў, а таксама галоўны рэдактар недзяржаўнай газеты «Таварыш» Сяргей Вазьняк і актывіст Аб’яднанай грамадзянскай партыі Андрэй Дзьмітрыеў трое сутак знаходзіліся за кратамі.

Узмацненьне рэпрэсіяў з боку ўлады зьвязанае з набліжэньнем прэзідэнцкай выбарчай кампаніі — маштабнай падзеі ў грамадзка-палітычным жыцьці краіны.

У траўні толькі Праваабарончым цэнтрам «Вясна» было прынята 5 заяваў, датычных абуральных фактаў парушэньняў правоў чалавека. Адна з іх сумесная з БХК, датычная асуджэньня вынесеных у Беларусі двух новых сьмяротных прысудаў, апошняя ад 27 траўня сумесная з Міжнароднай Федэрацыяй правоў чалавека (FIDH), зьвязаная з ацэнкай агульнай сітуацыі. І так няпростае становішча з правамі чалавека ў краіне пачало ўскладняцца, і праваабаронцы канстатуюць, што зьявіліся падставы сьцьвярджаць: рэпрэсіі да актыўных групаў грамадзянскай супольнасьці Беларусі набылі планавы характар.

Таксама з заявамі ў траўні выступілі ГА «Беларуская асацыяцыя журналістаў» і Асамблея НДА.

19 траўня Старшыня Еўрапейскага парламенту Ежы Бузэк заклікаў беларускія ўлады «неадкладна спыніць рэпрэсіі і перасьлед структураў

грамадзянскай супольнасьці і вярнуцца на шлях дэмакратызацыі». Таксама ў заяве Ежы Бузэк адзначыў, што праведзеная ў мясцовыя саветы выбарчая кампанія «не паказала бачных паляпшэньняў у галіне празрыстасьці і выкананьня дэмакратычных стандартаў».

3 траўня ў Жэневе пачала працу сесія Савету правоў чалавека ААН, прысьвечаная правядзеньню Ўніверсальнага перыядычнага агляду. У рамках гэтай сесіі Савет правоў чалавека ААН разгледзеў справаздачы аб становішчы з правамі чалавека ў шэрагу краінаў, у тым ліку Беларусі. На абмеркаваньні справаздачы ўраду краіны 12 траўня прысутнічалі беларускія праваабаронцы, якія падрыхтавалі альтэрнатыўную справаздачу па Беларусі. 14 траўня па выніках працэдуры УПА на адрас Беларусі былі заяўленыя рэкамендацыі па паляпшэньні становішча ў галіне правоў чалавека. 20 траўня Міжнародная федэрацыя правоў чалавека (FIDH) распаўсюдзіла прэс-рэліз «адносна Ўніверсальнага перыядычнага агляду Беларусі, пытаньняў сьмяротнага пакараньня, свабоды асацыяцыяў, свабоды слова і мірных сходаў, а таксама забароны катаваньняў і незалежнасьці судовай сістэмы». FIDH, а таксама яе арганізацыя-ўдзельніца Праваабарончы цэнтр «Вясна» і Беларускі Хельсінскі камітэт выказалі глыбокае расчараваньне з прычыны таго, што дэлегацыя не зрабіла канкрэтных захадаў па выкананьні шматлікіх рэкамендацыяў, і большасьць выступоўцаў з афіцыйнага беларускага боку не закранула асноўныя недахопы ў галіне правоў чалавека ў Беларусі». Прадстаўнікі ўраду заявілі, што ў краіне існуе свабода аб’яднаньняў, што для грамадзянскай супольнасьці створаныя спрыяльныя ўмовы працы, і што сродкі масавай інфармацыі зьяўляюцца незалежнымі. Праваабарончыя арганізацыі заклікалі кіраўніцтва краіны зрабіць неадкладныя захады па выкананьні прынятых ёй рэкамендацыяў. Універсальны перыядычны агляд Беларусі праваабаронцы ахарактарызавалі як «станоўчая актыўнасьць, пры адсутнасьці рэальных крокаў».

Як станоўчы момант варта адзначыць, што ў траўні па дзьвюх крымінальных справах, узбуджаных у дачыненьні да прызыўнікоў, якія прасілі замяніць тэрміновую службу ў войску на альтэрнатыўную, гарантаваную Канстытуцыяй Рэспублікі Беларусь, былі вынесеныя апраўдальныя прысуды. 4 траўня Менскі райсуд апраўдаў верніка Яна Міхайлава, які паводле папярэдняга прысуду амаль 3 месяцы адсядзеў пад арыштам за ўхіленьне ад праходжаньня вайсковай служ-

бы, а «Міжнародная амністыя» прызнала Міхайлава вязьнем сумленьня. 31 траўня суд Цэнтральнага раёну Гомелю апраўдаў верніка «Сьведкі Еговы» Дзьмітрыя Смыка, які паводле папярэдняга прысуду быў аштрафаваны на 100 б.в. (3 млн 500 тыс. руб). Праваабаронцы расцэньваюць новыя судовыя рашэньні як перамогу грамадзянскай супольнасьці краіны і першы крок да ўвядзеньня Закону аб альтэрнатыўнай службе, а таксама зьяўленьня механізма рэалізацыі канстытуцыйнага права на праходжаньне альтэрнатыўнай грамадзянскай службы.

Напрыканцы траўня Міжнародная арганізацыя Amnesty International апублікавала штогадовую справаздачу аб парушэньнях правоў чалавека ў сьвеце. Беларусі ў справаздачы прысьвечаны асобны разьдзел. У ім адзначаецца, што ўлады краіны працягвалі выносіць сьмяротныя прысуды. Забараняліся грамадзкія і культурныя мерапрыемствы, удзельнікі мірных дэманстрацый затрымліваліся, падвяргаліся жорсткаму абыходжаньню ў міліцэйскіх пастарунках. Правы на свабоду асацыяцыяў і сходаў былі абмежаваныя. Неадэкватныя спосабы прымяняліся ў барацьбе з гвалтам супраць жанчын. Працягваецца кантроль над сродкамі масавай інфармацыі. Беларускія праваабаронцы назвалі сёлетні даклад сур’ёзным паказчыкам для ўладаў Беларусі пра неабходнасьць тэрміновай лібералізацыі нацыянальнага заканадаўства і прывядзеньня сродкаў яго выкананьня ў адпаведнасьць з міжнароднымі стандартамі, якія існуюць у галіне грамадзянскіх і палітычных правоў.

# 1. Сьмяротнае пакараньне

12 траўня праваабаронцы ў межах кампаніі супраць сьмяротнага пакараньня ў Беларусі накіравалі на імя Міністра ўнутраных справаў, Генеральнага пракурора і Старшыні Вярхоўнага Суду Рэспублікі Беларусь запыты пра колькасьць вынесеных і выкананых сьмяротных прысудаў з 1990 па 2009 год. Як зазначыў берасьцейскі праваабаронца Раман Кісьляк, гэтыя зьвесткі неабходныя для працягу кампаніі па інфармаваньні насельніцтва пра прымяненьне сьмяротнага пакараньня ў Беларусі. (...)

14 траўня Гарадзенскі абласны суд прысудзіў да вышэйшай меры пакараньня двух жыхароў Горадні — Алега Грышкаўцова (29 гадоў) і Андрэя Бурдыку (28 г.). Яны прызнаныя вінаватымі ў забойстве з асаблівай жорсткасьцю трох чалавек, разбоі з прычыненьнем цяжкіх цялесных пашкоджаньняў, наўмысным пашкоджаньні маёмасьці і выкраданьні малалетняга. 17 траўня Беларускі Хельсінскі Камітэт (БХК) і Праваабарончы цэнтр «Вясна» выступілі з асуджэньнем вынесеных двух сьмяротных прысудаў. Міжнародная праваабарончая арганізацыя «Amnesty International» далучылася да гэтай заявы. Праваабаронцы адзначылі, што дадзеная мера пакараньня была абвешчаная літаральна праз два дні пасьля крытыкі, якая прагучала ў адрас Беларусі падчас сесіі рабочай групы па прадстаўленьні Ўніверсальнага перыядычнага агляду ААН за ўжываньне дзяржавай сьмяротнай кары.

«Гэтыя прысуды гавораць аб неабходнасьці тэрмінова абвесьціць мараторый на сьмяротнае пакараньне, — заявіў генеральны сакратар Савету Еўропы Турб'ерн Ягланд. — Прымяненьне сьмяротнага пакараньня па-ранейшаму зьяўляецца галоўнай перашкодай у адносінах Беларусі з Саветам Еўропы. Мы гатовыя аказаць садзейнічаньне ў рашэньні гэтага пытаньня і дапамагчы Беларусі стаць бліжэй да стандартаў Савету Еўропы ў галіне правоў чалавека». Адмяніць сьмяротныя прысуды афіцыйны Менск таксама заклікалі старшыня Камітэту міністраў Савету Еўропы Антоніо Мілашоскі і кіраўнік Парламенцкай асамблеі Савету Еўропы (ПАРЕ) Маўлют Чавушоглу.

# 2. Палітычна матываваны крымінальны перасьлед

6 траўня Вярхоўны Суд Беларусі вынес прысуд па крымінальнай справе Мікалая Аўтуховіча, Уладзіміра Асіпенкі, Міхаіла Казлова і Аляксандра Ларына. Абвінавачаныя правялі пад вартай больш за год, а судовы разгляд справы заняў амаль паўтары месяцы. У выніку судовага разьбіральніцтва большая частка абвінавачаньняў, а менавіта — наўмыснае зьнішчэньне альбо пашкоджаньне маёмасьці і падрыхтоўка тэрарыстычнага акту, не знайшла падцьверджаньня

доказамі і была зьнятая. У выніку трое былі асуджаныя за незаконныя дзеяньні ў адносінах да агнястрэльнай зброі, боепрыпасаў і выбуховых рэчываў. Гэта Мікалай Аўтуховіч, які атрымаў 5 год і два месяцы калоніі ўзмоцненага рэжыму, Уладзімір Асіпенка і Аляксандр Ларын — па тры гады зьняволеньня. Міліцыянт Міхаіл Казлоў асуджаны на два гады пазбаўленьня волі за бязьдзеяньне службовай асобы. З моманту ўзбуджэньня крымінальнай справы яна атрымала вялікі грамадзкі рэзананс ня толькі ў Беларусі, але і за мяжой. Да суду сьледства насіла закрыты для грамадзкасьці характар, працэс у Вярхоўным Судзе праходзіў у адкрытым рэжыме, што дазволіла праваабаронцам сачыць за ім і зрабіць пэўныя высновы. Вынікам стала прыняцьце ПЦ «Вясна» і БХК адпаведнай заявы, у якой выкладзеныя ўсе аргументы. Праваабаронцы заклікалі Генеральнага пракурора РБ і Старшыню ВС РБ правесьці праверку законнасьці і абгрунтаванасьці вынесенага прысуду і вызваліць асуджаных з-пад варты, а таксама прыцягнуць да адказнасьці службовых асобаў, якія дапусьцілі грубыя парушэньні крымінальна-працэсуальнага заканадаўства падчас папярэдняга сьледзтва. У заяве амбасады Вялікабрытаніі, якая прадстаўляе ў Беларусі Іспанію, краіну-старшыню Еўрасаюзу, ад 10 траўня адзначаецца: «Беручы пад увагу папярэдні актыўны ўдзел Аўтуховіча ў абароне правоў прадпрымальнікаў і ветэранаў вайны ў Афганістане, а таксама яго публічныя заявы пра выпадкі карупцыі, якія, паводле яго меркаваньня, мелі месца, гэты працэс можа разглядацца ў якасьці палітычна матываванага».

14 траўня Кастрычніцкі райсуд Віцебску абвесьціў прысуд, вынесены сябру КХП БНФ Сяргею Каваленку, — тры гады абмежаваньня волі без накіраваньня ў папраўчую ўстанову адкрытага тыпу. Таксама С. Каваленка мусіць сплаціць маральную кампенсацыю міліцыянтам Іванову і Палітыку — па мільёну, Максімаву — 1,5 мільёны, а таксама кампенсаваць прадпрыемству «Гарсьвятло» за пашкоджаную ілюмінацыю 1 мільён 222 тысячы рублёў і 62 тысячы рублёў «Зеленбуду». Крымінальны перасьлед актывіста пачаўся пасьля таго, як 7 студзеня ён на вачах у соцень мінакоў вывесіў на 40-метровай вышыні бел-чырвона-белы сьцяг, здолеўшы залезьці па зборнай металічнай канструкцыі на самую верхавіну галоўнай навагодняй ёлкі ў Віцебску. С. Каваленка абвінавачаны паводле ч. 1 арт. 339 КК (наўмысныя дзеяньні, якія груба парушаюць грамадзкі парадак) і ч.

2 арт. 363 (супраціў работніку праваахоўных органаў пры выкананьні ім службовых абавязкаў).

25 мая скончыўся тэрмін зьняволеньня актывіста «Маладога Фронту» палітвязьня Арцёма Дубскага, прызнанага ў ліку іншых фігурантаў «працэсу 14-ці» Міжнароднай праваабарончай арганізацыяй Amnesty International вязьнем сумленьня. На прэс-канферэнцыі, якая прайшла пасьля яго вызваленьня з магілёўскай калоніі, А. Дубскі заявіў, што працягне займацца грамадзкай дзейнасьцю.

# 3. Адміністрацыйныя затрыманьні і пакараньні грамадзка-палітычных актывістаў

19 траўня адміністрацыйная камісія разгледзела справу гомельскага актывіста «Маладога Фронту» Антося Назаранку па арт. 21.14 КаАП (парушэньне правілаў дабраўпарадкаваньня і ўтрыманьня населеных пунктаў) і абавязала кампенсаваць суму нанесенай шкоды ў памеры 600 тысяч рублёў за расклейваньне маладафронтаўскай агітацыі. Пры гэтым камісія праігнаравала факт прызнаньня А. Назаранкам віны і просьбу выпісаць яму мінімальны штраф, згодна п. 6 арт. 6.5 КаАП.

12 траўня Ленінскі райсуд сталіцы пакараў па арт. 17.1 КаАП (дробнае хуліганства) дэмакратычных актывістаў, затрыманых 6 траўня каля будынку Вярхоўнага Суду пасьля абвяшчэньня прысуду па так званай справе ваўкавыскіх прадпрымальнікаў. Міліцыянты склалі пратаколы па абвінавачаньні ў нецэнзурнай лаянцы ў грамадзкім месцы. Палітык Аляксандр Казулін аштрафаваны на 20 б.в. (700 тыс. руб), прадпрымальнік Алесь Макаеў, моладзевыя актывісты Мікола Дземідзенка і Уладзь Яроменак на 15 б.в. (525 тыс. руб).

20 траўня Савецкі райсуд Гомелю пакараў экс-кандыдата ў дэпутаты аблсавету, актывіста Партыі БХД Кастуся Жукоўскага максімальным штрафам у памеры 50 б.в. (1 млн 750 тыс. руб) за абразу міліцыянта на выбарчым участку. Пры гэтым суддзя Юры Валышыненка з самага пачатку адхіліў хадайніцтвы абвінавачанага, каб весьці слуханьні на беларускай мове і каб атрымаць з міліцыі

даведку пра тое, колькі разоў К. Жукоўскі, як кандыдат, выклікаў ахоўнікаў правапарадку дзеля фіксацыі факту парушэньня выбарчага заканадаўства. Па зьвестках прэс-службы БХД, дзеля вынясеньня прысуду суддзя нават ня выйшаў з залы: дастаў загадзя надрукаваны дакумент з папераў на сваім стале.

30 траўня ўвечары пасьля зьезду «Маладога Фронту» ў Менску быў затрыманы актывіст арганізацыі з Магілёву Дзьмітры Зорка. Міліцыянты правялі асабісты дагляд рэчаў з мэтай нібыта пошуку наркотыкаў. Знайшоўшы ў заплечніку рэгіянальнага актывіста кнігу «Маладафронтаўцы», Дз.Зорку даставілі ў Цэнтральнае РУУС Менску, дзе ўзялі адбіткі пальцаў, сфатаграфавалі і адпусьцілі ў гадзіну ночы без складаньня пратаколу. У выніку актывіст спазьніўся на цягнік.

## 4. Парушэньне прынцыпу свабоды слова і распаўсюду інфармацыі

6 траўня суддзя Першамайскага райсуду Валянціна Кісьмярошкіна прысудзіла заснавальніку газеты Віктару Рамнёву 1 мільён 50 тысяч штрафу за тое, што 1 красавіка ў ягонай машыне міліцыянты знайшлі 53 асобнікі «Витебского курьера». Гэта ўжо ня першы штраф, прысуджаны заснавальніку выданьня.

7 траўня за распаўсюд канвенцыі ААН аб абароне людзей ад гвалтоўнага зьнікненьня ў Берасьці былі затрыманыя рэгіянальныя праваабаронцы Раман Кісьляк і Андрэй Шарэнда. У пастарунку Маскоўскага РАУС у іх канфіскавалі друкаваную прадукцыю, пасьля чаго адпусьцілі без складаньня пратаколаў. Дзеяньні супрацоўнікаў міліцыі абскарджаныя.

21 траўня ГА БАЖ выказала абурэньне ў сувязі з грубым наступам на свабоду слова ў Беларусі, чарговая хваля якога пачалася 18 траўня з «рэйду» міліцыі і сьпецслужбаў па офісах і кватэрах грамадзкіх актывістаў. Быў арыштаваны сябра Праўленьня арганізацыі, галоўны рэдактар газеты «Товарищ» Сяргей Вазьняк, разам з якім пад вартай таксама ўтрымліваліся актывісты кампаніі «Гавары праўду!» Уладзімір Някляеў і Андрэй Дзьмітрыеў. Сярод тых, хто падпаў пад ператрусы, затрыманьні і допыты, акрамя С. Вазьняка, аказаліся яш-

чэ некалькі сябраў БАЖ: Юры Алейнік, Юры Варонежцаў, Ларыса Насановіч, Аляксандр Уліцёнак, Аляксандр Фядута. У заяве адзначаецца, што журналісцкая арганізацыя разглядае апошнія падзеі ў кантэксьце ранейшых, аналагічных. 19 траўня на падставе расьсьледаваньня крымінальнай справы аб паклёпе на высокую службовую асобу з КДБ у чарговы раз у міліцыю выклікалі журналістак Натальлю Радзіну, Сьвятлану Калінкіну і Марыну Коктыш, якім вось ужо некалькі месяцаў не аддаюць забраных у іх кампутараў. На думку БАЖ, «фармальныя падставы для гэткіх дзеяньняў — усяго толькі прыкрыцьцё для расправы з іншадумствам». БАЖ заклікала беларускае грамадзтва і міжнародную супольнасьць выказаць пратэст супраць гвалту над свабодай слова ў Беларусі.

## 5. Парушэньне права на свабоду мірных сходаў

7 траўня ў Менску прайшоў пікет памяці да 11 гадавіны зьнікненьня былога міністра ўнутраных спраў і апазіцыйнага палітыка, сябра АГП Юрыя Захаранкі, лёс якога да гэтага часу застаецца невядомым. Актывісты сталі ў ланцуг з партрэтамі Ю.Захаранкі, а потым паклалі іх разам з кветкамі каля пад'езда дому, у якім ён жыў. У гэты ж дзень Кастрычніцкі суд Менску аштрафаваў семярых удзельнікаў акцыі ў памерах ад 10 да 30 базавых велічыняў: Зьмітра Кавалгіна на 10 б.в., Аляксандра Сьцепаненку і Міхася Мікуліча на 15 б.в., Алега Корбана і Рамана Багдановіча на 20 б.в., лідэра АГП Анатоля Лябедзьку — на 25 б.в. і Сяржука Клюева на 30 б.в. Іх прызналі віноўнымі ў парушэньні парадку арганізацыі і правядзеньня масавых мерапрыемстваў па арт. 23.34 КаАП.

15 траўня прадстаўнікі МУС гвалтоўна спынілі мірнае шэсьце актывістаў сексуальных меншасьцяў. Напярэдадні Менгарвыканкам па фармальнай прычыне ня даў дазволу на правядзеньне ў сталіцы гей-прайду, удзельнікі якога планавалі сабрацца ля будынку Белдзяржфілармоніі і прайсьці па прасьпекце Незалежнасьці да прэзідыума Нацыянальнай акадэміі навук. «Amnesty International» выказала шкадаваньне ў сувязі з забаронай шэсьця і заклікала беларускія

ўлады паважаць правы сексуальных меншасьцяў. Аднак мірная несанкцыянаваная акцыя актывістаў ЛГБТ была разагнаная міліцыяй, а пяцёра ўдзельнікаў пакараныя мінімальнымі штрафамі па арт. 23.34 КаАП.

17 траўня барысаўскія праваабаронцы зьвярнуліся са скаргай у аблвыканкам на рашэньне Барысаўскага раённага выканкаму, згодна з якім сталым месцам для правядзеньня масавых мерапрыемстваў вызначана тэрыторыя за заходняй трыбунай гарадзкога стадыёну. Марына Статкевіч і Алег Мацкевіч лічаць, што адно месца, вызначанае для дастаткова вялікага гораду (...) , супярэчыць духу Канстытуцыі. Спасылаючыся на адпаведныя артыкулы заканадаўства ў галіне свабоды мірных сходаў, праваабаронцы просяць аблвыканкам прызнаць прынятае рашэньне незаконным і абавязаць Барысаўскі раённы выканаўчы камітэт вызначыць месцамі правядзеньня масавых мерапрыемстваў пляцоўкі, якія характарызуюцца масавасьцю наведваньня і публічнасьцю, з мэтай магчымасьці інфармаваньня грамадзянаў аб існуючых праблемах у выпадку правядзеньня масавых мерапрыемстваў.

27 траўня грамадзянін Бельгіі Адрыен Бодуэн накіраваў у суд Маскоўскага раёну Менску скаргу на незаконныя дзеяньні супрацоўнікаў раённага ўпраўленьня міліцыі. 17 траўня Адрыен разам з іншымі ўдзельнікамі паседжаньня Беспартшколы быў беспадстаўна затрыманы ў памяшканьні «Гістарычнай майстэрні». Малады чалавек абураны паводзінамі супрацоўнікаў праваахоўных органаў і ў скарзе паведамляе пра грубае парушэньне сваіх правоў. Ён просіць суд, сярод іншага, прызнаць дзеяньні супрацоўнікаў міліцыі незаконнымі і абавязаць іх прынесьці публічнае прабачэньне. Копію скаргі А. Бодуэн таксама накіраваў у консульства Бельгіі ў Беларусі і амбасаду Бельгіі ў Маскве.

Гарадзенскі гарвыканкам па надуманых падставах не дазволіў актывістам Беларускага незалежнага прафсаюзу работнікаў радыёэлектроннай прамысловасьці правесьці пікеты 1 чэрвеня з мэтай абароны правоў дзяцей. Адмову ў правядзеньні мірнага сходу, прысьвечанага Міжнароднаму дню абароны дзяцей, таксама атрымалі праваабаронцы ў Гомелі. Падставай паслужыла тое, што не былі аплочаныя паслугі міліцыі, медыцыны і санслужбаў. Між тым, Леанід Судаленка і Анатоль Паплаўны падкрэсьліваюць, што рашэньне гарвыканка-

му, якім устаноўлены парадак правядзеньня мірных сходаў у Гомелі, у частцы вызначэньня ў паўмільённым горадзе адзінага месца для іх правядзеньня і ўскладаньня абавязкаў па адплатным складаньні дамоваў з органамі правапарадку, медыцынаю і ўборкай тэрыторыі без сумневу супярэчыць ня толькі канстытуцыйным гарантыям на свабоду правядзеньня мірных сходаў, але і міжнародным абавязальніцтвам нашай краіны.

## 6. Катаваньні і іншыя формы жорсткага бесчалавечнага абыходжаньня

27 траўня супрацоўнікі міліцыі жорстка разагналі велапрабег, арганізаваны актывістамі «Моладзі БНФ» у гонар зоркі беларускай паэзіі Максіма Багдановіча. Пры гэтым міліцыянты, апранутыя ў спартыўную форму зьбілі ўдзельнікаў культурніцкай акцыі. Сярод пацярпелых Франак Вячорка і Зьміцер Пармон, якому супрацоўнікі праваахоўных органаў нават зламалі ключыцу, спрабуючы адабраць у яго бел-чырвона-белы сьцяг. У выніку З. Пармон трапіў у шпіталь, дзе яму была праведзена складаная аперацыя — устаўлена металічная пласьціна для правільнага зрастаньня костак.

## 7. Парушэньне права на свабоду асацыяцыяў

5 траўня Вярхоўны Суд Беларусі адхіліў скаргу Асамблеі няўрадавых дэмакратычных аб’яднаньняў на адмову Міністэрства юстыцыі ў рэгістрацыі. Пры гэтым, па словах юрыста Юрыя Чавусава, які прысутнічаў на паседжаньні, некаторыя аргументы Асамблеі суд часткова прызнаў, аднак у цэлым скарга была пакінутая без задавальненьня. Варта адзначыць, што заснавальнікам Асамблеі НДА тройчы адмовілі ў ажыцьцяўленьні права на свабоду стварэньня асацыяцыі.

26 траўня Вярхоўны Суд Беларусі адмовіў заснавальнікам беларускага аддзяленьня Міжнароднага грамадзкага аб’яднаньня

«Міжнародная Хельсінская асацыяцыя па правах чалавека» ў задавальненьні скаргі на адмову ў рэгістрацыі з боку Міністэрства юстыцыі. У аснову сваёй адмовы чыноўнікі Мінюсту паклалі ўласнае тлумачэньне ўкраінскага заканадаўства (бо цэнтральныя органы аб'яднаньня знаходзяцца ў Кіеве). Вярхоўны ж Суд Беларусі вырашыў не чакаць адказу з украінскага Міністэрства юстыцыі па гэтым пытаньні, хоць такі запыт быў накіраваны заснавальнікамі арганізацыі.

# 8. Звальненьні з працы па палітычных матывах

6 траўня ў Салігорску з дзяржаўнага прадпрыемства звольнены дэмакратычны актывіст Уладзімір Шыла, які ўладкаваўся на новую працу толькі 3 траўня. Па словах начальніка, напярэдадні ён меў размову наконт У. Шылы ў адпаведных органах. Актывіст не захацеў называць прадпрыемства, каб потым ня ўзьніклі праблемы ў кіраўніцтва. Па адукацыі У. Шыла інжынер-будаўнік, і да гэтага працаваў у недзяржаўнай будаўнічай фірме. Але потым яму паступіла прапанова менавіта з дзяржпрадпрыемства зьмяніць працу, на якую ён пагадзіўся. Спробы У. Шылы зарэгістраваць незалежнае друкаванае выданьне аказаліся марнымі.

Настаўнік беларускай мовы з вёскі Копці Віцебскага раёну Сяргей Салодкін, які выдае для землякоў маланакладную газету «Покліч волі» на ўласныя сродкі, звольнены з працы. Уведамленьне пра непрацягненьне працоўнага кантракту ён атрымаў адразу пасьля мясцовых выбараў — у райаддзеле адукацыі яму паведамілі, што ягоная настаўніцкая праца прызнана «малаэфектыўнай». Па словах С. Салодкіна, яму неаднаразова рабілі намёкі і ў школе, і ў райаддзеле адукацыі, што начальства лічыць ягонае выданьне «апазіцыйным». Яшчэ адна прычына, якая магла паўплываць на рашэньне чыноўнікаў, — гэта нежаданьне настаўніка ўступаць у афіцыйны прафсаюз.

Па заканчэньні тэрміну працоўнай дамовы быў звольнены сябра Свабоднага прафсаюзу Беларускага (СПБ) высокакваліфікаваны

работнік Бабруйскага заводу трактарных дэталяў і агрэгатаў Леанід Гайшун. У прафсаюзе ўпэўненыя, што прычынай звальненьня стала сяброўства ў Свабодным прафсаюзе і актыўная пазіцыя рабочага, які абараняў правы працаўнікоў прадпрыемства. Паколькі адміністрацыя завода парушыла дзеючую на прадпрыемстве калектыўную дамову, СПБ заявіў, што рыхтуе пазоў у суд аб аднаўленьні на працы свайго актывіста.

31 траўня мазырскі праваабаронца Уладзімір Целяпун, які працуе на пасадзе начальніка тэхнічнага аддзелу ААТ «Беларуськабель», атрымаў уведамленьне аб непрацягненьні з ім працоўнага кантракту. Тэрмін папярэдняга кантракту, заключанага на 5 гадоў, сканчаецца 30 чэрвеня. Па словах праваабаронцы, ніякіх тлумачэньняў з нагоды прыпыненьня працоўных адносінаў ад наймальніка ў асобе дырэктара ААТ «Беларуськабель» ён не атрымаў. У. Целяпун вядомы на Гомельшчыне дэмакратычны дзяяч, падчас мясцовай выбарчай кампаніі ён балатаваўся кандыдатам у Гомельскі абласны і Мазырскі раённы саветы дэпутатаў, але, як і большасьць апазіцыйных кандыдатаў, ня здолеў патрапіць у выканаўчыя органы ўлады. На прадпрыемства «Беларуськабель» ён уладкаваўся яшчэ ў 1976 годзе адразу пасьля службы ў войску.

# 9. Парушэньні права на свабоду сумленьня

Канфлікт паміж пратэстанцкай царкой «Новае жыцьцё» і сталічнымі ўладамі ў асобе экалагічнага ведамства працягваецца. Між тым спагнаньне з царквы 250 мільёнаў рублёў за нібыта забруджваньне навакольнага асяроддзя нафтапрадуктамі пакуль адкладзена. Такое рашэньне 27 траўня прыняў суддзя Гаспадарчага суду Алег Клюйко ў сувязі з прыняцьцем Вярхоўным Судом Рэспублікі Беларусь скаргі царквы на пастанову Маскоўскага райсуду ад 25 лютага, якім царква была прызнаная вінаватай у парушэньні прыродаахоўнага заканадаўства.

# Агляд-хроніка парушэньняў правоў чалавека ў Беларусі, чэрвень 2010 году

8 чэрвеня прадстаўнікі Праваабарончага цэнтру «Вясна» і Беларускага Хельсінскага камітэту правялі адмысловую прэс-канферэнцыю, прысьвечаную аналізу сітуацыі за першае паўгоддзе бягучага году. Адзначана, што за гэты час ніякіх пазітыўных зьменаў, датычных выкананьня правоў чалавека, у краіне не адбылося, а з набліжэньнем прэзідэнцкіх выбараў сітуацыя становіцца больш складанай. Праваабаронцы адзначылі зьмены, унесеныя ў Выбарчы кодэкс краіны. Яны паведамілі, што гэтыя зьмены істотна не паўплывалі на практыку правядзеньня апошніх выбараў у мясцовыя саветы, і гэтая кампанія прынцыпова нічым не адрозьнівалася ад папярэдніх.

Асабліва беларускія праваабаронцы заклапочаны фактам працягу ў Беларусі вынясеньня і прывядзеньня ў выкананьне сьмяротных прысудаў.

18 чэрвеня ў сувязі з пачаткам у СІЗА галадоўкі асуджанага ваўкавыскага прадпрымальніка Мікалая Аўтуховіча ПЦ «Вясна» сумесна з Міжнароднай Федэрацыяй правоў чалавека (FIDH) распаўсюдзілі сумесную заяву, у якой выказалі патрабаваньне да ўладаў Беларусі неадкладна спыніць парушэньне правоў зьняволенага і забясьпечыць яго неабходнай медыцынскай дапамогай. Прадстаўнікі праваабарончай супольнасьці адзначаюць, што ўвогуле праблема ўмоваў утрыманьня ў месцах пазбаўленьня волі і іншых месцах прымусовага ўтрыманьня грамадзянаў у Беларусі з’яўляецца надзвычай сур’ёзнай. Фактычна тое ж падцьвердзіў і Генеральны пракурор Рыгор Васілевіч, паведаміўшы 23 чэрвеня падчас прэс-канферэнцыі, прысьвечанай Дню работнікаў пракуратуры, што ягонае ведамства зрабіла прадстаўленьне адносна ўмоваў утрыманьня вязьняў у калоніях і сьледчых ізалятарах. На думку пракурорскіх работнікаў, умовы не заўсёды адпавядаюць нормам. Гэта датычыць і бытавых, і санітарных, і медыцынскіх нормаў. «У няволі павінен быць выключаны гвалт, як фізічны, так і псіхалагічны», — зазначыў Р.Васілевіч.

У чэрвені Савет Рэспублікі Нацыянальнага сходу ўхваліў законапраект «Аб амністыі ў сувязі з 65-годдзем Перамогі ў Вялікай Айчыннай вайне 1941—1945 гадоў». Па амністыі з папраўчых установаў закрытага тыпу можа быць вызвалена каля 2 230 чалавек, з установаў адкрытага тыпу — каля 900 чалавек, скарочаны тэрмін пакараньня 9 300 асуджаным. Беларусь па колькасьці зьняволеных на 100 тысяч насельніцтва займае другое месца ў Еўропе пасьля Расіі.Сярэдні тэрмін пазбаўленьня волі таксама адзін з самых высокіх у Еўропе — 6,3 гады. У адным з інтэрв'ю старшыня камісіі па нацыянальнай бясьпецы Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Беларусі Віктар Гумінскі прызнаўся, што «адныя амністыі сітуацыю з вялікай колькасьцю асуджаных у Беларусі ня выратуюць, неабходныя зьмены ў заканадаўстве». Па словах В.Гумінскага, дзеля таго, каб Беларусь пакінула адну з лідзіруючых пазіцый сярод краінаў па паказальніку колькасьці асуджаных на 100 тысяч насельніцтва, трэба зьмяніць пакараньні за эканамічныя злачынствы.

9 чэрвеня Прэзідэнт ЗША Барак Абама падоўжыў на год санкцыі ў дачыненьні да шэрагу службовых асобаў Беларусі. «Дзеяньні і палітыка шэрагу членаў ураду Беларусі і іншых дзяржаўных чыноўнікаў працягваюць прадстаўляць экстраардынарную пагрозу нацыянальнай бясьпецы і замежнай палітыцы ЗША. Такім чынам, санкцыі ў дачыненьні да беларускіх дзяржаўных чыноўнікаў, якія былі прынятыя 16 чэрвеня 2006 году, павінны працягваць дзейнічаць і пасьля 16 чэрвеня 2010», — адзначаецца ў дакуменьце.

18 чэрвеня Канада пацьвердзіла ўвядзеньне эканамічных санкцыяў супраць Беларусі. Пра гэта паведаміў партал TUT.BY са спасылкай на канадзкае агенцтва памежных службаў. «Увядзеньне гандлёвых і эканамічных санкцый супраць замежных дзяржаў і недзяржаўных суб'ектаў па-ранейшаму зьяўляецца важным інструментам для міжнароднай супольнасьці ў забесьпячэньні захаваньня міжнародных нормаў і законаў», — гаворыцца ў дакуменьце. Абноўлены Мемарандум D19-11-1, паводле якога былі ўведзеныя эканамічныя санкцыі ў дачыненьні да 14 замежных дзяржаваў і двух тэрарыстычных групаў, канадзкае агенцтва зацьвердзіла яшчэ 30 красавіка. Аднабаковыя эканамічныя санкцыі ў дачыненьні да Беларусі Канада ўвяла ў сьнежні 2006 году. Канадзкі бок патлумачыў сваё рашэньне жаданьнем зрабіць ціск на кіраўніцтва Беларусі, у якой рэгулярна парушаюцца правы чалавека і грамадзянскія свабоды.

# 1. Адміністрацыйныя затрыманьні і пакараньні грамадзка-палітычных актывістаў

8 чэрвеня Першамайскі райсуд Віцебску прызнаў сябра КХП-БНФ Сяргея Каваленку віноўным у дробным хуліганстве і пакараў штрафам у памеры 3 б.в. (105 тыс. руб.). 10 чэрвеня той самы суд па аналагічным абвінавачаньні пакараў таксама на 3 б.в. і малодшага брата Віталя Каваленку. Інцыдэнт адбыўся яшчэ 8 траўня, і браты перакананыя, што прэвентыўнае затрыманьне зьвязанае з тым, каб ізаляваць іх падчас сьвяткаваньня Дня перамогі (03.07.2010). Аднак пераканаць суд у тым, што ніякага правапарушэньня браты Каваленкі не зьдзяйсьнялі, не ўдалося.

16 чэрвеня кіраўнік віцебскай суполкі «Моладзі БНФ» Аляксандар Кузьняцоў атрымаў афіцыйнае паведамленьне, згодна з якім ён пакараны штрафам у памеры 1 б.в. — 35 тыс. руб. за засьмечваньне гораду перадвыбарчымі агітацыйнымі плакатамі. Такое рашэньне прыняла адміністрацыйная камісія Першамайскага райвыканкаму. У лісьце з гарвыканкаму таксама напісана, што А.Кузьняцоў нібыта не зьявіўся на пасяджэньне камісіі, і таму пакараньне — «завочнае».

25 чэрвеня ў Менску за раздачу бел-чырвона-белых сьцяжкоў, налепак і ўлётак, распаўсюджваемых у рамках кампаніі «Горад наш!» былі затрыманыя актывісты «Маладога Фронту» Алена Макарэвіч і Зьміцер Ясевіч. У апорным пункце Савецкага РУУС на іх склалі адміністрацыйныя пратаколы па ч.2 арт.21.14 КаАП — «за антысанітарыю», пасьля чаго адпусьцілі. Справы накіраваныя на разгляд у адміністрацыйныя камісіі.

# 2. Сьмяротнае пакараньне

Праваабаронцы атрымалі адказ з Міністэрства юстыцыі Рэспублікі Беларусь на запыт аб колькасьці вынесеных і выкананых сьмяротных прысудаў з 1990 па 2009 год. Пра выкананыя сьмяротныя прысуды Мінюст інфармацыю не прадаставіў, абмежаваўшыся толькі

інфармацыяй пра колькасьць асуджаных да сьмяротнай кары (па прысудах, якія ўступілі ў законную сілу). Так, па агульных падліках атрымліваецца, што з 1990 па 2009 гг. да выключнай меры пакараньня ў Беларусі былі асуджаны 321 чалавек. У афіцыйным лісьце за подпісам начальніка кіраваньня арганізацыі і аналітычнага забесьпячэньня дзейнасьці судовых органаў Л.А.Мяльгуй напісана: «Міністэрства юстыцыі Рэспублікі Беларусь не валодае дадзенымі пра разгляд справаў з прызначэньнем пакараньня ў выглядзе сьмяротнага пакараньня ў касацыйным парадку і парадку нагляду, а таксама ў частцы выкананьня прысудаў і памілаваньня асобаў, асуджаных да сьмяротнага пакараньня. Функцыі ў сьферы выкананьня і адбыцьця пакараньня ажыцьцяўляе Дэпартамент выкананьня пакараньняў Міністэрства ўнутраных справаў Рэспублікі Беларусь». Між тым, у сваіх адказах на аналагічныя звароты ў МУС, у Вярхоўны Суд і Генеральную пракуратуру ўсе пералічаныя органы спасылаліся адзін на аднаго ў неагалошваньні афіцыйнай статыстыкі.

## 3. Палітычна матываваны крымінальны перасьлед

4 чэрвеня суддзя Цэнтральнага райсуду Гомелю Тацяна Швец пакарала актывіста Партыі БХД Я. Якавенку па ч.1 арт. 435 КК («ухіленьне ад вайсковай службы») адным годам абмежаваньня волі з накіраваньнем ва ўстанову адкрытага тыпу (так званай «хіміі»). Гэта адбылося нягледзячы на станоўчую тэндэнцыю, якая назіралася ў апошні час і апраўдальныя прысуды, вынесеныя раней па аналагічным абвінавачаньні ў дачыненьні да вернікаў Дзьмітра Смыка і Яна Міхайлава. 15 чэрвеня ў Менску адбыўся «круглы стол» па тэме: «Абарона беларускай мовы ў Беларусі: Яўген Якавенка», ініцыяваны Партыяй БХД. Праваабаронцы, палітыкі і грамадзкія дзеячы ўсебакова абмеркавалі справу прызыўніка і паставілі свае подпісы пад тэкстам звароту, накіраванага прэзідэнту Беларусі, у Палату прадстаўнікоў і ў Генеральную пракуратуру. Падчас «круглага стала», праваабаронца Валянцін Стэфановіч паведаміў, што міжнародная праваабарончая арганізацыя «Amnesty International»

рыхтуецца да правядзеньня тэрміновай кампаніі з патрабаваньнем адмяніць прысуд Я.Якавенку.

9 чэрвеня клецкага дэмакратычнага актывіста Сяргея Панамарова дапыталі ў раённай пракуратуры ў якасьці падазраванага па крымінальнай справе, узбуджанай паводле арт. 369 КК («абраза прадстаўніка ўлады»). Спробы завесьці крымінальную справу на С.Панамарова за вострую крытыку мясцовай улады на старонках выданьня былі і раней. На гэты раз сьледчыя органы правялі экспертызу публікацыяў за 2006-2007 гг. У выніку ў больш чым 20-ці артыкулах выявілі некаторыя прыкметы абразы службовых асобаў, а ў сямі выпадках экспертыза абразу ўстанавіла дакладна, па факту чаго і была ўзбуджана крымінальная справа. Праваабаронцы падкрэсьліваюць сваё крытычнае стаўленьне да наяўнасьці падобных артыкулаў у крымінальным заканадаўстве Беларусі.

10 чэрвеня Асамблея НДА супольна з Домам правоў чалавека ў Вільні зладзілі брыфінг на тэму «Артыкул 193-1: крымінальная адказнасьць за дзейнасьць NGO ў Беларусі». Мерапрыемства адбылося ў зьвязку з IV рэгіянальным кангрэсам НДА, на які зьехаліся прадстаўнікі арганізацыяў Цэнтральна-Ўсходняй Еўропы, Каўказу і Балтыі. Арганізатары зьвярнуліся да прысутных з просьбай далучацца да кампаніі Асамблеі «Стоп 193.1».

# 4. Умовы ўтрыманьня ў месцах зьняволеньня

Асуджаны прадпрымальнік з Ваўкавыску Мікалай Аўтуховіч тыдзень праводзіў у СІЗА №1 Менску галадоўку пратэсту. У выніку больш чым гадавога ўтрыманьня пад вартай у вельмі неспрыяльных для здароўя ўмовах ён страціў практычна ўсе зубы і як сьледзтва — пазбавіўся магчымасьці нармальнага ўжываньня ежы. Працяглы час зьняволены безвынікова дамагаўся ад адміністрацыі СІЗА аказаньня медычнай дапамогі па пратэзаваньні зубоў. Ён зьвяртаўся з пісьмовай заявай у Дэпартамент выкананьня пакараньняў МУС, аднак просьбу ігнаравалі, і на думку М.Аўтуховіча, папера ўвогуле не пакідала сьценаў следчага ізалятару, што прымусіла яго пайсьці

на скрайнія меры. 23 чэрвеня пасьля сустрэчы з галоўным лекарам менскага СІЗА і абяцаньня, што ягонае патрабаваньне будзе выканана, палітвязень спыніў галадоўку. Камітэт па абароне рэпрэсаваных «Салідарнасьць» і Праваабарончы цэнтр «Вясна» накіравалі Сьпецдакладчыку ААН па катаваньнях тэрміновую супольную заяву адносна ўтрыманьня М.Аўтуховіча. Да заявы далучаныя копіі афіцыйных адказаў на патрабаваньні зьняволенага аб аказаньні тэрміновай медычнай дапамогі.

## 5. Парушэньне прынцыпу свабоды слова і распаўсюду інфармацыі

2 чэрвеня рэдакцыя «Народнай Волі» атрымала трэцяе цягам году папярэджаньне Міністэрства інфармацыі. Яно тычыцца серыі публікацый І. Копыла «Нябышына. Вайна», што друкавалася ў выданьні ў сакавіку 2010 г.. Спасылаючыся на заключэньне Інстытуту гісторыі Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі, Мінінфармацыі сьцвярджае, што шэраг прыведзеных у публікацыях гістарычных зьвестак не адпавядае рэчаіснасьці. Папярэджаньне «Народнай Волі» падпісаў 31 траўня міністр інфармацыі Алег Праляскоўскі на падставе парушэньня арт. 4 Закону «Аб СМІ», які абавязвае сродкі масавай інфармацыі распаўсюджваць адпаведную рэчаіснасьці інфармацыю.

Усьлед за «Народнай Воляй» папярэджаньні Міністэрства інфармацыі атрымалі яшчэ два незалежныя выданьні «Новы час» і «Товарищ».

Заснавальнікам друкаванага органу Беларускай партыі левых «Справядлівы сьвет», газеце « Товарищ» Мінінфармацыі вынесла папярэджаньне ў сувязі з парушэньнем перыядычнасьці выхаду выданьня. У дакуменьце, у прыватнасьці, адзначаецца, што трэці нумар «Товарища» за 2010 г. выйшаў толькі 7 траўня, у той час як газета зарэгістраваная ў якасьці тыднёвіка. Рэдактар газеты Сяргей Вазьняк прызнае прэтэнзіі міністэрства, аднак кажа, што выданьне ня мае магчымасьці выходзіць часьцей, і што міністр інфармацыі А. Праляскоўскі выдатна разумее, у якім становішчы знаходзіцца газета. Выданьне пазбавілі распаўсюду праз дзяржсістэму манапаліста —

«Белпошту», выкінулі з сістэмы падпіскі. Усе спробы друку газеты ў Беларусі таксама не прынесьлі выніку.

«Новы час» у чэрвені атрымаў адразу два папярэджаньні — ад Міністэрства інфармацыі (за недакладнасьці ў выходных дадзеных — адсутнасьці імя па бацьку галоўнага рэдактара, адсутнасьць штрых-коду і назвы дзяржаўнага органу кіраваньня ў сьферы масавай камунікацыі) і Міністэрства гандлю, якое расцаніла інфармацыю пра перадачы спадарожнікавага каналу «Белсат TV» як незаконную рэкламу. Галоўны рэдактар незалежнага выданьня Аляксей Кароль кажа, што насамрэч інфармацыя зробленая на бязвыплатнай аснове і не зьяўляецца рэкламай. Між тым, акрамя папярэджаньня, Міністрэрства гандлю склала адміністрацыйны пратакол, які будзе разглядацца ў судзе.

7 чэрвеня ў адсутнасьць абвінавачанага суд Першамайскага раёну Віцебску пакараў рэдактара «Витебского курьера» Алега Баршчэўскага па ч.2 арт. 22.9 КаАП за незаконны распаўсюд друкаваных СМІ, знойдзеных у ягонай машыне, штрафам у памеры 20 б.в. (700 тыс. руб.). Перавозку друкаваных выданьняў міліцыянты, а за імі і суд, палічылі распаўсюдам. Аднак дадзены адміністрацыйны артыкул прадугледжвае пакараньне за правапарушэньне, зьдзейсьненае ў сукупнасьці — за выраб і распаўсюд адначасова, таму дадзенае рашэньне суду супярэчыць дзеючаму заканадаўству.

Па аналагічных абвінавачаньнях былі прыцягнутыя да адміністрацыйнай адказнасьці ў выглядзе штрафаў сябра Партыі БНФ, актывіст Руху «За свабоду» Аляксандр Рамановіч і дэмакратычная актывістка Крысьціна Шацікава. 16 чэрвеня Пінскі гарадзкі суд прызнаў А. Рамановіча вінаватым у распаўсюдзе друкаванай прадукцыі без выходных дадзеных, канфіскаванай у яго падчас percatрусу 1 красавіка, і пакараў штрафам у памеры 30 б.в. (1 млн 50 тыс. руб.). 28 чэрвеня штраф у памеры 20 б.в. Кастрычніцкі райсуд Магілёву вынес К. Шацікавай, якая была затрыманая 4 траўня каля ўласнага дому з 12 тысячамі асобнікаў выданьня аднайменнай грамадзянскай ініцыятывы «Наш дом».

15 чэрвеня ў Менску каля будынку БДУ, дзе прадстаўнікі кампаніі «Гавары праўду!» раздавалі студэнтам улёткі са зваротам лідэра кампаніі паэта Уладзіміра Някляева, супрацоўнікі міліцыі затрымалі журналістак Вольгу Жарнасек і Насту Краўчук. Абедзвюх журналістак

даставілі ў РУУС Маскоўскага раёну, дзе пасьля высьвятленьня асобаў затрыманых і дагляду асабістых рэчаў адпусьцілі без складаньня пратаколаў. Па словах Насты Краўчук, пакуль журналісткі спрачаліся з аховай унівэрсітэту, адбылася патасоўка, у выніку чаго была сапсаваная журналісцкая відэакамера.

23 чэрвеня на плошчы Свабоды ў Менску супрацоўнікі АМАПу разагналі пікет супраць Указу Прэзідэнта № 60 «Аб мерах па ўдасканаленьні выкарыстаньня нацыянальнага сегменту сеткі Інтэрнэт». Дадзены заканадаўчы акт, які набывае моц з 1 ліпеня, закліканы зрабіць больш жорсткім кантроль беларускіх уладаў за інтэрнэт-прасторай у рэспубліцы. Актывісты нацыянал-бальшавіцкага руху падавалі заяўку на правядзеньне мітынгу за свабоду інтэрнэту, аднак Менгарвыканкам не санкцыянаваў мерапрыемства. У выніку некалькі чалавек былі затрыманыя і да суду ўтрымліваліся ў ЦІПе на вул. Акрэсьціна. На наступны дзень пяцёра ўдзельнікаў акцыі пратэсту судом Цэнтральнага раёну сталіцы былі прыцягнутыя да адміністрацыйнай адказнасьці ў выглядзе штрафаў. Лідэр беларускіх нацыянал-бальшавікоў Яўген Контуш атрымаў 25 базавых велічыняў, астатнія чацьвёра па 5 б.в.

# 6. Катаваньні і іншыя віды жорсткага бесчалавечнага абыходжаньня

2 чэрвеня актывіст «Моладзі БНФ» Зьміцер Пармон, які 27 траўня ў выніку зьбіцьця міліцыянтамі падчас спробы правесьці мірную акцыю апынуўся ў 6-м гарадзкім клінічным шпіталі з дыягназам «пералом ключыцы», накіраваў у пракуратуру Цэнтральнага раёну сталіцы заяву з просьбай правесьці пракурорскую праверку і прыцягнуць віноўных да адказнасьці. У заяве пацярпелы выклаў факты ўжыцьця гвалту ў дачыненьні да яго.

# 7. Парушэньне права на свабоду асацыяцыяў

Галоўнае ўпраўленьне юстыцыі Берасьцейскага аблвыканкаму прыпыніла рэгістрацыю праваабарончай арганізацыі «Берасьцейская вясна». Месяц таму рэгістрацыйныя дакументы былі пададзеныя ў адпаведную ўстанову. Заснавальнікі перакананыя, што рашэньне аб прыпыненьні рэгістрацыі — надуманае. Арганізацыя «Берасьцейская вясна» спрабуе атрымаць рэгістрацыю з 2006 году.

# 8. Звальненьні і адлічэньні па палітычных матывах

(..)

Беларускі прафсаюз працаўнікоў радыёэлектроннай прамысловасьці (РЭП) абвесьціў кампанію «ЗА Беларусь без кантрактаў». Старшыня прафсаюзу РЭП Генадзь Фядыніч сьцвярджае, што паводле міжнародных нормаў, кантракт можна заключаць толькі з асаблівымі катэгорыямі работнікаў. А ў Беларусі па кантрактах працуе амаль усё працаздольнае насельніцтва краіны. На думку лідэра прафсаюзу, важна выпрашыць праблему кантрактаў да таго, як пачнецца поўнамаштабны працэс прыватызацыі. Інакш кантрактам скарыстаюцца новыя ўласьнікі, каб хутка і на законных падставах пазбавіцца ад непатрэбных працаўнікоў. Кампанія мае на мэце правядзеньне інфармацыйнай, тлумачальнай працы сярод работнікаў, арганізацыю пікетаў, мітынгаў, сустрэчаў. У прафсаюзе таксама хочуць наладзіць зваротную сувязь — правесьці анкетаваньне, каб мець дакладнае ўяўленьне пра настроі людзей датычна праблемы масавай кантрактызацыі.

# Агляд-хроніка парушэньняў правоў чалавека ў Беларусі, ліпень-жнівень 2010 году

Грамадзка-палітычнае жыцьцё ў апошнія летнія месяцы (...) праходзіла на фоне абвастрэньня афіцыйных адносінаў паміж Беларусьсю і Расіяй, нафтавай і інфармацыйнай войнаў. Пры гэтым агульная сітуацыя ў галіне правоў чалавека ў Беларусі заставалася на ранейшым узроўні: абмежаваньні свабоды слова, адміністрацыйны і крымінальны перасьлед апанентаў улады, гвалтоўныя разгоны мірных акцыяў.

Прызнаньне 29 ліпеня Гаспадарчым судом Менску дамовы на арэнду памяшканьня дасьледчa-асьветніцкай установы «Рух наперад» у ТАА «Ціна Влаці» «нікчэмнай» фактычна дало юрыдычную падставу для ліквідацыі «Руху наперад». 25 жніўня апеляцыйная інстанцыя пакінула судовае рашэньне Гаспадарчага суду бяз зьменаў, а апеляцыйную скаргу без задавальненьня. «Мы разумелі ад пачатку, што ўлада будзе прымаць усе захады, каб паставіць нас у нелегальнае становішча, каб зрабіць, што мы нібыта дзейнічаем ад імя незарэгістраванай арганізацыі, і тады ўзмацніць супраць нас рэпрэсіі. Але мы зробім усё, каб ніводнага дня ніхто з актывістаў кампаніі «Гавары праўду!» не знаходзіўся ў нелегальных умовах», — заяўляў перад судом Уладзімір Някляеў, кіраўнік «Руху наперад», у межах якой дзейнічае кампанія «Гавары праўду!». Між тым прыхільнікі гэтай грамадзянскай ініцыятывы знаходзяцца пад пільнай увагай супрацоўнікаў праваахоўных органаў, і затрыманьні актывістаў з інфармацыйнай прадукцыяй сталі звычайнай практыкай.

30 жніўня адзначаўся Міжнародны дзень ахвяраў гвалтоўных зьнікненьняў. Міжнародная канвенцыя аб абароне ўсіх асоб ад гвалтоўных зьнікненьняў была прынятая 20 сьнежня 2006 году Генеральнай асамблеяй ААН. Дакумент падпісалі 57 дзяржаваў. У наступныя гады да яе далучыліся новыя краіны, і зараз пад дакументам стаяць подпісы паўнамоцных прадстаўнікоў 83 краінаў. Між тым Канвенцыя набудзе юрыдычную моц і ўступіць у дзеяньне толькі тады, калі яе

ратыфікуюць урады 20 краін удзельніц гэтай дамовы. Зараз гэты дакумент ратыфікаваны толькі 19 дзяржавамі. Сярод тых, хто не паставіў подпісы пад гэтым міжнародным дакументам — Рэспубліка Беларусь.

Тым часам праблема гвалтоўных зьнікненьняў для Беларусі актуальная. Напачатку жніўня лідэры апазіцыі, грамадзянскай супольнасьці, праваабаронцы і іншыя вядомыя беларусы зьвярнуліся ў Савет бясьпекі ААН з просьбай правесьці міжнароднае расьследаваньне выкраданьняў людзей у Беларусі: былога міністра ўнутраных справаў Юрыя Захаранкі, віцэ-сьпікера Вярхоўнага Савету XIII скліканьня Віктара Ганчара і прадпрымальніка Анатоля Красоўскага, а таксама журналіста Дзьмітрыя Завадзкага. Зварот быў накіраваны міністрам замежных справаў пастаянных чальцоў Рады бясьпекі ААН — Кітая, Расіі, Вялікабрытаніі, Францыі і ЗША.

# 1. Адміністрацыйныя затрыманьні і пакараньні грамадзка-палітычных актывістаў

16 ліпеня Першамайскі райсуд сталіцы прызнаў моладзевага актывіста Андрэя Кіма віноўным у арганізацыі несанкцыянаванай акцыі, прымеркаванай да 600-годдзя Грунвальдзкай бітвы, і пакараў мінімальным штрафам у памеры 0,5 б.в., улічыўшы п. 6 арт. 6.5 КаАП.

5 жніўня Савецкі райсуд Менску пакараў удзельнікаў акцыі, прысьвечанай 20-годдзю Дэкларацыі аб незалежнасьці Беларусі, адміністрацыйнымі штрафамі па абвінавачаньні ў нецэнзурнай лаянцы (арт 17.1 КаАП РБ): Міколу Дземідзенку і Кацярыну Давыдзік у памеры 3 б.в. (105 тыс. руб), Вячаслава Сіўчыка і Андрэя Кіма ў памеры — 10 базавых велічыняў (350 тыс. руб).

24 жніўня Салігорскі суд па абвінавачаньні за непадпарадкаваньне міліцыі пакараў штрафамі ў памеры 20 б.в. (700 тыс. руб) маладафронтаўцаў Андруся Тычыну і Рыгора Астапеню. Нагодай стала акцыя, прымеркаваная да дня падпісаньня Дэкларацыі аб незалежнасьці. 27 ліпеня маладафронтаўцы зьбіраліся зладзіць конкурс малюнкаў крэйдай на асфальце. Сярод затрыманых таксама былі Іван і Ільля Шылы, суд над якімі перанесьлі.

# 2. Парушэньне прынцыпу свабоды слова і распаўсюду інфармацыі

Напачатку ліпеня ў Вілейцы была заведзеная крымінальная справа па факце паклёпу ў каментарах на мясцовым незалежным сайце vialejka.org. У якасьці сьведкі ў міліцыю выклікалі аднаго з карыстальнікаў інтэрнэт-старонкі Міколу Суслу. У яго забралі на экспэртызу ўласны кампутар. Нагадаем, што раней была заведзеная крымінальная справа па факце паклёпу ў каментарах на сайце «Хартыя'97».

9 ліпеня на крычаўскім аўтавакзале супрацоўнікі міліцыі затрымалі кур’ера з 297 асобнікамі незалежнай крычаўскай газеты «Вольны горад», надрукаваныя ў Смаленску. Галоўнай тэмай арыштаванага нумару быў артыкул «НТВ зьнішчыла рэпутацыю прэзідэнта Лукашэнкі» з каментаром Паўла Шарамета. Праз нейкі час кур’ера адпусьцілі, але газеты канфіскавалі. Выдаўцы «Вольнага гораду» пісьмова запатрабавалі ад пракурора і начальніка раённай міліцыі вярнуць незаконна канфіскаваны наклад, а міліцыянтаў прыцягнуць да крымінальнай адказнасьці. 27 ліпеня рэдактару выданьня Сяргею Няроўнаму паведамілі ў раённай пракуратуры, што арыштаваны наклад «адправілі на лінгвістычную экспертызу». Эксьпертыза будзе доўжыцца да паўгоду.

У ліпені на працягу аднаго тыдня незалежнае выданьне «Наша Ніва» атрымала два папярэджаньні ад Міністэрства інфармацыі. У загалоўках артыкулаў, у якіх былі знойдзеныя «парушэньні», фігуруе «Хросны бацька». Абодва папярэджаньні непасрэдна тычацца нумару «НН», які чытачы па ўсёй краіне не знайшлі ў кіёсках «Белсаюздруку».

У папярэджаньні, датаваным 22 ліпеня, Мінінфармацыі вінавацiла газету ў распаўсюдзе зьвестак, якія не адпавядаюць рэчаіснасьці. Падставай для санкцыі стаў загаловак «Хросны бацька сканфіскаваў» («НН» № 26). «Паводле арт. 244 Грамадзянскага кодэксу РБ канфіскацыяй зьяўляецца бязвыплатнае выманьне маёмасьці ва ўласьніка ў выглядзе санкцыі за зьдзейсьненае злачынства ці іншае правапарушэньне». А між тым, наклад «НН», па інфармацыі РУП «Белсаюздрук», быў накіраваны на рэалізацыю, — падкрэсьлівала Мінінфармацыі.

Другое папярэджаньне, датаванае 26 ліпеня, тычылася артыкулу «БРСМ рэкламуе фільм «Хросны бацька», зьмешчанага ў «НН» № 25. «Згодна інфармацыі грамадзкага аб’яднаньня «Беларускі рэспубліканскі саюз моладзі» актывістамі згаданага аб’яднаньня 6 ліпеня ў г. Менску была зладжаная акцыя, зьместам якой не зьяўлялася рэклама згаданага фільму», — адзначаецца ў лісьце. Адпаведна, палічылі ў Мінінфарме, «апублікаваная інфармацыя не адпавядае рэчаіснасьці і ганьбіць рэпутацыю дадзенай юрыдычнай асобы».

У жніўні адміністрацыйная камісія Ленінскага раёну Гародні завочна прысудзіла штраф у памеры 25 базавых велічынь (875 тыс. руб.) намесьніку старшыні «Маладога Фронту» Алесю Кіркевічу за распаўсюд друкаванай прадукцыі ў межах кампаніі «Горад наш!». Ён быў затрыманы 3 ліпеня супрацоўнікамі міліцыі. Пасьля складаньня пратаколу па ч.2 арт. 21.14 КаАП (Парушэньне правілаў дабраўпарадкаваньня, забесьпячэньня чысьціні і парадку) міліцыя правяла дагляд кватэры актывіста.

## 3. Парушэньне права на свабоду мірных сходаў

У ліпені чыноўнікі Менгарвыканкаму без тлумачэньня прычыны не далі дазволу на правядзеньне 15 ліпеня «бітвы падушкамі», прымеркаванай да 600-годдзя Грунвальдскай бітвы. З ініцыятывай гэтай жартоўнай акцыі выступіла аб’яднаньне «Гісторыка». Між тым мірная акцыя адбылася каля Нацыянальнай бібліятэкі Беларусі, аднак значная колькасьць удзельнікаў была затрыманая супрацоўнікамі міліцыі.

26 ліпеня ў Гомелі былі затрыманыя каля дзесяці ўдзельнікаў акцыі, прымеркаванай да 20-ай гадавіны прыняцьця Дэкларацыі аб дзяржаўным суверэнітэце Беларусі. Сярод затрыманых знаходзіўся і прадстаўнік праваабарончага цэнтру «Вясна» Анатоль Паплаўны. Актывістаў даставілі ў пастарунак, дзе ў тэксьце паштовак знайшлі «інфармацыю антыпалітычнай накіраванасьці». Па словах праваабаронцы, канфіскацыя віншавальных паштовак адбывалася са шматлікімі парушэньнямі. Дзвюма гадзінамі раней у Гомелі затрымалі

грамадзкага актывіста Уладзіміра Няпомняшчых, які быў спынены супрацоўнікамі міліцыі дзеля надпісу «За Беларусь без Лукашэнкі» на майцы. Таксама ў гэты ж час у іншых месцах абласнога цэнтру былі затрыманыя дэмакратычныя актывісты Васіль Палякоў, Юрась Глушакоў і Ларыса Шчыракова.

Менгарвыканкам ня даў дазвол лідэрам палітычных партыяў і рухаў на правядзеньне 16 жніўня каля Акадэміі навук «ланцугу неабыякавых людзей» з патрабаваньнем міжнароднага расьследаваньня зьнікненьняў апазіцыйных палітыкаў Віктара Ганчара і Юрыя Захаранкі, бізнэсмэна Анатоля Красоўскага і журналіста Дзьмітрыя Завадзкага. Афіцыйная падстава — нібыта заяўка афармлена неналежным чынам, аднак у чым канкрэтна палягаюць парушэньні заяўнікам так і не патлумачылі.

У жніўні магілёўскія ўлады не дазволілі актывістам створанай Партыі свабоды і прагрэсу правесьці ў трох мікрараёнах гораду пікеты з мэтай збору подпісаў жыхароў пад зваротам да ўлады, каб тая пачала вырашаць актуальныя мясцовыя праблемы. У лісьце за подпісам намесьніка старшыні гарвыканкаму Ігара Шардыкі гаворыцца, што абраныя месцы для пікетаў не зьяўляюцца вызначанымі для правядзеньня масавых мерапрыемстваў.

Улады Мазыра не дазволілі правесьці 31 жніўня на месцы самаспаленьня яўрэяў падчас Другой сусьветнай вайны мітынг, прысьвечаны 69-й гадавіне трагедыі. Па словах старшыні пярвічнай арганізацыі Беларускага дабраахвотнага таварыства аховы помнікаў гісторыі і культуры Паўла Наздры, на мерапрыемства планавалася запрасіць сваякоў загінулых, гісторыкаў і журналістаў, палітыкаў і дыпламатаў, прадстаўнікоў грамадзкасьці.

## 4. Палітычна матываваны крымінальны перасьлед

Актывіст кампаніі «Гавары праўду!», сябра Саюзу беларускіх пісьменьнікаў і ПЭН-цэнтру Міхась Башура быў затрыманы ў Менску 6 жніўня на сваёй кватэры і зьмешчаны ў ізалятар часовага ўтрыманьня. 16-га жніўня яму выставілі абвінавачаньне ў вырабе і выкарыстаньні

падробных дакументаў па ч.1 і ч. 2 арт. 380 КК РБ. Два гады таму, выступаючы паручальнікам жонкі, якая брала крэдыт, М.Башура нібыта прадставіў даведку аб заробку, у якой былі завышаныя ягоныя даходы. Па словах актывіста, ён памыліўся пры падліках, унёсшы ў даведку недакладныя зьвесткі. Справу вядзе РУУС Савецкага раёну сталіцы. 18 жніўня М. Башуру перавялі ў жодзінскі ізалятар.

У кампаніі «Гавары праўду!» перасьлед М. Башуры зьвязваюць з ягонай актыўнай грамадзянскай дзейнасьцю. На апошніх мясцовых выбарах М. Башура вылучаўся кадыдатам у дэпутаты ад прадпрымальніцкага блоку. Праваабаронцы таксама бачаць у арышце актывіста яўны палітычны падтэкст. Хадайніцтвы адваката зьняволенага аб зьмяненьні меры стрыманьня на падпіску аб нявыезьдзе выніку не далі.

31 жніўня Менскі гарадскі суд не задаволіў касацыйную скаргу на рашэньне Савецкага райсуду, які адмовіўся вызваліць М.Башуру з-пад варты. Па словах адвакаткі Тамары Сідарэнка, у Беларусі наўрад ці знойдуцца людзі, якіх бралі б пад варту па аналагічным артыкуле Крымінальнага кодэксу.

15 ліпеня дэмакратычны актывіст і выдавец незалежнага выданьня з Клецку Сяргей Панамароў даведаўся ў пракуратуры Менскай вобласьці, што сьледзтва па крымінальнай справе супраць яго скончана і матэрыялы накіраваныя ў суд. Крымінальная справа супраць актывіста была ўзбуджана паводле арт. 369 КК РБ («Зьнявага прадстаўніка ўлады») па факту артыкулаў на старонках выданьня «Бойкі Клецк», дзе востра крытыкаваліся прадстаўнікі мясцовай улады. 23 жніўня меў пачацца крымінальны працэс, 26-га адміністрацыйны, аднак С. Панамароў зьехаў у Польшчу, дзе папрасіў палітычнага прытулку. У Беларусь ён зьбіраецца вярнуцца толькі пасьля зьмены ўлады.

# 5. Перасьлед дэмакратычных актывістаў

25 жніўня Астравецкі райсуд пакараў штрафам у памеры 1 млн 225 тыс. рублёў (35 б.в.) актывіста АГП Міколу Ўласевіча. Яго прызналі вінаватым у непадпарадкаваньні пажарным інсьпектарам. М. Уласевіч з рашэньнем суду ня згодны і лічыць яго палітычна матываваным.

На ягоную думку, такім чынам мясцовыя ўлады помсьцяць яму за тое, што ён не прызнае выбары ў мясцовыя саветы і працягвае іх абскарджваць. У прыватнасьці актывіст патрабуе прыцягнуць да крымінальнай адказнасьці сябраў раённай выбарчай камісіі, датычных да фальсіфікацыі вынікаў выбараў у Астравецкім раёне. Яшчэ ў мінулым годзе М. Уласевіч зьвярнуўся ў мясцовыя органы ўлады з тым, каб па сваім хатнім адрасе зарэгістраваць раённую суполку Аб'яднанай грамадзянскай партыі, сябрам якой ён зьяўляецца. Пажарны інсьпектар, правёўшы абсьледаваньне, адмовіў у рэгістрацыі і напісаў больш за 10 прадпісаньняў, якія трэба было выправіць. З кожнай наступнай праверкай пажарнікі, з яго слоў, патрабавалі выкананьня новых прадпісаньняў. М.Уласевіч, у сваю чаргу, пачаў пісаць скаргі іх кіраўніцтву ў вобласьць і нават міністру МНС.

# 6. Парушэньне права на свабоду асацыяцыяў

20 жніўня Грамадскаму праваабарончаму аб’яднаньню «Берасьцейская вясна» абласное ўпраўленьне юстыцыі ў дзясяты раз адмовіла ў рэгістрацыі. Падставай для адмовы паслужыў нібыта недакладны адрас жыхарства аднаго з заснавальнікаў, а менавіта нумар дому. Між тым, па словах старшыні арганізацыі Уладзіміра Вялічкіна, дадзеныя, прадстаўленыя Ўпраўленьнем унутраных справаў Берасьцейскага аблвыканкаму рэгіструючаму органу не адпавядаюць рэчаіснасьці, то бок заснавальнік, супраць якога ўзьнікла прэтэньзія, усё-ткі жыве ва ўказаным доме.

25 жніўня ў Галоўнае ўпраўленьне юстыцыі Берасьцейскага аблвыканкаму была накіраваная заява, у якой праваабаронцы просяць адмяніць прынятае рашэньне, зарэгістраваць «Берасьцейскую вясну» і абавязаць УУС аблвыканкаму выправіць памылку ў прадстаўленых зьвестках аб месцы жыхарства аднаго з заснавальнікаў. Да заявы прыкладзены копіі даведкі аб месцы рэгістрацыі заяўніка і пашпарту з прапіскай.

Згодна з рашэньнем Магілёўскага абласнога гаспадарчага суду, Магілёўскі праваабарончы цэнтр абавязаны выплаціць камуналь-

най управе Ленінскага раёну Магілёву 13 мільёнаў 658 тысяч рублёў запазычанасьці за арэнду сядзібы. Такіх грошай у праваабаронцаў няма, і паўстала пагроза страціць памяшканьне. Паводле сябра Магілёўскага праваабарончага цэнтру Барыса Бухеля, недаплату камунальнікі налічылі ад 24 красавіка 2008 году, калі няўрадавую арганізацыю пазбавілі льготнага каэфіцыенту аплаты арэнды, аднак пра гэта камунальнікі не праінфармавалі праваабаронцаў. Цягам двух гадоў, як сьцьвярджае Б.Бухель, яго арганізацыя плаціла паводле тых рахункаў, якія выстаўлялі камунальнікі. Паводле праваабаронцы, у суд камунальнікі зьвярнуліся пасьля патрабаваньня ўправы маёмасьці гарвыканкаму.

Магілёўскі праваабарончы цэнтр утвораны ў 1998 годзе. Ад 2006 году арганізацыя ўваходзіць у камісію пры ўправе юстыцыі аблвыканкаму па назіраньні за месцамі пазбаўленьня волі ў рэгіёне. Камісію ачольвае сябра праваабарончага цэнтру. Няўрадавая арганізацыя актыўна ўдзельнічае ў выбарчых кампаніях.

# 7. Парушэньне права на свабоду сумленьня

18 жніўня на паседжаньні групы, створанай Беларускай Хрысьціянскай Дэмакратыяй для абароны касьцёлу сьвятога Язэпа, быў дадзены старт масавай кампаніі абароны сьвятыні. Актывісты БХД у 14-ці гарадах Беларусі запланавалі сабраць некалькі тысяч подпісаў з патрабаваньнем вярнуць касьцёл вернікам. Калі рэакцыі на зварот ня будзе, БХД заявіла аб намеры распачаць штодзённае пікетаваньне каля будынку касьцёлу і кляштару, а таксама разгарнуць шырокую кампанію салідарнасьці. Нагадаем, згодна з планамі Менгарвыканкаму, будынак мусіць быць прыстасаваны пад гатэльны комплекс і аб’екты гандлёва-побытавага прызначэньня. У 2007 годзе кіраўніку Беларусі быў накіраваны зварот з больш чым 30 тысячамі подпісаў за вяртаньне касьцёлу вернікам, аднак з пачатку 2010 году вядуцца працы па пераабсталяваньні касьцёлу ў гатэль.

14 жніўня набыло законную моц рашэньне Гаспадарчага суду Менску пра спагнаньне з менскай царквы Рэлігійнага аб’яднаньня

абшчын хрысьціян поўнага Евангельля «Новае жыцьцё» 249 млн. рублёў у якасьці кампенсацыі за нанясеньне шкоды навакольнаму асяроддзю. 29 ліпеня Гаспадарчы суд сталіцы прызнаў пратэстанцкую царкву вінаватай у нанясеньні шкоды навакольнаму асяроддзю — забруджаньні тэрыторыі царквы нафтапрадуктамі. Акрамя 249 млн «Новае жыцьцё» абавязана выплаціць 8 млн рублёў дзяржпошліны. Камэнтуючы рашэньне суду адразу пасьля яго абвяшчэньня, юрыст царквы Сяргей Луканін заявіў, што прадстаўнікі «Новага жыцьця» не прызнаюць сябе вінаватымі. Таксама ён паведаміў пра намер абскардзіць судовае рашэньне ў апеляцыйнай інстанцыі. Аднак 8 жніўня ў выніку галасаваньня вернікаў было вырашана вердыкт суду не аспрэчваць, бо дзеля велізарнай сумы іску за працэс абскарджаньня прыйшлося б заплаціць вялізарную пошліну.

# 8. Катаваньні і іншыя формы жорсткага абыходжаньня

Актывіст «Моладзі БНФ» Зьміцер Пармон атрымаў з пракуратуры Цэнтральнага раёну Менску адказ на сваю заяву з просьбай узбудзіць крымінальную справу ў дачыненьні да міліцыянтаў, якія зьбілі яго падчас затрыманьня 27 траўня. У той дзень моладзь планавала правесьці велапрабег у гонар Максіма Багдановіча, аднак супрацоўнікі міліцыі з ужываньнем сілы перашкодзілі ўдзельнікам. У выніку З.Пармон апынуўся ў 6-ым гарадзкім клінічным шпіталі з дыягназам «пералом ключыцы» і яму была зроблена складаная хірургічная аперацыя. Між тым, як вынікае з адказу за подпісам сьледчага А.А.Бачылы, пракуратура Цэнтральнага раёну правяла праверку выкладзеных у заяве фактаў і не знайшла складу злачынства ў дзеяньнях міліцыянтаў. З паказаньняў сьведкаў-міліцыянтаў (Жданаў Н.Г., Градовіч А.С., Лазуцін А.В., Ляшок С.Д., Шарэдаў А.Л., Якімаў А.А, Касперскі Д.Г.) цялесныя пашкоджаньні ў З. Пармона «атрыманыя ім у выніку яго ж уласнай неасьцярожнасьці».

# 9. Дэпартацыя

У ліпені ПЦ «Вясна» па просьбе іспанскай грамадзянкі Інмакуляды Гансалес, якая прасіла даведацца пра лёс свайго затрыманага 1 чэрвеня ў менскім аэрапорце сябра Гі Франсуа Тукама (Guy François Toukam), знайшоў грамадзяніна Камеруна ў менскім Цэнтры ізаляцыі правапарушальнікаў на Акрэсьціна. 28-гадовага грамадзяніна Камеруна, які жыве ў Еўропе і мае від на жыхарства ў Іспаніі, затрымалі міграцыйныя службы па падазраньні ў падробцы пашпарту. Камерунец прыляцеў у Беларусь у складзе нарвежскага клубу IOF на гульню Кубку еўрапейскіх чэмпіёнаў па футзале *(разнавіднасьць міні-футболу)*. 44 дні прайшлі, пакуль беларускія службы пераканаліся: і камерунскі пашпарт, і іспанскі від на жыхарства Гі Франсуа Тукама сапраўдныя. Увесь гэты час камерунец правёў за кратамі, без юрыдычнай дапамогі, у дрэнных умовах. Па вяртаньні дадому Гі Франсуа Тукам распавёў пра ўмовы зьняволеньня ў менскім ізалятары, пра пабоі, турэмную ежу, расісцкія жарты сукамернікаў, а таксама адзначыў, што за паўтары месяцы «адпачынку» на Акрэсьціна, дзе ён схуднеў на 20 кг, давялося заплаціць 250 долараў: «Да людзей там абсалютна ніякай павагі. Замежнікі ня маюць ніякіх правоў. Душ можна толькі раз на тыдзень і толькі калі просіш-патрабуеш. Я 44 дні правёў без прагулак. У мяне забралі ўсе асабістыя рэчы. Ложкаў няма, спяць на драўлянай лаве. Замежнікі сядзяць там не асобна, а разам з бамжамі і звар’яцелымі, усе разам. Сярод зьняволеных ёсьць відавочна хворыя людзі. Некаторыя людзі так праводзяць у зьняволеньні па 7-8 месяцаў, і калі іх адпускаюць на вуліцу, яны проста ня могуць хадзіць!»

# 10. Сьмяротнае пакараньне

На 30 ліпеня ў Вярхоўным Судзе Беларусі быў прызначаны разгляд касацыйных скаргаў жыхароў Гародні Алега Грышкаўцова і Андрэя Бурдыкі, асуджаных да вышэйшай меры пакараньня за патройнае забойства. Сьмяротныя прысуды былі вынесеныя 14 траўня абласным судом, які палічыў цалкам даказанай віну абодвух злачынцаў. Па невядомых прычынах Вярхоўны суд перанёс дату разгляду касацыйнай скаргі на 17 верасьня.

# Агляд-хроніка парушэньняў правоў чалавека ў Беларусі, верасень 2010 году

Пачатак восені ў грамадзка-палітычным жыцьці краіны выдаўся даволі багатым на падзеі, што часткова зьвязана з набліжэньнем кампаніі па выбарах прэзідэнта Беларусі. У верасьні адбыліся сілавыя разгоны мірных акцыяў, шматколькасныя затрыманьні, працягваўся наступ на свабоду слова, адміністрацыйны перасьлед, моўная дыскрымінацыя. Заўчасная сьмерць заснавальніка апазіцыйнага сайту charter97.org Алега Бебеніна, закідваньне расейскай амбасады ў Менску, а праз тыдзень ізалятару на Акрэсьціна «кактэйлямі Молатава» і шматразовыя пераазатрыманьні падозраных, сярод якіх былі грамадзка-палітычныя актывісты, з наступнай перакваліфікацыяй крымінальных артыкулаў спрыялі стварэньню ў грамадстве абстаноўкі напружанасьці. Завершыўся верасень праваабарончым тыднем у Вільні, дзе запар прайшлі тры важныя і прадстаўнічыя мерапрыемствы — Штогадовая сустрэча Сеткі дамоў правоў чалавека (СДПЧ), міжнародная канферэнцыя па правах чалавека краінаў Балтыі і Беларусі і II Беларускі праваабарончы форум.

1 верасьня пачаўся новы навучальны год і тысячы беларускіх дзяцей пайшлі ў школу, і толькі нямногія — у беларускую. Колькасьць дзяцей, якія вучацца па-беларуску, апошнія гады скарачаецца, і ня ўсе жадаючыя могуць атрымаць навучаньне на роднай мове. Паводле статыстыкі, у краіне 1900 беларускамоўных школ, але пераважным чынам яны малакамплектныя і знаходзяцца ў вёсках, таму на роднай мове ў папярэднім годзе навучаліся толькі 18,6 % школьнікаў. Так, у мястэчку Бобр Крупскага раёну навучацца па-беларуску будзе толькі Мікола Пушкін — сын вядомага беларускага мастака Алеся Пушкіна. Таксама адзінай навучэнкай беларускамоўнага класу ў Магілёве стала Ялінка Салаўёва. Пяцікласьніца Алеся Бука вымушана была адмовіцца ад навучаньня ў прэстыжнай Глыбоцкай гімназіі і пайсьці вучыцца ў сярэднюю школу райцэнтру, дзе сфармавалі клас з беларускай мовай навучаньня.

10 верасьня ў Менску прадстаўнікі беларускай грамадзянскай супольнасьці прадставілі маніторынг па разьвіцьці сітуацыі ў Беларусі з лістапада 2008 г. па верасень 2010 г. Над дакументам працавалі эксьперты з Беларускага Хельсінскага Камітэту (БХК), Праваабарончага цэнтру «Вясна», Беларускай асацыяцыі журналістаў, Асамблеі НДА, Камітэту абароны рэпрэсаваных «Салідарнасьць» ды іншых. Напярэдадні, 8 верасьня, прэзентацыя маніторынгу адбылася ў Бруселі для чыноўнікаў Эўрапейскага Саюзу. Унікальнасьць дакументу ў тым, што яго аўтары сфармулявалі крытэрыі вымярэньня прагрэсу — адносна незалежных СМІ, свабоды сходаў, свабоды аб’яднаньняў і становішча грамадзянскай супольнасьці — па якіх прадстаўнікі Эўрасаюзу могуць ацэньваць разьвіцьцё сітуацыі ў Беларусі. Асноўным крытэрам ацэнкі сітуацыі зьяўляўся сістэмнасьць зьменаў, замацаваных на ўзроўні заканадаўства. Аўтары маніторынгу лічаць, што палітыка Эўрасаюзу ў дачыненьні да Беларусі павінна быць дзейснай, таму заклікаюць не адмяняць візавыя санкцыі ў дачыненьні да высокапастаўленых беларускіх чыноўнікаў, але часова прыпыніць іх дзеяньне. Таксама яны рэкамендавалі не падтрымліваць тэхнічныя праекты такіх беларускіх рэпрэсіўных інстытутаў, як КДБ і Міністэрства ўнутраных справаў.

Традыцыйны Дзень беларускай Салідарнасьці 16 верасьня скончыўся ня толькі масавымі затрыманьнямі, але і сапраўднай бойкай каля міліцэйскага пастарунку. Мірная акцыя, якая звычайна праводзілася на Кастрычніцкай плошчы ў Менску, гэтым разам праходзіла каля Касьцёлу сьвятога Язэпа на плошчы Свабоды, што было зьвязана з абвешачанай Беларускай Хрысьціянскай Дэмакратыяй кампаніяй за вяртаньне будынку вернікам. Напярэдадні акцыі каля 19 чалавек былі дастаўленыя ў Цэнтральны РУУС сталіцы. Затрыманых адпусьцілі праз тры гадзіны без складаньня пратаколаў. 20 верасьня працяг акцыі атрымаўся яшчэ больш брутальны і жорсткі. Міліцыянты не далі абаронцам касьцёлу падысьці да будынку: каля 12 чалавек былі прэвентыўна затрыманыя, некаторых з іх па дарозе ў Цэнтральны РУУС сталіцы моцна зьбілі. Лідэру партыі БХД Паўлу Севярынцу разьбілі твар, лідэра маладафронтаўцаў Зьмітра Дашкевіча білі нагамі ў грудзі. Затым усіх адпусьцілі цягам некалькіх гадзін без складаньня пратаколаў.

14 верасьня на пачазарговай сесіі Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу РБ прынята пастанова аб прызначэньні выбараў

прэзідэнта Беларусі на 19 сьнежня. Паколькі прэзідэнцкія выбары зьяўляюцца значнай падзеяй у палітычным жыцьці краіны, а сітуацыя напярэдадні іх правядзеньня даволі складаная, 16 верасьня прадстаўнікі ПЦ «Вясна» і БХК заявілі пра пачатак кампаніі па маніторынгу прэзідэнцкіх выбараў «Праваабаронцы за свабодныя выбары». У маніторынгу, які праводзіцца з мэтай ацэнкі выбарчага працэсу з пазіцый нацыянальнага заканадаўства і міжнародных стандартаў, задзейнічана 80 назіральнікаў, размеркаваных па ўсёй тэрыторыі Беларусі. У назіраньні непасрэдна за ходам галасаваньня прымуць удзел 600 назіральнікаў на 300 выбарчых участках у розных рэгіёнах, што дасьць магчымасьць праваабаронцам зрабіць заключэньне адносна дэмакратычнасьці і празрыстасьці выбарчай кампаніі.

Удзельнікі Штогадовай сустрэчы Сеткі Дамоў правоў чалавека, якая праходзіла 22-23 верасьня ў Вільні, накіравалі прэзідэнту Беларусі Лукашэнку зварот з заклікам прыняць тэрміновыя меры па выкананьні міжнародных стандартаў у галіне правоў чалавека. У звароце говорыцца, што нягледзячы на распачаты дыялог паміж беларускім урадам і Еўрапейскім Саюзам, Беларусь ня выканала папярэднія ўмовы ЕС, неабходныя для ўключэньня Беларусі ў праграму «Ўсходняга партнёрства». А менавіта: Беларусь праігнаравала наступныя патрабаваньні: 1) быць краінай без палітычных зьняволеных; 2) забясьпечыць свабоду СМІ; 3) працягнуць супрацоўніцтва з АБСЕ па рэформе выбарчага заканадаўства; 4) палепшыць умовы дзейнасьці НДА; 5) гарантаваць права на свабоду сходаў і палітычных асацыяцыяў.

Варта адзначыць, што амаль аднachасова ў Жэневе праходзіла 15-я сесія Савета ААН па правах чалавека. 23 верасьня на ёй быў разгледжаны і прыняты канчатковы даклад Усеагульнага перыядычнага агляду (УПА) па правах чалавека ў Беларусі. Беларусі было рэкамендавана зрабіць шэраг дзеяньняў у галіне права і правапрымяняльнай практыкі. Сярод іншых урад краіны не прыняў рэкамендацыі па адмене сьмяротнага пакараньня, адмене артыкулу 193.1 КК, які прадугледжвае крымінальную адказнасьць грамадзянаў за дзейнасьць ад імя незарэгістраваных арганізацыяў, рэкамендацыі па выкананьні свабоды сходаў грамадзянаў, выбарчым заканадаўстве і свабоды слова.

# 1. Адміністрацыйныя затрыманьні і пакараньні ўдзельнікаў мірных акцыяў

15 верасьня ў Ваўкавыску адбыўся суд над Міколам Кавальчуком па абвінавачаньні ў самавольным вывешваньні мемарыяльнай шыльды ў гонар 100-годдзя выбітнай паэткі Ларысы Геніюш. Суддзя прысудзіў штраф у памеры 2 б.в., але пастанавіў вярнуць шыльду законнаму ўладару.

20 верасьня суддзя Цэнтральнага райсуду Гомелю Марына Дамненка прызнала актывіста «Маладой Беларусі» Івана Зайцава вінаватым у дробным хуліганстве (брыдкаслоўе) і непадпарадкаваньні супрацоўнікам міліцыі. Па сукупнасьці двух артыкулаў КаАП актывіст атрымаў адміністрацыйны штраф у памеры 50 базавых велічыняў (1 млн 750 тыс. руб). І. Зайцаў быў схоплены трыма невядомымі ў цывільным 11 верасьня падчас правядзеньня сьвяточнага канцэрту ў Дзень гораду, калі падняў над галавой нацыянальны бел-чырвона-белы сьцяг. У судзе ён патлумачыў, што сапраўды супраціўляўся, аднак ня ведаў, што невядомыя — супрацоўнікі міліцыі. Варта адзначыць, што да першага судовага паседжаньня 13 верасьня І. Зайцаў двое сутак утрымліваўся за кратамі ў ІЧУ.

24 верасьня суддзя Петрыкаўскага райсуду Сяргей Багінскі прызнаў гомельскага актывіста БХД Кастуся Жукоўскага вінаватым у парушэньні двух артыкулаў адміністрацыйнага кодэксу (дробнае хуліганства — брыдкаслоўе і супраціў міліцыі) і пакараў арыштам на тэрмін 10 сутак. Супраць актывіста сьведчылі міліцыянты Грамкоў і Аўчыньнікаў, якія акурат і спрычыніліся да зьбіцьця актывіста 17 верасьня на фэсьце «Покліч Палесься» ў вёсцы Ляскавічы Петрыкаўскага раёну. У выніку К.Жукоўскі трапіў у раённую лякарню, адкуль яго праз двое з паловай сутак дачасна выпісалі, пасьля чаго ён працягваў лячыцца амбулаторна ў Гомелі. Медычны эпікрыз суддзя да ўвагі ня ўзяў, затое прыслухаўся да словаў міліцыянтаў. Пратэстуючы супраць незаконнага пакараньня актывіст за кратамі абвесьціў галадоўку.

# 2. Палітычна матываваныя крымінальныя справы

7 верасьня сакратарыят Грамадскага аб’яднаньня «Саюз беларускіх пісьменьнікаў» прыняў заяву наконт утрыманьня пад вартай Міхася Башуры. У заяве адзначаецца, што больш за месяц таму, 6 жніўня, быў гвалтоўна затрыманы паэт і выдавец, сябар Саюзу беларускіх пісьменьнікаў М. Башура. Сьледчыя органы інкрымінавалі яму «эканамічнае злачынства» — падробку фінансавых дакументаў дзеля атрыманьня ягонай жонкай грашовага крэдыту ў банку. М.Башуру абвінавачваюць у падробцы даведкі з месца працы. Да арышту ён браў актыўны ўдзел у кампаніі «Гавары праўду!», за што неаднаразова затрымліваўся, прычым у апошні раз падчасператрусу ў яго канфіскавалі тысячы подпісаў менчукоў за наданьне адной з вуліцаў Менску імя Васіля Быкава. Сакратарыят ГА «СПБ» заявіў, што да М.Башуры прынятыя меры стрыманьня крайне неадэкватныя правапарушэньню, якое яму інкрымінуецца, і патрабуе неадкладнага вызваленьня яго з-пад варты, як гэта і прадугледжана беларускім заканадаўствам. М.Башура знаходзіцца ў Жодзінскім ізалятары, хадайніцтвы адваката аб зьмяненьні да суда меры стрыманьня, задаволеныя не былі.

# 3. Перасьлед грамадзка-палітычных актывістаў

Напачатку верасьня ў Менску актывістам грамадзянскай кампаніі «Гавары праўду!» быў забаронены сумесны прагляд і футболу, і хакею. Прычына дастаткова абсурдная — майкі з надпісам «Праўда пераможа!». Першы інцыдэнт адбыўся 7 верасьня на стадыёне «Дынама» перад пачаткам футбольнага матчу Беларусь-Румынія. Пры ўваходзе ў адпаведны сектар, усіх прасілі расшпіліць курткі. Каля 50 чалавек у майках «Гавары праўду!» завезьлі ў пастарунак.

Затрыманьнямі 12 актывістаў кампаніі ў спорткомплексе «Менск-Арэна» завяршылася 9 верасьня аналагічная спроба патрапіць на ха-

кейны матч кантынентальнай хакейнай лігі Дынама (Менск) — Тарпеда (Ніжні Ноўгарад). У Цэнтральным РУУС сталіцы іх ня толькі зьнялі на відэа і правялі дактыласкапію, але фактычна зьдзекваліся — зрывалі ці разразалі майкі з лагатыпам кампаніі. Па словах прэссакратара кампаніі Юлі Рымашэўскай, паводзіны міліцыянтаў гэтым разам былі больш жорсткія, чым з затрыманымі падчас футбольнага матчу, мелі месца фізічныя зьдзекі — і хлопцаў, і дзяўчат ставілі на так званую расьцяжку, рабілі «ластаўку». Актывісты кампаніі «Гавары праўду!» падалі скаргі ў ФІФА, УЕФА і КХЛ на парушэньне іх правоў як заўзятараў. Сем чалавек зьвярнуліся ў пракуратуру Ленінскага раёну сталіцы, іншыя — у пракуратуру Цэнтральнага раёну.

3-га верасьня з затрыманьня актывістаў анархісцкага кірунку пачалася маштабная акцыя супрацоўнікаў праваахоўных органаў. Калі напачатку за падпал расейскай амбасады ў Менску ў якасьці падазраваных былі зьмешчаныя ў ізалятар часовага ўтрыманьня на Акрэсьціна 7 чалавек, то 8 верасьня ўжо за напад на Акрэсьціна туды адправілі грамадзка-палітычных дзеячоў — сябра Партыі свабоды Сяргея Папова, сябра «Правага альянсу» Ігара Чапігу і эколага Уладзіміра Валодзіна. Кожны раз праз трое сутак яны не выходзілі на волю, а заставаліся за кратамі ў якасьці падазраваных па іншай крымінальнай справе, што цалкам супярэчыць нормам крымінальна-працэсуальнага заканадаўства. Сьледчыя дзеяньні амаль не праводзіліся, тым ня менш актывісты правялі за кратамі па некалькі 3-суткавых тэрмінаў.

13 верасьня экалагічныя арганізацыі Беларусі, Расіі і Літвы выступілі з сумесным зваротам да беларускіх уладаў з патрабаваньнем неадкладна вызваліць У. Валодзіна. На волю ён выйшаў толькі 17 верасьня, як і І. Чапіга. С.Папоў быў вызвалены пазьней.

# 4. Парушэньне прынцыпу свабоды слова і распаўсюду інфармацыі

14 верасьня актывіст дэмакратычнага руху з Салігорску Андрэй Тычына аштрафаваны судом на 35 базавых велічыняў (1 млн 225 тыс. руб) за распаўсюд незалежнага друку. Ён разам з мясцовай прадпрымальніцай Тацянай Кучынскай быў затрыма-

ны супрацоўнікамі міліцыі на гарадзкім рынку 31 жніўня, калі раздаваў незалежную газету «Мы і рынак», а таксама «Газету Някляева» з лагатыпам грамадскай кампаніі «Гавары праўду!». Суд над Т. Кучынскай адбыўся 23 верасьня, яна аштрафаваная на 40 б. в. (1 млн 400 тыс. руб).

Незалежнае выданьне «Народная Воля» атрымала яшчэ адно папярэджаньне — чацьвёртае. Яго падпісаў 13 верасьня міністр інфармацыі Алег Праляскоўскі за парушэньне арт. 4 закону «Аб СМІ», які прадпісвае распаўсюджваць інфармацыю, што адпавядае рэчаіснасьці. Між тым, паводле арт. 51 п. 2.2. закону «Аб СМІ», вынясеньне рэдакцыі альбо заснавальніку СМІ на працягу году двух і больш папярэджаньняў можа пацягнуць за сабой прыпыненьне выпуску гэтага СМІ.

Яшчэ адно папярэджаньне міністэрства за распаўсюд неадпавядаючай рэчаіснасьці інфармацыі 14 верасьня атрымала недзяржаўнае выданьне — «Брестская газета». Аднак інфармацыя, аналагічная той, што апублікавала «БГ», зьявілася і ў шэрагу іншых выданьняў вобласьці — у тым ліку ў газеце «Заря» (сузаснавальнікамі якой выступаюць Берасьцейскі аблвыканкам і Берасьцейскі аблсавет дэпутатаў). На думку намесьніка старшыні БАЖ Андрэя Бастунца, «як у выпадку з «Народнай Воляй», так і ў выпадку з «Брестской газетой» мы бачым, што Мінінфармацыі выносіць папярэджаньні, нават не паспрабаваўшы разабрацца ў канфлікце. Між тым, закон «Аб СМІ», а дакладней, яго артыкулы 42—44, падрабязна апісваюць парадак выпраўленьня недакладнай інфармацыі».

15 верасьня галоўны суддзя Наваградскага райсуду Васіль Аляхновіч пакараў актывістаў кампаніі «Гавары праўду!» Івана Дзяшука і Натальлю Кацмаёр штрафам у памеры 20 базавых велічыняў (700 тыс. руб.) кожнага за распаўсюд незарэгістраванага выданьня «Праўда Някляева».

15 верасьня Вышэйшы гаспадарчы суд адмовіў «Нашай Ніве» ў задавальненьні скаргаў на два папярэджаньні, вынесеныя газеце Міністэрствам інфармацыі. У адным з папярэджаньняў міністэрства зьвінавaціла газету ў распаўсюджваньні зьвестак, якія нібыта не адпавядаюць рэчаіснасьці. Гаворка ідзе пра артыкул пад назвай «Хросны бацька сканфіскаваў». Другое папярэджаньне было вынесенае за артыкул «БРСМ рэкламуе фільм «Хросны бацька».

16 верасьня БАЖ — адна з найбуйнейшых недзяржаўных арганізацыяў Беларусі адзначыла 15-годдзе. Сузаснавальнікамі Беларускай асацыяцыі журналістаў у 1995 годзе сталі 38 чалавек. Сёньня БАЖаўцаў ужо больш за 1000. Акрамя цэнтральнага офісу ў Менску, асацыяцыя мае 5 рэгіянальных філіяў. З 1997 г. БАЖ — асацыяваны сябра Міжнароднай Федэрацыі Журналістаў (IFJ). У дзень свайго юбілею грамадзкае аб'яднаньне «Беларуская асацыяцыя журналістаў» заявіла, што і далей будзе адстойваць інтарэсы сваіх сябраў і правы беларускіх грамадзянаў на атрыманьне і распаўсюд інфармацыі, свабоду слова і выказваньня як асноўныя каштоўнасьці дэмакратычнага грамадзтва.

# 5. Парушэньне права на свабоду асацыяцыяў

12 верасьня адбыўся трэці ўстаноўчы зьезд Беларускай Хрысьціянскай Дэмакратыі, і 17 верасьня пакет неабходных дакументаў быў пададзены на рэгістрацыю ў Міністэрства юстыцыі. Па словах сустаршыні партыі Паўла Севярынца, час падачы дакументаў быў выбраны адмыслова, бо праз месяц Еўрасаюз будзе вырашаць пытаньне з візавымі санкцыямі адносна вышэйшых кіраўнікоў краіны.

15 верасьня Асамблея НДА прыняла заяву, у якой выказала занепакоенасьць узмацненьнем ціску на няўрадавыя арганізацыі з набліжэньнем выбараў прэзідэнта. У заяве падкрэсьліваецца, што судовая ліквідацыя і незаконныя адмовы ў рэгістрацыі даюць уладам магчымасьць задзейнічаць антыканстытуцыйны артыкул 193.1 КК РБ, які карае за дзейнасьць ад імя незарэгістраваных арганізацыяў.

22 верасьня напярэдадні 15-й сесіі Савету па правах чалавека ААН прадстаўнікі Асамблеі НДА, Праваабарончага цэнтру «Вясна», Моладзі БНФ, Ініцыятывы ды іншых дэмакратычных няўрадавых аб'яднаньняў у рамках кампаніі «Стоп 193.1!» зладзілі перформанс у касьцюмах персанажаў папулярнага мультфільму «Шрэк» каля будынку Міністэрства замежных справаў Беларусі. Сатырычная акцыя стала адказам на крывадушную пазіцыю ўладаў, бо ў апошні год неаднаразова чуліся абяцаньні з боку чыноўнікаў Мінюсту, ад дэпутатаў

Палаты прадстаўнікоў аб скасаваньні крымінальнай адказнасьці за дзейнасьць ад імя незарэгістраванай арганізацыі. Аднак 15 верасьня МЗС Беларусі адправіла ў ААН дакумент пад назвай «Меркаваньні і адказы Рэспублікі Беларусь па высновах і/альбо рэкамендацыях, прынятых для далейшага разгляду кампетэнтнымі дзяржаўнымі органамі ў рамках Універсальнага перыядычнага агляду 14 траўня 2010 году». З тэксту дакументу вынікае, што ўлады ўхіліліся ад вырашэньня прынцыповых пытаньняў, працягваючы заяўляць пра адсутнасьць сур'ёзных праблемаў з правамі чалавека ў Беларусі. Так, напрыклад, у «Меркаваньнях...» несумленна сьцьвярджаецца: «Беларусь не прымае рэкамендацыю адносна скасаваньня артыкулу 193.1 Крымінальнага кодэксу. Дадзены артыкул скіраваны на спыненьне дзейнасьці ў Беларусі экстрэмісцкіх групаў і арганізацыяў...».

29 верасьня ў Берасьцейскім абласным судзе адбыліся папярэднія слуханьні па зыску заснавальнікаў Грамадзкага праваабарончага аб'яднаньня «Берасьцейская Вясна» да галоўнага ўпраўленьня аблвыканкаму, якое не зарэгістравала арганізацыю. Прычынай адмовы паслужылі нібыта несапраўдныя дадзеныя ў дакументах, пададзеных на рэгістрацыю, а менавіта — нумар дому аднаго з заснавальнікаў. Аднак памылілася якраз абласное ўпраўленьне ўнутраных справаў, якое прадставіла памылковыя дадзеныя аб месцы пражываньня аднаго з заснавальнікаў: замест дому № 12 быў указаны № 13. Між тым, у дакументах заснавальнікаў усё было пазначана правільна. Спробы вырашыць спрэчнае пытаньне наконт рэгістрацыі «мірным шляхам» плёну не далі, таму праваабаронцы зьвярнуліся ў суд. Дата судовага разгляду прызначана на 12 кастрычніка.

## 6. Парушэньне права на свабоду мірных сходаў

2 верасьня каля будынку Гарадзенскага гарвыканкаму былі затрыманыя вядомы навукоўца прафесар Алесь Астроўскі з жонкай Аксанай, а таксама праваабаронца і журналіст Уладзімір Хільмановіч, якія зладзілі пікет у абарону беларускага школьніцтва. Праз тыдзень на іх склалі пратаколы аб адміністрацыйным правапарушэньні, ад-

нак судовае паседжаньне, прызначанае на 23 верасьня, не адбылося. Калі Астроўскія і У. Хільмановіч прыйшлі ў суд Ленінскага раёну, судзя Натальля Козел паведаміла, што працэс не адбудзецца ў зьвязку з дадатковым вывучэньнем матэрыялаў супрацоўнікамі міліцыі.

50 чалавек адзначылі ў Менску Дзень беларускай вайсковай славы ў пастарунку. 8 верасьня затрыманьнямі скончылася спроба правесьці сімвалічны «Бой падушкамі», дазвол на якую сталічныя ўлады так і не далі. Між тым арганізатары заявілі, што акцыя, прымеркаваная да гадавіны бітвы пад Оршай, усё роўна адбудзецца. Супрацоўнікі міліцыі пачалі прэвентыўна затрымліваць моладзь яшчэ на падыходзе да месца папярэдняга збору, аднак акцыя адбылася і нават у двух месцах. Усяго ў менскія пастарункі трапілі 50 чалавек. Там у іх перапісалі дадзеныя, узялі адбіткі пальцаў, правялі фота і відэаздымку і адпусьцілі без складаньня адміністрацыйных пратаколаў. Затрыманьні адбываліся з парушэньнем дзеючага заканадаўства, бо некаторых непаўнагадовых адпускалі адных, без бацькоў. Акрамя таго, у непаўнагадовых дзяцей нельга без дазволу бацькоў браць адбіткі пальцаў, здымаць на фота і відэа. Таксама час знаходжаньня ў пастарунку аказаўся больш за 3 гадзіны. Дзеяньні міліцыянтаў некаторыя затрыманыя абскардзілі.

Таксама затрыманьнямі скончылася спроба адзначыць Дзень вайсковай славы 11 верасьня, традыцыйным бардаўскім фэстам на Крапівенскім полі. Традыцыя праводзіць бардаўскі фэст у гонар гістарычнай бітвы пад Оршай — яна адбылася 8 верасьня 1514 году — была запачаткаваная ў 1992 годзе. Напярэдадні ў Аршанскі РАУС быў дастаўлены заяўнік фэсту Юрый Копцік, дзе яму ўручылі пастанову аб забароне правядзеньня масавага мерыпрыемства і папярэдзілі аб асабістай адказнасьці. 11 верасьня зранку міліцыя перакрыла пад’езды да Крапівенскага поля, не дазваляючы праехаць да вёскі Гацькаўшчына, дзе звычайна адбывалася імпрэза. А затым пачалі затрымліваць усіх, хто ішоў пешкі ў кірунку да вызначанага месца. Затрыманьні таксама праходзілі на вакзалах. У мясцовы пастарунак былі дастаўленыя каля 15 чалавек, трымалі іх там больш за чатыры гадзіны, затым адпусьцілі без складаньня пратаколаў.

# 7. Сьмяротнае пакараньне

Напачатку верасьня прадстаўнікі міжнароднай праваабарончай арганізацыі «Amnesty International» Хэза Макгіл і Айша Юнг у рамках праграмы змаганьня супраць практыкі сьмяротных пакараньняў злачынцаў наведалі Беларусь. Падчас візіту адбыліся сустрэчы з бацькамі асуджаных на сьмерць, прадстаўнікамі праваслаўнай Царквы, старшынёй рабочай групы Нацыянальнага сходу па вывучэньні праблемаў, зьвязаных са сьмяротным пакараньнем, Мікалаем Самасейкам, а таксама з прадстаўнікамі розных няўрадавых арганізацыяў.

14 верасьня ў Магілёўскім абласным судзе быў вынесены чарговы сьмяротны прысуд. Аляксандр Сычоў і Ігар Мялік прызнаныя віноўнымі ў серыі жорсткіх злачынстваў, зьдзейсьненых у складзе банды на тэрыторыі Магілёўскай вобласьці. Першы асуджаны да пажыцьцёвага зьняволеньня, другі — да вышэйшай меры пакараньня.

17 верасьня Вярхоўны Суд РБ пакінуў без задавальненьня касацыйныя скаргі жыхароў Гародні Алега Грышкаўцова і Андрэя Бурдыкі на сьмяротныя прысуды, вынесеныя ім за патройнае забойства 14 траўня Гарадзенскім аблсудом.

23 верасьня з удзелам рабочай групы Нацыянальнага сходу па вывучэньні праблематыкі сьмяротнага пакараньня адбылося паседжаньне «круглага стала», арганізаванага Радай Еўропы. «Скасаваньне сьмяротнага пакараньня павінна суправаджацца ўвядзеньнем адэкватнай турэмнай сістэмы і прымальных альтэрнатыўных пакараньняў», — адзначылі прадстаўнікі РЕ. — Скасаваньне сьмяротнага пакараньня ў Беларусі наблізіць краіну да стандартаў Рады Еўропы ў галіне правоў чалавека».

18 верасьня вядомы ва ўсім сьвеце сьпявак Стынг падчас канцэрту ў Менску ў ходзе сусьветнага турнэ Symphonicity падтрымаў намаганьні праваабаронцаў у барацьбе за адмену сьмяротнага пакараньня ў Беларусі. Стынг сустрэўся з імі перад пачаткам выступу, каб падпісаць петыцыю за адмену сьмяротнага пакараньня ў рамках кампаніі, якую праводзіць БХК, ПЦ «Вясна» і «Міжнародная Амністыя». «Час гэта зьмяніць», — сказаў Стынг у сваім відэазвароце.

# 8. Парушэньне права на свабоду сумленьня

З 16 верасьня партыя БХД распачала ў Менску бестэрміновую кампанію ў абарону кляштара бернардзінцаў з касьцёлам сьвятога Язэпа. Грамадзкія актывісты і вернікі штодня а 19-й гадзіне зьбіраюцца пад сьценамі зачыненай сьвятыні, дамагаючыся вяртаньня будынку ўжо на працягу 5 гадоў. 7 жніўня 2001 г. на касьцёл сьвятога Язэпа быў зарэгістраваны рымска-каталіцкі прыход, а ў пачатку 2007 г. ваенная камендатура вызваліла памяшканьні кляштару. Цяпер у касьцёле разьмяшчаюцца фонды двух дзяржаўных архіваў. У 2007 г. хрысьціянскія актывісты сабралі больш за 30 тыс. подпісаў пад зваротам з просьбай вярнуць кляштар, але становішча не зьмянілася. Вясной пачалася рэканструкцыя будынкаў кляштару пад гасьцінічны комплекс.

# Агляд-хроніка парушэньняў правоў чалавека ў Беларусі, кастрычнік 2010 году

У кастрычніку ўдзельнікі маніторынгу «Праваабаронцы за свабодныя выбары» адсочвалі за наступнымі этапамі выбарчай кампаніі — збор подпісаў у падтрымку патэнцыйных кандыдатаў у прэзідэнты, які завяршыўся 29 кастрычніка, а таксама вылучэньне кандыдатаў у склад участковых выбарчых камісіяў, аднаго з ключавых механізмаў выбарчага працэсу, які непасрэдна ажыцьцяўляе арганізацыю галасаваньня і падлік галасоў. Шанцы на працяг удзелу ў выбарчай кампаніі маюць 11 прэтэндэнтаў, якія здалі ў тэрытарыяльныя выбарчыя камісіі больш за 100 000 подпісаў. Да апошняга дня тэрміну збору подпісаў назіральнікі фіксавалі факты парушэньняў адміністрацыямі прадпрыемстваў і ўстановаў выбарчага заканадаўства, згодна з якім «не дапускаецца ўдзел адміністрацыі арганізацый у зборы подпісаў выбаршчыкаў у працоўны час, роўна як і прымус у працэсе збору подпісаў». Акрамя таго назіральнікі адзначылі асобныя выпадкі ціску на сяброў ініцыятыўных групаў у сувязі са здачай подпісаў. Вылучэньне кандыдатаў у склад участковых выбарчых камісіяў скончылася 31 кастрычніка. У іх увайшла толькі нязначная колькасьць кандыдатаў ад апазіцыйных партыяў (каля 0,25% ад агульнай колькасьці сяброў камісіяў). Тэрытарыяльныя выбарчыя камісіі адмовілі назіральнікам у магчымасьці сачыць за працэсам праверкі сапраўднасьці подпісаў, сабраных у падтрымку прэтэндэнтаў.

Еўрапарламент зноў заклікаў Беларусь увесьці мараторый на сьмяротнае пакараньне. Пра гэта гаворыцца ў адным з пунктаў прынятай 7 кастрычніка рэзалюцыі, прымеркаванай да Еўрапейскага дня супраць сьмяротнага пакараньня 10 кастрычніка. Акцыі, прымеркаваныя да гэтай даты, праходзілі ня толькі па ўсёй Беларусі, але і ў суседніх дзяржавах. Прадстаўнікі кампаніі «Праваабаронцы супраць сьмяротнага пакараньня» раздавалі мінакам улёткі, налепкі, буклеты. У цэнтры сталіцы каля Кастрычніцкай плошчы праваабаронцы і моладзевыя актывісты ў адмысловых майках з надпісам:

«Скажы «НЕ» сьмяротнаму пакараньню» зладзілі інфармацыйны ланцуг. У Вільні адбыўся дабрачынны канцэрт супраць сьмяротнага пакараньня, да кампаніі далучыліся актывісты недзяржаўнай арганізацыі Belarus Watch і Беларускі Дом правоў чалавека. Таксама ў кастрычніку да петыцыі супраць сьмяротнага пакараньня далучыліся намесьнік міністра замежных справаў Вялікабрытаніі Джэрэмі Браўн і апостальскі візітатар для беларусаў-каталікоў у замежжы айцец Аляксандр Надсан. 8 кастрычніка ў Нацыянальнай бібліятэцы Беларусі на тэматычнай кніжнай выстаўцы «Пакараньне сьмерцю: цана жыцьця і межы права» было прадстаўлена каля 50 дакументаў на расейскай, ангельскай і нямецкай мовах: кнігі, брашуры, перыядычныя выданьні. У гэты ж дзень у Музеі гісторыі Вялікай Айчыннай вайны адбылося адкрыцьцё выставы «Сьмерць — гэта не правасуддзе». На ёй прадстаўлена 100 плакатаў, адабраных у рамках конкурсу, які прайшоў пад патранажам генеральнага сакратара Рады Еўропы Турб’ерна Ягланда і прысьвечанага скасаваньню сьмяротнай кары. Экспазіцыя працягнецца да 11 сьнежня.

26 кастрычніка Міжнародная федэрацыя за правы чалавека (FIDH) і яе сяброўская арганізацыя ў Беларусі Праваабарончы цэнтр «Вясна» выступілі з сумеснай заявай, у якой выказалі занепакоенасьць у сувязі з узмацненьнем рэпрэсіяў з боку беларускіх уладаў у дачыненьні да актывістаў анархісцкага і антыфашысцкага моладзевых рухаў. У заяве адзначана, што з боку сьледчых органаў былі зроблены дзеяньні, якія груба парушаюць законныя правы затрыманых. Так, у дачыненьні да некаторых затрыманых былі парушаныя іх правы на абарону. Напрыклад, адвакат затрыманага Аляксандра Францкевіча ня мог выявіць месцазнаходжаньне свайго падабароннага на працягу трох сутак. Таксама сталі вядомыя факты аказаньня псіхалагічнага ціску. У выніку, падчас аднаго з допытаў затрыманая паўторна Тацяна Семянішчава паспрабавала перарэзаць вены рук канцылярскія нажом. У сувязі са спробай падпалу будынку КДБ у Бабруйску ў ноч з 16 на 17 кастрычніка былі затрыманыя, а потым вызваленыя Павал Чарнышэнка і Сяргей Сьлюсар, які ў верасьні затрымліваўся па падазраньні да зьдзяйсненьня нападу на расейскую амбасаду. Міжнародная Федэрацыя за правы чалавека і ПЦ «Вясна» патрабуюць спыніць супрацьпраўныя дзеяньні і неадкладна вызваліць затрыманых.

25 кастрычніка Рада Еўрасаюзу працягнула да 31 кастрычніка 2011 году санкцыі ў дачыненьні да высокапастаўленых чыноўнікаў Беларусі. У сьпіс увайшлі 41 чалавек разам з кіраўніком Беларусі Аляксандрам Лукашэнкам. Адначасова працягнуты і мараторый на санкцыі ў дачыненьні да 36 асобаў. Па-ранейшаму выключэньне складаюць старшыня Цэнтравыбаркаму Лідзія Ярмошына, былы генпракурор Віктар Шэйман, былыя міністры ўнутраных спраў Уладзімір Навумаў і Юрый Сівакоў і былы каманьдзір менскага АМАПу Юрый Падабед, якія не падпадаюць пад мараторый і ня могуць патрапіць на тэрыторыю Еўрасаюзу. У дакуменьце Рады ЕС утрымліваецца заклік да беларускіх уладаў правесьці прэзідэнцкія выбары ў адпаведнасьці з нормамі і стандартамі міжнароднага права.

У штогадовым рэйтынгу свабоды прэсы міжнароднай арганізацыі «Рэпарцёры бяз межаў», Беларусь заняла 154 месца з 178 краін-удзельніц. У прэс-рэлізе датычна нашай краіны паведамляецца наступнае: «Беларусь спрабуе захаваць адначасова два стратэгічных партнёрствы, з Расіяй і Еўрасаюзам, пры гэтым ня робіць крокаў насустрач грамадзянскай супольнасці і напярэдадні прэзідэнцкіх выбараў працягвае аказваць ціск на нешматлікія незалежныя СМІ».

# 1. Парушэньне права на свабоду асацыяцыяў

15 кастрычніка Гаспадарчы суд Менску прыняў рашэньне аб прыпыненьні рэгістрацыі інфармацыйна-кансалтынгавай установы «Правы альянс». Ліквідацыі ўстановы дамагаўся Менгарвыканкам, абвінавачваючы яе ў нестатутнай дзейнасьці. Паводле словаў кіраўніка «Правага альянсу» Юрася Карэтнікава, чыноўнікі спасылаліся на раздрукоўкі з інтэрнэт-сайтаў, у якіх гаварылася, што арганізацыя перасьледуе палітычныя мэты. Між тым, «Правы альянс» вядомы сваёй сацыяльнай дзейнасьцю, бо праводзіў у Менску антыалкагольныя і антынаркатычныя пікеты.

12 кастрычніка Берасьцейскі абласны суд пакінуў у моцы рашэньне Галоўнага ўпраўленьня юстыцыі аблвыканкаму, якое па фармальнай прычыне, а менавіта з-за тэхнічнай памылкі, дапуш-

чанай упраўленьнем унутраных справаў, адмовілася зарэгістраваць рэгіянальную праваабарончую арганізацыю «Берасьцейская вясна». Кіраўнік аб'яднаньня Уладзімір Вялічкін кажа, што такім чынам парушаныя правы 18 заснавальнікаў праваабарончай арганізацыі.

21 кастрычніка Салігорскі райвыканкам у трэці раз адмовіў у рэгістрацыі першаснай арганізацыі Беларускага незалежнага прафсаюзу (БНП) СТАА «Дэльта-Стыль». Чыноўнікі райвыканкаму спасылаліся на неадпаведнасьці ў пададзеных дакументах і парушэньні заканадаўства. На думку віцэ-старшыні БНП Мікалая Новіка, гэтыя прэтэньзіі надуманыя і неабгрунтаваныя. У сувязі з чарговай адмовай у рэгістрацыі, што зьяўляецца парушэньнем правоў працаўнікоў на аб'яднаньне ў прафсаюз, кіраўніцтва БНП прыняло рашэньне зьвярнуцца ў суд і правесьці пікет у Салігорску. БКДП праінфармаваў Міжнародную арганізацыю працы (МАП) аб чарговым парушэньні правоў працоўных у Беларусі.

25 кастрычніка Міністэрства юстыцыі Беларусі адмовіла ў дзяржаўнай рэгістрацыі партыі «Беларуская хрысьціянская дэмакратыя». Сярод прычынаў адмовы дзяржаўнае ведамства прыводзіць недакладнасьці ў пададзеных дакументах, а таксама вынікі тэлефоннага апытаньня заснавальнікаў супрацоўнікамі міністэрства, падчас якога, як адзначаецца ў паведамленьні Мінюсту, шэраг заснавальнікаў адмовіліся ад свайго ўдзелу ў БХД. Сустаршыня аргкамітэту партыі Павал Севярынец назваў чарговую, ужо трэцюю, адмову ў рэгістрацыі палітычна матываванай і заявіў пра ціск на заснавальнікаў партыі. Акрамя таго, Міністэрства дало адказ са спазьненьнем, што з'яўляецца парушэньнем заканадаўства. Дакументы на рэгістрацыю БХД падала ў Мінюст 19 верасьня.

12 кастрычніка Гаспадарчы суд Менску задаволіў пазоў Менгарвыканкаму аб пазбаўленьні дзяржаўнай рэгістрацыі дасьледчаасьветніцкай установы «Рух наперад», якая праводзіць грамадзянскую кампанію «Гавары праўду!». Раней дырэктар установы і прэтэндэнт на пасаду прэзідэнта Беларусі Уладзімір Някляеў заяўляў, што грамадзянская кампанія «Гавары праўду!» будзе працягвацца ў любым выпадку.

# 2. Палітычна матываваныя крымінальныя справы

19 кастрычніка ў Савецкім раённым судзе Менску завяршыўся разгляд крымінальнай справы актывіста кампаніі «Гавары праўду!» Міхася Башуры за нібыта паўторную падробку даведкі аб прыбытках для атрыманьня жонкай льготнага крэдыту на будаўніцтва жыльля. Напярэдадні пракурор Галіна Корнева запатрабавала для абвінавачанага 6 месяцаў арышту, а адвакат Тамара Сідарэнка прасіла суд апраўдаць М. Башуру, бо лічыць, што ягоная віна не была даказаная. Аднак суд прызнаў яго вінаватым па дзьвюх частках арт. 380 КК РБ і пакараў штрафам у памеры 500 базавых велічыняў, што складае 17 млн 500 тыс. руб (звыш 5700 $). Праваабаронцы лічаць гэтую справу палітычна матываванай.

26 кастрычніка ў Менгарсудзе разглядалася абскарджваньне рашэньня Цэнтральнага райсуду сталіцы адносна меры стрыманьня ў дачыненьні да студэнта паліталогіі ЕГУ Мікалая Дзядка. Скарга задаволеная не была, і абвінавачваемы застаўся пад вартай. Акрамя таго, следзтва працягнута да трох месяцаў — да 24 сьнежня. М.Дзядок быў затрыманы на пачатку верасьня па падазрэньні ў нападзе на амбасаду Расіі ў Менску, аднак 1 кастрычніка яму прад'явілі абвінавачаньне ва ўдзеле ў дэманстрацыі пратэсту каля Генштабу Міністэрства абароны, накіраванай супраць беларуска-расійскіх вайсковых вучэньняў «Захад—2009» у 2009 годзе. 24 верасьня з ізалятару часовага ўтрыманьня на Акрэсьціна М. Дзядка перавялі ў СІЗА на вул. Валадарскага, дзе ён чакае суду па гэтай справе. ПЦ «Вясна» лічыць, што згаданая дэманстрацыя, хаця і суправаджалася нязначным парушэньнем грамадзкага парадку (кіданьнем на тэрыторыю Генштабу адным з удзельнікаў дымавой шашкі), у цэлым насіла мірны характар. Яе ўдзельнікі выказвалі сваё меркаваньне і пратэст шляхам дэманстрацыі. У зьвязку з гэтым праваабаронцы ня згодныя з кваліфікацыяй дадзеных дзеяньняў паводле ч.2 арт.339 (хуліганства, зьдзейсьненае групай асобаў) і лічаць затрыманьні М.Дзядка і іншых асобаў па падозраньні ва ўдзеле ў акцыі пратэсту адвольнымі. Асаблівую ўвагу праваабаронцы зьвяртаюць на той факт, што М. Дзядок быў затрыманы на 21 суткі (перазатрымліваўся на трое сутак 7 разоў!) і ўтрымліваўся ў ІЧУ

без прад'яўленьня абвінавачаньня. ПЦ «Вясна» лічыць затрыманьні асобаў без дакладна ўстаноўленага тэрміну грубым парушэньнем дзеючага працэсуальнага заканадаўства і законных правоў затрыманых.

Былы міністр зьнешнеэканамічных сувязяў, былы амбасадар Беларусі ў Латвіі, удзельнік прэзідэнцкай кампаніі 2001 году і былы палітвязень Міхаіл Марыніч атрымаў паведамленьне з Камітэту ААН па правах чалавека (КПЧ). Міжнародная інстанцыя прызнала, што суд над палітыкам, які ў сьнежні 2004 году адбыўся ў Менску і прысудзіў Марыніча да пяці гадоў пазбаўленьня волі за нібыта крадзеж аргтэхнікі, якая належала амбасадзе ЗША, ня быў справядлівым і незалежным. На думку КПЧ гэты працэс строга адсочваўся беларускімі сьпецслужбамі, суддзі тэндэнцыйна ацэньвалі сабраныя падчас расьсьледваньня факты і паказаньні сьведак, і крымінальная справа, па сутнасьці, была палітычнай расправай. Акрамя таго, Камітэтам прызнана, што ў дачыненьні да палітыка ўжываліся катаваньні і бесчалавечнае, прыніжаючае годнасьць абыходжаньне. Зараз беларуская дзяржава абавязана забясьпечыць М.Марынічу «належнае лячэньне, уключаючы выплату адпаведнай кампенсацыі, і правядзеньне крымінальнага працэсу для ўстанаўленьня адказнасьці за неналежнае абыходжаньне».

## 3. Перасьлед грамадзкіх актывістаў

Сябра партыі Беларуская Хрысьціянская Дэмакратыя Яўген Якавенка, які ў чэрвені гэтага году быў асуджаны да 1 году абмежаваньня волі за ўхіленьне ад мерапрыемстваў вайсковага прызыву па пацыфіскіх перакананьнях і амніставаны ў сувязі з 65-годдзем Перамогі, па патрабаваньні ваенкамату ў кастычніку праходзіў медыцынскую камісію. Яго зноў намагаюцца прызваць у войска. У сувязі з гэтым прызыўнік накіраваў лісты ў Міністэрства абароны, Палату прадстаўнікоў і Генеральную пракуратуру, у якіх зьвярнуў увагу, што ў Беларусі працягваецца практыка прыцягненьня да крымінальнай адказнасьці грамадзянаў, якія хацелі б праходзіць замест тэрміновай службы альтэрнатыўную. Я.Якавенка ў сваіх запытах прасіў разабрацца ў сітуацыі і прыняць меры, спасылаючыся на распараджэньне прэм'ер-

міністра аб падрыхтоўцы законапраекту «Аб альтэрнатыўнай службе». У адказ прызыўнік атрымаў звычайныя адпіскі. Так, у лісьце за подпісам вайсковага камісару Гомельскага гарвыканкаму палкоўніка Яфімчыка прызыўніку паведамляецца, што «перапіска з ім па дадзеным пытаньні спыняецца», бо раней ужо быў дадзены вычарпальны адказ. Таксама Я.Якавенка зьвяртаўся ў суд Савецкага раёну Гомелю са скаргай на адмову Гомельскага гарадскога ваеннага камісарыяту прадставіць яму канстытуцыйнае права на праходжаньне альтэрнатыўнай службы. Аднак 21 кастрычніка суд адмовіў ва ўзбуджэньні грамадзянскай справы са спасылкай на п. 2 арт. 246 Грамадзянскага працэсуальнага кодэксу (ГПК), бо «ня выкананы парадак папярэдняга пазасудовага вырашэньня справы». У адказе, які прызыўнік атрымаў ад старшыні Камісіі па працы, сацыяльнай абароне, справах ветэранаў і інвалідаў Лаўрукевіч гаворыцца, што інфармацыяй аб тэрмінах унясеньня законапраекту «Аб альтэрнатыўнай службе» ў Палату прадстаўнікоў Нацыянальнага Сходу камісія не валодае.

# 4. Парушэньне прынцыпу свабоды слова і распаўсюду інфармацыі

1 кастрычніка суддзя Ленінскага райсуду Магілёву Станіслаў Шандаровіч прызнаў праваабаронцу і журналіста Валерыя Шчукіна вінаватым па арт. 22.9 ч. 2 КаАП («Выраб, дастаўка і распаўсюд друкаванай прадукцыі, выробленай з парушэньнем беларускага заканадаўства») і пакараў штрафам у памеры 30 базавых велічыняў (1 млн 50 тыс. руб). Міліцыянты затрымалі В. Шчукіна 8 жніўня, у аўтамабіле яны знайшлі і канфіскавалі 24 тысячы асобнікаў газеты аднайменнай грамадзянскай кампаніі «Наш дом», а таксама пяць з паловай тысяч брашур, прысьвечаных правам жанчын.

8 кастрычніка ў Віцебскай вобласьці супрацоўнікі ДАІ затрымалі аўтамабіль Віктара Рамнёва, дырэктара прыватнага прадпрыемства «Витебский корунд», што выдае недзяржаўную газету «Витебский курьер». В. Рамнёў дастаўляў са Смаленскай друкарні наклад чарговага нумару газеты, якая распаўсюджваецца на Віцебшчыне, але зарэгістраваная ў Расіі як перыядычнае выданьне. У выніку 11 тысячаў

асобнікаў былі канфіскаваныя. 12 кастрычніка суддзя Лёзьненскага райсуду Антаніна Афанасьева прызнала В. Рамнёва вінаватым па ч.2 арт. 22.9 КаАП у незаконным распаўсюдзе «Витебского курьера». Падчас судовага разгляду былі адхіленыя каля дзесяці хадайніцтваў падсуднага, не дапушчаны да ўдзелу ў працэсе праваабаронца Павел Левінаў у якасьці грамадзкага прадстаўніка і адмыслоўца ў дадзенай справе. На знак пратэсту В. Рамнёў разам з паплечнікамі пакінулі судовую залу, і прысуд у выглядзе штрафу памерам у 35 базавых велічынь (1 млн 225 тыс. руб) суддзя зачытала ў іх адсутнасьць. Варта дадаць, што толькі за апошнія паўгады В. Рамнёў неаднаразова быў пакараны за распаўсюд недзяржаўных выданьняў буйнымі штрафамі. Распаўсюдам міліцыя, а затым суды, лічаць перавозку друкаванай прадукцыі аўтатранспартам.

27 кастрычніка ў Жодзіне супрацоўнікі міліцыі зьявіліся на працу да актывіста Андрэя Зубры і даставілі яго спачатку ў пастарунак, а затым у суд, дзе адбыўся разгляд адміністрацыйнай справы па абвінавачаньні ў незаконным распаўсюдзе сродкаў масавай інфармацыі. Месяц таму міліцыянты затрымалі А. Зубра з 216 асобнікамі незалежнага выданьня «Тут і цяпер», склалі адміністрацыйны пратакол па ч. 2 арт. 22.9 КаАП РБ. Разгледзеўшы матэрыялы справы, суддзя Жодзінскага райсуду Грынкевіч вынес пастанову, згодна з якой міліцэйскі пратакол не адпавядае сутнасьці выкладзенага ў ч.2 арт. 22.9 КаАП правапарушэньня. Такім чынам, матэрыялы справы былі накіраваныя ў Жодзінскі ГАУС на дапрацоўку.

# 5. Парушэньне права на свабоду мірных сходаў

Мясцовыя ўлады забаранілі недзяржаўным прафсаюзам ладзіць мерапрыемствы, прымеркаваныя да 7 кастрычніка — Сусьветнага дня барацьбы за годныя ўмовы працы. У Магілёве, напрыклад, выканкам спаслаўся на пастанову, згодна з якой вызначаны пералік месцаў для правядзеньня масавых мерапрыемстваў, а заяўленыя прафсаюзамі месцы ў гэтым пераліку ня значацца. Свабодны прафсаюз металістаў зьбіраўся зладзіць акцыю ў Менску ў раёне вуліцы Ванеева, побач

з паркам 50-годдзя Кастрычніка. Аднак на думку чыноўнікаў Менгарвыканакаму, удзельнікі пікету маглі стварыць перашкоды транспартнаму руху, што і паслужыла нагодай для адмовы. Полацак стаў адзіным горадам Беларусі, дзе ўлады дазволілі незалежнаму прафсаюзу правесьці ў Міжнародны дзень барацьбы за годную працу вулічную акцыю.

11 кастрычніка ў Менску прайшла акцыя, прымеркаваная да дня «Камінг аўт» (англ. coming out), які адзначаюць геі і лесьбіянкі ўсяго сьвету. Напярэдадні актывісты ЛГБТ-руху падалі ў Менгарвыканкам заяўку на правядзеньне публічнага мерапрыемства, але сталічныя ўлады яе не задаволілі. У несанкцыянаванай акцыі ўзялі ўдзел дзесяць чалавек. Яны прайшлі з вясёлкавай сімволікай ад станцыі метро «Купалаўская» да Нямігі і назад. Адзін з актывістаў Сяргей Прадзед застаўся на Кастрычніцкай плошчы. Ён трымаў плакаты, на якіх былі выпіскі з Канстытуцыі арт. 35 пра свабоду сходаў, паперы пра адмову Менгарвыканкаму, і распавядаў мінакам пра сітуацыю з правамі чалавека ў Беларусі. Праз некаторы час супрацоўнікі праваахоўных органаў затрымалі С. Прадзеда, адвезьлі ў пастарунак і склалі адміністрацыйны пратакол. Судовы разгляд справы адбыўся на наступны дзень, ноч ЛГБТ-актывіст правёў на Акрэсьціна ў Цэнтры ізаляцыі правапарушальнікаў. 12 кастрычніка Цэнтральны райсуд Менску прызнаў С. Прадзеда віноўным у правапарушэньні, прадугледжаным ч. 3 арт. 23.34 КаАП («Парушэньне парадку арганізацыі і правядзеньня масавага мерапрыемства») і пакараў штрафам у памеры 20 базавых велічыняў (700 тыс. рублёў).

# 6. Адміністрацыйныя затрыманьні і пакараньні грамадзка-палітычных актывістаў

2 кастрычніка на плошчы Незалежнасьці ў Менску каля Чырвонага касьцёлу міліцыянты затрымалі чатырох маладафронтаўцаў, якія раздавалі запрашэньні на штодзённую акцыю абароны касьцёла сьвятога Язэпа. Афіцыйная падстава затрыманьня — дзеля высьвятленьня асобаў. У Маскоўскім РУУС у актывістаў узялі тлумачэньні,

ніякія пратаколы не складаліся, тым ня менш у пастарунку іх пратрымалі больш за 3 гадзіны. У дзеяньнях маладафронтаўцаў не было выяўлена складу злачынства, аднак міліцыянты выклікалі бацькоў затрыманых ды пагражалі праблемамі на працы, вучобе. Актывісты падалі скаргі на супрацьпраўныя дзеяньні супрацоўнікаў міліцыі.

# 7. Парушэньні права на свабоду сумленьня

14 кастрычніка ў пратэстанцкай царкве «Новае Жыцьцё» прайшоў круглы стол у абарону канстытуцыйнага права вернікаў на свабоду веравызнаньня. У ім прынялі ўдзел кіраўнікі царквы, юрысты, праваабаронцы, палітыкі і журналісты. Удзельнікі круглага стала заклікалі беларускія ўлады спыніць ціск на Вячаслава Ганчарэнку, пастара менскай царквы і яе вернікаў. У прынятай рэзалюцыі ўдзельнікі пасяджэньня заклікалі ўлады забясьпечыць рэалізацыю канстытуцыйнага права на свабоду сумленьня і веравызнаньня, а міжнародныя арганізацыі і праваабарончыя структуры — да салідарнасьці з прыхаджанамі абшчыны, а таксама з усімі беларускімі грамадзянамі, якія адстойваюць сваё права на свабоду сумленьня і веравызнаньня. Вырашана, што рэзалюцыя будзе накіравана ў Адміністрацыю прэзідэнта, Палату прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу, упаўнаважанаму па справах рэлігій і нацыянальнасьцяў. Дакумент таксама будзе накіраваны ў Еўрапарламент, офіс АБСЕ ў Менску і міжнародныя праваабарончыя структуры.

# 8. Сьмяротнае пакараньне

5 кастрычніка на памежным пункце «Каменны Лог» былі затрыманыя актывісткі кампаніі «Праваабаронцы супраць сьмяротнага пакараньня ў Беларусі» Ірына Тоўсьцік і Паліна Сьцепаненка. Іх высадзілі з аўтобусу «Вільня-Менск». Супрацоўнікі Ашмянскай мытні затрымалі інфармацыйныя матэрыялы кампаніі супраць сьмяротнага пакараньня, якія везьлі актывісткі, на праверку, аднак так і не вярнулі.

4 кастрычніка Сьвятлана Жук, маці расстралянага ў сакавіку па прысуду Андрэя Жука, абскардзіла ў Ленінскім райсудзе сталіцы адмову Дэпартаменту па выканананьні пакараньняў МУС паведаміць пра месца пахаваньня яе сына. З гэтай просьбай яна зьвярталася ў Міністэрства ўнутраных справаў. Дэпартамент па выканананьні пакараньняў спаслаўся на арт.175 КК, згодна з якім «цела для пахаваньня не выдаецца, пра месца пахаваньня не паведамляецца».

Жыхарка Берасьця, маці траіх дзяцей Сьняжана Неўдах у кастрычніку двойчы пісьмова зьярталася да прэзідэнта Беларусі, каб ён дапамог атрымаць Сьвятлане Жук зьвесткі пра месца пахаваньня расстралянага сына. Яна лічыць, што такі крок можна было б назваць гуманным у дачыненьні да жанчыны.

Берасьцейскі юрыст-праваабаронца Раман Кісьляк атрымаў адказ з МЗС Беларусі на сваю заяву, у якой намагаўся адмяніць закон аб таямніцы часу расстрэлу і месцы пахаваньня прысуджанага да сьмяротнага пакараньня. Р. Кісьляк лічыць, што такі адпаведны артыкул Крымінальна-выканаўчага кодэксу супярэчыць сёмаму артыкулу Міжнароднага пакту, дзе сказана, што таямніца наконт часу расстрэлу, нявыдача цела і таямніца пра месца пахаваньня — гэта негуманная трактоўка родных. Аднак намесьнік міністра Сяргей Алейнік, які падпісаў адказ юрысту, такой праблемы ня бачыць.

# 9. Парушэньні выбарчых правоў грамадзянаў

З 16 верасьня кампанія «Праваабаронцы за свабодныя выбары» ажыцьцяўляе незалежны маніторынг выбарчага працэсу з пункту гледжаньня беларускага выбарчага заканадаўства і міжнародных стандартаў свабодных і дэмакратычных выбараў, шырока інфармуе пра выяўленыя парушэньні, а таксама даводзіць свае высновы да беларускай грамадзкасьці і міжнароднай супольнасьці. У тыднёвых аналітычных аглядах, а таксама этапных справаздачах, якія зьмяшчаюцца на сайтах ПЦ «Вясна» і БХК, прыводзяцца галоўныя высновы, зробленыя прадстаўнікамі маніторынгу. Напрыклад, ад пачатку выбарчай кампаніі толькі з дапамогай юрыстаў кампаніі «Правааба-

ронцы за свабодныя выбары» былі пададзены 238 скаргаў, з якіх па стане на 31 кастрычніка задаволены толькі 9 (3,8%) — некаторыя з тых, што тычыліся рашэньняў мясцовых выканкамаў аб месцах, дзе забаронены пікеты па зборы подпісаў. Цэнтральная і тэрытарыяльныя выбарчыя камісіі не задаволілі ніводнай скаргі на парушэньні выбарчага заканадаўства інцыятыўнай групай Аляксандра Лукашэнкі.

# 10. Умовы ўтрыманьня ў месцах зьняволеньня

Асуджанаму на 5 гадоў пазбаўленьня волі ваўкавыскаму прадпрымальніку Мікалаю Аўтуховічу так і не аказалі медыцынскую дапамогу па пратэзаваньні зубоў. Палітвязень неаднаразова зьвяртаўся па гэтым пытаньні да адміністрацыі калоніі, аднак яно застаецца нявырашаным. Гэта стала вядома пасьля ягонай сустрэчы ў калоніі з жонкай, якая перадала М.Аўтуховічу блэндэр, бо без разьмяльчэньня ежы ён ужо ня можа есьці.

# 11. Звальненьні і адлічэньні з вучобы па палітычных матывах

20 кастрычніка кіраўніцтва недзяржаўнай газеты «Вечерний Бобруйск» прапанавала журналісту, сябру ГА «БАЖ» Дзьмітрыю Растаеву напісаць заяву на адпачынак. Прычынай паслужыла «настойлівае пажаданьне» Бабруйскага гарвыканкаму. Намесьнік старшыні і адказны за «ідэалагічны накірунак» паказаў заснавальніку падборку раздрукоўвак з ЖЖ і рэспубліканскай «Белгазеты», з якой супрацоўнічае журналіст, і заявіў: «Альбо Растаеў перастае друкавацца дзе-кольвек, акрамя як у вас, альбо самі разумееце... Падумайце пра газету». На думку журналіста, адпачынак, хутчэй за ўсё, акажацца «бестэрміновым».

# 12. Парушэньні працоўных правоў грамадзянаў

25 на дрэваапрацоўчай фабрыцы «Холдынгавай кампаніі» Пінскдрэў» адбылося надзвычайнае здарэньне. Прычына аварыі, па зьвестках прэс-службы МНС, выбух пылапаветранай сумясі на ўчастку вытворчасьці драўняна-паліўных гранулаў з-за парушэньня рэжыму эксплуатацыі абсталяваньня. Па факце аварыі на фабрыцы абласная пракуратура ўзбудзіла крымінальную справу па ч.2 ст.302 КК РБ («Парушэньне правілаў вытворча-тэхнічнай дысцыпліны, правілаў бясьпекі на выбуханебясьпечных прадпрыемствах»). Па словах працаўнікоў прадпрыемства, яны неаднаразова зьвярталіся да кіраўніцтва з пытаньнямі пра бясьпеку працы з-за высокай канцэнтрацыі драўлянага пылу ў паветры. Аднак супрацоўнікі лабараторыі казалі, што ўсе паказчыкі ў норме. Па стану на 1 лістапада ў медустановах засталося шасьцёра пацярпелых, 14 чалавек загінулі.

1 лістапада з заявай «Трагедыя нацыянальнага маштабу на фоне бязмоўя ўлады» выступіла Рада «Беларускага Кангрэсу дэмакратычных прафсаюзаў» (БКДП). «Мы ня лічым гэтую трагедыю выпадковым зьбегам акалічнасьцяў. Ажыцьцяўляючы пастаянны маніторынг вытворчасьцяў, умоў бясьпекі працы на іх, мы сёньня маем усе падставы заявіць — Беларусь стаіць на парозе тэхнагеннай катастрофы», — гаворыцца ў заяве. БКДП выказаў спачуваньні сем’ям і блізкім загінулых.

# Агляд-хроніка парушэньняў правоў чалавека ў Беларусі, лістапад 2010 году

У лістападзе завяршыўся этап збору подпісаў за вылучэньне прэтэндэнтаў у кандыдаты на Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь. 18 лістапада адбылося паседжаньне ЦВК па рэгістрацыі кандыдатаў. З 17 прэтэндэнтаў, якія зарэгістравалі ініцыятыўныя групы, 11 заявілі аб здачы як мінімум 100 000 подпісаў у сваю падтрымку; яшчэ 6 прэтэндэнтаў вырашылі добраахвотна спыніць свой удзел у выбарах. Уладзімір Правальскі ня быў зарэгістраваны дзеля таго, што, па меркаваньні ЦВК, здаў толькі 118 сапраўдных подпісаў. Заўвагі да астатніх 9 прэтэндэнтаў, сабраўшых больш за 100 000 подпісаў — Рыгора Кастусёва, Алеся Міхалевіча, Уладзіміра Някляева, Яраслава Раманчука, Віталя Рымашэўскага, Андрэя Саньнікава, Мікалая Статкевіча, Дзьмітрыя Уса і Віктара Цярэшчанкі — тычыліся як парушэньняў пры зборы подпісаў, так і неадпаведнасьці зьвестак аб маёмасьці і прыбытках. ЦВК палічыла гэтыя парушэньні не перашкаджаючымі рэгістрацыі і зарэгістравала іх кандыдатамі ў Прэзідэнты. Толькі адзін прэтэндэнт ня меў ніякіх заўвагаў з боку ЦВК — Аляксандр Лукашэнка, за якога было пададзена 1 100 000 подпісаў.

19 лістапада арганізатары грамадзкай ініцыятывы «Праваабаронцы за свабодныя выбары» правялі прэс-канферэнцыю, падчас якой падсумавалі вынікі чарговага этапу выбарчай кампаніі. Нягледзячы на больш спрыяльныя чым раней умовы, назіральнікі адзначылі цэлы шэраг парушэньняў выбарчага заканадаўства. Так, ініцыятыўныя групы прэтэндэнтаў працавалі ў няроўных умовах параўнальна з ініцыятыўнай групай дзейнага кіраўніка дзяржавы. Падчас збору подпісаў моцна выкарыстоўваўся адміністрацыйны рэсурс, а актывістам камандаў іншых прэтэндэнтаў забаранялася ўваходзіць у інтэрнаты, на тэрыторыю прадпрыемстваў і ўстановаў. Цэнтрвыбаркам таксама не зьвярнуў увагу на той факт, што подпісы за А. Лукашэнку зьбіралі людзі, якія не зьяўляліся сябрамі яго ініцыятыўнай

групы. Што тычыцца рэгістрацыі кандыдатаў, то яна адбывалася бяз значных абмежаваньняў права кандыдатаў быць абранымі. У той жа час закрытасьць працэдуры праверкі сапраўднасьці подпісаў не выключае маніпуляцыяў з боку выбарчых камісіяў і дае падставы для стаўленьня да вынікаў рэгістрацыі як да палітычна, а не юрыдычна матываваных. Па дадзеных назіральнікаў значная частка прэтэндэнтаў не сабрала неабходную для рэгістрацыі колькасьць подпісаў, але тым ня менш была зарэгістраваная ЦВК.

Віцэ-прэзідэнт Міжнароднай федэрацыі правоў чалавека Алесь Бяляцкі даслаў звароты на імя Генеральнага пракурора Беларусі Рыгора Васілевіча і ў Адміністрацыю Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь. Да іх праваабаронца далучыў афіцыйную заяву FIDH, прынятую міжнароднай арганізацыяй у сувязі з ціскам сілавых структураў на групы грамадзянаў, што прадстаўляюць анархісцкі і антыфашысцкі моладзевыя рухі ў краіне. Ён заклікаў спыніць супрацьпраўныя дзеяньні і не дапускаць парушэньняў правоў чалавека пры правядзеньні сьледзтва.

30 лістапада Міністэрства фінансаў ЗША ў чарговы раз працягнула рашэньне аб зьмякчэньні санкцыяў у дачыненьні да двух беларускіх прадпрыемстваў канцэрна «Белнафтахім» — «Лакафарба» і «Полацак-Шкловалакно». Дзейнасьць санкцыяў прыпынена да 31 траўня 2011 году. Яны былі ўведзены тры гады таму — у лістападзе 2007 году ў сувязі з парушэньнем правоў чалавека ў Беларусі. 5 верасьня 2008 году Мінфін ЗША на паўгады зьмякчыў санкцыі і з таго часу штораз працягвае гэтае рашэньне.

# 1. Парушэньне права на свабоду асацыяцыяў

10 лістапада ўступіла ў сілу рашэньне Гаспадарчага суду Менску аб ліквідацыі ўстановы «Рух наперад». Апеляцыйная калегія суду адмовіла ў задавальненьні скаргі прадстаўнікоў установы на рашэньне гэтага ж суду аб ліквідацыі ўстановы. Афіцыйная падстава ліквідацыі — несапраўднасьць дамовы з арэндадаўцам і, адпаведна, адсутнасьць юрыдычнага адрасу. Між тым, менавіта ўстанова «Рух

наперад» зьяўлялася афіцыйным ініцыятарам кампаніі «Гавары праўду!», лідэрам якой зьяўляецца У. Някляеў — адзін з кандыдатаў у Прэзідэнты.

16 лістапада Вярхоўны суд Беларусі адхіліў скаргу праваабарончай арганізацыі «Берасьцейская вясна» на нерэгістрацыю аб'яднаньня. Матывіроўка адмовы: на час прыняцьця рашэньня фактычна існавала несупадзеньне паміж пададзеным адрасам аднаго з заснавальнікаў і тым, які быў у базе дадзеных Міністэрства ўнутраных спраў.

## 2. Палітычна матываваныя крымінальныя справы

4 лістапада быў затрыманы і зьмешчаны ў СІЗА жыхар сталіцы Максім Веткін. Яму прад'яўлена абінавачваньне ў нападзе на амбасаду Расіі 30 жніўня і нападзе на будынак «Беларусбанку» ў ноч з 30 красавіка на 1 траўня. М. Веткін прызнаў сваю датычнасьць да гэтых нападаў, аднак сябры актывіста ўпэўненыя, што прызнаньне ён зрабіў пад ціскам міліцыі. М.Веткін стаў трэцім абвінавачаным па справе хуліганскіх нападаў, зьдзейсьненых на працягу году ў розных месцах Менску, Салігорску і Бабруйску. Усе гэтыя эпізоды з нападамі былі аб'яднаныя ў адну крымінальную справу аб хуліганстве (ч. 2 арт. 339 КК). Па ёй таксама праходзяць Мікалай Дзядок і Аляксандр Францкевіч, якія з верасьня ўтрымліваюцца за кратамі. 10 лістапада стала вядома, што сьледзтва працягнутае да 6 месяцаў, у сувязі з чым тэрмін утрыманьня пад вартай працягнуты.

16 лістапада студэнцкае прадстаўніцтва Еўрапейскага гуманітарнага ўніверсітэту абвесьціла пра пачатак бестэрміновай акцыі ў падтрымку зьняволенага Мікалая Дзядка, студэнта паліталогіі ЕГУ, паколькі за час правядзеньня сьледзтва неаднаразова было груба парушана крымінальна-працэсуальнае заканадаўства. На першым этапе плануецца сабраць і даслаць зьняволенаму некалькі соцень лістоў у знак салідарнасьці. У звароце, распаўсюджаным студэнтамі ЕГУ, адзначаецца: «16 лістапада, у Дзень Салідарнасьці з ахвярамі палітычнага рэжыму ў Беларусі, мы патрабуем ад сілавых структур Беларусі альбо вызваліць М.Дзядка з-пад варты з-за адсутнасьці доказаў ягонай

датычнасьці да якіх бы там ні было правапарушэньняў і злачынстваў, альбо правесьці адкрыты і справядлівы суд па матэрыялах справы». Таксама студэнты заклікалі ўсіх неабыякавых людзей далучацца да кампаніі салідарнасьці і пісаць лісты М.Дзядку.

5 лістапада з Івацэвіцкай калоніі ўмоўна-датэрмінова вызвалены Уладзімір Асіпенка, асуджаны па так званай справе ваўкавыскіх прадпрымальнікаў. Да заканчэньня тэрміну пакараньня яму заставалася ўсяго 3 месяцы і 4 дні.

Крымінальная справа супраць незалежных журналістак Натальлі Радзінай, Ірыны Халіп, Марыны Коктыш і Сьвятланы Калінкінай перададзена ў пракуратуру. Па словах старэйшага дазнаўцы Ўпраўленьня ўнутраных справаў Гомелю Аляксандра Пусева, справа па артыкуле «паклёп» была раней прыпыненая згодна п.1 ч.1 арт. 246 КПК РБ («з-за невыяўленьня асобы, якая падлягае абвінавачваньню») і знаходзілася ў архіве, але прыкладна месяц таму яе запатрабавала кіраўніцтва Менскай гарадской пракуратуры. Пры гэтым канфіскаваная ў журналістак тэхніка дагэтуль знаходзіцца ў сьпецыяльным сховішчы для рэчдоказаў і рашэньне пра яе вяртаньне не прынятае. «Нагадаю, што ў пракуратуры Менску знаходзіцца таксама яшчэ адна крымінальная справа супраць сайта, узбуджаная за каментары чытачоў. Уся гэтая сітуацыя наглядна дэманструе характар прэзідэнцкай выбарчай кампаніі, якая ідзе ў краіне — яе ўжо сёньня можна назваць несвабоднай і недэмакратычнай», — пракаментавала сітуацыю каардынатарка Хартыі'97 Натальля Радзіна.

18 лістапада Гарадзенская пракуратура вынесла афіцыйнае папярэджаньне па крымінальным артыкуле 193.1 (дзейнасьць ад імя незарэгістраванай арганізацыі) намесьніку старшыні «Маладога Фронту» Алесю Кіркевічу. Гэта адбылося на падставе заявы, якую пад прымусам супрацоўнікаў сьпецслужбаў напісала маці аднаго з актывістаў гарадзенскага аддзяленьня арганізацыі.

30 лістапада Менскі гарадскі суд не задаволіў скаргу актывіста кампаніі «Гавары праўду!» Міхася Башуры на прысуд, вынесены Савецкім райсудом сталіцы 19 кастрычніка. Адначасова суддзі не задаволілі пратэст пракуратуры на той самы прысуд. Па словах М.Башуры, разгляд прайшоў вельмі хутка і з парушэньнем юрыдычнай працэдуры.

# 3. Перасьлед грамадзкіх актывістаў

11 лістапада салігорскага маладафронтаўца і актывіста кампаніі «Гавары праўду!»Андруся Тычыну, які быў затрыманы на акцыі 7-га лістапада і ў той жа дзень дастаўлены ў ваенкамат, накіравалі ў псіхіятрычную бальніцу ў Навінках (Менск) на абсьледваньне. Па словах А. Тычыны, ён ніякім чынам не ўхіляўся ад прызыву, а паводзіны ўладаў і ваеннага камісарыяту зьвязвае з удзелам у выбарчай кампаніі.

Пры перасячэньні мяжы прадстаўнікі апазіцыі пачалі прыцягваць асаблівую ўвагу ў памежных службаў. Так, 2 лістапада ў Гомелі на чыгуначным вакзале ў цягніку Кіеў — Санкт-Пецярбург мытнікі правялі паўторны дагляд 4 магілёўскіх актывістаў кампаніі «Гавары праўду!». Дагляд быў зроблены пасьля таго, як актывісты прайшлі мытны кантроль на станцыі «Церуха» пры перасячэньні беларускай мяжы.

Пад асабісты дагляд трапілі на чыгуначным вакзале ў Горадні і праваабаронцы Уладзімір Хільмановіч і Віктар Сазонаў. 4 лістапада яны вярталіся з Польшчы і былі затрыманыя на дзьве гадзіны.

# 4. Парушэньне прынцыпу свабоды слова і распаўсюду інфармацыі

12 лістапада на менскім аўтавакзале «Ўсходні» міліцэйскія і цывільныя машыны заблакавалі мікрааўтобус, які перавозіў наклад новага нумару незалежнай газеты «Новы час». Супрацоўнікі ДАІ забралі дакументы ў кіроўцы мікрааўтобусу і загадалі яму прыехаць у Ленінскі РУУС, дзе падчас разбору зьявіўся невядомы ў цывільным і загадаў адпусьціць распаўсюднікаў.

30 лістапада Кастрычніцкі райсуд Віцебску пакараў Сяргея Кандакова штрафам у памеры 20 б.в. (700 тыс.руб.) за распаўсюд незалежнай газеты «Витебский курьер», якая зарэгістраваная як расійскае перыядычнае выданьне і друкуецца ў Смаленску. Выдавацца на радзіме газета ня мае магчымасьці. Акрамя таго «Витебский курьер» пазбаўлены ліцэньзіі на продаж і ня можа трапіць у падпісны каталог.

24 лістапада Крычаўскі раённы суд не задаволіў іск выдаўца незалежнай газеты «Вольны горад» Уладзіміра Кудраўцава, які дамагаўся

кампенсацыі маральнай шкоды ад раённай міліцыі ў памеры пяці мільёнаў рублёў. Нагодай для суду сталася канфіскацыя міліцыянтамі трох накладаў выданьня. Галоўнай тэмай арыштаванага нумару быў артыкул «НТВ зьнішчыла рэпутацыю прэзідэнта Лукашэнкі» з камэнтаром Паўла Шарамета пра скандальны фільм «Хросны Бацька». Суддзя Антаніна Качанава палічыла, што прэтэньзіі журналіста да міліцыянтаў беспадстаўныя. Пастанова суду абскарджана ў вышэйстаячай інстанцыі.

Міністэрства гандлю вынесла папярэджаньне лунінецкай незалежнай газеце «Информ-прогулка» за разьмяшчэньне ў некалькіх травеньскіх выпусках рэкламы незалежнага тэлеканала «Белсат TV» «без указаньня найменьня, уліковага нумару плацельшчыка замежнага рэкламадаўцы», чым парушыла п. 4 арт. 10 закону «Аб рэкламе». А паколькі за згаданае правапарушэньне прадугледжана таксама адміністрацыйная адказнасьць, прадстаўніка рэдакцыі выклікалі ў Мінгандлю для складаньня пратаколу.

# 5. Парушэньне права на свабоду мірных сходаў

Менгарвыканкам адмовіў прадстаўнікам моладзевай кааліцыі «Новае Пакаленьне» правесьці на плошчы Незалежнасьці 7 лістапада пікет са зборам подпісаў за перайменаваньне станцыі метро «Плошча Леніна» ў «Плошчу Незалежнасьці». Прычына — забарона праводзіць пікеты бліжэй чым за 200 метраў ад пераходаў мэтрапалітэну. Арганізатары ня сталі праводзіць несанкцыянаванае мерапрыемства, а распачалі збор подпісаў недалёк ад плошчы Незалежнасьці: моладзевыя актывісты расьцягнуліся ад Чырвонага касьцёлу да будынку чыгуначнага вакзалу. Акцыя прайшла без затрыманьняў, але пашпартныя дадзеныя некаторых зборшчыкаў супрацоўнікі Маскоўскага РУУС ўсё ж перапісалі.

У канцы лістапада гомельскія праваабаронцы Леанід Судаленка і Анатоль Паплаўны накіравалі заяўку на правядзеньне ў горадзе 10 сьнежня, у Дзень правоў чалавека, пікета. На мэце правядзеньня масавага мерапрыемства таксама ставілася інфармаваньне жыхароў

гораду аб праве не ісьці на датэрміновае галасаваньне. Гарвыканкам адмовіў праваабаронцам на той падставе, што заяўнікі не аплацілі паслугі міліцыі, «хуткай дапамогі» і камунальных службаў, а таксама месцам правядзеньня акцыі вызначылі плошчу Паўстаньня, у той час як для правядзеньня масавых мерапрыемстваў, якія праводзяцца не па ініцыятыве ўлады, дазволена толькі адна пляцоўка — каля ДК Беларускага таварыства глухіх.

## 6. Адміністрацыйныя затрыманьні і пакараньні грамадзка-палітычных актывістаў

6 лістапада больш за чатыры гадзіны правёў у пастарунку Ленінскага раёну Магілёву актывіст «Маладога Фронту» Валянцін Лабачоў. Яго затрымалі людзі ў цывільным каля Палацу гімнастыкі, які адкрываў А.Лукашэнка. Пры асабістым даглядзе ў рэчах маладафронтаўца міліцыянты знайшлі паветраныя шарыкі і бел-чырвона-белыя сьцягі.

7 лістапада ў Салігорску каля помніка Леніну, дзе мелася адбыцца ўрачыстае ўскладаньне кветак, былі затрыманыя актывісты «Маладога Фронту» Іван Шыла і Андрусь Тычына. На галоўнай плошчы гораду яны разгарнулі плакат «7 лістапада — дзень памяці ахвяраў палітычных рэпрэсій». У пастарунку супрацоўнікі міліцыі склалі на затрыманых пратаколы па арт. 23.34 КаАП за арганізацыю несанкцыянаванага пікетаваньня. Між тым, па словах А. Тычыны, маладафронтаўцы прымалі ўдзел у дазволенай акцыі, хоць і прытрымліваліся іншага меркаваньня.

Уначы 12 лістапада ў Першамайскім раёне Менску за распаўсюд налепак «Сыходзь!» быў затрыманы 24-гадовы актывіст БХД Антось Котаў. У пастарунку міліцыянты склалі пратакол па ч. 2 арт. 21.14 КаАП «Парушэньне правілаў дабраўпарадкаваньня і ўтрыманьня населеных пунктаў», пасьля чаго актывіста адпусьцілі. Акцыя «Сыходзь!», ініцыяваная БХД і «Маладым фронтам», прайшла 24 лістапада на Кастрычніцкай плошчы сталіцы.

16 лістапада ў Менску быў затрыманы актывіст «Маладога Фронту» Эдуард Лобаў. Ён распаўсюджваў інфармацыйныя матэры-

ялы кампаніі «Сыходзь!», а таксама ўлёткі з заклікам прыйсьці на Кастрычніцкую плошчу 24 лістапада. У пастарунку Савецкага раёну на маладафронтаўца быў складзены адміністрацыйны пратакол паводле артыкулу 23.34 КаАП (Парушэньне парадку правядзеньня масавага мерапрыемства).

24 лістапада адміністрацыйная камісія Маскоўскага раёну Менску пакарала штрафам на 3 б.в. (105 тыс. руб.) маладафронтаўца Эдуарда Лобава, які 9 кастрычніка быў затрыманы ў Бабруйску за расклейваньне налепак на інфармацыйных шчытах каля пад'ездаў. Паводле пастановы, Э. Лобаў такім чынам парушыў правілы дабраўпарадкаваньня тэрыторыі, што з'яўляецца парушэньнем ч.2 арт.21.14 КаАП. Актывіст лічыць вынесенае рашэньне цалкам неабгрунтаваным, паколькі інфармацыйныя шчыты прадугледжаны менавіта для абвестак.

22 лістапада ў Віцебску за несанкцыянаванае пікетаваньне з заклікам да байкоту прэзідэнцкіх выбараў былі затрыманыя грамадзкі актывіст Ян Дзяржаўцаў і распаўсюднік незалежнай прэсы Барыс Хамайда. Яны выйшлі ў цэнтр гораду з плакатамі «Толькі байкот» і «Удзел у выбарчым фарсе — гэта здрада Радзіме». У пастарунку на іх склалі пратаколы і адвезьлі ў суд. Суддзя Чыгуначнага райсуду Віцебску Алена Цыганкова пакарала Я. Дзяржаўцава штрафам у памеры 10 б.в., а Б. Хамайду — 5-цю суткамі арышту, бо ён ужо неаднаразова затрымліваўся за парушэньне арт. 23.34 КаАП. Аднак арыштаваны знаходзіўся пад вартай толькі адны суткі з пяці, бо абласная пракуратура па ўласнай ініцыятыве аспрэчыла судовае рашэньне. Абласны суд, у сваю чаргу, прызнаў пакараньне, вынесенае Хамайду, неадпавядальным складу зьдзейсьненага правапарушэньня. Як адзначана ў пастанове, суд кіраваўся «прынцыпамі гуманізму і справядлівасьці», таму з улікам асобы вядомага апазіцыянера, чалавека ўжо пеньсійнага ўзросту, пяцёра сутак было заменена на адны суткі.

# 7. Сьмяротнае пакараньне

Брэстаўчанка Сьняжана Неўдах атрымала адказы з Адміністрацыі Прэзідэнта і Нацыянальнага Цэнтру заканадаўства і прававых дасьледаваньняў РБ на свой зварот ад 28 кастрычніка, у якім прасіла,

каб маці расстралянага Андрэя Жука паведамілі пра месца пахаваньня сына. У лісьце з адміністрацыі паведамляецца, што пытаньне вывучаецца ў Нацыянальным Цэнтры заканадаўства і прававых дасьледаваньняў. У другім адказе паведамляецца, што прапанова С.Неўдах аб унясеньні зьменаў у Крымінальна-выканаўчы кодэкс будзе разгледжана рабочай групай Цэнтру ў рамках падрыхтоўкі праекту Закону РБ «Аб унясеньні зьменаў і дапаўненьняў у Крымінальна-выканаўчы кодэкс РБ», распрацоўка якога прадугледжана праектам плана падрыхтоўкі законапраектаў на 2011 год.

30 лістапада актывісты кампаніі «Праваабаронцы супраць сьмяротнага пакараньня» правялі ў Менску акцыю «Гарады за жыцьцё — гарады супраць сьмяротнага пакараньня». Дзясяткі зьнічоў надвячоркам запалілі актывісты каля сьцен Чырвонага касцёлу (Сымона і Алены).

# 8. Парушэньні выбарчых правоў грамадзянаў

З 85 скаргаў на неўключэньне 413 чалавек у склад участковых выбарчых камісіяў (УВК), суды адмовілі ва ўсіх 85 выпадках, праігнараваўшы довады аб дыскрымінацыйным падыходзе выканкамаў да прадстаўнікоў апазіцыйных палітычных партыяў. Свае адмовы суды абгрунтавалі тым, што фармальныя працэдуры стварэньня УВК былі выкананыя.

Мазырскі праваабаронца Уладзімір Целяпун атрымаў адказ з ЦВК на зварот аб законнасьці рашэньня Мазырскага райвыканкаму па ўтварэньні «працоўнай групы», якая фактычна прызначыла ўсіх людзей ва ўчастковыя камісіі. Старшыня ЦВК Лідзія Ярмошына прызнала, што ня ўсе палажэньні дакументу ў поўнай меры стасуюцца з выбарчым заканадаўствам, аднак пры гэтым яна ўказала, што ў назіральніка няма права назіраць за гэтай групай.

26 лістапада 13 магілёўскіх дэмакратычных актывістаў, сярод якіх былі давераныя асобы кандыдатаў на пасаду Прэзідэнта Рыгора Кастусёва, Аляксея Міхалевіча, Уладзіміра Някляева, Яраслава Раманчука, Віталя Рымашэўскага, Андрэя Саньнікава і Дзьмітрыя Уса, а таксама

праваабаронцы Барыс Бухель і Сяргей Фамін, зьвярнуліся з заявай у Ленінскі райсуд з просьбай абавязаць выбарчую камісію Ленінскага раёну пашырыць колькасьць месцаў для вядзеньня агітацыйнай кампаніі. Старшыня Ленінскага райсуду Галіна Кужалева прыняла рашэньне адмовіць ва ўзбуджэньні грамадзянскай справы на той падставе, што падобныя справы суду не падсудныя.

# 9. Умовы ўтрыманьня ў месцах зьняволеньня

24 лістапада Праваабарончы цэнтр «Вясна» выступіў з заявай, у якой выказаў занепакоенасьць сітуацыяй з асуджаным прадпрымальнікам сябрам АГП Андрэем Бандарэнкам, які адбывае пакараньне ў бабруйскай калоніі. У заяве адзначаецца, што ў дачыненьні да А.Бандарэнкі неаднаразова ўжываўся ціск з боку адміністрацыі папраўчай установы, ёсьць інфармацыя, што яму нават пагражалі «выпадковай сьмерцю». Гэтыя факты сьведчаць аб выкарыстаньні ў дачыненьні да А. Бандарэнкі жорсткіх, бесчалавечных, прыніжаючых чалавечую годнасьць відаў абыходжаньня, якія прыраўніваюцца да катаваньняў. Праваабаронцы не выключаюць палітычнага матыву перасьледу асуджанага і патрабуюць забясьпечыць яму належныя ўмовы адбыцьця пакараньня.

# 10. Звальненьні і адлічэньні з вучобы па палітычных матывах

У лістападзе звольнілі з працы аўтара відэаролікa пра бабулін пашпарт і прэзідэнцкую выбарчую кампанію Яўгенія Шапчыца і аднаго з актораў Паўла Бандзіча. Абодвум кіраўніцтва прапанавала напісаць заявы «па згодзе бакоў». Студэнт-завочнік Акадэміі мастацтваў Я.Шапчыц працаваў інжынерам відэамантажу Белтэлерадыёкампаніі, П. Бандзіч — у Міжнародным экалагічным універсітэце імя Сахарава кіраўніком тэатральнай студыі.

Ролік «Бабуля-2010» з'явіўся на YouTube 8 лістапада. Калі колькасьць праглядаў набліжалася да 30 тысяч, відэа нечакана стала недаступным. Адміністрацыя парталу зьмясьціла тлумачэньне, што «ролік мае непрымальны зьмест». Праўда, неўзабаве ён быў зноў загружаны на YouTube. Ціск на вытворцаў аказаўся дадатковай рэкламай, і на цяперашні момант колькасьць праглядаў відэаролiку значна вырасла.

Праваабаронца з Маладэчна Алесь Капуцкі, які з'яўляецца доўгатэрміновым назіральнікам кампаніі «Праваабаронцы за свабодныя выбары», з 1 сьнежня застаўся бяз працы. Кіраўніцтва прыватнага прадпрыемства, на якім ён працаваў, нічога не патлумачыўшы, не падоўжыла з ім кантракт. Аналагічная сітуацыя з ім ужо здаралася ў 2008 годзе, калі пачыналася парламенцкая выбарчая кампанія, і А. Капуцкі быў каардынатарам доўгатэрміновых назіральнікаў у сваім рэгіёне.

# Агляд-хроніка парушэньняў правоў чалавека ў Беларусі, сьнежань 2010 году

Апошні месяц году быў важным для падвядзеньня вынікаў прэзідэнцкай кампаніі, якая цягнулася тры месяцы і павінна была скончыцца 19 сьнежня.

З нагоды Міжнароднага дня правоў чалавека 10 сьнежня па ўсёй краіне прайшлі інфармацыйныя акцыі. Фактычна ўсе яны адбыліся без інцыдэнтаў. Так, у Менску хоць і былі затрыманыя каля 15-ці з 40-ка ўдзельнікаў шэсьця, арганізаванага ініцыятывай «Грамадзянін», але ў хуткім часе ўсе яны былі вызваленыя без складаньня пратаколаў.

Падчас сумеснай акцыі Праваабарончага цэнтру «Вясна» і Беларускага Хельсінскага камітэту актывісты ў цэнтры Менску раздавалі мінакам улёткі з заклікам супраць сьмяротнага пакараньня, а таксама тэкст Усеагульнай дэкларацыі правоў чалавека.

Дзевяць кандыдатаў у прэзідэнты з 10-ці (зьвяртацца да А.Лукашэнкі ведаючы ягоную пазіцыю па гэтым пытаньні, праваабаронцы палічылі бессэнсоўным) адказалі на пытаньне праваабаронцаў: «Калі вас абяруць прэзідэнтам, якім будзе ваш першы крок (дзеяньне) па паляпшэньні сітуацыі з правамі чалавека ў Беларусі?» Адказы былі зьмешчаныя на сайце spring96.org. Варта адзначыць, што патэнцыйныя кандыдаты гатовыя былі праводзіць рэформы ў гэтым накірунку і адмяніць сьмяротнае пакараньне.

10 сьнежня Беларускі Дом правоў чалавека ў Вільні сумесна з 11 еўрапейскімі праваабарончымі і грамадзкімі арганізацыямі абʼявіў пра запуск электроннага збору подпісаў пад зваротам да дзейнага і будучага прэзідэнта Беларусі на адмысловай інтэрнэт-старонцы (belarus-petition.org). Петыцыя зьмяшчае заклік да атрыманьня Беларусьсю правоў, якія зʼяўляюцца базавым падмуркам функцыянаваньня сучаснага грамадзтва. У прыватнасьці, у звароце пералічваюцца такія рэкамендацыі, як увядзеньне мараторыя і скасаваньне сьмяротнай кары; захаваньне права ўсіх беларускіх грамадзянаў на свабоду слова, сходаў, абʼяднаньняў, СМІ і веравызнаньня; скасаваньне артыку-

лу 193.1 КК, які прадугледжвае турэмнае зьняволеньне за дзейнасьць ад імя незарэгістраванай арганізацыі. Беларускія праваабаронцы ў сваю чаргу заклікалі падтрымаць і распаўсюдзіць петыцыю.

18 сьнежня прадстаўнікі сямі праваабарончых арганізацыяў Беларусі распаўсюдзілі зварот з заклікам да Адміністрацыі Прэзідэнта, Міністэрства ўнутраных справаў і Камітэту дзяржбясьпекі РБ не нагнятаць атмасьферу страху ў грамадзтве ў перыяд выбарчай кампаніі і не ўжываць гвалт у адносінах да мірных дэманстрантаў. Праваабаронцы ў сваім звароце адзначылі, што ўладам варта сур'ёзна прааналізаваць прычыны такога незвычайнага і неардынарнага кроку з боку большасьці кандыдатаў у прэзідэнты і неадкладна ўнесьці дэмакратычныя зьмены ў выбарчае заканадаўства, якія зрабілі б выбарчы працэс больш справядлівым і празрыстым.

Заклік кандыдатаў на знак пратэсту супраць няроўных умоваў правядзеньня выбарчай кампаніі, адсутнасьці дэмакратычнага выбарчага працэсу, сабрацца на Кастрычніцкай плошчы Менску пасьля завяршэньня галасаваньня — у 20 гадзінаў 19 сьнежня, прававабаронцы лічылі правамоцным, паколькі права вольна выказваць сваю думку шляхам сходаў, мітынгаў, дэманстрацыяў гарантавана беларускім грамадзянам Канстытуцыяй краіны, а таксама міжнароднымі пагадненьнямі, падпісанымі Беларусьсю. Аднак за тыдзень да мітынгу дзяржаўныя СМІ, а таксама кіраўнікі МУС і КДБ папярэджвалі аб рыхтуючыхся апазіцыяй правакацыях, тэрарыстычных акцыях, ужываньні зброі пры правядзеньні масавага мерапрыемства. Выступаючы 15 сьнежня на нарадзе па пытаньнях прэзідэнцкай кампаніі і забесьпячэньні грамадзкай бясьпекі ў гэты перыяд, А. Лукашэнка з аднаго боку паведаміў, што «прэзідэнцкія выбары не павінны быць азмрочаныя якімісьці сутычкамі і сутыкненьнямі», з другога боку, заявіў: «Ня дай бог, толькі пераступіць хтосьці той Рубікон, да якога наогул нельга блізка падыходзіць ... Рэакцыя праваахоўных органаў, ды і вайскоўцаў, павінна быць адэкватнай і жорсткай.»

Калі Кастрычніцкая плошча 19 сьнежня будзе занята войскамі, бронетэхнікай і міліцыяй, то кідаць людзей на «танкі» кандыдаты ў прэзідэнты ня будуць. Пра гэта заявіў Уладзімір Някляеў падчас сумеснай прэс-канферэнцыі з Андрэем Саньнікавым у адказ на пытаньне пра іх план дзеяньняў у такім выпадку. «Але мы будзем лічыць гэтыя дзеяньні сілавым, ваенным супрацьстаяньнем волі народу. Гэта мы будзем заяўляць і дэманстраваць».

Удзень 19 сьнежня прадстаўнікі грамадзянскай ініцыятывы «Праваабаронцы за свабодныя выбары» правялі прэс-канферэнцыю, на якой агучылі папярэднія высновы назіраньня за ходаю датэрміновага галасаваньня, а таксама адзначылі праблемы, зафіксаваныя на выбарчых участках. Каардынатары назіраньня Алег Гулак і Валянцін Стэфановіч канстатавалі: невялікая палёгка ў плане дэмакратыі ёсьць, але ў цэлым выбарчы працэс выклікае недавер. Сярод станоўчых момантаў — адсутнасьць масавых прэвэнтыўных затрыманьняў і арыштаў прадстаўнікоў апазіцыі падчас правядзеньня прэзідэнцкай кампаніі, хоць на сярэдзіну дня 19.12 стала вядома амаль аб трох дзясятках затрыманых па Беларусі (большасьць з іх адпусьцілі пасьля высьвятленьня асобы і папярэджаньня аб недапушчальнасьці ўдзелу ў мітынгу, аднак некалькі чалавек засталіся пад вартай у якасьці падазраваных па крымінальных справах). У той жа час непрапісанасьць працэдуры захоўваньня бюлетэняў падчас датэрміновага галасаваньня дазваляла ўчастковым камісіям па-рознаму трактаваць закон, што прыводзіла да розных практычных дзеяньняў. «Няма пэўнай нормы ў заканадаўстве і пра месцазнаходжаньне сябраў камісій падчас перапынку ў іх працы і пасьля галасаваньня. А паколькі, згодна з артыкулам 13 Выбарчага кодэксу, назіральнікі маюць права назіраць за выбарчым працэсам толькі падчас галасаваньня, то яны ня бачаць, што адбываецца ў перапынках і пасьля заканчэньня волевыяўленьня грамадзянаў, — адзначылі праваабаронцы. Акрамя таго, назіралася тэндэнцыя росту прымусу да датэрміновага галасаваньня на дзяржпрадпрыемствах, асабліва ў малых гарадах, што зьяўляецца адкрытым выкарыстаньнем адміністрацыйнага рэсурсу. Таксама мелі месца папярэджаньні назіральнікам, ціск на іх альбо выдаленьне з участкаў. Частка назіральнікаў казала пра перашкоды пры намеры прысутнічаць пры галасаваньні на даму. Па меркаваньні ўдзельнікаў праваабарончага маніторынгу, асноўныя праблемы былі як на ўчастках, так і ў агульнай атмасьферы стаўленьня да выбараў.

Нягледзячы на тое, што сама прэзідэнцкая кампанія праходзіла ў адносна ліберальных умовах і ў лепшы бок адрозьнівалася ад папярэдніх, пасьлявыбарчыя падзеі, а менавіта вечар асноўнага дня галасаваньня, падчас якога адбыўся жорсткі разгон мірнай акцыі пратэсту ў цэнтры сталіцы, на Плошчы Незалежнасьці каля Дому Ураду, перакрэсьлілі ўсе ранейшыя набыткі, што адзначаліся ў адносінах

паміж Беларусьсю і Захадам (Еўрасаюзам). Кіраўніцтва краіны вярнулася да жорсткага перасьледу апанентаў і зьнішчэньня тых парасткаў дэмакратыі, якія існавалі ў грамадзтве. Рэпрэсіўная машына пасьля двухгадовага перапынку запрацавала з новай сілай, і пад яе колы трапілі сотні людзей. Затрыманьні, арышты,ператрусы, допыты, зьбіцьцё, адміністрацыйны і крымінальны перасьлед выклікаў шок таксама і ў міжнароднай супольнасьці.

Увечары 19 сьнежня ў раёне Нямігі па дарозе на Кастрычніцкую плошчу адбыўся ўзброены напад сілавікоў у масках на групу кандыдата ў прэзідэнты У.Някляева. Былі выкарыстаны сьвета-шумавыя гранаты, канфіскавана гукаўзмацняльная апаратура. Пры гэтым сам кандыдат быў моцна зьбіты, пасьля чаго дастаўлены ў шпіталь хуткай дапамогі з дыягназам чэрапна-мазгавая траўма сярэдняй ступені цяжкасьці.

У 20.00 ад 20-ці да 40 тысяч удзельнікаў мірнай акцыі пратэсту прайшлі ад Кастрычніцкай плошчы ў Менску ў бок плошчы Незалежнасці да Дому Ураду. Кандыдаты ў прэзідэнты правялі мітынг. Невядомымі асобамі падчас мітынгу была ўчынена спроба выламаць дзверы ў будынку Дому Ураду, было разьбітае шкло. Гэта дазволіла сьпецназаўцам у шлёмах са шчытамі і дубінкамі выкарыстаць празьмерную сілу і жорсткасьць дзеля разгону мірных дэманстрантаў. Удзельнікаў акцыі зьбівалі, наносячы ўдары па галаве і твары. Шмат удзельнікаў акцыі шпіталізавана, больш за 600 чалавек было затрымана і пазьней асуджана да адміністрацыйнага арышту альбо штрафу па арт. 23.34 КаАП — парушэньне правілаў парадку і арганізацыі масавага мерапрыемства.

У ліку затрыманых аказаліся кандыдаты ў прэзідэнты А. Саньнікаў, Р. Костусеў, В. Рымашэўскі, М. Статкевіч, іх давераныя асобы, палітыкі, журналісты, вядомыя грамадзкія дзеячы, а таксама старшыня БХК, адзін з каардынатараў кампаніі «Праваабаронцы за свабодныя выбары» Алег Гулак.

Уначы офіс ПЦ «Вясна», арганізацыі, якая разам з іншымі беларускімі праваабаронцамі праводзіла кампанію па маніторынгу выбараў, падвергся нападу з боку міліцыі, у выніку чаго былі затрыманыя 10 праваабаронцаў. У затрыманых былі ўзятыя тлумачэньні і праз тры з паловай гадзіны яны былі адпушчаныя. Тым ня менш, з офісу ПЦ «Вясна» была канфіскаваная ўся кампутарная тэхніка,

іншыя носьбіты інфармацыі, відэакамера і фотаздымач. Таксама ўначы быў праведзеныператрус на офісе «Хартыі'97», затрыманая рэдактарка сайту Натальля Радзіна з іншымі журналістамі. Усю ноч адбываліся затрыманьні ў кватэрах лідэраў апазіцыі. Дома быў затрыманы старшыня партыі АГП Анатоль Лябедзька. Уначы У. Някляева выкралі са шпіталю, зачыніўшы ягоную жонку ў суседнім пакоі. Да 27 сьнежня лёс У.Някляева быў невядомы: казалі, што ён знаходзіцца ў СІЗА КДБ, але адвакатам адмаўлялі ў спатканьні нібыта дзеля недахопу вольных памяшканьняў. Некалькі гадзінаў уначы 20 сьнежня Я.Раманчук правёў у адміністрацыі прэзідэнта, пасьля чаго нараніцу склікаў тэрміновую прэс-канферэнцыю, на якой перад камерамі дзяржаўных тэлеканалаў зачытаў зварот з асуджэньнем масавых беспарадкаў.

У 12 гадзінаў адбылася запланаваная выніковая прэс-канферэнцыя па выніках маніторынгу кампаніі «Праваабаронцы за свабодныя выбары». «Брудныя выбары» будзе самай дакладнай ацэнкай гэтых выбараў», — адзначыў В. Стэфановіч.

У сваю чаргу міністр унутраных справаў Анатоль Куляшоў заявіў у эфіры Першага нацыянальнага каналу, што арганізатары акцыі пратэсту апазіцыі будуць прыцягнутыя да крымінальнай адказнасьці па артыкуле 293 КК (масавыя беспарадкі). Яе максімальная санкцыя — 15 гадоў пазбаўленьня волі.

На той момант ужо было вядома, што затрыманыя сотні людзей, што частку з іх трымаюць у аўтазаках бяз ежы і вады, што сярод зьбітых ёсьць жанчыны і дзяўчаты. Праваабаронцы, валанцёры ў вялікай колькасьці зьбіралі зьвесткі аб затрыманых, дзяжурылі ў судах, каб інфармацыя пра затрыманых магла дайсьці да сваякоў, родных. Усе працэсы праходзілі ў закрытым рэжыме, фактычна без адвакатаў, на разгляд справы адводзілася некалькі хвілінаў, прысуд выносіўся ў выглядзе арышту. Штрафы давалі як выключэньне жанчынам, якія маюць непаўнагадовых дзяцей, ці інвалідам. Акрамя таго, сярод затрыманых сустракаліся выпадковыя мінакі, якія ня бралі ўдзел у акцыі пратэсту, але судовы канвеер працаваў без разбору.

21 сьнежня ўлады назвалі лічбу затрыманых — 639, але і яна не была дакладнай. З улікам адпушчаных, дастаўленых у медустановы і зьмешчаных у СІЗА па крымінальных справах, колькасьць перавышала 700 чалавек. Цэнтр ізаляцыі правапарушальнікаў ня мог зьмясьціць

столькі арыштаваных, таму 239 чалавек, па інфармацыі праваахоўных органаў, былі перавезеныя ў Жодзіна, у турму № 8, больш за 50 затрыманых жаночага полу перавялі ў ІЧУ Мінскага раёну.

Дзясяткі еўрапейскіх арганізацыяў асудзілі дзеяньні беларускіх уладаў. 20 сьнежня адкрыты зварот да прэзідэнта Беларусі з заклікам вызваліць сотні дэманстрантаў, журналістаў, палітыкаў, затрыманых за мірнае выражэньне сваёй думкі падпісалі арганізацыі Сеткі Дамоў правоў чалавека. Са зваротамі выступілі праваабарончая арганізацыя «Міжнародная амністыя», Міжнародная федэрацыя правоў чалавека (FIDH), Міжнародная федэрацыя журналістаў, Праваабарончая арганізацыя Freedom House, старшыня Еўрапарламенту Ежы Бузек, урады краінаў ЗША і Еўрасаюзу.

У Менску пачаў працу Камітэт міжнароднага кантролю за сітуацыяй з правамі чалавека ў Беларусі. Утварыць яго пастанавіла кааліцыя няўрадавых арганізацый краін АБСЕ 27 сьнежня. У Камітэт увайшлі каля 30 міжнародных арганізацый, сярод іх: Міжнародная грамадзянская ініцыятыва для АБСЕ (ICI OSCE), Маскоўская Хельсінская група — МХГ (Расія), Міжнародная сетка «Свабода, законнасьць і правы ў Еўропе» (FLARE), Міжнародны моладзевы праваабарончы рух (МПД). Для працы на тэрыторыі Рэспублікі Беларусь Камітэт сфармаваў доўгатэрміновую Міжнародную назіральную місію, куды ўваходзяць супрацоўнікі праваабарончых арганізацый з розных краін прасторы АБСЕ, міжнародных арганізацый, а таксама незалежныя эксперты. Каб захаваць нейтралітэт місіі ў адносінах да палітычнай сітуацыі, у склад Камітэту не ўваходзяць беларускія арганізацыі.

# 1. Парушэньне права на свабоду асацыяцыяў

Праект Закону «Аб некамерцыйных арганізацыях», які распрацоўваецца Міністэрствам юстыцыі і Цэнтрам заканадаўства і прававых дасьледаваньняў, ня ўлічвае пазіцыю беларускіх грамадзкіх аб'яднаньняў. З такой заявай выступіла Асамблея НДА. Грамадзкі сектар насьцярожвае тое, што тэкст законапраекту, хоць і знаходзіцца на фінальнай стадыі распрацоўкі, дагэтуль ня быў прадстаўлены на аб-

меркаваньне грамадзкасьці, гаворыцца ў заяве. «Працэс распрацоўкі Закону «Аб некамерцыйных арганізацыях» Мінюстам падобны да арганізацыі грамадзкіх слуханьняў у Астраўцы адносна будаўніцтва АЭС. Тады фармальна быццам бы адбыліся грамадзкія слуханьні, а фактычна тыя арганізацыі, якія хацелі паўдзельнічаць і валодалі інфармацыяй, былі адштурхнутыя. Падобнае спрабуюць зрабіць і зараз, лічыць старшыня Рабочай групы Асамблеі НДА Сяргей Мацкевіч. Таму Асамблея заклікала адказныя дзяржаўныя органы адкласьці перадачу законапраекту ў Палату прадстаўнікоў да правядзеньня шырокага грамадзкага абмеркаваньня.

## 2. Палітычна матываваныя крымінальныя справы

27-гадовага інжынера-электроншчыка Ігара Аліневіча затрымалі 28 лістапада ў Маскве і на наступны дзень зьмясьцілі ў турму КДБ «амерыканку». Затрыманьне адбывалася пры незвычайных абставінах. Паводле адваката, І.Аліневіча абвінавачваюць у датычнасьці да нападу на амбасаду Расіі ў Менску 30 жніўня і ў акцыі каля Генштабу, якую год таму ў Менску правялі прыхільнікі анархізму. Затрыманы сваю датычнасьць да нападаў раней адмаўляў. Таксама па справе выбухаў, у якую аб'яднаныя некалькі розных эпізодаў (напад на амбасаду Расіі, менскі ізалятар на Акрэсьціна, будынкі казіно «Шангры-Ла», філіял Беларусбанку, Палац прафсаюзаў, Генштаб ды іншыя інцыдэнты), знаходзяцца за кратамі Аляксандр Францкевіч, Мікалай Дзядок і Максім Веткін.

18 сьнежня ў Менску прэвентыўна былі затрыманыя маладафронтаўцы Зьміцер Дашкевіч, Эдуард Лобаў і Дзяніс Лазар па падазрэньні ў зьдзяйсьненьні хуліганскіх дзеяньняў у адпаведнасьці з узбуджанай крымінальнай справай па ч. 3 арт.339 КК РБ. Па версіі сьледзтва, з хуліганскіх меркаваньняў яны беспадстаўна і наўмысна, кулакамі і металічным абцугамі зьбілі двух грамадзянаў. 28 сьнежня Дзяніс Лазар быў адпушчаны на свабоду, і ўсе падазрэньні з яго зьнятыя, справа ў дачыненьні да яго спынена, а З.Дашкевічу і Э.Лобаву было прад'яўлена абвінавачаньне ў зьдзяйсьненьні злачынства, утрыманьне пад вартай працягнута на 2 месяцы.

Інфармацыя праваабаронцаў па сітуацыі з крымінальным перасьледам, зьвязаным з прэзідэнцкай выбарчай кампаніяй (па стану на 31 сьнежня): па справе аб масавых беспарадках — ч. 1, ч.2 арт. 293 КК РБ праходзяць 29 чалавек, 27 з іх утрымліваюцца ў сьледчым ізалятары КДБ. Сярод абвінавачаных — пяцёра кандыдатаў у прэзідэнты Уладзімір Някляеў, Андрэй Саньнікаў, Мікалай Статкевіч, Віталь Рымашэўскі, Алесь Міхалевіч. Яшчэ двое — Р. Кастусёў і Дз. Ус — у ліку падазраваных і пад падпіскай аб нявыезьдзе. Сярод астатніх даверанныя асобы, кіраўнікі штабоў, актывісты: Лябедзька Анатоль, Корбан Алег, Паўлаў Анатоль, Севярынец Павал, Атрошчанкаў Аляксандр, Бандарэнка Зьміцер, Кобец Уладзімір, Халіп Ірына, Радзіна Натальля, Палажанка Анастасія, Дзьмітрыеў Андрэй, Фядута Аляксандр, Вазьняк Сяргей, Арастовіч Аляксандр, Марцалеў Сяргей, Класкоўскі Аляксандр, Новік Дзьмітрый, Ліхавід Мікіта, Федаркевіч Андрэй, Лобан Уладзімір, а таксама грамадзяне Расіі Гапонаў Іван і Брэус Арцём.

Сваякі арыштаваных па крымінальнай справе аб падзеях 19 сьнежня ў Менску стварылі грамадзкі камітэт «Вызваленьне», у які ўвайшлі жонкі, бацькі і дзеці зьняволеных кандыдатаў і іх паплечнікаў. Яны накіравалі ліст кіраўніцтву Расіі, Еўрсаюзу і ЗША з заклікам зрабіць усё магчымае для вызваленьня новых беларускіх палітвязьняў.

Па зьвестках праваабаронцаў, па падзеях 19 сьнежня ўзбуджана яшчэ адна крымінальная справа — за зьнявагу дзяржаўных сімвалаў. Пакуль па гэтай справе няма падазраваных, але супрацоўнікі міліцыі актыўна шукаюць фота і відэадоказы, на якіх зафіксавана, хто падчас шэсьця па прасьпекце Незалежнасьці замяніў на будынку КДБ дзяржаўны сьцяг на забаронены нацыянальны бел-чырвона-белы штандар.

## 3. Парушэньне прынцыпу свабоды слова і распаўсюду інфармацыі

У сьнежні пачалася падпісная кампанія на перыядычныя выданьні. Ідэалагічныя аддзелы райвыканкамаў праводзяць прымусовую падпіску на дзяржаўную прэсу, кіраўнікам прадпрыемстваў, арганізацыяў і ўстановаў даводзяцца планы з указаньнем канкрэт-

ных лічбаў абавязковай падпіскі на друкаваныя СМІ. Таксама была даведзеная норма падпіскі грамадзянаў і да паштальёнаў.

Па паведамленьні прэс-службы БАЖ, яшчэ аднаму замежнаму карэспандэнту адмовілі ў акрэдытацыі. Спроба атрымаць акрэдытацыю для асьвятленьня прэзідэнцкіх выбараў скончылася нічым для вядомага шведзкага фотакарэспандэнта Дзіна Кокса (Dean CK Cox). На пытаньне, ці можна яму прыехаць у Беларусь у якасьці турыста, у беларускай амбасадзе адказалі адмоўна — маўляў, візы яму ўсё роўна не дадуць, бо ведаюць, што ён журналіст. Дзін Кокс наведваў Беларусь у часе выбараў 2006 году, прыязджаў і летась. Раней праблем з атрыманьнем візы ў яго не паўставала.

БАЖ апублікавала сьпісы затрыманых ( з улікам адпушчаных па стане на 22.12) і пацярпелых журналістаў і сябраў арганізацыі. Былі арыштаваныя — 15, пяцёра з іх — па крымінальнай справе. Гэта Ірына Халіп, «Новая газета» (Расія), Натальля Радзіна, рэдактар «Хартыі-97», Сяргей Вазьняк, рэдактар газеты «Товарищ», сябра Праўленьня БАЖ, Аляксандр Фядута, Павал Севярынец, сябра Рады «БАЖ» . Пацярпелі фізічна, але не былі затрыманыя 21 журналіст, сярод якіх замежнікі Джэймс Хіл («The New York Times»), афіцыйна акрэдытаваны пры МЗС, Гайнц Цэзарэк, фотакарэспандэнт аўстрыйскага інтэрнэт-выданьня news.at, Антон Харчанка і Віктар Філяеў (тэлеканал «Russia Today»), Дзьмітрый Тархаў і Ільля Амельчанка (здымачная група REN-TV), Вольга Аленава («Коммерсантъ»)

# 4. Парушэньне права на свабоду мірных сходаў

Менгарвыканкам не дазволіў групе жанчын правесьці пікет супраць парушэньняў чыноўнікамі правоў грамадзянаў. Па словах заяўніка акцыі юрыста Тамары Сяргей, пікетаваньне з удзелам каля 50 прадстаўнікоў з усіх рэгіёнаў Беларусі было запланавана ўдзень на 6 сьнежня каля будынку ратушы на плошчы Свабоды. Адмову ў правядзеньні масавага мерапрыемства намесьнік старшыні Менгарвыканкаму Міхаіл Ціцянкоў матываваў тым, што акцыя «будзе ствараць перашкоды пешаходнаму руху; транспартнаму руху, а таксама

функцыянаваньню суб’ектаў гаспадараньня, разьмешчаных паблізу». На думку Т. Сяргей, забарона пікету парушае артыкул 35 Канстытуцыі РБ і Закон аб масавых мерапрыемствах, таму група жанчын зьвярнулася ў Генеральную пракуратуру аб прыцягненьні да адказнасьці М. Ціцянкова.

# 5. Адміністрацыйныя затрыманьні і пакараньні грамадзка-палітычных актывістаў

8 сьнежня ў Менску супрацоўнікі ДАІ затрымалі аўтамабіль, якім кіраваў лідэр «Маладога Фронту» З.Дашкевіч. У Першамайскім РУУС паведамілі, што ягонае прозьвішча адсутнічае ў электроннай базе кіроўцаў і ягоныя правы кіроўцы падробленыя. Пытаньне было вырашана пасьля таго, як у пастарунак прыехалі назіральнікі АБСЕ. З.Дашкевіча адпусьцілі, але яго аўтамабіль пакінулі дзеля праверкі, ці не знаходзіцца ён ва ўгоне. На наступны дзень міліцыянты зноў затрымалі З. Дашкевіча, які разам з паплечнікамі ехаў на машыне бацькі намесьніцы старшыні МФ Насты Палажанкі. Усіх даставілі ў Кастрычніцкі РУУС дзеля высьвятленьня на прадмет угона машыны, дзе ўзялі тлумачэньні і адпусьцілі.

9 сьнежня суддзя Крупскага райсуду Вольга Фома прызнала вядомага беларускага мастака Алеся Пушкіна віноўным адразу па двух артыкулах адміністрацыйнага кодэксу — дробнае хуліганства (нецэнзурная лаянка) і супраціў міліцыянтам і вынесла пакараньне ў выглядзе арышту тэрмінам на 13 сутак. А. Пушкін быў затрыманы напярэдадні ў сваёй хаце ў мястэчку Бобр Крупскага раёну па ілжывым абвінавачаньні: нібыта ён зьбіў чалавека. Адвакат Павел Сапелка лічыць, што адміністрацыйныя справы супраць мастака сфабрыкаваныя. Такую думку выказалі і калегі А. Пушкіна — сябры творчай суполкі «Пагоня» Беларускага саюзу мастакоў. Яны прынялі заяву пратэсту супраць неправамерных дзеяньняў уладаў, у якой зазначаецца, што «дзеяньні сілавых структур, сэксотаў, у выпадку арышту мастака, якраз накіраваныя на зачыстку тэрыторыі перад прэзідэнцкімі выбарамі. Ведаючы вольналюбівую натуру твор-

цы, які наладжваў мастацкія перформансы супраць ціску і фальшу ўладаў, іхняга гаспадарчага бязьдзеяньня, а перадусім — глухаты да гістарычнай мінуўшчыны, варожасьці да беларускай мовы, ім якраз спатрэбілася такая правакацыя».

17 сьнежня на гарадзенскім чыгуначным вакзале быў затрыманы актывіст выбарчага штабу У.Някляева Кірыл Семянчук. На наступны дзень ён быў асуджаны на 6 сутак адміністрацыйнага арышту. Ніякай дадатковай інфармацыі ягонай жонцы не паведамілі. Раніцай 19 сьнежня таксама быў затрыманы і асуджаны на 3 сутак арышту Алег Калянкоў, давераная асоба У.Някляева. Як высьветлілася пазьней, абодвух пакаралі за ўдзел у пікеце супраць датэрміновага галасаваньня, зладжаны каля Гарадзенскага аграрнага ўніверсітэту.

18 сьнежня ў Гомелі быў затрыманы кіраўнік абласнога штабу і давераная асоба В.Рымашэўскага Юры Клімовіч. Суддзя Цэнтральнага райсуду Марына Дамненка на падставе ілжывых сьведчаньняў прызнала яго віноўным у дробных хуліганстве (нецэнзурная лаянка) і пакарала адміністрацыйным арыштам тэрмінам на 15 сутак.

# 6. Сьмяротнае пакараньне

6 сьнежня Камітэт па правах чалавека ААН зарэгістраваў індывідуальнае паведамленьне Алега Грышкаўцова, які 14 траўня 2010 году быў асуджаны да сьмяротнага пакараньня. Ён скардзіцца на парушэньне правоў, прадугледжаных міжнародным Пактам аб грамадзянскіх і палітычных правах, найперш — права на справядлівае судовае разьбіральніцтва. У паведамленьні таксама ўтрымліваецца просьба прымяніць меры часовай абароны і не прыводзіць прысуд у выкананьне, пакуль справа ня будзе ўсебакова разгледжаная ў КПЧ.

13 сьнежня А.Грышкаўцоў зьвярнуўся да А.Лукашэнкі з прашэньнем прыпыніць выкананьне сьмяротнага прысуду да разгляду ў КПЧ яго індывідуальнага паведамленьня. Ліст асуджанага праз адвакатаў быў перададзены ў Адміністрацыю Прэзідэнта. Да гэтай меры А.Грышкаўцоў быў вымушаны прыбегчы, паколькі раней, нягледзячы на інфармаваньне кампетэнтных органаў Беларусі пры разглядзе ў КПЧ ААН аналагічных скаргаў асуджаных да вышэйшай ме-

ры пакараньня А.Жука і В. Юзэпчука, апошнія былі расстраляныя напрыканцы сакавіка 2010 году.

## 7. Умовы ўтрыманьня ў месцах зьняволеньня

Галоўная праблема з пратэзаваньнем зубоў палітычнага зьняволенага Мікалая Аўтуховіча застаецца нявырашанай, вязень працягвае страчваць вагу. Адміністрацыя калоніі дамагаецца, каб М. Аўтуховіч прызнаў сябе вінаватым і падпісаў расьпіску аб правапаслухмяных паводзінах і ўдзельнічаў у мастацкай самадзейнасьці. Адмова лічыцца парушэньнем парадкаў. Таксама зьняволены перадаў, што ў дачыненьні да яго чыняць розныя правакацыі. Праваабаронцы лічаць, што Дэпартамент выкананьня пакараньняў парушае правы незаконна асуджанага.

## 8. Звальненьні і адлічэньні з вучобы па палітычных матывах

Сябру ГА «БАЖ» і пазаштатнаму карэспандэнту «БелГазеты» Дзьмітрыю Растаеву, якога рэдакцыя газеты «Вечерний Бобруйск» накіравала ў вымушаны адпачынак, было прапанавана напісаць заяву на звальненьне «па ўласным жаданьні». Журналіст не пагадзіўся з такой фармулёўкай і пазначыў, што звальняецца «ў сувязі са зьменай істотных умоваў працы». Нагадаем, што ў адпачынак журналіста адправіла кіраўніцтва выданьня пасьля візіту заснавальніка газеты Валянціна Сысоя да намесьніка старшыні бабруйскага гарвыканкаму Міхаіла Кавалевіча, адказнага за «ідэалагічны накірунак».

Пасьля першага звальненьня Яўгена Шапчыца — рэжысёра сатырычнага відэароліка пра прэзідэнцкую выбарчую кампанію, звольнілі і Паўла Бандзіча, выканаўцу ролі зборшчыка подпісаў, які меў бестэрміновы кантракт з Міжнародным экалагічным унівэрсітэтам імя Сахарава ў якасьці кіраўніка тэатральнай студыі. П. Бандзіча ветліва папрасілі сысьці па ўласным жаданьні.

Выканаўца ролі «ўнука» Алега А., студэнта 5-га курсуфакультэту журналістыкі бюджэтнага аддзяленьня БДУ таксама адлічылі з унівэрсітэту.

Праваабаронца з Маладэчна Алесь Капуцкі, доўгатэрміновы назіральнік кампаніі «Праваабаронцы за свабодныя выбары», з 1 сьнежня застаўся бяз працы. Кіраўніцтва прыватнага прадпрыемства, на якім ён працаваў, нічога не патлумачыўшы, не працягнула з ім кантракт. Аналагічная сітуацыя з праваабаронцам ужо здаралася ў 2008 годзе, калі пачыналася парламенцкая выбарчая кампанія, і А.Капуцкі быў назіральнікам у сваім рэгіёне.

# 9. Парушэньні права на свабоду перасоўваньня

Амбасада Беларусі ў Стакгольме адмовіла ў візе старшыні праваабарончай арганізацыі Östgruppen Марціну Угла. Па меркаваньні М.Углы, адмова ў візе — гэта, відавочна, пакараньне за тую крытыку, якую ён дазваляе сабе на адрас беларускіх уладаў у сувязі са станам правоў чалавека ў Беларусі. Цяперашняя адмова — ужо чацьвёртая запар. Марціну Углу не дазваляюць наведаць Беларусь ад чэрвеня 2006 году.

Таксама беларускія ўлады адмовілі ў візе старшыні Нарвежскага Хельсінкскага камітэту Бёрну Энгесланду (*Bjorn Engesland).* Як паведаміў сп. Энгесланд, Беларуская амбасада ў Стакгольме вярнула яму пашпарт са штампам з забаронай на ўезд — без тлумачэньня прычынаў. Старшыня Праваабарончага цэнтру «Вясна» Алесь Бяляцкі лічыць, што адмова ў візе замежнаму праваабаронцу наўпрост зьвязаная з прэзідэнцкімі выбарамі ў Беларусі.

# Дадаткі

## 1. Заявы ПЦ «Вясна

### Праваабарончы цэнтр «Вясна» патрабуе спыненьня крымінальнай справы супраць Івана Міхайлава

Права грамадзянаў на альтэрнатыўную службу вынікае з арт. 57 Канстытуцыі Рэспублікі Беларусь. Дадзеным артыкулам Асноўнага Закону краіны прадугледжана, што абарона Рэспублікі Беларусь зьяўляецца абавязкам і сьвяшчэнным доўгам яе грамадзяніна. Парадак праходжаньня вайсковай службы, падставы і ўмовы яе замены на альтэрнатыўную службу вызначаюцца законам.

Такім чынам, Канстытуцыя не разглядае вайсковую службу ў якасьці адзінай і безумоўнай, паколькі прадугледжвае магчымасьць вызваленьня ад вайсковай службы альбо замену яе на альтэрнатыўную.

Адпаведна, Канстытуцыя прадугледжвае права грамадзяніна на выкананьне свайго абавязку і сьвяшчэннага доўгу па абароне Радзімы ў формах, прадугледжаных Асноўным Законам, у тым ліку і шляхам праходжаньня альтэрнатыўнай службы.

У адпаведнасьці з арт. 4 Закону Рэспублікі Беларусь ад 15 сакавіка 1994 г. «Аб парадку ўступленьня ў сілу Канстытуцыі Рэспублікі Беларусь» законы, указаныя ў Канстытуцыі, неабходна было прыняць на працягу двух гадоў пасьля ўступленьня яе ў сілу, гэта значыць да 30 сакавіка 1996 г.

Аднак, ні Вярхоўны Савет 12 скліканьня, ні Вярхоўны Савет 13 скліканьня ня выканалі гэтага патрабаваньня і ня вырашылі пытаньні аб падставах і ўмовах замены вайсковай службы альтэрнатыўнай і парадку яе праходжаньня шляхам прыняцьця сьпецыяльнага закону.

Пры гэтым, трэба адзначыць, што арт. 57 Канстытуцыі захаваўся ў першаснай рэдакцыі Канстытуцыі Рэспублікі Беларусь 1994 г. і пасьля прынятых на рэферэндумах 1996 г.і 2004 г. зьменаў у Канстытуцыю. Ніякіх нормаў, якія дазвалялі б парламенту адтэрмінаваць на заканадаўчым узроўні рэалізацыю арт. 57 Канстытуцыі ў частцы заме-

ны праходжаньня вайсковай службы альтэрнатыўнай, у Канстытуцыі няма. Нягледзячы на гэта, Нацыянальны сход Рэспублікі Беларусь дагэтуль не прыняў Закону, скіраванага на рэалізацыю дадзенага артыкулу Канстытуцыі.

Адмаўленьне праходжаньня вайсковай службы па матывах сумленьня (рэлігійных і іншых пераканьнях) закранае іншыя правы асобы, гарантаваныя Канстытуцыяй Беларусі і міжнароднымі нормамі ў галіне правоў чалавека, ратыфікаванымі краінай.

Так, у адпаведнасьці з арт. 31 Канстытуцыі Беларусі кожны мае права самастойна вызначаць сваё стаўленьне да рэлігіі, адзінаасобна ці сумесна з іншымі спавядаць любую рэлігію ці не спавядаць ніякай, выражаць ці распаўсюджваць свае перакананьні, зьвязаныя з адносінамі да рэлігіі, удзельнічаць у адпраўленьні рэлігійных культаў, рытуалаў, абрадаў, не забароненых законам.

Гэтыя правы гарантаваныя і нормамі міжнароднага права, прыярытэт якіх прызнае Рэспубліка Беларусь — Усеагульнай дэкларацыяй правоў чалавека і Міжнародным пактам аб грамадзянскіх і палітычных правах.

Права кожнага на адмову ад вайсковай службы па перакананьнях сумленьня было прызнана і Саветам па правах чалавека ААН.

Такое права грамадзянаў Беларусі было прызнана і ў Беларусі. У Рашэньні Канстытуцыйнага Суду Рэспублікі Беларусь ад 26 траўня 2000 г. «Аб некаторых пытаньнях рэалізацыі артыкулу 57 Канстытуцыі Рэспублікі Беларусь» гаворыцца:

1. Адзначыць, што грамадзяне Рэспублікі Беларусь у адпаведнасьці з Канстытуцыяй маюць права, у прыватнасьці, па рэлігійных перакананьнях на замену вайсковай службы альтэрнатыўнай, якое павінна быць забясьпечана дзейсным механізмам яго рэалізацыі. У сувязі з гэтым лічыць неадкладным прыняцьце закону аб альтэрнатыўнай службе ці ўнясеньні неабходных зьменаў і дапаўненьняў у Закон «Аб усеагульным вайсковым абавязку і вайсковай службе» з мэтай вызначэньня механізму рэалізацыі права на альтэрнатыўную службу. На перыяд да рашэньня на заканадаўчым узроўні пытаньняў аб падставах і ўмовах замены вайсковай службы альтэрнатыўнай і парадку яе праходжаньня згадзіцца, з улікам выключнасьці абставінаў, з практыкай стварэньня кампетэнтнымі дзяржаўнымі органамі ў адпаведнасьці з арт. 31, 57, 59 і іншымі артыкуламі Канстытуцыі ўмоваў для выка-

ваньня грамадзянамі Рэспублікі Беларусь ускладзеных на іх абавязкаў па абароне Рэспублікі Беларусь у тых формах, якія не парушаюць іх рэлігійных перакананьняў.

2. Пры вырашэньні кампетэнтнымі дзяржаўнымі органамі пытаньняў аб адказнасьці за ўхіленьне ад праходжаньня вайсковай службы неабходна вызначаць, у якой ступені тыя ці іншыя дзеяньні грамадзяніна зьвязаныя з рэалізацыяй ім свайго канстытуцыйнага права на праходжаньне вайсковай службы альтэрнатыўнай альбо з адмовай ад праходжаньня вайсковай службы ў такіх умовах, якія не забясьпечваюць павагу яго рэлігійных пераканьняў. У кожным канкрэтным выпадку гэтымі органамі павінны быць прынятыя ўсе меры для ўсебаковага і належнага вывучэньня ўсіх абставінаў справы як у мэтах забесьпячэньня правоў і свабодаў грамадзян, якія жадаюць выканаць свой абавязак па абароне Рэспублікі Беларусь у іншых дазволеных формах, так і ў мэтах выключэньня злоўжываньняў з боку некаторых асобаў, якія такім чынам маюць намер ухіліцца ад вайсковай службы.

У зьвязку з вышэй згаданым, Праваабарончы цэнтр «Вясна» лічыць, што грамадзяне Рэспублікі Беларусь маюць поўнае права адмовіцца ад праходжаньня вайсковай службы па перакананьнях сумленьня і патрабаваць забесьпячэньня рэалізацыі канстытуцыйнага права на альтэрнатыўную службу.

Праваабарончы цэнтр «Вясна» лічыць недапушчальным крымінальны перасьлед асобаў, якія заявілі аб адмаўленьні ад праходжаньня вайсковай службы па рэлігійных матывах і гатоўнасьці прайсьці альтэрнатыўную службу. Крымінальны перасьлед такіх асобаў зьяўляецца парушэньнем правоў чалавека.

Праваабарончы цэнтр «Вясна» патрабуе неадкладнага вызваленьня Івана Міхайлава і спыненьня крымінальнага перасьледу ў дачыненьні да яго.

Праваабарончы цэнтр «Вясна» патрабуе ад Нацыянальнага сходу Беларусі неадкладанага прыняцьця закону аб альтэрнатыўнай службе як практычнага механізму рэалізацыі артыкулу 57 Канстытуцыі Рэспублікі Беларусь.

Менск, 12.01.2010

## Праваабаронча цэнтр «Вясна» патрабуе неадкладнага вызваленьня Івана Міхайлава і тэрміновага прыняцьця парламентам Закону «Аб альтэрнатыўнай службе»

1 лютага 2010 году суд Менскага раёну прыгаварыў Івана Міхайлава да трох месяцаў арышту за ўхіленьне ад мерапрыемстваў, зьвязаных з прызывам на вайсковую службу.

Іван Міхайлаў неаднаразова зьвяртаўся ў прызыўную камісію Менскага раёну з просьбай прадаставіць яму магчымасьць прайсьці альтэрнатыўную вайсковую службу ў сувязі з тым, што па сваіх рэлігійных перакананьнях ён ня можа праходзіць вайсковую службу са зброяй у руках. Аднак замест гэтага Іван быў спачатку зьмешчаны ў СІЗА ў межах узбуджанай крымінальнай справы, а затым і прызнаны вінаватым ва ўхіленьні ад вайсковай службы.

Права грамадзянаў на альтэрнатыўную службу вынікае з арт. 57 Канстытуцыі Рэспублікі Беларусь. Дадзеным артыкулам Асноўнага Закону краіны прадугледжана, што абарона Рэспублікі Беларусь зьяўляецца абавязкам і сьвяшчэнным доўгам яе грамадзяніна. Парадак праходжаньня вайсковай службы, падставы і ўмовы яе замены на альтэрнатыўную службу вызначаюцца законам.

У сувязі з гэтым, Праваабаронча цэнтр «Вясна» лічыць, што грамадзяне Рэспублікі Беларусь маюць поўнае права адмовіцца ад праходжаньня вайсковай службы па перакананьнях сумленьня і патрабаваць забесьпячэньня рэалізацыі канстытуцыйнага права на альтэрнатыўную службу.

Праваабаронча цэнтр «Вясна» лічыць недапушчальным крымінальны перасьлед асобаў, якія заявілі аб сьвядомым адмаўленьні ад праходжаньня вайсковай службы па рэлігійных і іншых матывах і гатоўнасьці прайсьці альтэрнатыўную службу. Крымінальны перасьлед такіх асобаў зьяўляецца парушэньнем правоў чалавека.

Праваабаронча цэнтр «Вясна» патрабуе неадкладнага вызваленьня Івана Міхайлава і спыненьня крымінальнага перасьледу ў дачыненьні да яго.

Праваабаронча цэнтр «Вясна» патрабуе ад Нацыянальнага сходу Беларусі неадкладнага прыняцьця закону аб альтэрнатыўнай службе як практычнага механізму рэалізацыі артыкулу 57 Канстытуцыі Рэспублікі Беларусь.

Менск, 02.02.2010 г.

## Праваабаронцы заклікаюць улады забясьпечыць права на справядлівы суд у справе Аўтуховіча і Асіпенкі

Праваабарончы цэнтр «Вясна» заклікае беларускія ўлады забясьпечыць Мікалаю Аўтуховічу, Уладзіміру Асіпенку і ўсім абвінавачваемым па дадзенай крымінальнай справе права на яе справядлівы разгляд бесстароньнім і незалежным судом у адкрытым судовым працэсе.

Праваабарончы цэнтр «Вясна» выказвае занепакоенасьць тым фактам, што Вярхоўны Суд Рэспублікі Беларусь будзе разглядаць дадзеную крымінальную справу ў якасьці суду першай інстанцыі. У сувязі з тым, што прысуд Вярхоўнага Суду РБ уступае ў законную сілу неадкладна пасьля яго вынясеньня і не падлягае абскарджваньню ў касацыйным парадку, дадзены факт, на думку праваабаронцаў, істотна абмяжоўвае правы абвінавачваемых на магчымасьць далейшага абскарджваньня вынесенага прысуду.

Улічваючы шырокі грамадзкі рэзананс гэтай крымінальнай справы і сур'ёзнасьць прад'яўленых прадпрымальнікам абвінавачваньняў у мэтах гарантыі поўнага, аб'ектыўнага і ўсебаковага разгляду дадзенай справы ПЦ «Вясна» заклікае ўлады забясьпечыць абвінавачваемым магчымасьць абскардзіць вынесены прысуд у касацыйным парадку ў калегіі суддзяў.

Дадзеная магчымасьць магла б быць цалкам забясьпечаная абвінавачваемым пры разглядзе крымінальнай справы ў судах абласнога ўзроўню з далейшай судовай праверкай законнасьці вынесенага прысуду калегіяй па крымінальных справах Вярхоўнага суду Рэспублікі Беларусь.

Менск, 09.03.2010

## «Вясна» выказвае занепакоенасьць жорсткімі ўмовамі ўтрыманьня палітзьняволеных на Кубе

Праваабарончы цэнтр «Вясна» выказвае сваю занепакоенасьць і заклапочанасьць у сувязі з тым, што 23 лютага 2010 году на 85-ты дзень галадоўкі ў Гаване памёр вядомы кубінскі палітвязень Арланда Сапата (Orlando Zapata), які быў асуджаны да 36 гадоў пазбаўленьня

волі за абразу органаў улады, парушэньне грамадзкага парадку і непадпарадкаваньне прадстаўнікам улады.

Мы лічым, што ягоная сьмерць стала вынікам жорсткіх ўмоваў утрыманьня ды ігнараваньнем з боку ўлады патрабаваньняў вязьня пра паляпшэньне ўмоваў у месцах зьняволеньня.

Таксама з трывогай адзначаем, што з 24 лютага 2010 г. у горадзе Санта-Клара галадае кубінскі журналіст і псіхолаг Гільермо Фарыньяс (Guillermo Fariñas) з патрабаваньнем вызваліць 26 цяжкахворых палітзьняволеных. Стан яго здароўя выклікае занепакоенасьць.

З 2 сакавіка 2010 г. галадаюць родныя і паплечнікі віцэ-прэзідэнта партыі «30 лістапада» Марынцы Луго (6 чалавек), якой за тры месяцы зьняволеньня так і не прад'явілі афіцыйнага абвінавачваньня.

Праваабарончы цэнтр «Вясна» выказвае сваю салідарнасьць з палітзьняволенымі, якіх на Кубе налічваецца каля 200 чалавек (па іншых крыніцах больш за 300) і зьвяртаецца да кубінскіх уладаў з наступнымі патрабаваньнямі:

задаволіць просьбу Гільермо Фарыньяс і тэрмінова вызваліць 26 цяжкахворых палітвязьняў, а таксама аказаць ім належную медыцынскую дапамогу;

задаволіць пасьмяротна патрабаваньне Арланда Сапата і прывесьці ўмовы ўтрыманьня зьняволеных у адпаведнасьць з міжнароднымі стандартамі;

неадкладна вызваліць Марынцу Луго;

вызваліць і рэабілітаваць усіх кубінскіх зьняволеных па палітычных матывах.

**Ад імя Рады Праваабарончага цэнтру «Вясна» Уладзімір Лабковіч**

17.03.2010

## У Беларусі прыведзены ў выкананьне сьмяротныя прысуды

23.03.2010

Адміністрацыя СІЗА № 1 адмовілася прыняць прадуктовую перадачу ад маці Андрэя Жука і паведаміла аб прывядзеньні ў выкананьне сьмяротных прысудаў, вынесеных улетку 2009 году яе сыну і Васілю Юзэпчуку.

Улады цынічна праігнаравалі патрабаваньне беларускіх праваабаронцаў і Камітэту па правах чалавека ААН (КПЧ) не прыводзіць прысуды ў выкананьне, пакуль справы знаходзяцца на разглядзе ў КПЧ.

Прадугледжаныя заканадаўствам афіцыйныя паведамленьні судоў, якія вынесьлі сьмяротныя прысуды, аб іх выкананьні да цяперашняга часу родным не дасланыя.

Праваабаронцы лічаць, што прывядзеньне сьмяротных прысудаў у выкананьне было зьдзейсьнена насуперак патрабаваньням нацыянальнага заканадаўства і міжнародных абавязкаў, ратыфікаваных нашай краінай.

Рэспубліка Беларусь ратыфікавала Міжнародны пакт аб грамадзянскіх і палітычных правах і Факультатыўны пратакол да яго, тым самым прызнаўшы кампетэнцыю Камітэту па правах чалавека ААН разглядаць індывідуальныя скаргі па меркаванаму парушэньню якога-небудзь з правоў, выкладзеных у Пакце.

Канстытуцыя Рэспублікі Беларусь гарантуе выкананьне агульнапрызнаных прынцыпаў міжнароднага права і гарантуе правы і свабоды грамадзян Беларусі, замацаваныя ў Канстытуцыі, законах і прадугледжаныя міжнароднымі абавязацельствамі дзяржавы (арт. арт. 8; 21). Крымінальна-выканаўчы кодэкс Рэспублікі Беларусь замацаваў прыярытэт міжнародных дамоваў над нацыянальным заканадаўствам, якое рэгулюе выкананьне крымінальных пакараньняў (арт.3).

Паводле арт. 61 Канстытуцыі Рэспублікі Беларусь, кожны мае права ў адпаведнасьці з міжнародна-прававымі актамі, ратыфікаванымі Рэспублікай Беларусь, зьвяртацца ў міжнародныя арганізацыі з мэтай абароны сваіх правоў і свабодаў, калі вычарпаны ўсе наяўныя ўнутрыдзяржаўныя сродкі прававой абароны.

Абодва асуджаных выкарысталі гарантаванае Канстытуцыяй права. Васіль Юзэпчук і маці Андрэя Жука накіравалі індывідуальныя скаргі ў КПЧ. Дзяржава атрымала ноту Ўпраўленьня Вярхоўнага Камісара ААН па правах чалавека пра рэгістрацыю іх індывідуальных зваротаў і абгрунтаванае на правіле 92 Працэдур КПЧ патрабаваньне не прыводзіць у выкананьне сьмяротныя прысуды, пакуль справы знаходзяцца на разглядзе ў КПЧ.

Нягледзячы на гэта, беларускія ўлады прывялі абодва прысуды ў выкананьне.

Праваабаронцы рашуча асуджаюць прывядзеньне ў выкананьне сьмяротных прысудаў у дачыненьні да В. Юзэпчука і А. Жука і абураныя тым фактам, што дзяржава расстраляла сваіх грамадзян, дэманструючы ігнараваньне правоў чалавека і міжнародных працэдур, якія забясьпечваюць гарантыі па іх выкананьні.

Праваабаронцы нагадваюць, што на сёньняшні дзень Беларусь застаецца адзінай дзяржавай у Еўропе, якая выкарыстоўвае сьмяротнае пакараньне.

Праваабаронцы нагадваюць, што КПЧ прыраўняў існуючую ў Беларусі працэдуру выкананьня сьмяротнага пакараньня да нечалавечай формы абыходжаньня.

Праваабаронцы патрабуюць ад кіраўніцтва Рэспублікі Беларусь выкананьня нацыянальнага заканадаўства і міжнародных абавязкаў, павагі да правоў чалавека і найвышэйшай каштоўнасьці — чалавечага жыцьця.

Таксама праваабаронцы патрабуюць выдаць родным целы расстраляных для пахаваньня ў адпаведнасьці з існуючымі традыцыямі.

Праваабаронцы працягваюць настойваць на найхутчэйшым прыняцьці рашэньня пра ўвядзеньне мараторыя на сьмяротнае пакараньне ў Рэспубліцы Беларусь.

**«Праваабаронцы супраць сьмяротнага пакараньня ў Беларусі»**

## Вывешваньне бел-чырвона-белага сьцяга не зьяўляецца падставай для крымінальнага перасьледу

### Заява Праваабарончага цэнтру «Вясна»

20 красавіка 2010 г. у судзе Кастрычніцкага р-на г. Віцебску распачнецца разгляд крымінальнай справы, якая была ўзбуджаная ў дачыненьні да сябра КХП БНФ Сяргея Каваленкі ў зьвязку з тым, што 7 студзеня 2010 г. Сяргей Каваленка вывесіў на галоўнай навагодняй ёлцы г. Віцебска беларускі гістарычны і нацыянальны бел-чырвона-белы сьцяг. За гэты ўчынак Каваленка быў неадкладна затрыманы супрацоўнікамі міліцыі, якія ўжылі супраць Каваленкі фізічную сілу.

Дзеяньні Каваленкі былі кваліфікаваныя, як «хуліганства» (ч.1 арт. 339 КК). Таксама Каваленка быў абвінавачаны ў тым, што падчас затрыманьня ён нібыта пагражаў і зьдзейсьніў гвалтоўныя дзеяньні супраць супрацоўнікаў міліцыі (ч.2 арт. 363КК).

Праваабарончы цэнтр «Вясна» ў сувязі з гэтым заяўляе наступнае:

Публічная дэманстрацыя і вывешваньне Каваленкам нацыянальнага бел-чырвона-белага сцягу ў ніякім выпадку ня можа кваліфікавацца, як хуліганскія дзеяньні, паколькі яны ня носяць характару асаблівага цынізму і яўнай непавагі да грамадзтва і ня мелі гэтага на мэце.

Зьдзейсьненае Каваленкам зьяўляецца грамадзка-палітычнай акцыяй, якая была зьдзейсьненая ў дадзенай форме і ня мела намеру, скіраванага на прычыненьне шкоды грамадзкаму парадку ці непавагі да грамадзтва.

Выклікае сумнеў таксама факт таго, што падчас затрыманьня супрацоўнікамі міліцыі Каваленка нібыта зьдзейсьніў супраць іх гвалтоўныя дзеяньні. Супрацоўнікамі міліцыі пры затрыманьні Каваленкі былі выкарыстаная празьмерная фізічная сіла і сьпецыяльныя сродкі ў выглядзе кайданкоў. Законнасьць гэтых дзеяньняў міліцыі С. Каваленка спрабаваў аспрэчыць у органах пракуратуры і судзе, медыцынская эксьпертыза зафіксавала цялесныя пашкоджаньні ў С. Каваленкі. Нядаўняе асуджэньне судом Кастрычніцкага раёну г. Віцебску пры сумнеўных абставінах па гэтым жа артыкуле актывіста Сургана выклікаюць у нас сумневы ў тым, што гэтыя абвінавачваньні не зьяўляюцца помстай праваахоўных органаў у дачыненьні і да С. Каваленкі і апраўданьнем перавышэньня сваіх службовых паўнамоцтваў.

У зьвязку з гэтым Праваабарончы цэнтр «Вясна» патрабуе спыніць крымінальны перасьлед Сяргея Каваленкі па ч.1 арт. 339 КК Рэспублікі Беларусь у сувязі з відавочнай адсутнасьцю складу злачынства, прадугледжанага гэтым артыкулам.

Праваабарончы цэнтр «Вясна» патрабуе ад уладаў Беларусі забясьпечыць Сяргею Каваленку права на разгляд ягонай справы бестароньнім, незалежным судом, устанавіць усе акалічнасьці справы і вызначыць правамоцнасьць дзеяньняў міліцыі ў дачыненьні да С. Каваленкі і ўстанавіць ісьціну па справе.

**20 красавіка 2010 году, г. Менск.**

## Заява Праваабарончага цэнтру «Вясна»

30 красавіка ў Наваполацку ў прыватным офісе праваабаронцы Зьміцера Салаўёва адбыўся вобшук. Ён праводзіўся з санкцыі пракурора горада Анатоля Аўсюка і начальніка аддзелу па вышуковай працы аддзелу крымінальнага вышуку Наваполацкага ГАУС Карэнскага В.С. у межах крымінальнай справы, узбуджанай па арт. 341 КК РБ — «Апаганьваньне будынкаў і псаваньне маёмасьці». Падставай для ўзбуджэньня справы паслужылі надпісы са свастыкай, зробленыя на сьценах гораду. У вынікуператрусу канфіскаваныя сістэмны блок кампутара, дыскі, шмат розных друкаваных выданьняў і бел-чырвона-белыя сьцягі.

На офісе праваабаронцы Зьміцера Салаўёва праходзяць шматлікія культурніцкія імпрэзы, такія як Беларуская дыктоўка, сустрэчы з вядомымі пісьменьнікамі і мастакамі. Зьміцер Салаўёў вядомы ў Наваполацку праваабаронца і грамадзкі дзяяч, там ён сустракаецца з людзьмі, якім бывае патрэбна дапамога з прычыны парушэньня іхніх правоў. У Наваполацку — гэта адзінае незалежнае ад уладаў месца, дзе могуць сабрацца людзі з дэмакратычнымі поглядамі. Менавіта таму ўлады вельмі нярвова ставяцца да ягонага існаваньня. У 2006 годзе ў выніку вобшуку з офісу была канфіскаваная аргтэхніка, друкаваныя выданьні і праваабарончыя дакументы. Да гэтага часу ў парушэньне закону нічога з канфіскаванага не было вернута.

Офіс Зьміцера Салаўёва таксама неаднаразова падвяргаўся нападам неафашыстаў. Сьцены будынку звонку размалёўваліся сва-

стыкай, быў пашкоджаны ралет на вакне. На працягу 2008-09 гадоў праваабаронца тройчы зьвяртаўся ў гарадзкую пракуратуру з патрабаваньнем узбудзіць крымінальную справу супраць дзеючых у горадзе неанацыстаў, якія таксама размалёўвалі фашыстоўскімі і антысеміцкімі лозунгамі іншыя будынкі ў г.Наваполацку. У выніку прыходзілі адмовы, у якіх было напісана, што дзеяньні невядомых асобаў не падпадаюць пад крымінальную адказнасьць.

Рада Праваабарончага цэнтру «Вясна» наўпрост зьвязвае вобшук у офісе праваабаронцы Зьміцера Салаўёва з ягонай актыўнай грамадзкай пазіцыяй. У прыватнасьці, зусім нядаўна праваабаронца ўдзельнічаў у маніторынгу выбараў ў мясцовыя саветы. Замест таго, каб затрымаць неафашыстаў, якія дзейнічаюць у Наваполацку і Полацку, улады выкарыстоўваюць любую магчымасьць, каб аказаць ціск на праваабаронцу і перашкодзіць ягонай праваабарончай, грамадзкай і культурніцкай дзейнасьці.

У сувязі з дзеяньнямі ўладаў, накіраванымі на абмежаваньне дзейнасьці праваабаронцы Зьміцера Салаўёва, мы заяўляем рашучы пратэст і заклікаем прыпыніць неапраўданы ціск на праваабаронцу, неадкладна вярнуць канфіскаваную маёмасьць і заняцца пошукам сапраўдных злачынцаў!

Рада Праваабарончага цэнтру «Вясна»

Менск, 03.05.2010

**Заява праваабаронцаў па справе Аўтуховіча**

6 траўня 2010 г. Вярхоўны Суд Рэспублікі Беларусь вынес прысуд па крымінальнай справе Мікалая Аўтуховіча, Уладзіміра Асіпенкі, Міхаіла Казлова і Аляксандра Ларына.

Мікалай Аўтуховіч абвінавачваўся ў зьдзяйсьненьні злачынстваў, прадугледжаных арт. 18, ч. 3 арт. 218 Крымінальнага кодэксу Рэспублікі Беларусь (далей — КК) (наўмыснае зьнішчэньне альбо пашкоджаньне маёмасьці), ч. 4 арт. 295 КК (незаконныя дзеяньні ў адносінах да вогнястрэльнай зброі, боепрыпасаў і выбуховых рэчываў), арт. 13 і арт. 359 КК (падрыхтоўка тэрарыстычнага акту);

Уладзімір Асіпенка, Аляксандр Ларын — па ч. 3 арт. 16 і ч. 2 арт. 218 КК, ч. 3, 4 арт. 295 КК, арт. 13 і арт. 359 КК;

Міхаіл Казлоў — па ч. 2 арт. 425 КК (бязьдзеяньні службовай асобы).

Абвінавачаныя правялі пад вартай працяглы час (больш за адзін год).

Пасьля судовага разьбіральніцтва суд апраўдаў Мікалая Аўтуховіча, Уладзіміра Асіпенку, Аляксандра Ларына па наўмысным зьнішчэньні альбо пашкоджаньні маёмасьці і па падрыхтоўцы тэрарыстычнага акту.

Прысудам Мікалай Аўтуховіч, Уладзімір Асіпенка, Аляксандр Ларын асуджаны па ч. 3 арт. 295 КК (незаконныя дзеяньні ў адносінах да вогнястрэльнай зброі, боепрыпасаў і выбуховых рэчываў), а Міхаіл Казлоў — па арт. 425 КК (бязьдзеяньні службовай асобы) адпаведна да 5, 3, 3 і 2 гадоў пазбаўленьня волі.

З моманту ўзбуджэньня крымінальнай справы, якая атрымала вялікі грамадзкі рэзананс у краіне, расьсьледаваньне з самага пачатку насіла закрыты для грамадзкасьці характар. Адвакатам абвінавачаных пад пагрозай крымінальнай адказнасьці забаранялася агалошваць любую інфармацыю аб ходзе расьсьледаваньня крымінальнай справы.

Судовы працэс у Вярхоўным Судзе Рэспублікі Беларусь адбываўся ў адкрытым рэжыме, што дазволіла прадстаўнікам беларускай і міжнароднай грамадзкасьці, СМІ, праваабарончых арганізацыяў сачыць за яго ходам. Па выніках назіраньня за разглядам справы ў судзе Праваабарончы цэнтр «Вясна» і РПГА «Беларускі Хельсінскі Камітэт» прыйшлі да наступных высноваў.

У ходзе папярэдняга сьледзтва былі дапушчаныя сур'ёзныя парушэньні працэсуальных гарантый, у тым ліку, права на абарону. Так, абвінавачаны па справе А.Ларын фактычна быў пазбаўлены права на абарону на этапе папярэдняга следзтва. У выніку допытаў і іншых працэсуальных дзеяньняў, якія праходзілі без удзелу адваката, ён даў паказаньні, якія пазьней былі выкарыстаныя супраць яго самога, а таксама супраць іншых абвінавачаных: М.Аўтуховіча, Ул.Асіпенкі, М.Казлова.

Следзтва відавочна выкарыстоўвала для ціску на сьведак такія метады, як узяцьцё іх пад варту ў якасьці падазраваных асобаў. Пасьля атрыманьня неабходных для следзтва паказаньняў затрыманыя

вызваляліся, пераводзіліся ў статус сьведак, а крымінальны перасьлед у дачыненьні да іх спыняўся. Па справе было арыштавана, такім чынам, больш за 10 чалавек. Як правіла, яны дапытваліся ў адсутнасьці абаронцаў.

Сьведка Лявонаў правёў за кратамі 6 месяцаў.

Дадзеныя факты можна расцэньваць як злоўжываньні сьледзтва і адвольныя затрыманьні.

Большасьць апытаных па справе сьведак у судовым паседжаньні заявілі аб псіхалагічным і фізічным ціску, які аказваўся на іх з боку следзтва. Значная частка сьведак абвергла дадзеныя імі раней падчас сьледзтва паказаньні абвінаваўчага характару.

У зьвязку з вышэйпазначаным доказы, дабытыя пры такіх абставінах, не павінны мець юрыдычнай сілы і ня могуць быць пакладзены ў аснову абвінаваўчага прысуду.

Абаронцы неаднаразова заяўлялі падчас судовага працэсу, што яны былі абмежаваныя сьледзтвам у магчымасьцях зьбіраньня доказаў, многія з іх хадайніцтваў не задавальняліся сьледчымі. Некаторыя важныя для аб’ектыўнага разгляду справы хадайніцтвы абароны былі адхілены судом, што можа сьведчыць аб абвінаваўчым ухіле працэсу і парушае прынцыпы аб’ектыўнасьці і бесстароннасьці суду.

Справа разглядалася Вярхоўным Судом Рэспублікі Беларусь у якасьці суду першай інстанцыі, што пазбавіла абвінавачаных права на абскарджаньне прысуду, паколькі прысуд Вярхоўнага Суду Рэспублікі Беларусь паводле Крымінальна-працэсуальнага кодэксу ўступае ў сілу адразу пасьля яго вынясеньня. Гэта зьяўляецца істотным парушэньнем права на доступ да правасуддзя, супярэчыць арт. 115 Канстытуцыі Рэспублікі Беларусь і арт. 2, 14 Міжнароднага Пакту аб грамадзянскіх і палітычных правах.

Аналіз доказаў, атрыманых і дасьледаваных у судовым працэсе, не дае падставы лічыць іх дастатковымі для вынясеньня абвінаваўчага прысуду.

Згодна з інфармацыяй сьледчага, справа знаходзіцца на кантролі Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь.

Пры такіх абставінах абвінаваўчы прысуд і пазбаўленьне волі асуджаных па дадзенай справе зьявіліся вынікам разьбіральніцтва з яўнымі парушэньнямі працэсуальных гарантый, зьвязаных з палітычнымі матывамі ўлады, што трапляе пад вызначэньне паняць-

ця «палітычныя вязьні», дадзенага экспертамі Савета Еўропы (згодна з дакументам Савета Еўропы SG\Inf(2001) 34\24 October 2001).

Мы патрабуем ад Генеральнага пракурора Рэспублікі Беларусь і Старшыні Вярхоўнага Суду Рэспублікі Беларусь правесьці праверку законнасьці і абгрунтаванасьці вынесенага прысуду і вызваліць асуджаных з-пад варты, а таксама прыцягнуць да адказнасьці службовых асоб, якія дапусьцілі грубыя парушэньні крымінальна-працэсуальнага заканадаўства падчас папярэдняга сьледзтва.

**РПГА «Беларускі Хельсінскі Камітэт»**
**Праваабарончы цэнтр «Вясна»**

Менск, 06.05.2010 г.

## Сілавы разгон і затрыманьні ўдзельнікаў гей-прайду ў Менску зьяўляюцца парушэньнем права на свабоду мірных сходаў і праявай дыскрымінацыі

Заява Праваабарончага цэнтру «Вясна»

15 траўня 2010 г. прадстаўнікі МУС гвалтоўна спынілі мірнае шэсьце аткывістаў ЛГБТ. Напярэдадні Менгарвыканкам забараніў яго правядзеньне па фармальнай прычыне і не прадаставіў магчымасьці правядзеньня шэсьця ў іншым, задавальняючым абодва бакі, месцы.

У зьвязку з гэтым Праваабарончы цэнтр «Вясна» лічыць дзеяньні беларускіх уладаў парушэньнем канстытуцыйных правоў удзельнікаў шэсьця, а таксама міжнародных нормаў у галіне правоў чалавека.

Паводле Канстытуцыі Рэспублікі Беларусь кожнаму грамадзяніну гарантуецца свабода меркаваньняў, перакананьняў і іх свабоднае выражэньне, а таксама свабода мірных сходаў, шэсьцяў, дэманстрацый і пікетаваньняў. Канстытуцыя Беларусі забараняе ўсялякага кшталту дыскрымінацыю грамадзянаў.

Свабода мірных сходаў і забарона дыскрымінацыі па якой не было б падставе ўтрымліваецца ў арт. 22 і 26 Міжнароднага Пакту аб

грамадзянскіх і палітычных правах, абавязацельствы па выкананьні якога былі добраахвотна ўзятыя Рэспублікай Беларусь.

Праваабарончы цэнтр «Вясна» ў чарговы раз заклікае ўлады Беларусі да павагі правоў чалавека і забесьпячэньня свабоды мірных сходаў і выказваньня свайго меркаваньня ўсім грамадзянам, без усялякай дыскрымінацыі па якіх бы то не было прыкметах, у тым ліку па прыкмеце сексуальнай арыентацыі.

Праваабарончы цэнтр «Вясна» таксама адзначае, што падобныя дзеяньні ўладаў не спрыяюць зьмяншэньню ўзроўню гамафобіі ў беларускім грамадзтве.

Мы патрабуем неадкладнага вызваленьня ўсіх затрыманых удзельнікаў шэсьця 15 траўня 2010 г.

Менск, 17 траўня 2010 г.

## Праваабарончыя арганізацыі асуджаюць вынясеньне двух сьмяротных прысудаў у Беларусі

**Amnesty International, Беларускі Хельсінскі Камітэт і Праваабарончы цэнтр «Вясна»**
**Лондан/Менск, 17.05.2010**

Amnesty International далучаецца да вядучых беларускіх праваабарончых арганізацыяў з асуджэньнем сьмяротных прысудаў, вынесеных у адносінах да дзвюх асобаў, якія былі прызнаныя вінаватымі ў зьдзяйсьненьні забойства ў горадзе Гародне.

14 мая 2010 году Алег Грышкаўцоў (29) і Андрэй Бурдыка (28) прысуджаныя да сьмяротнага пакараньня праз расстрэл за злачынствы, зьдзейсьненыя падчас узброенага нападу на кватэру ў Гародне ў кастрычніку 2009 году. Абодва мужчыны былі прызнаныя вінаватымі ў наўмысным забойстве, разбоі, падпале, выкраданьні непаўналетняга, крадзяжы і рабаўніцтве.

«Сьмяротнае пакараньне — не адказ на гвалтоўнае злачынства. У той час, калі сьвет імкнецца да адмены сьмяротнага пакараньня, Беларусь рухаецца ў адваротным накірунку,» — адзначыла Галя Гован, дырэктар праграмы Amnesty International па Еўропе і Цэнтральнай Азіі.

Беларусь застаецца адзінай еўрапейскай краінай, якая паранейшаму прыводзіць у выкананьне сьмяротныя прысуды. Amnesty International, Беларускі Хельсінскі Камітэт і Праваабарончы цэнтр «Вясна» зьвярнуліся да беларускіх уладаў з заклікам прадэманстраваць імкненьне да адмены сьмяротнага пакараньня шляхам зьмякчэньня абодвух прысудаў.

«Мы будзем ацэньваць урад па яго дзеяньнях, а вынясеньне гэтых прысудаў паказвае сапраўднае жаданьне ўладаў надалей выкарыстоўваць гэтае жорсткае і бессэнсоўнае пакараньне. Адзінай пераканаўчай заявай было б абвяшчэньне мараторыя», — кажа Алег Гулак, старшыня Беларускага Хельсінскага Камітэту.

Важна адзначыць, што прысуды былі абвешчаны праз два дні пасьля крытыкі, якая прагучала ў адрас Беларусі за выкарыстаньне краінай сьмяротнага пакараньня падчас сесіі працоўнай групы па прадастаўленьні Ўніверсальнага перыядычнага агляду ААН. Урад адзначыў, што сьмяротнае пакараньне — часовая мера, якая выкарыстоўваецца толькі за найбольш цяжкія злачынствы, і што ідзе актыўнае абмеркаваньне яго адмены.

«Сьмяротныя прысуды Алегу Грышкаўцову і Андрэю Бурдыку яшчэ раз прадэманстравалі патрэбу ва ўвядзеньні неадкладнага мараторыя на сьмяротнае пакараньне. Зразумела, што пакуль закон прадугледжвае сьмяротнае пакараньне, суддзі будуць працягваць выносіць сьмяротныя прысуды», — кажа Галя Гован.

Таксама нагадаем, што два чалавекі былі расстраляныя ў Беларусі ў сакавіку. Васіль Юзэпчук быў пакараны сьмерцю за забойства шасьці жанчынаў, а Андрэй Жук атрымаў сьмяротны прысуд за ўзброены напад і забойства мужчыны і жанчыны.

Як паведамляецца, Алег Грышкаўцоў і Андрэй Бурдыка абрабавалі кватэру ў Гародне, забіўшы пры гэтым мужчыну і дзвюх жанчынаў, а таксама ўзялі дзіцё ў якасьці закладніка. Яны падпалілі кватэру і прымусілі вадзіцеля таксі адвезьці іх у Менск ці Маскву, але былі затрыманы наступнай раніцай, калі вадзіцелю ўдалося ўцячы.

## Сумесная заява Міжнароднай Федэрацыі за правы чалавека (FIDH) і Праваабарончага цэнтру «Вясна»

**Менск-Парыж, 27 траўня 2010 г.**

Міжнародная Федэрацыя за правы чалавека (FIDH) і яе сяброўская арганізацыя ў Беларусі Праваабарончы цэнтр «Вясна» выказваюць глыбокую занепакоенасьць з нагоды хвалі новых рэпрэсіўных дзеяньняў (перарусаў, допытаў і арыштаў) у дачыненьні да актывістаў грамадзянскай супольнасьці, праваабаронцаў, незалежных журналістаў і прадстаўнікоў палітычнай апазіцыі, а таксама ў сувязі з агульным пагаршэньнем стану правоў чалавека ў краіне.

«Выклікае нарастаючую занепакоенасьць новая хваля абмежаваньня асноўных грамадзянскіх і палітычных правоў, што назіраецца ў Беларусі ў апошнія месяцы: парушэньні права свабоднага атрыманьня і распаўсюду інфармацыі, свабоды мірных сходаў і асацыяцый, свабоды выказваньня ўласнага меркаваньня, — заявіла Суэр Белхасен, Прэзідэнт FIDH. — Мы баімся, што ўсё гэта — толькі частка нарастаючага і мэтанакіраванага ціску напярэдадні важнай палітычнай кампаніі — падрыхтоўкі прэзідэнцкіх выбараў».

Асаблівую занепакоенасьць выклікае факт, што Беларусь застаецца адзінай краінай Еўропы і постсавецкай прасторы, якая да гэтага часу ня толькі практыкуе сьмяротныя прысуды, але і прыводзіць іх у выкананьне, нягледзячы на заклікі міжнароднай супольнасьці. «Факт выкананьня сьмяротных прысудаў у дачыненьні да Андрэя Жука і Васіля Юзэпчука ў сакавіку 2010 году, нягледзячы на тое, што Камітэтам па правах чалавека ААН былі накіраваныя запыты аб часовых мерах абароны, і вынясеньня 14 траўня 2010 году двух сьмяротных прысудаў адносна Алега Грышкаўцова і Андрэя Бурдыкі сьведчыць пра нежаданьне Беларусі кіравацца фундаментальнымі прынцыпамі правоў чалавека», — падкрэсьліў Алесь Бяляцкі, віцэ-прэзідэнт FIDH і Прэзідэнт ПЦ «Вясна».

Праваабаронцы, якія ўсе апошнія гады працуюць ва ўмовах, спалучаных з вялікай рызыкай, апошні час сутыкнуліся з дадатковымі цяжкасьцямі. Шэраг ператрусаў прайшоў у рэгіянальных офісах праваабаронцаў. Так, 30 красавіка 2010 г. прайшоў ператрус з канфіскацыяй кампутарнай тэхнікі ў офісе наваполацкага праваа-

баронцы Зьміцера Салаўёва. Міліцыя канфіскавала кампутарнае абсталяваньне ў праваабаронцы ў сувязі з тым, што ў горадзе на сьценах дамоў зьявіліся неанацысцкія надпісы. Варта адзначыць, што Зьм. Салаўёў некалькі разоў беспасьпяхова зьвяртаўся са скаргамі ў міліцыю па фактах напісаньня неанацысцкіх лозунгаў у горадзе і на сьцяне яго офісу. Таксама нагадаем, што Зьм. Салаўёў тройчы ў 2007 і 2009 гг. прадастаўляў свой офіс у якасьці юрыдычнага адрасу для рэгістрацыі ў Міністэрстве юстыцыі Рэспублікі Беларусь праваабарончага грамадзкага аб'яднаньня «Наша Вясна», якое беспасьпяхова спрабавалі зарэгістраваць сябры ліквідаванага беларускімі ўладамі ў 2003 г. Праваабарончага цэнтру «Вясна». Зьм. Салаўёў зьяўляўся адным з заснавальнікаў «Нашай Вясны».

19.05.2010 ператрус прайшоў у офісе яшчэ аднаго з заснавальнікаў праваабарончага грамадзкага аб'яднаньня «Наша Вясна» — у праваабаронцы Валеры Пуціцкага ў г. Рэчыца.

Акрамя гэтага, шэраг ператрусаў адбыўся на працоўных месцах і ў прыватных жылых памяшканьнях у шэрагу журналістаў — у журналіста адной з вядучых незалежных газет «Народная Воля» Марыны Коктыш, намесьніка галоўнага рэдактара выданьня Сьвятланы Калінкінай, а таксама ў вядучага незалежнага журналіста Ірыны Халіп і журналіста сайта «Хартыя-97» Натальлі Радзінай. Усе гэтыя журналісты з'яўляюцца сьведкамі па крымінальнай справе, узбуджанай па факце паклёпу на генерала КДБ Івана Каржа. Канфіскацыя кампутараў, правядзеньне двух экспертыз кампутарнай тэхнікі з зламаньнем пароляў асабістай электроннай пошты і перапіскі па скайпу паказваюць на мэтанакіраваны перасьлед і ціск на журналістаў вядучых незалежных СМІ напярэдадні важнай палітычнай кампаніі — прэзідэнцкіх выбараў. FIDH і Праваабарончы цэнтр «Вясна» выказваюць занепакоенасьць тым, што следзтва можа зьмяніць працэсуальны статус журналістаў і распачаць у дачыненьні да іх крымінальны перасьлед.

18-19 траўня 2010 г. у больш чым 20-ці гарадах Беларусі прайшлі ператрусы на прыватных кватэрах і офісах НДА актывістаў грамадзянскай кампаніі «Гавары праўду!». У выніку гэтых дзеяньняў былі адвольна затрыманыя некалькі дзясяткаў чалавек. Кіраўнікі кампаніі Уладзімір Някляеў, Сяргей Вазьняк і Андрэй Дзьмітрыеў правялі трое сутак у ІЧУ г. Менску як падазраваныя ў крымінальнай справе. Лічым, што дадзеная санкцыянаваная ўладамі Беларусі сілавая ак-

цыя накіравана на запалохваньне актывістаў кампаніі і асабіста Ул. Някляева як аднаго з магчымых кандыдатаў на будучых выбарах Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь. 3 сакавіка 2010 г. ператрусу і допыту быў падвергнуты лідэр грамадзянскай ініцыятывы «Еўрапейская Беларусь» Андрэй Саньнікаў, які таксама напярэдадні заявіў аб намеры балатавацца ў якасьці кандыдата на будучых прэзідэнцкіх выбарах.

Далей FIDH і ПЦ «Вясна» адзначаюць, што ў краіне да гэтага часу ў месцах пазбаўленьня волі знаходзяцца асобы, крымінальны перасьлед і асуджэньне якіх мы зьвязваем з іх палітычнай дзейнасьцю. Гэта актывіст апазіцыі Алег Сурган, Кастрычніцкім судом г.Віцебску асуджаны 19.02.2010 на 6 месяцаў арышту па арт. 364 Крымінальнага кодэксу (гвалт альбо пагроза гвалту ў адносінах да супрацоўніка органаў унутраных спраў).

14.05.2010 г. Кастрычніцкім судом г. Віцебску быў пакараны па артыкулах 339 (наўмысныя дзеяньні, якія груба парушаюць грамадзкі парадак і выражаюць відавочную непавагу да грамадзтва) і 363 (супраціў супрацоўніку ўнутраных спраў або іншай асобе, якая ахоўвае грамадзкі парадак) трыма гадамі абмежаваньня волі без накіраваньня ў папраўчую ўстанову адкрытага тыпу актывіст Кансерватыўна-хрысьціянскай партыі Сяргей Каваленка за тое, што 7 студзеня 2010 г. вывесіў на галоўнай ёлцы Віцебску беларускі нацыянальны бел-чырвона-белы сьцяг.

16 траўня 2010 г. быў вынесены і ўступіў у законную сілу прысуд Вярхоўнага Суду Рэспублікі Беларусь па справе прадпрымальніка Мікалая Аўтуховіча, Уладзіміра Асіпенкі, Міхаіла Казлова і Аляксандра Ларына. Першапачаткова абвінавачаныя ў шэрагу цяжкіх злачынстваў, у тым ліку ў падрыхтоўцы тэрарыстычнага акту, М. Аўтуховіч, А. Ларын, У. Асіпенка ў выніку адкрытага разгляду справы ў судзе былі апраўданыя па большасьці прад’яўленых абвінавачваньняў, аднак асуджаныя за захоўваньне зброі і боепрыпасаў, а М . Казлоў за бязьдзейнасьць службовай асобы. Следства па дадзенай крымінальнай справе, на думку FIDH і ПЦ «Вясна», суправаджалася значнымі парушэньнямі працэсуальных гарантый, што відавочна зьвязана з палітычнай мэтай уладаў.

Да гэтага часу не амніставаныя і вымушаныя знаходзіцца за межамі Рэспублікі Беларусь з-за пагрозы крымінальнага перасьледу асуджаныя на абмежаваньне волі за ўдзел у мірнай дэманстрацыі пратэсту

прадпрымальнікаў у студзені 2009 г. Тацяна Цішкевіч, Аляксей Бондар і Міхаіл Крываў. 15.06.2009 г. Максім Дашук паўторна быў прысуджаны да 1 году і 3 месяцаў абмежаваньня волі без накіраваньня ва ўстановы адкрытага тыпу і да гэтага часу адбывае вынесенае яму пакараньне.

Падчас правядзеньня выбараў дэпутатаў мясцовых Саветаў дэпутатаў 26-га скліканьня ў красавіку 2010 г. Упраўленне КДБ па Гарадзенскай вобласьці ўзбудзіла крымінальную справу супраць аднаго з кандыдатаў у дэпутаты, палітычнага актывіста Руху «За свабоду» з г. Масты Алеся Зарэмбюка. А. Зарэмбюк з'яўляецца вядомым маладым палітыкам, які быў дэпутатам Мастоўскага раённага Савету дэпутатаў 2003-2007 г., неаднаразова балатаваўся ў якасьці кандыдата ў дэпутаты на мясцовых і парламенцкіх выбарах.

Таксама варта адзначыць, што 01.07.2010 уступае ў сілу падпісаны 01.02.2010 А.Лукашэнкам указ № 60 «Аб мерах па ўдасканаленьні выкарыстаньня нацыянальнага сегменту сеткі Інтэрнет», які можа сур'ёзна абмежаваць правы беларускіх грамадзян на атрыманьне і распаўсюд інфармацыі.

**У гэтай сувязі FIDH і ПЦ «Вясна» заклікаюць улады Беларусі:**

1. Неадкладна вызваліць усіх асуджаных па палітычных матывах, якія знаходзяцца ў зьняволеньні альбо адбываюць іншыя віды пакараньняў, якія зьяўляюцца абмежаваньнем іх волі. Амніставаць раней асуджаных за ўдзел у мірнай дэманстрацыі і забясьпечыць ім магчымасьць вярнуцца на радзіму.
2. Спыніць перасьлед журналістаў, грамадзкіх і палітычных актывістаў і забясьпечыць усім грамадзянам краіны права свабоднага ўдзелу ў будучай выбарчай прэзідэнцкай кампаніі.
3. Спыніць перасьлед праваабаронцаў.
4. Неадкладна ўвесьці мараторый на сьмяротнае пакараньне.
5. Забясьпечыць грамадзянам краіны рэалізацыю імі свабоды мірных сходаў, асацыяцый, свабоды выказваньня ўласнага меркаваньня.

## FIDH і Праваабарончы цэнтр «Вясна» патрабуюць ад уладаў Беларусі неадкладна аказаць неабходную медыцынскую дапамогу Мікалаю Аўтуховічу

FIDH і Праваабарончаму цэнтру «Вясна» стала вядома аб пачатку бестэрміновай галадоўкі зьняволенага Мікалая Аўтуховіча ў сувязі з адмовай у прадастаўленьні яму медыцынскай дапамогі з боку адміністрацыі СІЗА № 1 г. Менску.

У выніку працяглага, больш за год, утрыманьня пад вартай у вельмі неспрыяльных для здароўя ўмовах Мікалай Аўтуховіч страціў практычна ўсе зубы і як следзтва — магчымасьць нармальнага прыёму ежы. Нягледзячы на шматразовыя звароты зьняволенага да адміністрацыі СІЗА і ў Дэпартамент выкананьня пакараньняў МУС Беларусі, яму сістэматычна адмаўляюць у доступе да неабходнай медыцынскай дапамогі. Пры гэтым адміністрацыя СІЗА блакуе перадачу зваротаў Мікалая Аўтуховіча ў Дэпартамент выкананьня пакараньняў МУС.

Прадпрымальнік Мікалай Аўтуховіч быў асуджаны 16 траўня 2010 г. Вярхоўным Судом Рэспублікі Беларусь на 5 гадоў пазбаўленьня волі па абвінавачваньні ў захоўваньні зброі і боепрыпасаў. Першапачаткова Мікалай Аўтуховіч, а таксама Уладзімір Асіпенка, Міхаіл Казлоў і Аляксандр Ларын абвінавачваліся ў шэрагу цяжкіх злачынстваў, у тым ліку ў падрыхтоўцы тэрарыстычнага акту, але ў выніку адкрытага разгляду справы ў судзе былі апраўданыя па большасьці прад’яўленых абвінавачваньняў.

Справа першапачаткова мела гучны грамадзкі рэзананс і знаходзілася пад пільнай увагай праваабаронцаў. На думку FIDH і ПЦ «Вясна», следзтва па дадзенай крымінальнай справе суправаджалася значнымі парушэньнямі працэсуальных гарантый, відавочна зьвязаных з палітычнай матывіроўкай.

FIDH і Праваабарончы цэнтр «Вясна» расцэньваюць адмову беларускіх уладаў у прадастаўленьні неабходнай медыцынскай дапамогі вязьню Мікалаю Аўтуховічу як бесчалавечнае, жорсткае абыходжаньне і катаваньні, парушэньне арт. 25 Канстытуцыі Рэспублікі Беларусь і арт. 7 Міжнароднага Пакту аб грамадзянскіх і палітычных правах.

FIDH і Праваабарончы цэнтр «Вясна» патрабуюць ад уладаў Беларусі неадкладна спыніць парушэньне правоў зьняволенага Мікалая Аўтуховіча і забясьпечыць яго неабходнай медыцынскай дапамогай.

Парыж-Менск, 18 чэрвеня 2010 г.

## Перасьлед незалежных галасоў павінен быць спынены. Сьмерць Алега Бябеніна павінна быць расьсьледавана

**Менск — Парыж, 7 верасьня 2010 г.**

FIDH і яе членская арганізацыя Праваабарончы цэнтр «Вясна» глыбока занепакоеныя працягам рэпрэсій супраць незалежных журналістаў і дзеячаў грамадзянскай супольнасьці ў Беларусі напярэдадні прэзідэнцкіх выбараў, якія пройдуць у канцы 2010 г.

3 верасьня 2010 г. вядомы незалежны журналіст **Алег Бябенін** быў знойдзены павешаным у сябе ў загарадным доме недалёку ад Менску. Бябенін быў заснавальнікам і кіраўніком незалежнага вэбсайту «Хартыя'97» і сябрам Беларускага саюзу журналістаў. Пракуратура Дзяржынскага раёну пачала расьсьледаваньне абставінаў яго сьмерці. Па заяве праваахоўных органаў, сп.Бябенін скончыў жыцьцё самагубствам.

Аднак цьмяныя абставіны яго сьмерці змушаюць яго сваякоў, калег і праваабарончыя арганізацыі ўсумніцца ў афіцыйнай версіі фактаў. Не было знойдзена перадсьмяротнай запіскі, якая тлумачыць прычыны самагубства, і, паводле смс-паведамленьняў, адпраўленых сябрам, Бябенін зьбіраўся ў той вечар пайсьці ў кіно. Акрамя таго, па інфармацыі вэбсайту «Хартыя'97», падчас пярвічнага дасьледаваньня цела на шыі сп.Бябеніна быў знойдзены сьлед ад здушэньня, што можа ўказваць як на самазабойства, так і на гвалтоўную сьмерць ад удушэньня з дапамогай пятлі.

**Сухэйр Белхасэн** , Прэзідэнт Міжнароднай федэрацыі правоў чалавека (FIDH), заявіла: «Тое, што г-н Бябенін у папярэднія гады неаднаразова падвяргаўся ціску і запалохваньню за дзейнасьць у якасьці незалежнага журналіста, выклікае асаблівую занепакоенасьць. Неабходна правесьці празрыстае і адкрытае расьсьледаваньне акалічнасьцяў яго сьмерці».

5 верасьня 2010 году старшыня Еўрапарламенту **Ежы Бузэк** таксама заклікаў да правядзеньня празрыстага расьследаваньня па факце гэтай трагічнай гібелі і заявіў, што сп.Бябенін «сваёй працай у «Хартыі'97» змагаўся за стварэньне дэмакратычнай Беларусі».

Акрамя гэтага, 6 верасьня 2010 году **Сьвятлана Калінкіна**, галоўны рэдактар незалежнай газеты «Народная Воля», напісала

артыкул аб сьмерці Бябеніна, атрымала ананімнае пасланьне на паштоўцы кампаніі «Гавары праўду!» (арганізаванай актывістамі, якія абараняюць свабоду слова, якая душыцца ўладамі Беларусі) з пагрозай сьмерці: «Жыві і бойся. Пачалося паляваньне на здраднікаў. Яшчэ адзін артыкул і табе п ... ц ». Сп-ня Калінкіна заявіла: «Паштоўка не была адпраўлена па пошце, яе проста паклалі ў маю паштовую скрыню — як бы намякаючы на тое, што тым, што паслалі выдатна вядомы мой адрас. Сёньня, пасьля нечаканай сьмерці Алега Бябеніна, абставіны якой выклікаюць мноства пытаньняў, гэта ня спроба запалохаць мяне асабіста, а дзеяньні, накіраваныя на стварэньне атмасьферы напружанасьці і страху як у журналісцкай супольнасьці і грамадзтве ў цэлым».

FIDH і «Вясна» таксама нагадваюць, што беларускія і міжнародныя праваабарончыя арганізацыі паказваюць на высокую верагоднасьць таго, што некалькі былых высокапастаўленых службовых асобаў Беларусі адказныя за зьнікненьне і магчымыя пазасудовыя пакараньні сьмерцю палітычных апанентаў рэжыму Лукашэнкі, а менавіта **В.Ганчара**, **Ю.Захаранкі**, прадпрымальніка **А.Красоўскага** і апаратара расейскага тэлебачаньня **Дз.Завадскага** — усе гэтыя людзі зьніклі бяз вестак. **Алесь Бяляцкі**, віцэ-прэзідэнт FIDH і старшыня Праваабарончага цэнтру «Вясна» лічыць, што «адсутнасьць праргэсу ў расьсьледаваньні гэтых спраў спараджае агульны недавер да сьледзтва па факце сьмерці Алега Бябеніна. Ціск на незалежныя галасы ў Беларусі толькі падмацоўвае падобнае стаўленьне».

FIDH і «Вясна» зьвяртаюцца з заклікам да ўладаў Беларусі:

- Правесьці неадкладнае, поўнае і незаангажаванае расьсьледаваньне па факце сьмерці незалежнага журналіста Алега Бябеніна і прадставіць яго вынікі, у тым ліку рэчавыя доказы і высновы судовай экспертызы, беларускім арганізацыям, у прыватнасьці, Саюзу журналістаў Беларусі і міжнароднай супольнасьці.
- Неадкладна спыніць рэпрэсіі і пагрозы супраць незалежных галасоў і грамадзянскай супольнасьці.

## Заява праваабаронцаў з нагоды пачатку кампаніі па маніторынгу выбараў Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь

Палата прадстаўнікоў Нацыянальнага Сходу Рэспублікі Беларусь вызначыла дату правядзеньня чарговых выбараў Прэзідэнта — 19 сьнежня 2010 г. Паводле арт. 81 Канстытуцыі Беларусі, Прэзідэнт абіраецца на пяць гадоў непасрэдна народам на падставе ўсеагульнага, свабоднага, роўнага і прамога выбарчага права пры таемным галасаваньні.

Выбары Прэзідэнта з'яўляюцца значнай падзеяй у грамадзка-палітычным жыцьці краіны і традыцыйна выклікаюць вялікую цікавасьць з боку суб'ектаў палітычнага працэсу, прадстаўнікоў грамадзянскай супольнасьці і грамадзянаў Беларусі. Таксама выбары кіраўніка дзяржавы заўсёды зьяўляюцца значным экзаменам па дэмакратыі для ўладаў Беларусі, уплываюць на імідж нашай краіны ў сьвеце.

Улічваючы важнасьць выбараў Прэзідэнта, мы, прадстаўнікі беларускіх праваабарончых арганізацый, «Беларускага Хельсінскага камітэту» і Праваабарончага цэнтру «Вясна», абвяшчаем аб пачатку кампаніі «Праваабаронцы за свабодныя выбары».

Мэтай кампаніі зьяўляецца правядзеньне назіраньня за выбарамі Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь, ацэнка выбарчага працэсу з пункту гледжаньня беларускага выбарчага заканадаўства і міжнародных стандартаў свабодных і дэмакратычных выбараў, інфармаваньне пра нашы высновы беларускай грамадзкасьці і міжнароднай супольнасьці.

Назіраньне за выбарамі Прэзідэнта ў межах кампаніі «Праваабаронцы за свабодныя выбары» будзе ажыцьцяўляцца сіламі сябраў нашых арганізацый у строгай адпаведнасьці з дзеючым нацыянальным заканадаўствам.

Доўгатэрміновае назіраньне за ўсімі этапамі выбарчага працэсу будзе ажыцьцяўляцца 80 назіральнікамі, якія разьмеркаваны па ўсёй тэрыторыі краіны. Доўгатэрміновыя назіральнікі будуць зарэгістраваны ў тэрытарыяльных камісіях па правядзеньні выбараў Прэзідэнта (раённых, гарадзкіх, абласных і Менскай гарадзкой).

За правядзеньнем галасаваньня на выбарчых участках з пачатку датэрміновага галасаваньня і да падліку галасоў будуць назіраць 600 кароткатэрміновых назіральнікаў на 300 выбарчых участках па ўсё тэрыторыі краіны. Асаблівую ўвагу назіральнікі будуць удзяляць яўцы выбаршчыкаў.

Кампанія «Праваабаронцы за свабодныя выбары» зьяўляецца незалежнай і палітычна незаангажаванай. Мы не прадстаўляем палітычныя партыі, а таксама якіх-небудзь палітычных дзеячоў, у тым ліку заявіўшых аб сваім намеры ўдзельнічаць у выбарах у якасьці кандыдатаў у Прэзідэнты Рэспублікі Беларусь. Увесь выбарчы працэс будзе ацэньвацца намі максімальна непрадузята, сыходзячы выключна з прынцыпаў свабодных, дэмакратычных і празрыстых выбараў, пры якіх народ нашай краіны можа ў поўнай меры рэалізаваць сваё канстытуцыйнае права на ўдзел у кіраваньні сваёй краінай і выбар кіраўніка дзяржавы.

Менск, 16 верасьня 2010 г.

**Неабходна спыніць перасьлед моладзевых актывістаў!**

**Парыж-Менск, 26 кастрычніка 2010 г.**

Міжнародная федэрацыя за правы чалавека ( FIDH) і яе сяброўская арганізацыя ў Беларусі Праваабарончы цэнтр «Вясна» выказваюць занепакоенасьць у сувязі з узмацненьнем з верасьня 2010 г. па цяперашні час рэпрэсій з боку беларускіх уладаў у дачыненьні да актывістаў некаторых палітычных рухаў, у прыватнасьці, такіх як анархісцкія і антыфашысцкія моладзевыя рухі.

У ноч з 30 на 31 жніўня 2010 году ў Менску адбыўся напад на расійскую амбасаду (невядомы кінуў «кактэйль Молатава» на тэрыторыю амбасады, у выніку чаго згарэў аўтамабіль, ніхто не пацярпеў). Замест паўнавартаснага расьследаваньня па заведзенай крымінальнай справе беларускія органы крымінальнага перасьледу пачалі выклікаць на «гутаркі» і допыты ў КДБ актывістаў анархісцкага моладзевага руху па ўсёй Беларусі, у выніку чаго каля 30 чалавек былі затрыманыя, у іх дамах правялі ператрусы і канфіскавалі кампутарную тэхніку.

3 верасня 2010 г. адбыліся першыя масавыя затрыманьні ў Менску па падазрэньні ў зьдзяйсьненьні гэтага нападу. 7 актывістаў моладзевага анархісцкага руху на трое сутак апынуліся ў ізалятары часовага ўтрыманьня, аднак, 6 верасьня іх «перазатрымалі» з парушэньнем крымінальна-працэсуальнага заканадаўства, ужо як быццам бы

па іншым абвінавачваньні. Пасьля трох «перазатрыманьняў» 5 чалавек выйшлі на волю, двое — Аляксандр Францкевіч і Мікалай Дзядок — да гэтага часу знаходзяцца ў зьняволеньні.

Мікалай Дзядок быў затрыманы супрацоўнікамі міліцыі пасьлядоўна 7 разоў па трое сутак, адзін раз нават без тлумачэньня, у чым ён падазраецца. Пасьля гэтага актывіста перавялі ў СІЗА № 1 у Менску. 1 кастрычніка 2010 году яму прад'явілі абвінавачваньне ў арганізацыі несанкцыянаванага мерапрыемства — дэманстрацыі, якая прайшла ў мінулым годзе — 19 верасьня 2009 году. Дэманстранты, у колькасьці прыкладна 30-ці чалавек, выступалі супраць сумесных расійска-беларускіх вучэньняў «Захад-2009», якія праходзілі ў Беларусі ў верасьні 2009 году.

Падчас дэманстрацыі невядомай асобай на тэрыторыю генеральнага штабу Рэспублікі Беларусь была закінутая дымавая шашка. М. Дзядок быў абвінавачаны ў тым, што ён «кіраваў калонай, раздаваў марлевыя павязкі, балончыкі, праводзіў інструктаж». Яго «злачынства» было кваліфікаванае па арт. 339, ч. 2 Крымінальнага кодэксу (хуліганства, учыненае групай асоб). Віну Мікалай Дзядок не прызнае.

З боку сьледчых органаў былі зроблены дзеяньні, якія груба парушаюць законныя правы затрыманых. Так, ніхто з затрыманых не трапляе пад пералік падстаў для затрыманьня, пералічаных у артыкуле 108 Крымінальна-працэсуальнага кодэксу, паколькі — ніхто ня бачыў іх у час зьдзяйсьненьня злачынства, ніхто не паказвае на іх як на асоб, якія зьдзейсьнілі злачынства, няма ніякіх слядоў на вопратцы і г.д.

У дачыненьні да некаторых затрыманых былі парушаныя іх правы на абарону. Напрыклад, адвакат затрыманага Аляксандра Францкевіча ня мог выявіць месцазнаходжаньне свайго падабароннага на працягу трох сутак.

Занепакоенасьць выклікае і сама сітуацыя з «перазатрыманьнямі». Згодна з дзеючымі працэдурамі, дакладна ўстаноўленымі дзеючым заканадаўствам (Крымінальна-працэсуальным кодэксам), па артыкуле 339 КК частцы 1 і частцы 2 затрыманьне не павінна перавышаць 3 сутак. У дадзеным выпадку, сьледчыя органы выкарыстоўвалі затрыманьне спачатку па падазрэньні ў нападзе на расійскую амбасаду, затым — па падазрэньні ў нападзе на Федэрацыю прафсаюзаў, затым яшчэ пад нейкай іншай новай падставе. Такім чынам, груба парушаліся правы затрыманых.

Таксама нашым арганізацыям сталі вядомыя факты псіхалагічнага ціску на затрыманых. У выніку, падчас аднаго з допытаў актывістка Таццяна Семянішчава паспрабавала перарэзаць вены рук канцылярскія нажом. Ад іншых актывістаў патрабавалі паказаньняў аб вінаватасьці Мікалая Дзядка па пададзеным абвінавачваньні, прычым у зваротным выпадку супрацоўнікі міліцыі пагражалі дапытваемым неадкладным затрыманьнем і іншымі «праблемамі».

На дадзены момант у зьняволеньні па-ранейшаму знаходзяцца Мікалай Дзядок, Аляксандр Францкевіч (ён абвінавачваецца ў тым, што здымаў на відэакамеру напад невядомых асобаў на РАУС у г. Салігорску, калі ў маі 2010 году ў будынак аддзяленьня міліцыі былі кінутыя 2 бутэлькі з запальнай сумесьсю), а таксама паўторна затрыманы раней выпушчаны на волю актывіст-анархіст Сяргей Слюсар ў г. Бабруйску (на гэты раз ён падазраецца ў тым, што кінуў «кактэйль Молатава» ў будынак Камітэту дзяржаўнай бясьпекі ў горадзе Бабруйску ў ноч з 16 на 17 кастрычніка 2010 г.).

Міжнародная Федэрацыя за правы чалавека і ПЦ «Вясна» лічаць недапушчальнымі адвольныя затрыманьні і ўзмацненьне ціску на актывістаў моладзевых рухаў, якія суправаджаюцца парушэньнем працэсуальных нормаў з боку сьледчых органаў. Нашы арганізацыі патрабуюць спыніць гэтыя супрацьпраўныя дзеяньні і неадкладна вызваліць затрыманых.

## Беларускія праваабаронцы выступілі з заявай

ЗАЯВА

14 лістапада 2010 году будзе праходзіць Нацыянальная канферэнцыя па выніках дасьледваньняў Індэксу грамадзянскай супольнасьці ў РБ. Арганізатарам дасьледваньня з беларускага боку зьяўляецца старшыня праўленьня ГА «Цэнтр «СКАФ», член Грамадзка-кансультатыўнага савету (АКС) пры Адміністрацыі прэзідэнта Юры Загуменнаў. Адначасова арганізатарам гэтай канферэнцыі пастаўленая мэта стварыць Агульнанацыянальную платформу грамадзянскай супольнасьці, а таксама праваабарончую платформу.

Нягледзячы на тое, што прадстаўнікамі праваабарончых арганізацый неаднаразова выказваліся апасеньні пра:

- неапраўданую хуткасьць і пасьпешлівасьць стварэньня праваабарончай платформы;
- заяўленае імкненьне арганізатараў супрацоўнічаць з уладамі пры адсутнасьці з боку дзяржавы сігналаў згоды да дыялогу з праваабаронцамі і пры тым, што значная частка праваабарончых арганізацыяў у краіне была пазбаўленая і дагэтуль ня мае афіцыйнай рэгістрацыі;
- тое, што ў Крымінальным кодэксе Беларусі дагэтуль прысутнічае арт. 193.1, які прадугледжвае крымінальную адказнасьць за дзейнасьць незарэгістраваных арганізацый;
- тое, што некалькі праваабарончых арганізацый актыўна займаюцца маніторынгам правядзеньня выбараў у гэты перыяд, і іх удзел у стварэньні платформы для паляпшэньня стасункаў паміж праваабарончымі арганізацыямі і ўладамі можа быць расцэнены як фактар, які паўплывае на незалежнасьць і нейтральнасьць правядзеньня маніторынгу выбараў,
- тое, што Агульнанацыянальная платформа грамадзянскай супольнасьці для распрацоўкі механізму яе ўзаемадзеяньня з дзяржаўнымі арганізацыямі і міжнароднымі партнёрамі ствараецца неапраўдана хуткімі тэмпамі без уліку думкі шматлікіх няўрадавых арганізацыяў.

Тым ня менш, як паведаміла інфармацыйнае агенцтва БелаПАН ад 16.10.2010 г., са слоў Ю.Загуменнава, «да канца кастрычніка ў межах праекту АБСЕ будзе ініцыявана стварэньне платформ грамадзянскай супольнасьці па правах чалавека», а 14 лістапада будзе спроба абвясьціць пра стварэньне Агульнанацыянальнай платформы грамадзянскай супольнасьці.

У сувязі з гэтым мы пратэстуем супраць валюнтарысцкага падыходу па стварэньні праваабарончай платформы і Агульнанацыянальнай платформы грамадзянскай супольнасьці без уліку інтарэсаў і меркаваньня дзеючых праваабарончых арганізацый краіны.

Не зразумела, як ішла падрыхтоўка да гэтага мерапрыемства. У лік арганізатараў не ўваходзяць найбуйнейшыя аб’яднаньні няўрадавых арганізацый, напрыклад такіх, як Асамблея НДА, Платформа няўрадавых арганізацый Усходняга партнёрства і г.д.

Праваабарончыя арганізацыі, праваабарончыя групы і асобныя праваабаронцы актыўна працуюць супольна на працягу ўжо больш чым дзесяці гадоў. Вынікам супольнай працы зьяўляюцца грамадзянскія кампаніі, такія як «Праваабаронцы за свабодныя выбары», «Праваабаронцы супраць сьмяротнага пакараньня», «Кампанія за альтэрнатыўную службу», «Кампанія за адмену 193.1», існаваньне сумесных адукацыйных і праваабарончых праектаў (Школа правоў чалавека), праца Дому правоў чалавека ў выгнаньні (Вільня, Літва), сумесная праца беларускіх няўрадавых арганізацый па падрыхтоўцы альтэрнатыўнага дакладу ў межах падрыхтоўкі Ўніверсальнага перыядычнага агляду.

25 верасьня гэтага году быў праведзены 2-гі Форум праваабарончых арганізацый, у якім бралі ўдзел 18 праваабарончых арганізацый з Беларусі. Перамовы і кансультацыі паміж праваабарончымі арганізацыямі вядуцца пастаянна падчас беларускіх і міжнародных праваабарончых сустрэч і мерапрыемстваў.

Такім чынам, рэальная платформа беларускіх праваабарончых ініцыятываў існуе ўжо не адзін год. Тым ня менш, мы адзначаем амаль поўную адсутнасьць жаданьня беларускіх уладаў улічваць думку праваабаронцаў па найважнейшых пытаньнях, якія датычаць сацыяльных, грамадзянскіх і палітычных правоў беларускіх грамадзян, выкананьня прынятых на сябе міжнародных абавязкаў у галіне правоў чалавека.

Мы заяўляем, што ў выпадку згоды і жаданьня беларускіх уладаў да супрацоўніцтва з праваабарончымі арганізацыямі, мы гатовыя да такога супрацоўніцтва на прынцыпах, прапанаваных у распрацаванай пад эгідай Асамблеі НДА Канцэпцыі ўзаемадзеяньня органаў дзяржаўнай улады і грамадзянскай супольнасьці. Праваабаронцы і надалей будуць працягваць сваю працу, дзеля ўмацаваньня правоў чалавека і разьвіцьця дэмакратыі.

Праваабарончы цэнтр «Вясна»
Алесь Бяляцкі

Камітэт абароны рэпрэсаваных «Салідарнасьць»
Іна Кулей

Беларуская асацыяцыя журналістаў
Жана Літвіна

«Незалежнае таварыства прававых дасьледваньняў»
Алена Танкачова

ГА «Цэнтр па правах чалавека»
Раіса Міхайлоўская

Выпускнік Вышэйшага міжнароднага курса па абароне правоў чалавека
Барыс Звозскаў

Беларускі Дом правоў чалавека
Тацяна Рэвяка

Асьветніцкая праваабарончая ўстанова «Офіс па правах людзей з інваліднасьцю»
Сяргей Драздоўскі

ГА Магілёўскі праваабрончы цэнтр
Уладзімір Краўчанка

Праваабарончы цэнтр «Прававая дапамога насельніцтву»
Алег Волчак

Менск, 11.11.2010

## Праваабарончы цэнтр «Вясна» выказвае занепакоенасьць сітуацыяй з асуджаным прадпрымальнікам Андрэем Бандарэнкам

Заява

Менск, 24.11.2010 г.

Сябра Нацыянальнага камітэту Аб’яднанай грамадзянскай партыі, кандыдат у дэпутаты падчас парламенцкіх выбараў 2008 г. Андрэй Бандарэнка адбывае пакараньне ў бабруйскай калоніі, дзе ў дачыненьні да

яго неаднаразова ўжываўся ціск з боку адміністрацыі папраўчай установы, а менавіта: незаконнае зьмяшчэньне ў карцэр некалькі разоў запар, беспадстаўныя дысцыплінарныя пакараньні, адмовы ў медычнай дапамозе. Да таго ж, ёсьць інфармацыя, што на Андрэя Бандарэнку аказваўся псіхалагічны ціск — яму пагражалі «выпадковай сьмерцю». Дадзеныя факты сьведчаць аб выкарыстаньні ў дачыненьні да А. Бандарэнкі жорсткіх, бесчалавечных, прыніжаючых чалавечую годнасьць відаў абыходжаньня, якія прыраўніваюцца да катаваньняў.

Зьвяртаем увагу, што Андрэй Бандарэнка быў асуджаны 23.02.2010 за «крадзёж праз махлярства» да 6 гадоў зьняволеньня. Свой прысуд прадпрымальнік лічыць палітычна матываваным. З 15 чэрвеня па 7 ліпеня 2010 г. у знак пратэсту А.Бандарэнка трымаў галадоўку. Праваабарончы цэнтр «Вясна» не выключае палітычнага матыву перасьледу А. Бандарэнкі. Вынесены ў дачыненьні А. Бандарэнкі прысуд таксама выклікае сумневы ў ягонай абаснаванасьці і законнасьці.

У сувязі з гэтым Праваабарончы цэнтр «Вясна» зьвяртаецца да беларускіх уладаў і ў першую чаргу да прадстаўнікоў Міністэрства ўнутраных справаў і заклікае не дапускаць парушэньня правоў асуджанага А. Бандарэнкі і забясьпечыць яму належныя ўмовы адбыцьця пакараньня. Мы патрабуем неадкладна спыніць пагрозу жыцьцю і здароўю асуджанаму прадпрымальніку і палітычнаму дзеячу.

## ПЦ «Вясна» пратэстуе супраць кампаніі тэрору ў адносінах да іншадумцаў і палітычных апанентаў

Заява

2 студзеня 2011 г.

Праваабарончы цэнтр «Вясна» выказвае рашучы пратэст супраць распачатай у Беларусі кампаніі тэрору ў адносінах да іншадумцаў і палітычных апанентаў дзеючай улады.

Пачынаючы з 19 сьнежня 2010 году, краіну захлынула хваля палітычных рэпрэсій. 29-30 сьнежня былі прад’яўлены афіцыйныя абвінавачаньні па ч.1 і 2 арт. 293 Крымінальнага кодэксу Рэспублікі Беларусь (арганізацыя і ўдзел у масавых беспарадках) 22 падазра-

ваным, якія ўтрымліваюцца ў СІЗА КДБ, у тым ліку пяці кандыдатам у прэзідэнты: Андрэю Саньнікаву, Мікалаю Статкевічу, Аляксею Міхалевічу, Уладзіміру Някляеву і Віталю Рымашэўскаму. Акрамя кандыдатаў у прэзідэнты, абвінавачаньні прад'яўлены кіраўнікам іх передвыбарчых штабоў, журналістам, іншым вядомым дзеячам апазіцыі. Адносна ўсіх іх абрана мера стрыманьня ў выглядзе ўтрыманьня пад вартай на два месяцы.

Яшчэ як мінімум 9 чалавек знаходзяцца ў статусе падазраваных па крымінальнай справе аб масавых беспарадках, у тым ліку два кандыдаты ў прэзідэнты — Рыгор Кастусёў і Дзьмітрый Ус, а таксама двое грамадзян Расійскай Федэрацыі.

Дагэтуль у ізалятары часовага ўтрыманьня г. Мінску знаходзяцца старшыня моладзевай арганізацыі «Малады Фронт» Зьміцер Дашкевіч і актывіст гэтай арганізацыі Эдуард Лобаў па падазрэньні ў зьдзяйсьненьні злоснага хуліганства.

Больш за 200 чалавек працягваюць утрымлівацца ў месцах пазбаўленьня волі ў якасьці адміністрацыйна арыштаваных за ўдзел у акцыі пратэсту ў Менску 19 сьнежня і наступных акцыях салідарнасьці з палітзьняволенымі. Усяго арыштам і штрафам на працягу апошніх дзесяці дзён падвергнуты больш за 700 чалавек.

Асаблівую занепакоенасьць Праваабарончага цэнтру «Вясна» выклікае інфармацыя аб выкарыстаньні катаваньняў у адносінах затрыманых, неаказаньні своечасовай медыцынскай дапамогі, ужываньні метадаў псіхалагічнага ціску.

З 20 сьнежня пачаліся масавыя вобшукі і допыты актывістаў апазіцыйных палітычных партый, грамадскіх арганізацый, незалежных СМІ. Сотні актывістаў апазіцыі, прадстаўнікоў незалежнай грамадзянскай супольнасьці, журналісты падвяргаюцца пагрозам і запалохваньню з боку органаў КДБ і МУС.

Падверגліся вобшукам памяшканьні праваабарончых арганізацый і праваабаронцаў як у Менску, так і ў рэгіёнах краіны. Дзейнасьць праваабаронцаў спрабуюць дыскрэдытаваць у вачах грамадства.

Пад ціск уладаў патрапілі і адвакаты, якія абараняюць абвінавачаных па крымінальнай справе аб масавых беспарадках.

Праваабарончы цэнтр «Вясна» выказвае рашучы пратэст з нагоды разьвязваньня ўладамі Беларусі масавых палітычных рэпрэсій у краіне і заяўляе:

— Выбары Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь не зьяўляліся свабоднымі і дэмакратычнымі. Вынікі выбараў, абвешчаныя ЦВК, ніякім чынам не адлюстроўваюць рэальнага волевыяўленьня грамадзян Беларусі.

— Акцыя пратэсту па выніках недэмакратычных і несвабодных выбараў насіла мірны характар. Грамадзяне, якія сабраліся ў цэнтры Менску, мелі мірныя мэты і імкнуліся мірным шляхам выказаць сваё меркаваньне і пратэст.

— Інцыдэнт з біцьцём шыбаў у будынку Дому ўраду ня быў прадухілены органамі аховы правапарадку. Дэманстратыўнае бязьдзеяньне органаў МУС, якія ў вялікай колькасьці былі сканцэнтраваны на плошчы Незалежнасьці, указвае на арганізаваную ўладамі правакацыю.

— Дзеяньні органаў міліцыі пры разгоне дэманстрацыі насілі відавочна непрапарцыйны характар. Ужываньне фізічнай сілы і сьпецсродкаў прывяло да вялікай колькасьці параненых удзельнікаў мірнай акцыі пратэсту.

— Напад прадстаўнікоў сьпецслужбаў у цывільным на кандыдата ў прэзідэнты Уладзіміра Някляева і ягоных прыхільнікаў меў відавочна правакацыйны, пазапраўны характар.

— Зьбіцьцё і арышт фактычна ўсіх кандытаў у прэзідэнты, якія апаніравалі А. Лукашэнку на выбарах, зьяўляецца нічым іншым, як палітычнай расправай.

— Узбуджэньне КДБ крымінальнай справы па ч.1 і 2 арт. 293 Крымінальнага кодэксу (масавыя беспарадкі) выкарыстоўваецца выключна для працяглай ізаляцыі лідэраў апазіцыйнага дэмакратычнага руху, а таксама ў мэтах ціску і запалохваньня ўсёй незалежнай грамадзянскай супольнасьці краіны, незалежных журналістаў і СМІ, а таксама ўсіх іншадумцаў у краіне.

Праваабарончы цэнтр «Вясна» патрабуе неадкладнага вызваленьня ўсіх арыштаваных і спыненьня рэпрэсій у дачыненьні да апазіцыйных лідэраў і актывістаў, прадстаўнікоў грамадзянскай супольнасьці і незалежных СМІ.

Праваабарончы цэнтр «Вясна» выказвае салідарнасьць з усімі арыштаванымі за свае погляды, членамі іх сем’яў і заклікае прадстаўнікоў беларускай грамадзкасьці і міжнароднай супольнасьці да салідарызацыі з усімі рэпрэсаванымі.

Праваабарончы цэнтр «Вясна» заклікае ўрады краін Еўрапейскага Саюзу, ЗША, міжнародныя арганізацыі асудзіць рэпрэсіі і масавыя парушэньні правоў чалавека ў Беларусі і прадпрыняць усе магчымыя захады для іх неадкладнага спыненьня.

# 2. Іншыя дакументы

**Рэзалюцыя II Беларускага праваабарончага форуму «Становішча з правамі чалавека ў Беларусі застаецца недапушчальна кепскім і патрабуе сістэмных захадаў па выпраўленьні»**

**Вільня, 25.09.2010**

«Мы, удзельнікі II Беларускага праваабарончага форуму, ацэньваючы разьвіцьцё становішча з правамі чалавека ў Рэспубліцы Беларусь з часу правядзеньня мінулага Форуму ў студзені 2004 году, з расчараваньнем канстатуем, што паводле асноўных параметраў сітуацыя з правамі чалавека ў нашай краіне застаецца стабільна нездавальняючай.

Па найбольш балючых кропках, якія былі пазначаны праваабаронцамі ў 2004 годзе, так і не было зафіксавана ўстойлівага прагрэсу:

- Рэальна не забясьпечаны гарантаваныя Канстытуцыяй Рэспублікі Беларусь правы і свабоды, многія з прынятых заканадаўчых актаў не адпавядаюць міжнародным стандартам у галіне правоў чалавека, што закладае аснову для парушэньня канстытуцыйных правоў грамадзянаў;
- Беларусь па-ранейшаму ігнаруе ўзятыя на сабе міжнародна-прававыя абавязацельствы ў галіне правоў чалавека, у тым ліку рашэньні Камітэту па правах чалавека ААН, што прыняты ў дачыненьні да Беларусі;
- Адсутнасьць незалежнай судовай сістэмы як самастойнай галіны ўлады фактычна пазбаўляе грамадзянаў магчымасьці абараніць парушаныя правы ў судовым парадку, абмяжоўвае доступ да правасуддзя;

- Да гэтага часу не праведзена поўнае, аб’ектыўнае і галоснае расьследаваньне зьнікненьняў Юрыя Захаранкі, Віктара Ганчара і Анатоля Красоўскага, афіцыйнае расьследваньне справы аб зьнікненьні Дзьмітрыя Завадзкага прыпынена 31 сакавіка 2006 году і з тых часоў не ўзнаўлялася;

- Беларусь застаецца адзінай краінай Еўропы і постсавецкай прасторы, якая да гэтага часу ня толькі практыкуе сьмяротныя прысуды, але і прыводзіць іх у выкананьне;

- У краіне захоўваецца інстытут палітычных зьняволеных, у крымінальным і адміністрацыйным парадку перасьледуюцца апаненты існуючага рэжыму;

- Інфармацыйная прастора татальна кантралюецца ўладай, палітыка якой у дачыненьні да недзяржаўных СМІ і журналістаў застаецца жорсткай і дыскрымінацыйнай;

- Не забясьпечаны свабода сходаў і асацыяцый. Працягваюцца ліквідацыі ў судовым парадку і адмовы ў рэгістрацыі некамерцыйных арганізацый, уведзена забарона на іх дзейнасьць у незарэгістраваным статусе (артыкул 193-1 Крымінальнага кодэксу). 17 асобаў асуджаны па дадзеным артыкуле;

- Не забясьпечана рэальная роўнасьць двух дзяржаўных моваў.

У той жа час па некаторых параметрах у асобныя перыяды за апошнія пяць год назіралася пэўная станоўчая дынаміка. У сувязі з гэтым мы вітаем:

- Датэрміновае вызваленьне некаторых палітычных зьняволеных.

- Распачаты дыялог з Еўрапейскім Саюзам па пытаньнях правоў чалавека.

- Прадстаўленьне нацыянальнай справаздачы ў межах Універсальнага перыядычнага агляду ААН.

- Кропкавыя захады па лібералізацыі ўнутранай палітыкі, у тым ліку зьвязаныя з памяншэньнем размаху палітычных рэпрэсій пасьля іх эскалацыі ў 2006 годзе, рэгістрацыяй асобных грамадзкіх арганізацый і вяртаньнем у дзяржаўныя сеткі распаўсюду часткі недзяржаўных СМІ, стварэньнем Грамадзка-кансультатыўнага Савету пры Адміністрацыі прэзідэнта і Каардынацыйнага Савету ў сьферы масавай інфармацыі і запрашэньнем у іх склад асобных прадстаўнікоў праваабарончай супольнасьці краіны.

Аднак кропкавыя і збольшага несістэмныя жэсты добрай волі засталіся малазначнымі на фоне агульнага грэблівага стаўленьня

дзяржаўных органаў да каштоўнасьцяў правоў чалавека і асноўных свабод: незваротных і сістэмных зьменаў да лепшага не адбываецца.

Мы выказваем глыбокае расчараваньне ў сувязі з непрыманьнем дзяржаўнымі ўладамі большасьці рэкамендацый па асабліва вострых праблемах у галіне правоў чалавека, зробленых Саветам па правах чалавека ААН падчас разгляду Ўніверсальнага перыядычнага агляду ў траўні 2010 году.

**Мы заклікаем урад Беларусі** да

- Перагледзець сваё меркаваньне і прадпрыняць усемагчымыя захады па выкананьні рэкамендацый, якія былі зроблены Саветам па правах чалавека ААН па выніках праходжаньня Рэспублікай Беларусь працэдуры Ўніверсальнага перыядычнага агляду.
- Абвяшчэньня мараторыя на выкананьне сьмяротных прысудаў з наступным скасаваньнем сьмяротнага пакараньня.
- Скасаваньня забароны на дзейнасьць незарэгістраваных грамадзкіх аб'яднаньняў і іншых структур грамадзянскай супольнасьці, у тым ліку да скасаваньня артыкулу 193.1 Крымінальнага кодэксу.
- Ажыцьцяўленьня захадаў па выкананьні рашэньняў Камітэту па правах чалавека ААН, прынятых па справах парушэньняў Пакту аб грамадзянскіх і палітычных правах з боку Рэспублікі Беларусь.
- Далучэньня Беларусі да Факультатыўнага пратаколу, да Міжнароднага Пакту аб эканамічных, сацыяльных і культурных правах.
- Забесьпячэньня рэальнай роўнасьці двух дзяржаўных моваў Рэспублікі Беларусь: выданьня ўсёй заканадаўчай базы на беларускай і рускай мовах; забесьпячэньня ўсім жадаючым магчымасьці атрымаць адукацыю на беларускай мове; роўнага выкарыстаньня дзяржаўных моваў у дзяржаўных СМІ, на радыё і тэлебачаньні; на практыцы рэалізаваць свабоду ад дыскрымінацыі грамадзянаў па прыкмеце мовы.

Мы гатовы прыкласьці і свае ўласныя намаганьні дзеля таго, каб дапамагчы беларускаму ўраду ажыцьцявіць гэтыя і іншыя захады па набліжэньні нашай краіны да міжнародных і еўрапейскіх стандартаў правоў чалавека. У сувязі з гэтым лічым сваім доўгам адзначыць, што далучэньне нашай краіны да еўрапейскіх механізмаў, якія б

давалі нашым грамадзянам еўрапейскі ўзровень гарантый грамадзка-палітычных і сацыяльна-эканамічных правоў у адпаведнасьці са стандартамі Савету Еўропы магчымы толькі тады, калі наша дзяржава пазбавіцца ад сьмяротнага пакараньня — гэтага варварскага рудыменту, які ставіць Беларусь у сітуацыю ізгоя на еўрапейскім кантыненьце.

У сьвятле бягучага грамадзка-палітычнага парадку дня мы таксама заклікаем беларускі ўрад у бліжэйшай кароткатэрміновай перспектыве:

- вызваліць палітычных зьняволеных і аднавіць правы асобаў, якія былі пакараны і/ці застаюцца часткова пазбаўленымі правоў на падставе іх палітычных меркаваньняў ці грамадзкай дзейнасьці, уключна з аднаўленьнем па месцы вучобы адлічаных студэнтаў і па месцы працы звольненых грамадзка-палітычных дзеячоў.
- устрымацца ад палітычных рэпрэсій супраць удзельнікаў выбарчай кампаніі на выбарах прэзідэнта ў сьнежні 2010 году і правесьці гэтыя выбары ў адпаведнасьці з нормамі нацыянальнага права і крытэрыямі свабодных і справядлівых выбараў АБСЕ.
- не ўжываць дадатковых абмежавальных захадаў супраць незалежных медыяў, свабоды слова, у тым ліку не пераўтвараць зьдзейсьненае ў 2010 годзе рэгуляваньне Інтэрнэту ў сродак цэнзуры.
- не накладаць дадатковых абмежаваньняў на стварэньне і дзейнасьць грамадзкіх аб’яднаньняў і іншых форм некамерцыйных арганізацый, у тым ліку не дапусьціць пагаршэньня іх стану ў сувязі з распрацоўкай праекту закону «Аб некамерцыйных арганізацыях».

Мы выказваем упэўненасьць, што крокі, прадпрынятыя ў дадзеным накірунку, дазволяць пераадолець негатыўны міжнародны імідж і самаізаляцыю Беларусі, будуць спрыяць стварэньню дзяржаўнай сістэмы ўлады, дзе выконваюцца і паважаюцца правы і свабоды чалавека, стануць трывалым падмуркам для разьвіцьця грамадзянскай супольнасьці ў краіне».

## Ацэнка падзеяў, зьвязаных з выбарамі прэзідэнта: пазіцыя Праваабарончага цэнтру «Вясна»

### Несвабодны характар выбараў як каталізатар масавага пратэсту

Праваабарончы цэнтр «Вясна», зьяўляючыся адным з суб’ектаў нацыянальнай маніторынгавай місіі «Праваабаронцы за свабодныя выбары», адзначае некаторыя паляпшэньні падчас асобных этапаў выбарчай кампаніі, аднак у цэлым ацэньвае прэзідэнцкія выбары 2010 году як не адпавядаючыя шэрагу ключавых міжнародных стандартаў дэмакратычнасьці выбараў.

Выбары Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь не прызнаныя свабоднымі і дэмакратычнымі і міжнароднай місіяй назіраньня за выбарамі БДІПЧ АБСЕ.

Адзначым, што пачынаючы з 1996 г. усе выбарчыя кампаніі, у тым ліку прэзідэнцкія 2001, 2006 гг., не прызнаваліся АБСЕ адпавядаючымі міжнародным стандартам у галіне свабодных і дэмакратычных выбараў.

Трэба адзначыць, што ўсе выбарчыя кампаніі за апошнія пятнаццаць гадоў, асабліва прэзідэнцкія, маюць загадзя прадказальны характар і даўно ўжо не зьяўляюцца рэальнай формай рэалізацыі грамадзянамі краіны канстытуцыйнага права ўдзелу ў кіраваньні краінай і формай рэальнага народаўладдзя. У зьвязку з гэтым палітычныя суб’екты ўспрымаюць выбары хутчэй як палітычную кампанію, а ня як рэальную магчымасьць зьмены ўлады шляхам усеагульнага галасаваньня.

Практычна ўсе выбарчыя кампаніі і рэферэндумы агульнанацыянальнага ўзроўню (выбары дэпутатаў Палаты прадстаўнікоў, прэзідэнцкія выбары) заканчваюцца акцыямі пратэсту супраць іх недэмакратычнага і несвабоднага характару. Нягледзячы на мірны характар гэтых сходаў, органы міліцыі жорстка падаўляюць такія выступы. Іх удзельнікі падвяргаюцца адміністрацыйным арыштам, зьбіцьцю. Нярэдкія выпадкі прыцягненьня да крымінальнай адказнасьці актывістаў апазіцыі за арганізацыю і ўдзел у такіх акцыях. Так, за арганізацыю мірных акцый пратэсту супраць вынікаў парламенцкіх выбараў і рэферэндуму аб зьменах Канстытуцыі (ліквідацыі абмежаваньня прэзідэнцкіх тэрмінаў) да крымінальнай адказнасьці за

«арганізацыю групавых дзеяньняў, якія парушаюць грамадзкі парадак» былі прыцягнутыя лідэры апазіцыі **М.Статкевіч** і **П.Севярынец**.

У 2006 г. за ўдзел у шэрагу мірных акцый пратэсту супраць вынікаў прэзідэнцкіх выбараў да адміністрацыйнай адказнасьці ў выглядзе арыштаў было прыцягнута больш за 700 чалавек.

Фактычна пасьля заканчэньня кожных прэзідэнцкіх выбараў у Беларусі адбываюцца арышты асобаў, якія балатаваліся на выбарах у якасьці кандыдатаў у Прэзідэнты ці зьбіралі подпісы за сваё вылучэньне ў якасьці кандыдатаў. У 2001 г. быў арыштаваны і прыгавораны да пазбаўленьня волі **Міхаіл Марыніч**, пасьля выбараў 2006 г. да 5,5 гадоў пазбаўленьня волі быў прыгавораны адзін з кандыдатаў у Прэзідэнты **Аляксандр Казулін**.

**Рэакцыя ўладаў.**

Як і падчас прэзідэнцкіх выбараў 2006 г. улады рабілі актыўныя захады па прадухіленьні магчымых масавых пратэстаў грамадзянаў супраць несвабодных выбараў.

У гэтых мэтах выкарыстоўваліся дзяржаўныя СМІ, найперш дзяржаўнае тэлебачаньне. Грамадзянаў загадзя запалохвалі правакацыямі, якія нібыта рыхтуюцца апазіцыяй.

10 сьнежня 2010 г. Генеральная пракуратура Рэспублікі Беларусь вынесла пяці кандыдатам у прэзідэнты афіцыйныя папярэджаньні аб недапушчальнасьці парушэньня заканадаўства. Папярэджаньні атрымалі **Уладзімір Някляеў**, **Віталь Рымашэўскі**, **Мікалай Статкевіч**, **Яраслаў Раманчук** *і* **Андрэй Саньнікаў**. Нагодай сталі заклікі кандыдатаў да правядзеньня несанкцыянаванай акцыі на Кастрычніцкай плошчы ў Менску пасьля заканчэньня галасаваньня 19 сьнежня 2010 г. Прычым кандыдаты **М.Статкевіч** *і* **В.Рымашэўскі** такім чынам былі папярэджаныя паўторна. Першае папярэджаньне Генпракуратурай было ім вынесенае за заклікі прыняць удзел у несанкцыянаванай акцыі на Кастрычніцкай плошчы 24 лістапада 2010 году.

На наступны дзень, 11 сьнежня 2010 г., кіраўнік Адміністрацыі Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь **Уладзімір Макей** зрабіў афіцыйную заяву, якая была шырака растыражаваная праз дзяржаўныя СМІ. Згодна з ягонай заявай апазіцыйныя кандыдаты ў прэзідэнты, заклікаючы прыхільнікаў сабрацца ў дзень выбараў 19 сьнежня на

Кастрычніцкай плошчы Менску, насамрэч рыхтуюць правакацыі, у тым ліку з ужываньнем выбуховых рэчываў. «Цяпер ужо вядома, што яны не зьбіраюцца мірным чынам праводзіць гэта мерапрыемства і рыхтуюць групы баевікоў. Думаю, што ва ўлады дастаткова сіл і сродкаў, каб адрэагаваць спакойна і годна на падобнага роду сітуацыі», — дадаў кіраўнік прэзідэнцкай адмінстрацыі.

Сьпецыяльную нараду з сілавікамі «па пытаньнях бясьпекі падчас выбараў» 15 сьнежня 2010 году правёў **А.Лукашэнка**, дзе ён заявіў: «Рэакцыя праваахоўных органаў і вайскоўцаў таксама мусіць быць адэкватнай і жорсткай». Паводле **А. Лукашэнкі**, «народу ніякая Плошча не патрэбная», а тыя з лідэраў апазіцыі, якія на яе клічуць, самі «пахаваюцца». Ён даручыў дзяржаўнаму сакратару Рады бясьпекі **Леаніду Мальцаву** скаардынаваць дзейнасьць праваахоўных органаў падчас выбараў.

Таксама пагражальныя і папераджальныя заявы рабілі старшыня КДБ **Вадзім Зайцаў**, Генеральны Пракурор **Рыгор Васілевіч**, Міністр Унутраных справаў **Анатоль Куляшоў**.

**Падзеі 19 сьнежня**

Акцыя пратэсту супраць несвабодных выбараў планавалася і анансавалася апазіцыйнымі кандыдатамі ў прэзідэнты як выключна мірны масавы сход. Разам з тым, напярэдадні дня выбараў пачаліся прэвентыўныя затрыманьні патэнцыйных удзельнікаў акцыі, што набыло масавы характар у асноўны дзень галасаваньня 19 сьнежня: па ўсёй краіне арыштоўваліся, блакаваліся ў кватэрах, здымаліся з транспартных сродкаў і іншым чынам ізаляваліся грамадзкія і палітычныя актывісты, давераныя асобы кандыдатаў і сябры перадвыбарчых штабоў. Пра кіруемы і спланаваны характар гэтых дзеяньняў сьведчаць словы **А.Лукашэнкі** пасьля галасаваньня на выбарчым участку № 1 у Менску: «Не перажывайце, нікога сёньня на плошчы ня будзе».

Свой намер правядзеньня акцыі ў выключна мірным рэчышчы ў дзень выбараў выказалі кандыдаты ў прэзідэнты **Уладзімір Някляеў**, **Рыгор Кастусёў**, **Віталь Рымашэўскі**, **Алесь Міхалевіч** і **Яраслаў Раманчук** у звароце да Генеральнага пракурора Беларусі, які быў перададзены ў 16 гадзін. Акрамя патрабаваньня спыніць прэвентыўныя затрыманьні па краіне, кандыдаты прапанавалі Генеральнаму пракурору самому прыйсьці

на Кастрычніцкую плошчу, каб даць ацэнку дзеяньням праваахоўных органаў і дэманстрантаў.

Яшчэ да пачатку акцыі, якая была запланавана на 20 гадзін на Кастрычніцкай плошчы, стала зразумела, што ўлады не зьбіраюцца дапусьціць масавага і доўгатэрміновага пратэсту ў цэнтры сталіцы і маюць свой план разьвіцьця падзеяў.

У 19.10 па дарозе на Кастрычніцкую плошчу быў зьдзейсьнены напад супрацоўнікамі сьпецслужбаў у штацкім на калону прыхільнікаў кандыдата ў прэзідэнты **Уладзіміра Някляева**. Усе прысутныя журналісты былі пакладзеныя тварам у сьнег, відэаапаратура была наўмысна пашкоджаная. Сам кандыдат быў зьбіты і з траўмамі дастаўлены ў бальніцу хуткай дапамогі. Падчас нападу былі выкарыстаны выбуховыя пакеты, канфіскавана гукаўзмацняльная апаратура, якая меркавалася быць выкарыстанай на акцыі . Гэта стала сур’ёзным сігналам, што сьпецслужбы дзейнічаюць па загадзя выпрацаваным сцэнары і гатовы да выкарыстаньня любых незаконных сілавых і правакацыйных дзеяньняў. Галоўны пасыл такога разьвіцьця падзеяў быў сфармуляваны ў выказваньні **А. Лукашэнкі** 19 сьнежня: «Я з бандытамі і дыверсантамі дыялогу не вяду».

Акцыя пратэсту на Кастрычніцкай плошчы, якая сабрала па розных ацэнках ад 20 да 40 тысяч удзельнікаў, пачалася ў запланаваны час і праходзіла выключна ў мірным рэчышчы, супрацоўнікі міліцыі не перашкаджалі яе правядзеньню. Ня ўмешвалася міліцыя ў дзеяньні дэманстрантаў нават тады, калі калона перакрыла прасьпект Незалежнасьці. Падчас руху ў накірунку плошчы Незалежнасьці дэманстранты скандавалі лозунгі, трымалі ў руках сьцягі і транспаранты, ніякіх прадметаў, якія б сьведчылі пра намеры гвалтоўных дзеяньняў, у іх руках не было зафіксавана. На плошчы Незалежнасьці каля Дому ўраду ніводзін з прысутных кандыдатаў і іншых выступоўцаў не заклікаў да захопу будынку органу дзяржаўнага кіраваньня, вялася размова пра перамовы і працяг акцыі пратэсту 20 сьнежня на гэтай жа плошчы. Разам з тым, у 22 гадзіны, нягледзячы на вялікую канцэнтрацыю сілавых структур, невядомымі былі разьбіты дзьверы і вокны ў Доме ўраду, пры гэтым праваахоўныя органы ніяк не рэагавалі на паводзіны людзей, якія зьдзяйсьнялі супрацьпраўныя дзеяньні, не спрабавалі іх спыніць і ізаляваць ад іншых дэманстрантаў. Падобныя дзеяньні сіл правапарадку сьведчаць пра спланаваны і кіруемы

характар зьдзейсьненай правакацыі з мэтай апраўданьня далейшых сілавых захадаў супраць удзельнікаў акцыі пратэсту.

**Дзеяньні міліцыі**

По меркаваньні назіральнікаў Праваабарончага цэнтру «Вясна» і іншых праваабарончых арганізацыяў, якія ажыцьцяўлялі назіраньне за правядзеньнем акцыі 19 сьнежня на плошчы Незалежнасьці, дзеяньні міліцыі па сілавому разгону мітынгу мелі відавочна непрапарцыйны характар. У дачыненьні да мірных дэманстрантаў, у тым ліку супраць жанчын, непаўнагадовых, ужывалася фізічная сіла і сьпецыяльныя сродкі ў выглядзе гумавых палак. Гэта прывяло да вялікай колькасьці параненых сярод удзельнікаў дэманстрацыі. Дзясяткі параненых былі вымушаны зьвярнуцца па медыцынскую дапамогу. Большая частка дэманстрантаў была затрыманая ўжо пасьля разгону мітынгу на далёкай адлегласьці ад месца яго правядзеньня. Таксама вядомыя некалькі выпадкаў затрыманьня зусім выпадковых людзей.

Вядома, што для сілавога разгону мітынгу былі задзейнічаныя розныя сьпецыяльныя падразьдзяленьні міліцыі з розных гарадоў Беларусі, а таксама ваеннаслужачыя тэрміновай службы ўнутраных войск, слухачы Акадэміі МУС.

Падчас сілавога разгону мітынгу былі зьбітыя кандыдаты ў прэзідэнты **Віталь Рымашэўскі**, **Андрэй Саньнікаў**, **Рыгор Кастусёў**.

Па сьведчаньнях затрыманых, у дачыненьні да іх супрацоўнікамі міліцыі ўжывалася фізічная сіла, а таксама іншыя віды бесчалавечнага абыходжаньня, яны падвяргаліся абразам і прыніжэньням: людзей кідалі на падлогу машын, пры гэтым супрацоўнікі міліцыі хадзілі па іх сьпінах, людзям пагражалі фізічнай расправай, абражалі іх годнасьць нецэнзурнай лаянкай.

Усе затрыманыя на плошчы дастаўляліся ў РУУСы г. Менску для складаньня пратаколаў аб адміністрацыйным правапарушэньні па арт. 23.34 КаАП Рэспублікі Беларусь (парушэньне парадку арганізацыі ці правядзеньня масавага мерапрыемства). Вялікая група затрыманых была дастаўленая адразу ў ЦІП на вул. Акрэсціна ў г. Менску. У некаторых РУУСах працэдура афармленьня складала некалькі гадзінаў і ўвесь гэты час затрыманыя стаялі тварам да сцяны. У ЦІП затрыманыя таксама шмат гадзінаў (да 8 і болей) правялі ў калідоры, сто-

ячы тварам да сьцяны, некаторыя з затрыманых чакалі сваёй чаргі ў машынах. Пры гэтым людзям не давалі піць, адзначаліся выпадкі зьбіцьця і абразаў затрыманых з боку супрацоўнікаў міліцыі.

Таксама трэба адзначыць, што міліцыя не паведамляла сваякам затрыманых аб месцы іх знаходжаньня. Інфармацыя аб тым, у якіх ІЧУ ці ЦІП утрымліваюцца адміністрацыйна арыштаваныя, адсутнічала і прадстаўлялася толькі пры непасрэдным тэлефанаваньні сваякоў дзяжурным гэтых установаў. Усяго вядома аб чатырох месцах утрыманьня адміністрацыйна арыштаваных: ІЧУ г.Жодзіна, ІЧУ РУУС Менскага раёну (жанчыны), ІЧУ г.Менску і ЦІП ГУУС Менгарвыканкаму на вул.Акрэсьціна ў г.Менску.

Трэба адзначыць, што супрацоўнікі міліцыі пры выкананьні сваіх службовых абавязкаў ня мелі на вопратцы бэйджаў з прозьвішчамі ці індывідуальных нумароў. Гэтая акалічнасьць значна ўскладняе ідэнтыфікацыю супрацоўнікаў міліцыі пры высьвятленьні пытаньняў аб перавышэньні імі службовых паўнамоцтваў і парушэньні правоў чалавека, а таксама спрыяе адчуваньню беспакаранасьці і ананімнасьці ў супрацоўнікаў міліцыі.

*Даведка: арт. 23.34 КаАП Рэспублікі Беларусь прадугледжвае адміністрацыйную адказнасьць за парушэньне ўстаноўленага парадку арганізацыі ці правядзеньня сходу, мітынгу, вулічнага шэсьця, дэманстрацыі, іншага масавага мерапрыемства ці пікетаваньня. Артыкул складаецца з трох частак: першая частка прадугледжвае адказнасьць для ўдзельнікаў такіх масавых мерапрыемстваў, якія на працягу году не прыцягваліся да адказнасьці за такія правапарушэньні. Санкцыя ч.1 арт. 23.34 —папярэджаньне, ці штраф у памеры да 30 б.в., ці адміністрацыйны арышт да 15 сутак.*

*Частка 2 прадугледжвае адказнасьць для арганізатараў такіх мерапрыемстваў. Санцыя — штраф у памеры ад 20 да 40 б.в, ці арышт да 15 сутак.*

*Частка трэцяя для асобаў, якія на працягу году зьдзейсьнілі правапарушэньне паўторна. Санкцыя — штраф у памеры ад 20 да 50 б.в., ці арышт да 15 сутак.*

*Парадак арганізацыі і правядзеньня масавых мерапрыемстваў рэгулюецца Законам Рэспублікі Беларусь «Аб масавых мерапрыемствах».*

**Суды над адміністрацыйна затрыманымі за ўдзел у акцыі 19 сьнежня 2010 году**

Усе 9 раённых судоў г. Менску разглядалі адміністрацыйныя справы затрыманых удзельнікаў мітынгу на плошчы Незалежнасьці. У выніку было асуджана каля 700 чалавек. Справы разглядаліся суддзёй з удзелам сакратара судовага паседжаньня. У сярэднім адзін судовы працэс займаў 10-15 хвілінаў. Інфармацыя аб тым, якія суды будуць разглядаць справу той ці іншай асобы, адсутнічала, сьпісы з прозьвішчамі затрыманых адсутнічалі практычна ва ўсіх судах. У судах Маскоўскага і Савецкага раёнаў суды прайшлі ў закрытым рэжыме: на іх не дапускалі прадстаўнікоў СМІ, сваякоў затрыманых, прадстаўнікоў грамадзкасьці. Цяжкасьці з доступам у судовыя працэсы былі таксама ў судах Ленінскага, Кастрычніцкага, Партызанскага, Заводскага раёнаў.

Праваабарончым цэнтрам «Вясна» было падрыхтавана больш за 20 скаргаў у Менскі гарадзкі суд на пастановы судоў аб прыцягненьні да адміністрацыйнай адказнасьці і прааналізавана больш за 150 вынесеных судамі пастановаў адносна затрыманых 19 сьнежня асобаў.

На падставе гэтага аналізу можна зрабіць наступныя высновы:

Усе вынесеныя пастановы выглядаюць аднатыпна. Усе затрыманыя абвінавачваліся ў тым, што прымалі ўдзел у несанкцыянаваным мітынгу па вул. Савецкая, 11, выкрыквалі лозунгі «Жыве Беларусь!» і «Сыходзь!», на патрабаваньні супрацоўнікаў міліцыі аб спыненьні супрацьпраўных дзеяньняў не рэагавалі.

Віна затрыманых у зьдзяйсьненьні правапарушэньня даказвалася толькі пісьмовымі матэрыяламі па справе: пратаколам аб адміністрацыйным правапарушэньні, рапартамі ці пратаколамі апытаньня сьведкаў. У якасьці сьведкаў выступалі выключна супрацоўнікі міліцыі, прычым у судовае паседжаньне яны не выклікаліся і ў якасьці сьведкаў судом не дапытваліся. Тлумачэньні саміх затрыманых судамі пад увагу не прымаліся і ацэньваліся «крытычна». Пастановы судоў насілі выключна абвінаваўчы ўхіл, выпадкаў апраўданьня судамі хаця б аднаго затрыманага зафіксавана не было. У вынікау былі асуджаныя і асобы, затрыманыя выпадкова падчас масавага захопу верагодных удзельнікаў пасьля разгону акцыі.

Некаторыя затрыманыя прызнавалі сваю віну ва ўдзеле ў несанкцыянаваным мітынгу і заяўлялі пісьмовыя хадайніцтвы аб прымяненьні пры вынясеньні пастановы п.6 арт.6.5 КаАП

Рэспублікі Беларусь — прымяненьні штрафу ў памеры ніжэйшага памеру, устаноўленага санкцыяй адпаведнай часткай арт.23.34 КаАП Рэспублікі Беларусь. Так, ч.1 арт. 23.34 КаАП Рэспублікі Беларусь ня ўтрымлівае ніжэйшага памеру, таму штраф у такім выпадку мусіць складаць 0,5 базавых велічынь. Аднак суды ігнаравалі падобныя хадайніцтвы (у тым ліку пісьмовыя) і выносілі арышты тэрмінам ад 10 да 15 сутак. Трэба адзначыць, што на працягу 2010 г. да 19 сьнежня суды актыўна выкарыстоўвалі дадзеную норму КаАП пры разглядзе адміністрацыйных справаў аб парушэньнях парадку арганізацыі і правядзеньня масавых мерапрыемстваў. Ігнараваньне дадзенага палажэньны КаАП судамі пры разглядах справаў удзельнікаў акцыі 19 сьнежня сьведчыць аб тым, што суды кіраваліся хутчэй адпаведнымі ўказаньнямі, а ня нормамі права.

**Права на абарону.** У шэрагу выпадкаў перад пачаткам судовага паседжаньня суддзі не заўсёды растлумачвалі затрыманым іх правы, прадугледжаныя арт.4.1 ПІКаАП Рэспублікі Беларусь, у тым ліку права на ўдзел абаронцы пры разглядзе адміністрацыйнай справы судом. Калі затрыманыя заяўлялі хадайніцтвы аб удзеле пры разглядзе справы адваката, такая магчымасьць прадстаўлялася. Пры гэтым адзначаліся выпадкі, калі затрыманым адмаўлялі ў задавальненьні заяўленых хадайніцтваў аб удзеле адвакату.

**Права на абскарджаньне.** Большасьць асобаў, у дачыненьні да якіх былі вынесеныя адміністрацыйныя арышты, былі пазбаўленыя магчымасьці абскардзіць вынесеныя пастановы.

Згодна з арт. 12.2, 12.4 ПІКаАП Беларусі пастанова суду аб накладаньні адміністрацыйнага спагнаньня ў выглядзе арышту, як не ўступіўшая ў законную сілу, можа быць абскарджаная ў вышэйстаячы суд на працягу пяці дзён з моманту яе абвяшчэньня асобе, у дачыненьні да якой яна вынесеная.

Пры гэтым, згодна з ч. 2 арт. 11.12 ПІКаАП Рэспублікі Беларусь, пастанова аб накладаньні адміністрацыйнага арышту прыводзіцца ў выкананьне неадкладна.

Пры склаўшайся сітуацыі атрымліваецца, што пастанова аб накладаньні арышту яшчэ не ўступіла ў законную сілу, аднак асоба ўжо адбывае вынесены яму арышт. Пры гэтым, знаходзячыся ў месцах адбыцьця пакараньня, асобы пазбаўленыя магчымасьцяў заключыць дамовы з адвакатамі, аплаціць дзяржаўную пошліну і г.д.

Трэба адзначыць, што ў шэрагу выпадкаў арыштаваныя перадавалі напісаныя імі скаргі адміністрацыі ІЧУ і ЦІП, аднак тыя не заўсёды перадавалі іх у суды. Перададзеныя скаргі ў большасьці выпадкаў пакідаліся бяз руху ці вярталіся без разгляду ў сувязі з неаплатай дзяржаўнай пошліны. Гэта прыводзіла да пропуску тэрмінаў, вызначаных ПІКаАП для абскарджаньня пастановаў, не ўступіўшых у законную сілу. Неабскарджаньне пастановы як неўступіўшай у законную сілу, пазбаўляла асобу права на далейшае абскарджаньне пастановы ў парадку нагляду.

Асуджаным не выдавалі копіі пастановаў, не растлумачвалі права на абскарджаньне вынесеных пастановаў.

Пры напісаньні скаргаў на вынесеныя пастановы ў Менскі гарадзкі суд юрысты Праваабарончага цэнтру «Вясна» прасілі аднавіць тэрміны на абскараджаньне ў сувязі з іх пропускам па паважных прычынах. Менскі гарадзкі суд аднаўляў прапушчаныя тэрміны і прымаў скаргі да вытворчасьці.

**Крымінальныя справы**

У сувязі з падзеямі, зьвязанымі з выбарамі Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь, узбуджаныя тры крымінальныя справы: па частках 1 і 2 арт.293 Крымінальнага кодэксу Рэспублікі Беларусь — «Масавыя беспарадкі», па ч.3 арт.339 — «Хуліганства» і арт.370 — «Зьнявага дзяржаўных сімвалаў».

Найбольшая колькасьць асобаў праходзіць па справе аб «масавых беспарадках», якая была ўзбуджаная 20 сьнежня 2010 году ГУУС Менгарвыканкаму.

***<u>Артыкул 293 «Масавыя беспарадкі»</u>:*** *1. Арганізацыя масавых беспарадкаў, якія суправаджаюцца гвалтам над асобай, пагромамі, падпаламі, зьнішчэньнем маёмасьці, узброеным супрацівам прадстаўнікам улады, караецца пазбаўленьнем волі на тэрмін ад пяці да пятнаццаці гадоў. 2. Удзел у масавых беспарадках, які выразіўся ў непасрэдным зьдзяйсьненьні дзеяньняў, названых у частцы першай дадзенага артыкулу, — караецца пазбаўленьнем волі на тэрмін ад трох да васьмі гадоў.*

Па стане на 19 студзеня 2011 году праваабаронцам вядома пра 32 абвінавачаных і 16 падазраваных па гэтай справе. Сярод абвінавачаных — пяць кандыдатаў у прэзідэнты: **Уладзімір**

**Някляеў**, **Андрэй Саньнікаў**, **Аляксей Міхалевіч**, **Мікалай Статкевіч** і **Віталь Рымашэўскі**. Акрамя **В.Рымашэўскага**, які знаходзіцца пад падпіскай аб нявыезьдзе, астатнія кандыдаты ўтрымліваюцца пад вартай у ізалятары КДБ. Яшчэ два кандыдаты ў прэзідэнты — **Рыгор Кастусёў** і **Дзьмітрый Ус** — зьяўляюцца падазраванымі па гэтай справе, мерай стрыманьня для іх абраная падпіска аб нявыезьдзе. Абвінавачаньні ў арганізацыі і ўдзеле ў масавых беспарадках прад'яўленыя таксама кіраўнікам перадвыбарчых штабоў і davераным асобам кандыдатаў, журналістам, актывістам дэмакратычных партый і арганізацый, актыўным удзельнікам акцыі пратэсту 19 сьнежня. Сярод абвінавачаных — тры жанчыны: жонка кандыдата ў прэзідэнты А.Саньнікава, журналістка **Ірына Халіп**, журналістка **Натальля Радзіна** і намесьнік старшыні «Маладога Фронту» **Анастасія Палажанка**, а таксама двое грамадзян Расійскай Федэрацыі. З 31 абвінавачанага 28 утрымліваюцца пад вартай, 4 — пад падпіскай аб нявыезьдзе. З вядомых праваабаронцам 16 падазраваемых 5 утрымліваюцца пад вартай, 9 — пад падпіскай аб нявыезьдзе, 2 — знаходзіцца па-за межамі краіны; большасьць з іх — удзельнікі акцыі пратэсту, якія адбылі адміністрацыйныя арышты.

По інфармацыі ГУУС Менгарвыканкаму, выяўлены каля 120 актыўных удзельнікаў акцыі пратэсту 19 сьнежня, таму сьпіс абвінавачаных і падазраваных не закрыты і, хутчэй за ўсё, будзе павялічвацца.

***Артыкул 339 «Хуліганства»:*** *1. Наўмысныя дзеяньні , якія груба парушаюць грамадзкі парадак і выказваюць відавочную непавагу да грамадзтва, што суправаджаюцца ўжываньнем гвалту або пагрозай яго ўжываньня або зьнішчэньнем або пашкоджаньнем чужой маёмасьці або якія адрозьніваюцца па сваім зьмесьце выключным цынізмам (хуліганства), — ... 2. Хуліганства, зьдзейсьненае паўторна, альбо групай асоб, альбо зьвязанае з супраціўам асобе, якая прыпыняе хуліганскія дзеяньні, альбо спалучанае з прычыненьнем менш цяжкага цялеснага пашкоджаньня (злоснае хуліганства) 3. Дзеяньні, прадугледжаныя часткамі першай або другой дадзенага артыкулу, зьдзейсьненыя з ужываньнем зброі, іншых прадметаў, якія выкарыстоўваюцца ў якасьці зброі для прычыненьня цялесных пашкоджаньняў, ужываньнем выбуховых рэчываў або выбуховых прылад або зьдзейсьненыя з пагрозай іх ужываньня, пры*

*адсутнасьці прыкмет больш цяжкага злачынства (асабліва злоснае хуліганства) — караецца пазбаўленьнем волі на тэрмін ад трох да дзесяці гадоў.*

Крымінальная справа па ч.3 арт.339 КК РБ была ўзбуджана супраць лідэру «Маладога Фронту» **Дзьмітрыя Дашкевіча** і актывістаў гэтай арганізацыі **Эдуарда Лобава** і **Дзяніса Лазара**, якія былі затрыманы ў Менску 18 сьнежня 2010 г. Паводле версіі следства, з хуліганскіх меркаваньняў яны беспадстаўна і наўмысна, кулакамі і металічнымі абцугамі зьбілі двух грамадзянаў. 28 сьнежня **Дзяніс Лазар** быў адпушчаны на свабоду, усе падазрэньні з яго былі зьнятыя; 6 студзеня 2011 году **Дзьмітрыю Дашкевічу** і **Эдуарду Лобаву** прад’яўлена абвінавачаньне, абодва яны ўтрымліваюцца пад вартай у турме г.Жодзіна.

***Артыкул 370 «Зьнявага дзяржаўных сімвалаў»:*** *Зьнявага Дзяржаўнага гербу Рэспублікі Беларусь, Дзяржаўнага сцягу Рэспублікі Беларусь, Дзяржаўнага гімну Рэспублікі Беларусь — караецца грамадзкімі працамі, ці штрафам, ці выпраўленчымі працамі на тэрмін да двух гадоў, ці арыштам на тэрмін да трох месяцаў, ці абмежаваньнем свабоды на тэрмін да аднаго году.*

Па гэтай справе пакуль няма падазраваных, але супрацоўнікі міліцыі выяўляюць фота- і відэадоказы, на якіх зафіксавана, хто падчас шэсьця па прасьпекце Незалежнасьці замяніў на будынку КДБ дзяржаўны сьцяг на нацыянальны бел-чырвона-белы. У межах расьсьледаваньня справы праведзены вобшукі ў некаторых журналістаў, якія маглі мець падобныя фота- і відэаматэрыялы.

Узбуджэньне крымінальнай справы было выкарыстана ўладамі як фармальная нагода для правядзеньня вобшукаў, выклікаў на размовы і допыты прадстаўнікоў палітычнай апазіцыі, грамадзкіх арганізацый, праваабаронцаў, рэдакцый незалежных СМІ.

За перыяд з 20 сьнежня па 19 студзеня 2011 году толькі па інфармацыі Праваабарончага цэнтру «Вясна» ў Беларусі было праведзена каля 100 вобшукаў. Адначасова каля 100 грамадзянаў краіны выклікаліся на допыты ў КДБ у якасьці сьведкаў у межах узбуджанай справы. Вельмі часта грамадзянаў выклікаюць на «размовы» ў органы МУС па тэлефонах, матывуючы прычыну выкліку тым, што нумар дадзенага абаненту быў зафіксаваны ў раёне плошчы Незалежнасьці 19 сьнежня. Пры гэтым грамадзянам, як правіла, не растлумачвалі права

не даваць тлумачэньні і паказаньні супраць сябе. Былі зафіксаваныя факты перашкодаў з боку прадстаўнікоў КДБ і міліцыі аказаньню праваой дапамогі грамадзянаў пры правядзеньні допытаў і размоваў.

Маштабы правадзімых вобшукаў сьведчаць аб тым, што ўзбуджэньне крымінальнай справы было выкарыстана ўладамі Беларусі для кампаніі перасьледу і ціску на іншадумцаў у краіне, стварэньня атмасьферы страху ў беларускім грамадзтве.

**Права на абарону абвінавачаных, ціск на адвакатаў і праваабаронцаў**

Нягледзячы на тое, што арт.48 КПК Рэспублікі Беларусь гарантуе абаронцам права бесперашкодна сустракацца са сваімі падабароннымі сам на сам і канфідыцыйна, без абмежаваньняў колькасьці і працягласьці размоваў, адвакаты большасьці абвінавачаных, якія ўтрымліваюцца пад вартай, пазбаўленыя такой магчымасьці і бачаць сваіх падабаронных толькі падчас правядзеньня допытаў. Асноўнай прычынай немагчымасьці арганізацыі такіх сустрэчаў адміністрацыя СІЗА КДБ называе малую колькасьць вольных памяшканьняў, дзе адбываюцца сустрэчы. Нягледзячы на шматлікія скаргі адвакатаў у Генеральную пракуратуру, сітуацыя не зьмяняецца. Пры гэтым Генеральная пракуратура і Менская гарадская пракуратура неаднаразова заяўлялі, што ўсім абвінавачаным забясьпечанае права на юрыдычную дапамогу. Толькі 17 студзеня 2011 г. пасьля неаднаразовых скаргаў у пракуратуру адвакат Уладзіміра Някляева **Тамара Сідарэнка** атрымала адказ з Менскай гарадзкой пракуратуры, у якім начальніку СІЗА КДБ было прапанавана знайсьці магчымасьці для забесьпячэньня правоў адвакатаў на сустрэчы са сваімі падабароннымі.

Каментары адвакатаў сродкам масавай інфармацыі аб немагчымасьці сустрэчаў са сваімі падабароннымі, а таксама адносна стану іх здароўя і ўмоваў утрыманьня выклікалі негатыўную рэакцыю Міністэрства юстыцыі Рэспублікі Беларусь. Мінюст абвінаваціў некаторых адвакатаў у тым, што іх каментары маюць тандэнцыйны і аднабаковы характар і гэтым яны парушаюць правілы адвакацкай этыкі. У адрас Менскай гарадзкой калегіі адвакатаў Мінюст накіраваў прадстаўленьне аб разглядзе магчымасьці прыцягненьня чатырох адвакатаў да дысцыплінарнай адказнасці. Адносна сябра прэзідыума Менскай гарадзкой калегіі, адваката А.Саньнікава **Паўла Сапелкі**

прапанавана разгледзець пытаньне аб прыпыненьні ліцэньзіі адваката і мэтазгоднасьці ягонага сяброўства ў прэзідыуме.

12 сьнежня адбылося паседжаньне Менскай гарадзкой калегіі адвакатаў, на якім было разгледжанае прадстаўленьне Мінюсту. Кіраўніцтва калегіі ня ўгледзела падставаў для ўзбуджэньня вытворчасьці па прадстаўленьні і ўжываньні санкцыяў супраць адвакатаў.

Ціску з боку ўладаў падвяргаюцца і праваабаронцы Беларусі. Так, уначы 20 сьнежня 2010 г. асобамі ў цывільным быў праведзены несанкцыянаваны вобшук на офісе ПЦ «Вясна», у выніку якога былі канфіскаваныя ўсе сістэмныя блокі кампутараў. 10 асобаў, у тым ліку юрысты **Валянцін Стэфановіч** і **Уладзімір Лабковіч**, былі затрыманыя супрацоўнікамі міліцыі і дастаўленыя ў Першамайскі РУУС г.Менску, дзе яны правялі больш за тры гадзіны і былі вызваленыя без тлумачэньняў прычынаў іх затрыманьня.

5 студзеня вобшук быў праведзены на офісе БХК. 17 студзеня на офісе ПЦ «Вясна» быў праведзены паўторны вобшук. 19 студзеня вобшук быў зьдзейсьнены на офісе Цэнтру правоў чалавека.

Таксама вобшукі былі праведзеныя ў прыватных памяшканьнях праваабаронцаў **Алены Танкачовай**, **Алега Гулака**, **Алеся Бяляцкага**, **Алеся Капуцкага** (Маладэчна) і **Раісы Міхайлоўскай**.

Акрамя таго, 13 студзеня Мінюст вынес пісьмовае папярэджаньне БХК за зварот, накіраваны ад імя арганізацыі сьпецыяльнаму дакладчыку ААН па незалежнасьці судоў, у якім праваабаронцы апісвалі факты ціску на адвакатаў з боку Мінюсту. Міністэрства юстыцыі расцаніла інфармацыю БХК, накіраваную ў міжнародныя арганізацыі, як тую, якая неаб'ектыўна адлюстроўвае працу дзяржаўных і праваахоўных органаў па падтрыманьні ў рэспубліцы стабільнасьці і правапарадку, наўмысна скажае рэальную абстаноўку ў краіне, як спробу дыскрэдытаваць Рэспубліку Беларусь у вачах сусьветнай грамадзкасьці.

**Высновы:**

- Выбары Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь не зьяўляліся свабоднымі і дэмакратычнымі. Вынікі выбараў, абвешчаныя ЦВК, ніякім чынам не адлюстроўваюць рэальнага волевыяўленьня грамадзян Беларусі.
- Акцыя пратэсту па выніках недэмакратычных і несвабодных выбараў мела мірны характар. Грамадзяне, якія сабраліся ў цэнтры

Менску, мелі мірныя мэты і імкнуліся мірным шляхам выказаць сваё меркаваньне і пратэст.

- Інцыдэнт з біцьцём шыбаў у будынку Дому ўраду ня быў прадухілены органамі аховы правапарадку. Дэманстратыўнае бязьдзеяньне органаў МУС, якія ў вялікай колькасьці былі сканцэнтраваны на плошчы Незалежнасьці, указвае на арганізаваную ўладамі правакацыю, якая была выкарыстаная для сілавога разгону мітынгу і арыштаў больш за 700 яго ўдзельнікаў.

- Дзеяньні органаў міліцыі пры разгоне дэманстрацыі мелі відавочна непрапарцыйны характар. Ужываньне фізічнай сілы і сьпецсродкаў прывяло да вялікай колькасьці параненых удзельнікаў мірнай акцыі пратэсту.

- Напад прадстаўнікоў сьпецслужбаў у цывільным на кандыдата ў прэзідэнты Уладзіміра Някляева і ягоных прыхільнікаў меў відавочна правакацыйны, пазапраўны характар.

- Зьбіцьцё і арышт фактычна ўсіх кандыдатаў у прэзідэнты, якія апаніравалі А.Лукашэнку на выбарах, зьяўляецца нічым іншым як палітычнай расправай.

- Узбуджэньне КДБ крымінальнай справы па ч.1 і 2 арт.293 Крымінальнага кодэксу (масавыя беспарадкі) выкарыстоўваецца выключна для працяглай ізаляцыі лідэраў апазіцыйнага дэмакратычнага руху, а таксама ў мэтах ціску і запалохваньня ўсёй незалежнай грамадзянскай супольнасьці краіны, незалежных журналістаў і СМІ, праваабаронцаў, а таксама ўсіх іншадумцаў у краіне.

- Пачынаючы з 19 сьнежня 2010 г., у краіне назіраецца рэзкае павелічэньне хвалі палітычна матываваных рэпрэсіяў і фактаў парушэньня правоў чалавека. Назіраецца вяртаньне ўладаў Беларусі да жорсткіх і рэпрэсіўных метадаў узьдзеяньня на структуры палітычных партый, грамадзянскай супольнасьці, незалежных СМІ.

- Колькасьць палітычных вязьняў у краіне дасягнула рэкорднай за перыяд 16-гадовага кіраваньня А.Лукашэнкі колькасьці і сьпіс увязьненных яшчэ не закрыты.

## Заява № 1 доўгатэрміновай Міжнароднай назіральнай місіі Камітэту міжнароднага кантролю за сітуацыяй з правамі чалавека ў Беларусі

30 сьнежня 2010, г. Менск

*Дзейнічаючы па даручэньні Камітэту міжнароднага кантролю за сітуацыяй з правамі чалавека ў Беларусі (КМК), які аб'ядноўвае прадстаўнікоў праваабарончых арганізацыяў краінаў прасторы АБСЕ і міжнародных грамадзянскіх сетак і арганізацыяў,*

*ажыцьцяўляючы маніторынг агульнай сітуацыі з захаваньнем фундаментальных правоў чалавека ў Рэспубліцы Беларусь, а таксама пытаньняў абароны праваабаронцаў і забесьпячэньня іх прафесійнай дзейнасьці,*

*падкрэсьліваючы, што правы чалавека зьяўляюцца прадметам прамой і законнай заклапочанасьці міжнароднай грамадзянскай супольнасьці;*

*заклікаючы ўлады Беларусі сьледаваць узятым на сябе міжнародным абавязальніцтвам у сьферы правоў чалавека, а дзяржавы-ўдзельніцы АБСЕ, прытрымліваючыся прынцыпаў АБСЕ, — кантраляваць выкананьне гэтых абавязацельстваў;*

**Доўгатэрміновая Міжнародная назіральная місія, падводзячы вынікі двух першых дзён сваёй дзейнасьці, выказвае заклапочанасьць па наступных пунктах:**

Па зьвестках, якія атрыманыя Місіяй ад беларускіх і міжнародных праваабарончых арганізацыяў і з інтэрнэт-СМІ, існуюць праблемы з аказаньнем медыцынскай дапамогі шэрагу затрыманых і арыштаваных асобаў, у прыватнасьці Андрэю Саньнікаву, Уладзіміру Някляеву, Натальлі Радзінай і іншым. Мы хочам нагадаць, што калі такія факты маюць месца, то яны могуць быць прыраўнівацца да катаваньняў альбо жорсткага і бесчалавечнага абыходжаньня, у адпаведнасьці з міжнароднымі нормамі. Місія заклікае ўлады Рэспублікі Беларусь альбо прызнаць гэтыя факты, альбо вынесьці ім афіцыйнае абвяржэньне, і ў любым выпадку забясьпечваць неадкладнае і паўнавартаснае аказаньне медыцынскай дапамогі ўсім затрыманым ці арыштаваным асобам, хто мае ў ёй патрэбу.

Місія адзначае факт ціску на праваабаронцаў і перашкоды іх законнай праваабарончай дзейнасьці. 29 сьнежня ў Менску вядомая бе-

ларуская праваабаронца Алена Танкачова была выкліканая на допыт у КДБ, пасьля заканчэньня якога дала падпіску аб неразгалошваньні падрабязнасьцей гутаркі. Пасьля допыту ў кватэры праваабаронцы быў праведзены ператрус. Падчас ператрусу былі канфіскаваныя дакументы і матэрыялы, непасрэдна зьвязаныя з ажыцьцяўленьнем Аленай прафесійнай праваабарончай дзейнасьці. Місія лічыць, што ў цяперашніх умовах, улады Рэспублікі Беларусь, у адпаведнасьці з Дэкларацыяй ААН «Аб праве і абавязку асобных асобаў, групаў і органаў грамадзтва заахвочваць і абараняць агульнапрызнаныя правы чалавека і асноўныя свабоды», а таксама абавязальніцтвамі АБСЕ, замацаванымі ў асноватворных дакументах Арганізацыі і пацьверджанымі на саміце кіраўнікоў дзяржаваў і ўрадаў дзяржаваў-удзельніцаў АБСЕ, які прайшоў у Астане 1-2 сьнежня 2010 году, павінна ня толькі не перашкаджаць працы праваабаронцаў і праваабарончых арганізацыяў, але і ўсяляк садзейнічаць ім.

У сувязі з унясеньнем Міністэрствам юстыцыі прадстаўленьня кіраўніцтву Менскай гарадзкой калегіі адвакатаў (http://www.minjust.by/ru/site_menu/news?id=734), у якім Міністэрства патрабуе прыняць дысцыплінарныя меры ў адносінах да шэрагу адвакатаў, якія абараняюць палітыкаў і грамадзкіх дзеячаў, Місія лічыць, што такая форма ціску можа стварыць пагрозу для паўнавартаснай прафесійнай дзейнасьці незалежнай адвакацкай супольнасьці. Адвакаты, якія на законных падставах ажыцьцяўляюць абарону грамадзянаў і іх гарантаваных правоў і свабодаў, згодна з міжнароднымі стандартамі (перш за ўсё, замацаванымі ў Дэкларацыі ААН «Аб праве і абавязку асобных асобаў, групаў і органаў грамадзтва заахвочваць і абараняць агульнапрызнаныя правы чалавека і асноўныя свабоды» і пацьверджанымі дакументамі АБСЕ), прыраўноўваюцца да праваабаронцаў і падлягаюць асаблівай абароне.

Менавіта таму Місія будзе надаваць асаблівую ўвагу гарантыям паўнавартаснай прафесійнай дзейнасьці адвакатаў. Мы лічым, што любы ціск на адвакатаў ставіць пад сумнеў доступ да эфектыўнай прававой дапамогі іх кліентаў і можа стварыць перашкоды для адпраўленьня справядлівага правасуддзя, да якога, паводле сваіх заяваў, імкнуцца ўлады Рэспублікі Беларусь.

**Місія заклікае ўлады Рэспублікі Беларусь дзейнічаць у адпаведнасьці з прынятымі на сябе міжнароднымі**

**абавязацельствамі і не дапускаць парушэньняў правоў чалавека і ціску на праваабаронцаў і любых іншых асобаў, якія ажыцьцяўляюць праваабарончую дзейнасьць.**

Кіраўнік Місіі
***Андрэй Юраў***

## Заява Місіі № 3 «Аб становішчы праваабаронцаў і журналістаў у Рэспубліцы Беларусь па стану на 13 студзеня 2011 году»

*Дзейнічаючы па даручэньні Камітэту міжнароднага кантролю за сітуацыяй з правамі чалавека ў Беларусі (КМК), які аб'ядноўвае прадстаўнікоў праваабарончых арганізацыяў краінаў прасторы АБСЕ і міжнародных грамадзянскіх сетак і арганізацыяў,*

*ажыцьцяўляючы маніторынг агульнай сітуацыі з захаваньнем фундаментальных правоў чалавека ў Рэспубліцы Беларусь, а таксама пытаньняў абароны праваабаронцаў і забесьпячэньня іх прафесійнай дзейнасьці,*

*падкрэсьліваючы, што правы чалавека зьяўляюцца прадметам прамой і законнай заклапочанасьці міжнароднай грамадзянскай супольнасьці;*

*заклікаючы ўлады Беларусі сьледаваць узятым на сябе міжнародным абавязальніцтвам у сьферы правоў чалавека, а дзяржавы-ўдзельніцы АБСЕ, прытрымліваючыся прынцыпаў АБСЕ, — кантраляваць выкананьне гэтых абавязацельстваў;*

**Міжнародная назіральная місія,**

адзначаючы, што сітуацыя з правамі чалавека ў Беларусі ўжо стала прадметам разгляду розных міжнародных арганізацыяў і структураў: Еўрапейскага Парламенту, трох сьпецыяльных дакладчыкаў ААН (па пытаньні аб становішчы праваабаронцаў, па пытаньні аб заахвочваньні і абароне права на свабоду меркаваньняў і іх свабоднае выказваньне, па пытаньні аб незалежнасьці суддзяў і адвакатаў), Бюро па дэмакратычных інстытутах і правах чалавека АБСЕ, а таксама Камітэту Міністраў Савету Еўропы і Генеральнага Сакратара ААН Пан Гі Муна, якія выказалі заклапочанасьць утрыманьнем пад вартай журналістаў, кандыдатаў у

прэзідэнты і іх давераных асобаў, якое працягваецца, і заклікалі да іх неадкладнага вызваленьня і няўхільнага захаваньня іх правоў чалавека,

вітаючы той факт, што больш за 100 няўрадавых арганізацыяў з 20 краінаў рэгіёну АБСЕ зьвярнуліся з заклікам да дзяржаваў-удзельніц АБСЕ прыняць меры ў дачыненьні да сітуацыі з правамі чалавека ў Беларусі, у тым ліку пры дапамозе механізмаў чалавечага вымярэньня,

**Выказвае занепакоенасьць у сувязі з тым, што:**

• у Місію працягвае пастунаць інфармацыя абператрусах у кватэрах і офісах незалежных журналістаў і праваабаронцаў у розных гарадах Беларусі, у прыватнасьці ў Менску, Гародні і Гомелю;

• у СМІ перыядычна зьяўляюцца сьведчаньні пра ціск на сем'і палітычных апанентаў дзеючай улады, што знаходзяцца ў зьняволеньні, у прыватнасьці на сям'ю кандыдата ў прэзідэнты Андрэя Саньнікава і журналісткі «Новой газеты» Ірыны Халіп [1], а таксама на сям'ю кандыдата ў прэзідэнты Алеся Міхалевіча; [2]

• па-ранейшаму, не атрымалі афіцыйнага абвяржэньня распаўсюджаныя ў шэрагу СМІ зьвесткі аб тым, што не забясьпечаны допуск адвакатаў і членаў сем'яў да абвінавачаных па крымінальнай справе аб масавых беспарадках 19 сьнежня 2010 году; у прыватнасьці, былых кандыдатаў у прэзідэнты Андрэя Саньнікава, Уладзіміра Някляева і Мікалая Статкевіча, а таксама журналістаў Аляксандра Атрошчанкава, Ірыну Халіп і Натальлю Радзіну адвакаты змаглі наведаць апошні раз яшчэ ў канцы сьнежня мінулага году. [3]

Адначасова з гэтым, на афіцыйным сайце Міністэрства юстыцыі паведамляецца, што ў асобных сродках масавай інфармацыі зьяўляюцца публікацыі, у якіх у скажоным сьвятле падаецца інфармацыя аб рэалізацыі падсьледнымі ў сувязі з падзеямі 19 сьнежня 2010 г. права на юрыдычную дапамогу. Міністэрствам юстыцыі ўнесена прадстаўленьне па факце парушэньня асобнымі СМІ Закону Рэспублікі Беларусь «Аб сродках масавай інфармацыі».

Канкрэтныя прыклады інфармацыі і падставы для прадстаўленьня не прыводзяцца.

Міністэрства юстыцыі таксама паведамляе, што вынесла Беларускаму Хельсінскаму Камітэту пісьмовае папярэджаньне за парушэньні заканадаўства аб грамадзкіх аб'яднаньнях, сродках масавай інфармацыі, распаўсюд недакладнай інфармацыі, якая дыскрэ-

дытуе праваахоўныя органы і органы юстыцыі рэспублікі, уласнага Статуту арганізацыі пасьля таго, як праваабарончая арганізацыя накіравала зварот да Сьпецыяльнага дакладчыка ААН па пытаньні аб незалежнасьці суддзяў і адвакатаў.

На тэлебачаньні разгорнута інфармацыйная кампанія, якая імкнецца пераканаць грамадзтва ў вінаватасьці падсьледных, у той час як высновы аб вінаватасьці асобы да заканчэньня сьледзтва парушаюць прынцып прэзумпцыі невінаватасьці. Прыкладам такой кампаніі зьяўляецца паказ дакументальнага фільму «Железом по стеклу».

**У сувязі з вышэйпералічаным, грунтуючыся на мандаце Міжнароднай назіральнай місіі Камітэту міжнароднага кантролю за сітуацыяй з правамі чалавека ў Беларусі, настойваем на тым, каб улады Рэспублікі Беларусь:**

• спынілі выкарыстаньне крымінальнага перасьледу і сьледчыя дзеяньні для перашкоды дзейнасьці праваабаронцаў, а таксама ў якасьці падставы для ціску на палітычных апанентаў і членаў іх сем’яў;

• няўхільна забясьпечылі выкананьне гарантыяў павагі чалавечай годнасьці ў дачыненьні да ўсіх падазраваных і абвінавачаных, а таксама іх доступ да кваліфікаванай юрыдычнай дапамогі;

• рэагавалі на паведамленьні ў сродках масавай інфармацыі і афіцыйныя звароты ў дзяржаўныя і міждзяржаўныя структуры аб парушэньнях правоў чалавека расьследаваньнем дзеяньняў дзяржаўных органаў і службовых асобаў, а ня санкцыямі ў адрас аўтараў зваротаў.

***Прадстаўнік Місіі ў Рэспубліцы Беларусь***
***Аляксандра Делеменчук,***

***Кіраўнік Місіі***
***Андрэй Юраў***

## Аналітычная запіска праваабаронцаў аб умовах перавозкі, судовага разьбіральніцтва і ўтрыманьня затрыманых удзельнікаў акцыі пратэсту 19 сьнежня

Дакумент падрыхтаваны на падставе дадзеных, атрыманых у перыяд з 03.01.2011 г. па 05.01.2011 г. уключна ад 73 чалавек, у тым ліку, з 61 анкеты, уласнаручна запоўненых апытаных, а таксама на падставе дадзеных, атрыманых падчас асабістага апытаньня 12 затрыманых.

**1. Дзеяньні супрацоўнікаў сіл бясьпекі на плошчы і ў іншых раёнах г.Менску**

a. Большасьць апытаных сьведчылі пра ўжываньне гвалту з боку супрацоўнікаў АМАП у працэсе затрыманьня.

b. Ужываньне сьпецсродкаў (дубінкі) у дачыненьні да часткі апытаных удзельнікаў публічнага мерапрыемства.

c. Частка апытаных былі выпадковымі мінакамі і не прымалі ўдзел у публічным мерапрыемстве.

**2. Умовы перавозкі затрыманых**

a. Па сьведчаньні некалькіх апытаных, шчыльнасьць запаўненьня сьпецтранспарту МУС РБ — да 70 чалавек (пры колькасьці пасадачных месцаў — каля 30).

b. Па сьведчаньні аднаго з апытаных, шчыльнасьць запаўненьня аўтобусаў (аналагічных маршрутным) склала 71 чалавек.

c. Па сьведчаньні большасьці апытаных, затрыманым адмаўлялі ў спраўленьні натуральных патрэбаў (за выключэньнем тых, якія ўтрымліваліся ў адным з аўтазакаў).

d. Таксама амаль усе апытаныя сьведчаць аб адмове ў прадастаўленьні вады.

e. Час дастаўкі складаў ад 2 да 3 гадзін.

**3. Умовы ўтрыманьня ў месцах дасудовага ўтрыманьня затрыманых**

*a. У ІЧУ на вул.Акрэсьціна*

i. Апытаныя, затрыманыя ад 40 хвілін да 3 гадзін, утрымоўваліся ў сьпецтранспарце.

ii. Пасьля вывядзеньня з сьпецтранспарту апытаныя ад 30 да 40 хвілін утрымліваліся на вуліцы.

iii. Па сьведчаньні большасьці апытаных, затрыманым адмаўлялі ў спраўленьні натуральных патрэбаў (за выключэньнем тых, якія ўтрымліваліся ў адной з адзінак сьпецтранспарту) на працягу перыяду да 9 гадзін.

iv. Па сьведчаньні ўсіх апытаных ад 2 да 3 гадзін яны былі вымушаны стаяць у калідоры тварам да сьцяны з рукамі за сьпіной, пасьля чаго ім было дазволена сесьці на падлогу.

v. Праз яшчэ мінімум дзьве гадзіны затрыманых пачалі групамі адводзіць на афармленьне, дзе яны сядзелі альбо ляжалі на падлозе, чакаючы афармленьня, пры гэтым, па сьведчаньні некалькіх апытаных, супрацоўнікі АМАП, праходзячы міма, наносілі ўдары нагамі па ляжачых на падлозе затрыманых.

vi. Афармленьне часткі затрыманых пачалося праз 12 гадзін з моманту затрыманьня (асноўная частка затрыманьняў, па сьведчаньнях апытаных, адбывалася ў інтэрвале з 22:00 да 02:00), пры гэтым увесь паказаны час апытаныя былі пазбаўленыя сну.

vii. Якая-небудзь ежа, а таксама вада затрыманым за адзінкавым выключэньнем (зафіксаваныя два сьведчаньні аб тым, што пасьля судовых працэсаў у адной з адзінак сьпецтранспарту супрацоўнікі АМАП па ўласнай ініцыятыве кармілі арыштаваных) не прадастаўлялася (упершыню была прадстаўленая праз 30 гадзін з моманту затрыманьня).

viii. У распараджэньні затрыманых была толькі вада з-пад крана ў санвузьле, якая была прадастаўлена на працягу 9 гадзін з моманту дастаўленьня.

ix. Сваякам прадстаўнікі ўладаў аб затрыманьні не паведамлялі.

*b. У раённых УУС г.Менску*

i. Па сьведчаньнях апытаных, стаўленьне з боку супрацоўнікаў РУУС, у цэлым, лепш, чым з боку супрацоўнікаў АМАП, хоць зафіксаваныя некалькі пасьведчаньняў аб нанясеньні пабояў у Кастрычніцкім РУУСе.

ii. Пры гэтым некаторыя арыштаваныя сьведчылі аб апытаньнях студэнтаў, магчыма, супрацоўнікамі КДБ, з прымусам апытваемых да зачытваньня падрыхтаванага тэксту на відэакамеру пад пагрозай адлічэньня з ВНУ.

iii. У Кастрычніцкім РУУСе непаўналетняй затрыманай пагражалі ўтапленьнем ва ўнітазе, зьбіцьцём, ігнараваліся просьбы затрыманай не паліць, адрасаваныя супрацоўнікам РУУС.

**4. Умовы транспарціроўкі ў суды, утрыманьне ў судзе**

a. Пры транспарціроўцы затрыманых у суд шчыльнасьць запаўненьня, па сведчаньні апытаных, відавочна перавышала дапушчальную (шэсьць чалавек пры наяўнасьці двух пасадачных месцаў).

b. У будынках судоў затрыманыя ўтрымліваліся да 8 чалавек у памяшканьнях, разьлічаных на двух-трох чалавек.

**5. Судовае разьбіральніцтва**

a. Прадастаўленыя амаль усіх апытаных матэрыялы спраў аб адміністрацыйных правапарушэньнях складаліся ў ідэнтычным ключы без уліку фактычных абставін затрыманьня.

b. Дзяржаўны адвакат не падаваўся ў большасьці выпадкаў, калі апытаныя затрыманыя прасілі аб яго ўдзеле ў працэсе, пры гэтым зафіксаваны адмова ў допуску адваката, нанятага сваякамі затрыманага.

c. Сьведкі абароны не дапытвалі па сьведчаньнях усіх апытаных.

d. Па словах усіх апытаных, працягласьць судовых працэсаў не перавышала 10-15 хвілін, пры гэтым пазіцыя абароны пасьлядоўна не ўлічвалася.

e. Парадак абскарджаньня судовых актаў тлумачыцца не заўсёды або ня ў поўным аб’ёме (не заўсёды тлумачыўся абавязак выплаты дзяржаўнай пошліны, ні разу не была прадастаўлена магчымасьць яе аплаціць, не была растлумачана магчымасьць хадайнічаць аб вызваленьні ад яе выплаты).

f. Копіі судовых актаў, па сьведчаньнях пераважнай большасьці апытаных, выдаваліся па заканчэньні тэрміну адміністрацыйнага арышту (г.зн. па заканчэньні тэрміну абскарджаньня), аднак у судзе Маскоўскага раёну г.Менску копіі судовых актаў, як правіла, выдаваліся адразу пасьля вынясеньня судовага рашэньня.

g. У Жодзінскім ІЧУ паперу для складаньня скаргаў выдавалі на 4 дзень або па заканчэньні пяці дзён (тэрмін абскарджаньня складае пяць дзён з моманту абвяшчэньня судовага акту), пры гэтым дзяржаўны адвакат для складаньня скаргаў не прадастаўляўся.

h. Ва ўсіх зафіксаваных выпадках (за выключэньнем спраў аб адміністрацыйных правапарушэньнях у дачыненьні да грамадзян Расіі), калі скаргі на судовыя акты былі складзеныя, названыя скаргі па сутнасьці разгледжаны не былі.

**6. Дастаўленьне ў ІЧУ**

a. Па сьведчаньні некаторых апытаных, АМАП дастаўляў арыштаваных у ІЧУ Жодзіна, наносіў пабоі пры ўваходзе ў аўтазак, а таксама пры выхадзе з аўтазаку.

b. Па сьведчаньні аднаго з арыштаваных, ён стаў сьведкам зьбіцьця арыштаванага супрацоўнікамі АМАП з мэтай прымусу яго сьпяваць песьню «Саня застанецца з намі».

**7. Ўтрыманьне пад вартай**

*a. Агульнае*

i. Пітная вада не прадастаўлялася

ii. Нізкая якасьць прадастаўленага харчаваньня, частка апытаных сьведчылі аб нястраўнасьцях сярод арыштаваных

iii. Кваліфікаваная медыцынская дапамога аказвалася не заўсёды

iv. Пасьцельныя прыналежнасьці (матрац, коўдра, пасьцельная бялізна) выдаваліся не заўсёды

*b.ІЧУ Жодзіна*

i. Па сьведчаньні ўсіх апытаных, тэмпература была прымальнай, але пры гэтым было душна

ii. Туалетныя прыналежнасьці не выдаваліся

iii. Па сьведчаньнях многіх апытаных, у камерах былі казуркі (прусы)

iv. На шпацыры выводзілі ня ўсіх апытаных, а тых, каго выводзілі — раз у 2-3 сутак на 15-30 хвілін у дворык 5х4 метры альбо ў калідор

v. У Жодзіне лямпы дзённага сьвятла на ноч адключаліся, уключалася больш слабая лямпа напальваньня

vi. Туалет у частцы камер уяўляў сабой унітаз з высокай перагародкай, у частцы — дзірку ў падлозе з нізкай перагародкай (не вышэй за 1 м)

*d.ІЧУ РУУС Менскага раёну*

i. Па сьведчаньнях часткі апытаных, арыштаваныя першыя 3-4 дні ўтрымоўваліся ў халоднай, неацяпляльнай камеры, вымушаныя былі спаць у верхняй вопратцы

ii. На ноч асьвятленьне не адключалася

iii. Па сьведчаньні аднаго з апытаных, прадстаўленая ежа была халоднай, першыя два дні сьняданак не падаваўся і быў прадастаўлены толькі пасьля заяваў пра галадоўку

iv. Прагулкі раз у дзень на 15 хвілін

v. Перадачы дастаўлялі ня ў поўным аб'ёме, адмаўлялі ў перадачы прадуктаў харчаваньня

vi. Туалет уяўляў сабой дзірку ў падлозе з нізкай перагародкай

*e. ІЧУ на вул. Акрэсьціна*

i. Пасьцельныя прыналежнасьці выдаваліся не заўсёды, але нават у выпадку выдачы — толькі на 3-5 дзён

ii. На шпацыры не выводзілі

iii. Частка апытаных сьведчаць аб утрыманьні ў халоднай, неацяпляльнай камеры

iv. Доступ у душ быў прадстаўлены толькі 1-2 разы (зафіксавана таксама пасьведчаньне аб прадастаўленьні доступу ў душ толькі пасьля калектыўнай скаргі), аднаму з апытаных-толькі на 8-9 суткі

v. Ежу ў перадачах прымалі не заўсёды і толькі не раней 25.12.2010г.

*f.Прыёмнік-разьмеркавальнік для непаўнагадовых*

і Затрыманыя ўтрымлівалася да вечару 20.12.2010г. у халодным, неацяпляльным памяшканьні

ii. Пасцельныя прыналежнасьці не выдаваліся, затрыманая была вымушана спаць на падлозе

iii. Доступ у душ не прадстаўляўся

iv. Затрыманай было адмоўлена ў прадастаўленьні гігіенічных прылад

v. Сваякі затрыманай не інфармаваліся

**Высновы з прааналізаванай інфармацыі:**

1. У дачыненьні да большай часткі апытаных у той ці іншай форме ўжываўся гвалт;

2. Умовы перавозкі і ўтрыманьня пад вартай усіх апытаных затрыманых альбо арыштаваных характарызуюцца як бесчалавечнае і прыніжаючыя чалавечую годнасьць;

3. Судовыя працэсы ў дачыненьні да ўсіх апытаных затрыманых не адпавядалі крытэрам справядлівага судовага разьбіральніцтва і характарызуюцца відавочна абвінаваўчым ухілам.

# 3. Міжнародныя рэзалюцыі

### Рэзалюцыя Еўрапейскага Парламенту ад 10 сакавіка 2010 аб становішчы грамадзянскай супольнасьці й нацыянальных меншасьцяў у Беларусі

Еўрапейскі Парламент,

— улічваючы свае папярэднія рэзалюцыі па сітуацыі ў Беларусі, у прыватнасьці, рэзалюцыю ад 17 сьнежня 2009[1],

— улічваючы высновы па Беларусі, зробленыя Радай па Агульных Справах і Зьнешніх Сувязях на ейнай сустрэчы 17 лістапада 2009, адносна далейшага прыпыненьня візавых абмежаваньняў у адносінах да некаторых службовых асоб Беларусі, уключаючы Прэзідэнта Аляксандра Лукашэнку, і падаўжэньня абмежавальных мераў да кастрычніка 2010,

— улічваючы вынік 2996-ай сустрэчы Рады па Замежных Справах ад 22 лютага 2010 і заяву Высокага Прадстаўніка, лэдзі Эштан, па сітуацыі з Саюзам Палякаў у Беларусі ад 16 лютага 2010,

— улічваючы Дэкларацыю аб Усходнім Партнёртсве, прынятую Радай Еўропы 19 сакавіка 2009 і сумесную дэкларацыю, прынятую на Пражскім Саміце па Усходнім Партнёрстве 7 траўня 2009,

— улічваючы Рамачную Канвенцыю Рады Еўропы па Абароне Нацыянальных Меншасьцяў ад 1 лютага 1995,

— улічваючы міжнародныя прынцыпы й стандарты датычныя правоў меншасьцяў, у прыватнасьці тыя, якія ўтрымліваюцца ў міжнародных дамовах па правах чалавека, такіх як Хельсінскі Заключны Акт ад 1 жніўня 1975 (секцыя 1.VII), Дакумент Капенгагенскай сустрэчы па Чалавечым Вымярэньні ад 29 чэрвеня 1990 і Парыжскай Хартыі Новай Еўропы ад 21 лістапада 1990,

— улічваючы сваё абмеркаваньне па Беларусі ад 24 лютага 2010, зьвязаную з ім адмысловую дэлегацыйную місію ў Беларусь 25-27 лютага 2010 і атрыманыя ёй зьвесткі,

— улічваючы Правіла 110 (4) сваіх Працэсуальных Правілаў,

A. Паколькі, 15 лютага 2010, 40 актывістаў, у асноўным сябры Саюзу Палякаў у Беларусі (СПБ), у тым ліку старшыня СПБ Анжаліка Борыс, сьпікер СПБ Ігар Банцар, віцэ-старшыня СПБ Мечыслаў Яскевіч, Прэзідэнт Назіральнай Рады СПБ Ан-

джэй Пачобут і лідэр апазіцыйнай Аб’яднанай Грамадзянскай Партыі Анатоль Лябедзька, былі арыштаваныя ў Беларусі з мэтай перашкодзіць ім узяць удзел у судзе датычным Польскага Дому ў Івянцы; паколькі ўсе актывісты былі вызваленыя да 20 лютага,
Б. паколькі СПБ пад старшынствам Анжалікі Борыс, двойчы абранай дэмакратычным чынам, у 2005 і 2009, не прызнаецца дзяржаўнымі ўладамі й падвяргаўся пастаяннаму перасьледу з 2005, і паколькі ягоныя сябры часта абвінавачваюцца ў незаконнай дзейнасьці й сутыкаюцца з крымінальнымі абвінавачваньнямі,

В. паколькі беларускія ўлады выкарыстоўвалі міліцыю супраць сяброў СПБ у Гародне ў 2005 і ў Івянцы ў 2010,

Г. паколькі беларускія ўлады перашкодзілі прадстаўнікам СПБ, выкліканым у якасьці сьведак на суд над старшынёй суполкі СПБ ў Івянцы спадарыняй Тэрэзай Собаль, наведаць суд,

Д. паколькі дыскрымінацыя супраць Саюзу Палякаў, найвялікшай НДА Беларусі, зьяўляецца паказальнікам агульнага стаўленьня да грамадзянскай супольнасьці й дэмакратычнай апазіцыі ў Беларусі,

Е. паколькі гродзенская фірма «Паланіка», што кіруецца Анжалікай Борыс і зьяўляецца адзінай крыніцай фінансаваньня СПБ, была аштрафаваная на 71 мільён рублёў за нібыта парушэньне правілаў падаткаабкладаньня й зараз знаходзіцца пад пагрозай банкруцтва,

Ё. Паколькі беларускія ўлады лічаць легітымным старшынём Саюзу Палякаў Станіслава Сямашку і абвяшчаюць сваю падтрымку арганізацыі пад ягоным старшынствам, якую польская супольнасьць лічыць нелегітымнай,

Ж. Паколькі прадстаўнікі еўрапейскіх структур, уключаючы Прэзідэнта Еўрапейскага Парламенту Ежы Бузека, віцэ-Прэзідэнтку Камісіі/Высокага Прадстаўніка Саюзу па Замежных Справах і Палітыцы Бясьпекі баранэсу Эштан і Камісарку па Ўнутраных Справах Цэцылію Мальмстрём, а таксама польскі Парламент і французскае Міністэрства Замежных Справаў, выказалі сваю заклапочанасьць нядаўнімі дзеяньнямі беларускіх уладаў супраць СПБ і асудзілі выкарыстаньне міліцыі супраць ягоных сяброў,

З. Паколькі дадзеныя дзеяньні беларускіх уладаў супярэчаць міжнародным стандартам абароны нацыянальных меншасьцяў, прадстаўленых, між іншым, у Рамачнай Канвенцыі па Абароне

Нацыянальных Меншасьцяў ад 1 лютага 1995, паколькі Беларусь інтэнсіфікавала свае дзеяньні скіраваныя супраць сяброў гэтай арганізацыі,

I. Паколькі ў параграфе 1 Супольнай Дэкларацыі Пражскага Саміту Ўсходняга Партнёрства, падпісанай Беларусьсю, гаворыцца: «Удзельнікі Пражскага Саміту пагаджаюцца, што Ўсходняе Партнёрства будзе засноўвацца на прынцыпах міжнароднага заканадаўства й падставовых каштоўнасьцях, уключаючы дэмакратыю, верхавенства права й павагу да правоў і асноўных свабод чалавека»,

Й. Паколькі Еўрапейская Камісія ў сваіх высновах ад 17 лістапада 2009 прызнае, што адкрыліся новыя магчымасьці для дыялога й паглыбленага супрацоўніцтва паміж Еўрапейскім Саюзам і Беларусьсю з мэтай спрыяньня сапраўднаму разьвіцьцю ў кірунку дэмакратыі й павагі да правоў чалавека, і зноў падцвярджае ў гэтым зьвязку сваю гатоўнасьць паглыбляць стасункі Еўрапейскага Саюзу з Беларусьсю, падвержанай далейшаму прагрэсу ў кірунку дэмакратыі, правоў чалавека й верхавенства права, а таксама дапамагаць краіне ў дасягненьні гэтых задач,

1. Выказвае сваю сур'ёзную заклапочанасьць нядаўнімі парушэньнямі правоў чалавека ў Беларусі ў адносінах актывістаў грамадзянскай супольнасьці, асабліва сяброў Саюзу Палякаў, і абвяшчае сваю салідарнасьць з грамадзянамі, якія пазбаўленыя магчымасьці карыстацца ўсёй паўнатой іхніх грамадзянскіх правоў;

2. Асуджае міліцэйскі й судовы перасьлед супраць Саюзу Палякаў і любыя спробы беларускіх уладаў навязаць польскай супольнасьці новае кіраўніцтва, патрабуе ад беларускіх уладаў рэабілітаваць Саюз Палякаў у Беларусі (СПБ) пад старшынствам Анжалікі Борыс і забясьпечыць вяртаньне ім іхняй маёмасьці ў належны час;

3. Зноў пацвярджае сваю зацікаўленасьць у адкрытым і структураваным дыялогу з Беларусьсю пры ўмове, што дэмакратызацыя палітычнай сістэмы ў Беларусі прывядзе да канкрэтных вынікаў і адлюстроўвацьме павагу да правоў чалавека й верхавенства права;

4. Заклікае Беларусь прытрымлівацца ейных міжнародных абавязацельстваў па абароне й заахвочваньні правоў ейных меншасьцяў; у той жа час заклікае ўлады палепшыць умовы для дзейнасьці грамадзянскай супольнасьці, асабліва моладзі, адносна свабоды самавыяўленьня й сходаў, становішча незалежных медыяў, уключаючы доступ да інтэрнэту, а таксама рэгістрацыі НДА, з мэ-

тай падрыхтоўкі й правядзеньня свабоднага й справядлівага выбарчага працэсу на выбарах у мясцовыя Саветы Дэпутатаў 25 красавіка;

5. Паўтарае свой заклік з папярэдніх рэзалюцый, у прыватнасьці, ад 15 студзеня й 17 сьнежня 2009, гарантаваць свабоду слова й асацыяцый і забясьпечыць свабодную рэгістрацыю палітычных партый, такіх як Беларуская Хрысьціянская Дэмакратыя (БХД), рэлігійную свабоду й стварэньне спрыяльных умоваў для дзейнасьці грамадзкіх аб'яднаньняў НДА (такіх як «Вясна») й незалежных медыяў у Беларусі;

6. Заклікае беларускія ўлады вызваліць палітычных актывістаў, такіх як Андрэй Бандарэнка, і вязьняў сумленьня, такіх як Іван Міхайлаў і Арцём Дубскі, адмяніць абмежавальныя меры адносна актывістаў грамадзянскай супольнасьці, такіх як удзельніца Форуму Грамадзянскай Супольнасьці Ўсходняга Партнёрства Тацяна Шапуцька, і ўстрымацца ад мер, скіраваных на кантроль зьмесьціва беларускіх сайтаў у сусьветным сеціве;

7. Падкрэсьлівае, што дыялог ЕС з Беларусьсю можа быць узаемавыгадным і верыць, што Беларусі можа быць аказаная падтрымка ў атрыманьні найбольшай выгады ад Усходняга Партнёрства, у прыватнасьці, у найбольш эфектыўным выкарыстаньні фінансавых сродкаў, выдзеленых па гэтай праграме на інфраструктуру, энергію й сацыяльныя праекты, і выкарыстаньні іншых інструментаў і ўстановаў ЕС, у выпадку калі беларускія ўлады прымуць на сябе абавязкі па правядзеньні рэальных зьменаў у сьферы свабод, дэмакратыі, верхавенства права й павагі да правоў чалавека, і ў прыватнасьці правоў нацыянальных меншасьцяў;

8. Нагадвае, што Эўрапейскі Саюз ужо прадэманстраваў істотную адкрытасьць для кантактаў з Беларусьсю, што таксама выражаецца ўключэньнем Беларусі ва Ўсходняе Партнёрства, нагадвае, што посьпех гэтых кантактаў залежыць ад крокаў па дэмакратызацыі й падтрымцы правоў чалавека, у тым ліку правоў меншасьцяў, Урадам Беларусі;

9. Указвае, што Беларусь атрымае выгаду ад наступных рэчаў у выпадку, калі беларускія ўлады будуць прытрымлівацца падставовых правоў чалавека й крытэраў, зьвязаных з дэмакратыяй:

— заключэньне й ратыфікацыя Пагадненьня аб Партнёрстве й Супрацоўніцтве паміж ЕС і Беларусьсю (ППС),

— эфектыўнае выкарыстаньне фінансавых інструментаў ЕС, такіх як інструменты Эўрапейскага Інвестыцыйнага Банку (ЕІБ) ды Інструмент Эўрапейскага Суседства й Партнёрства (ІЕСП),

— пашырэньне фінансаваньня Эўрапейскім Банкам Рэканструкцыі й Разьвіцьця (ЕБРР) праектаў у Беларусі, уключаючы дзяржаўныя аб’екты,

— аднаўленьне Ўсеагульнай Сістэмы Прэферэнцый (УСП+) для Беларусі,

— атрыманьне яшчэ аднаго транша па стабілізацыйным крэдыце ад Міжнароднага Валютнага Фонду (МВФ),

— аднаўленьне перамоваў па допуску Беларусі ў Сусветную Гандлёвую Арганізацыю (СГА),

— дапамога па пашырэньні праграмы Арганізацыі Эканамічнага Супрацоўніцтва й Разьвіцьця (АЭСР) у Беларусі;

10. Надае вялікую ўвагу важнасьці лібералізацыі палітычнага й грамадзкага жыцьця ў Беларусі й падкрэсьлівае, што далейшыя парушэньні правоў чалавека й верхавенства права ў Беларусі могуць прывесьці да перагляду пазіцыі ЕС адносна Беларусі, уключаючы аднаўленьне санкцый;

11. Даручае свайму Прэзідэнту перадаць гэтую рэзалюцыю ў Раду, Камісію й парламенты й урады краін-удзельніц, Генеральнаму Сакратару Аб’яднаных Нацый, Парламенцкім Асамблеям АБСЕ й Рады Эўропы, Сакратарыяту Садружнасьці Незалежных Дзяржаў і Парламенту й Ураду Беларусі.

[1] Прынятыя тэксты, P7_TA (2009) 0117

## Парламенцкая асамблея Рады Эўропы прыпыняе кантакты з уладамі Беларусі

Рэзалюцыя ПАРЕ
29.04.2010, Страсбург

У рэзалюцыі ўказваецца на «недастатковы прагрэс» Беларусі ў галіне адпаведнасьці стандартам Рады Эўропы. У прыватнасьці, у дакуменьце гаворыцца, што ў краіне «ў атмасьферы сакрэтнасьці» былі прыведзены ў выкананьне два сьмяротныя прыгаворы, калі скаргі асуджаных разглядаў Камітэт ААН па правах чалавека.

Адзначаюцца таксама выпадкі парушэньня ў Беларусі правоў польскай нацыянальнай меншасьці і адсутнасьць міжнародных назіральнікаў на выбарах у мясцовыя саветы.

У дакуменьце выказваецца шкадаваньне ў сувязі з «недастатковай палітычнай воляй беларускіх уладаў разьдзяліць каштоўнасьці Рады Еўропы». Пры гэтым у рэзалюцыі ўтрымліваецца заклік прадоўжыць дыялог з Беларусьсю.

Як раней паведамлялася, рашэньне аб правядзеньні тэрміновых дэбатаў па сітуацыі ў Беларусі было прынята 26 красавіка на пасяджэньні бюро ПАРЕ.

## МІЖНАРОДНАЯ МІСІЯ ПА НАЗІРАНЬНІ ЗА ВЫБАРАМІ Рэспубліка Беларусь — Прэзідэнцкія выбары, 19 сьнежня 2010 году ПАПЯРЭДНІЯ ВЫСНОВЫ І ЗАКЛЮЧЭНЬНІ

Менск, 20 сьнежня 2010 году – Дадзеныя папярэднія высновы і заключэньні зьяўляюцца вынікам агульных намаганьняў Бюро па дэмакратычных інстытутах і правах чалавека АБСЕ (БДІПЧ/АБСЕ) і Парламенцкай асамблеі АБСЕ (ПА АБСЕ).

Ацэнка была зробленая для вызначэньня таго, ці адпавядалі выбары абавязацельствам краінаў-удзельніцаў АБСЕ, а таксама дзейнаму заканадаўству Рэспублікі Беларусь. Папярэднія высновы і заключэньні абвяшчаюцца да заканчэньня выбарчага працэсу. Падрабязная выніковая ацэнка будзе знаходзіцца ў частковай залежнасьці ад правядзеньня пазасталых этапаў выбарчага працэсу, у тым ліку занясеньня ў пратаколы і абвяшчэньня вынікаў, а таксама ад працэсу разгляду магчымых скаргаў і апеляцыяў. Усебаковая канчатковая справаздача БДІПЧ/АБСЕ, у якую ўвойдуць рэкамендацыі па ўнясеньні магчымых ўдасканаленьняў, будзе прапанаваная прыкладна праз восем тыдняў пасьля завяршэньня выбарчага працэсу. ПА АБСЕ прадставіць сваю справаздачу на сваёй зімовай сустрэчы ў Вене 24-25 лютага 2011 году.

### Папярэднія высновы

Прэзідэнцкія выбары паказалі, што ў Беларусі наперадзе значны шлях да адпаведнасьці сваім абавязацельствам у рамках АБСЕ, нягледзячы на тое, што некаторыя маленькія крокі былі зробленыя. Ноч пасьля выбараў была азмрочаная затрыманьнямі большасьці

кандыдатаў, соцень актывістаў, журналістаў і прадстаўнікоў грамадзянскай супольнасьці.

Нягледзячы на тое, што сам працэс галасаваньня быў ацэнены на «добра», працэдуры значна пагоршыліся падчас падліку галасоў, нівелюючы крокі, зробленыя для паляпшэньня выбарчага працэсу. Працэдуры падліку галасоў былі ацэненыя як «кепскія» і «вельмі кепскія» амаль на палове ўчасткаў для галасаваньня, на якіх праводзілася назіраньне. Падлік пераважна праводзіўся ў цішыні і непразрыста, што падрывае давер да ягоных вынікаў. У многіх выпадках назіральнікаў абмяжоўвалі, і ў іх не было сапраўднай магчымасьці назіраць за падлікам. У некаторых выпадках лічбы, занесеныя ў пратаколы галасаваньня на ўчастках для галасаваньня, мяняліся па прыбыцьці ў ТВК.

У выбарах прынялі ўдзел шэраг кандыдатаў. Бясплатны эфір быў прадастаўлены ў непадцэнзурным фармаце, але ён быў абмежаваны па часе і маштабе. Упершыню дэбаты ў жывым эфіры далі кандыдатам магчымасьць зьвярнуцца да выбаршчыкаў наўпрост; дзейны кіраўнік дзяржавы вырашыў не прымаць удзел. Аднак бальшыня кандытатаў, што супрацьстаялі дзейнаму кіраўніку дзяржавы, ня верылі ў справядлівасьць выбарчых органаў і выбарчага працэсу.

Праграмы навінаў, якія выйшлі ў эфір і маніторынг якіх праводзіла МНВ БДІПЧ/АБСЕ, надзялілі больш як 89 адсоткаў часу палітычных і выбарчых навінаў дзейнаму кіраўніку дзяржавы; нават з улікам переваг статусу дзейнага кіраўніка дзяржавы гэта шмат. Танальнасьць асьвятлення дзейнасьці прэзідэнта Лукашэнкі была выключна станоўчай ці нейтральнай, а танальнасьць асьвятленьня дзейнасьці іншых кандыдатаў была пераважна адмоўнай. Адсутнасьць плюралізму ў СМІ зьменшыла магчымасьці выбаршчыкаў рабіць падчас выбарчай кампаніі інфармаваны выбар. У дзень выбараў шэраг буйных інтэрнэт-сайтаў, а таксама некаторыя сацыяльныя сеткі і апазіцыйныя вэб-сайты, былі заблакаваныя.

**Папярэднія заключэньні і высновы**

Нягледзячы на некаторыя станоўчыя крокі па ўнясеньні зьменаў у Выбарчы кодэкс, прававыя рамкі ўсё яшчэ не даюць належнай гарантыі правядзеньня выбараў у адпаведнасьці з абавязацельствамі АБСЕ. У наяўных прававых рамках важныя асьпекты выбарча-

га працэсу застаюцца ня поўнасьцю прапісанымі. У прыватнасьці, адсутнічаюць неабходныя абарончыя механізмы, якія дазволілі б гарантаваць сумленнасьць датэрміновага галасаваньня і падліку галасоў.

Цэнтральная выбарчая камісія (ЦВК) добра ажыцьцяўляла тэхнічныя асьпекты выбарчага працэсу. Паседжаньні праводзіліся адкрыта; іх наведвалі назіральнікі і СМІ. Аднак ЦВК не была аб'ектыўнай. Васьмёра кандыдатаў накіравалі сваіх прадстаўнікоў у ЦВК, але яны ня мелі права голасу пры прыняцьці рашэньняў. ЦВК прымала рэзалюцыі, спрабуючы патлумачыць дзейныя палажэньні заканадаўства, што тычацца правоў назіральнікаў і датэрміновага галасаваньня, але яна ня здолела прадаставіць дастатковых раз'ясьненьняў.

Уключэнне ў склад тэрытарыяльных выбарчых камісіяў (ТВК) і ўчастковых выбарчых камісіяў (УВК) ня менш як трацiны сяброў палітычных партыяў і грамадзкіх аб'яднаньняў магло стаць станоўчым крокам. Аднак адсутнасьць афіцыйных крытэраў, паводле якіх вызначалі сяброў камісій і адсутнасьць дэталёва прапісаных працэдур зьменшыла эфектыўнасьць гэтага палажэньня. Кандыдатам адмаўлялі без належнага тлумачэньня і абгрунтаваньня. У сапраўднасьці толькі 0,26 адсотка ўсіх сяброў УВК і 0,7 адсотка сяброў ТВК былі накіраваныя палітычнымі партыямі, што лічацца апазіцыйнымі.

Усе кандыдаты ў прэзідэнты прызнавалі, што рэгістрацыя ініцыятыўных груп і збор подпісаў прайшлі пры палепшаных умовах. У выніку адкрытай для ўдзелу працэдуры ЦВК зарэгістравала дзесяць кандыдатаў у прэзідэнты.

Кандыдаты былі здольныя без перашкодаў даносіць свае пасланьні да выбаршчыкаў. Станоўчая зьмена ў юрыдычных рамках дазволіла кандыдатам праводзіць сустрэчы з выбаршчыкамі ўжо без папярэдняга атрыманьня дазволу. Аднак кампанію характарызавала адсутнасьць аднолькавых правілаў гульні. БДІПЧ/АБСЕ адзначыла выпадкі неналежнага выкарыстаньня адміністрацыйнага рэсурсу для агітацыі за дзейнага кіраўніка дзяржавы. У выніку, дзейны прэзідэнт і астатнія дзевяць кандыдатаў спаборнічалі ў няроўных умовах.

Нягледзячы на папраўкі, унесеныя ў 2010 годзе, прававыя рамкі, што зараз існуюць, не забясьпечваюць эфектыўнага механізму разгляду скаргаў і апеляцыяў. Яны даюць ЦВК магчымасьць разглядаць выбарчыя спрэчкі непаслядоўна і непразрыста. Ва ўмовах

адсутнасьці выразна прапісаных правілаў УВК і ТВК імправізавалі пры ўсталяваньні працэдураў, выконваючы іх непасьлядоўна. У дадатак, прававыя рамкі ня ўтрымліваюць палажэньняў, якія дазвалялі б аспрэчыць вынікі выбараў.

## Рэзалюцыя Еўрапейскага парламенту адносна сітуацыі ў Беларусі

21.01.2011

Еўрапейскі парламент,

— маючы на ўвазе папярэднюю рэзалюцыю Еўрапарламенту адносна сітуацыі ў Беларусі, у прыватнасьці рэзалюцыю ад 17 сьнежня 2009 г.,

— маючы на ўвазе Рашэньне Рады 2010/639/CFSP ад 25 кастрычніка 2010 г. адносна абмежаваньняў у дачыненьні да пэўных афіцыйных асобаў Беларусі, працягнуць іх да 31 кастрычніка 2011 г.,

— маючы на ўвазе Рашэньне Рады замежных справаў ад 25 кастрычніка 2010 г.,

— маючы на ўвазе заявы Офіса дэмакратычных інстытуцыяў і правоў чалавека АБСЕ і Парламенцкай асамблеі АБСЕ «Аб папярэдніх высновах адносна прэзідэнцкіх выбараў у Беларусі» ад 20 сьнежня 2010 г.,

— маючы на ўвазе Правілы 110 Рэгламенту,

A. У сувязі з тым, што Пражская дэкларацыя саміта Усходняга партнёрства зноў пацьвердзіла, у тым ліку і адносна Беларусі, аддасьць прынцыпам міжнароднага закону і асноўным каштоўнасьцям, у іх ліку дэмакратыі, верхавенства закону і павагі да правоў чалавека і асноўных свабодаў,

B. У сувязі з тым, што Рада 25 кастрычніка 2010 г. «заклікала ўлады Беларусі забясьпечыць правядзеньне прэзідэнцкіх выбараў у адпаведнасьці з міжнароднымі стандартамі і нормамі дэмакратычных выбараў АБСЕ і ААН,

C. У сувязі з тым, што Беларусь прыняла на сябе абавязаньні ўлічыць рэкамендацыі АБСЕ і Офіса дэмакратычных інстытуцыяў і правоў чалавека адносна ўдасканальваньня выбарчага кодэксу

Беларусі з мэтай прывесьці яго ў адпаведнасьць з міжнароднымі стандартамі дэмакратычных выбараў і кансультавацца адносна прапанаваных зьменаў з АБСЕ; у сувязі з тым, што парламент Беларусі прыняў рэформу Выбарчага кодэксу без папярэдняй кансультацыі з АБСЕ,

D. У сувязі з тым, што Рада «зноў пацьвердзіла сваю гатоўнасьць пашыраць дачыненьні з Беларусьсю ў залежнасьці ад разьвіцьця Беларусі ў кірунку да дэмакратыі, павагі да правоў чалавека і верхавенства закону, а таксама гатоўнасьць дапамагаць Беларусі ў дасягненьні гэтых мэтаў»,

E. У сувязі з тым, што Рада, пасьля ацэнкі прагрэсу ў Беларусі, вырашыла працягнуць абмежавальныя захады супраць пэўных афіцыйных асобаў Беларусі, але прыпыніць ўжываньне візавых санкцыяў на паездкі ў ЕС да 31 кастрычніка 2011 г.,

F. У сувязі з тым, што ў адпаведнасьці з заявамі ПА АБСЕ і Офіса дэмакратыі і правоў чалавека АБСЕ «Аб папярэдніх высновах адносна прэзідэнцкіх выбараў у Беларусі» пэўны прагрэс можна адзначыць у часе выбарчага працэсу, але ён азмрочаны сур’ёзнымі парушэньнямі ў часе галасаваньня і гвалтам у дзень выбараў 19 сьнежня,

G. У сувязі з тым, што больш за 700 чалавек былі зьняволеныя за іх удзел у дэманстрацыі 19 сьнежня ў Менску, бальшыня з іх была вызваленая пасьля адбываньня кароткіх тэрмінаў зьняволеньня паводле адміністрацыйных прысудаў, тым часам як 24 апазіцыйныя журналісты і актывісты, у тым ліку 6 кандыдатаў у прэзідэнты, былі абвінавачаныя «ў арганізацыі масавых беспарадкаў» і ім пагражае да 15 гадоў зьняволеньня, а яшчэ 14 чалавек могуць быць асуджаныя такім жа чынам неўзабаве,

H. У сувязі з тым, што разгон міліцыяй дэманстрацыі 19 сьнежня 2010 г. і далейшыя захады праваахоўных органаў супраць дэмакратычнай апазіцыі, свабоды медыяў і грамадзянскай супольнасьці былі асуджаныя прэзідэнтам Еўрапарламенту, высокімі прадстаўнікамі ЕС і Генеральным сакратаром ААН,

I. У сувязі з тым, што адвакаты, якія прадстаўляюць дэмакратычных актывістаў, апазіцыянераў і іх родных, не дапускаюцца да зьняволеных,

1. **Прызнае**, што адпаведна з папярэднімі высновамі ПА АБСЕ і Офісу дэмакратычных інстытуцыяў і правоў чалавека аб тым, што

прэзідэнцкія выбары 19 сьнежня 2010 не адпавядалі міжнародным стандартам свабодных, справядлівых і празрыстых выбараў; прызнае, што ў гэтым галасаваньні была страчаная чарговая магчымасьць для дэмакратызацыі Беларусі, і заклікае, у сувязі са шматлікімі сур'ёзнымі парушэньнямі, адзначанымі АБСЕ, да новых выбараў, якія б былі праведзеныя адпаведна з свабоднымі і дэмакратычнымі нормамі і стандартамі АБСЕ;

2. **Асуджае ўжываньне супраць пратэстоўцаў грубай сілы** міліцыяй і КДБ у дзень выбараў, асабліва жорсткі напад на Уладзіміра Някляева, парушэньне правоў на свабоду сходаў і выказваньняў, а таксама правоў чалавека, і выказвае заклапочанасьць спробамі ўладаў Беларусі ўзяць пад апеку Данілу Саньнікава, 3-гадовага сына кандыдата ў прэзідэнты Андрэя Саньнікава і журналісткі Ірыны Халіп, якія абое застаюцца зьняволеныя ад 19 сьнежня; асаблівую занепакоенасьць выказвае станам здароўя Мікалая Статкевіча, які ўжо месяц трымае галадоўку;

3. Рэзка **асуджае арышт і затрыманьні мірных дэманстрантаў і бальшыні кандыдатаў у прэзідэнты** (напрыклад, Уладзіміра Някляева, Андрэя Саньнікава, Мікалая Статкевіча, Аляксея Міхалевіча), лідэраў дэмакратычнай апазіцыі (напрыклад, Паўла Севярынца, Анатоля Лябедзькі) і вялікай колькасьці грамадзянскіх актывістаў, журналістаў, настаўнікаў і студэнтаў, якім пагражаюць прысуды да 15 гадоў зьняволеньня; заклікае да незалежнага і аб'ектыўнага расьследаваньня пад эгідай АБСЕ; заклікае да неадкладнага спыненьня палітычна матываваных прысудаў;

Еўрапейскі парламент,

— беручы пад увагу папярэднюю рэзалюцыю Еўрапарламенту адносна сітуацыі ў Беларусі, у прыватнасьці рэзалюцыю ад 17 сьнежня 2009 г.,

— беручы пад увагу пастанову Рады 2010/639/CFSP ад 25 кастрычніка 2010 г. адносна абмежаваньняў у дачыненьні да пэўных афіцыйных асобаў Беларусі,

— беручы пад увагу пастанову Рады міністраў замежных справаў ад 25 кастрычніка 2010 г.,

— беручы пад увагу заявы Офісу дэмакратычных інстытуцыяў і правоў чалавека АБСЕ і Парламенцкай асамблеі АБСЕ «Аб папярэдніх высновах адносна прэзідэнцкіх выбараў у Беларусі» ад 20 сьнежня 2010 г.,

— беручы пад увагу Правіла 110 Рэгламенту,

A. У сувязі з тым, што Пражская дэкларацыя саміту «Ўсходняга партнёрства» зноў пацьвердзіла, у тым ліку і адносна Беларусі, адданасьць прынцыпам міжнароднага закону і асноўным каштоўнасьцям, у тым ліку дэмакратыі, вяршэнству закону і павазе да правоў чалавека і асноўных свабод,

B. У сувязі з тым, што Рада 25 кастрычніка 2010 г. «заклікала ўлады Беларусі забясьпечыць правядзеньне прэзідэнцкіх выбараў у адпаведнасьці з міжнароднымі стандартамі і нормамі дэмакратычных выбараў АБСЕ і ААН»,

C. У сувязі з тым, што Беларусь прыняла на сябе абавязаньні ўлічыць рэкамендацыі АБСЕ і яе Офісу дэмакратычных інстытуцыяў і правоў чалавека адносна ўдасканальваньня Выбарчага кодэксу Беларусі з мэтай прывесьці яго ў адпаведнасьць з міжнароднымі стандартамі дэмакратычных выбараў і кансультавацца адносна прапанаваных зьменаў з АБСЕ; у сувязі з тым, што парламент Беларусі прыняў рэформу Выбарчага кодэксу без папярэдняй кансультацыі з АБСЕ,

D. У сувязі з тым, што Рада «зноў пацьвердзіла сваю гатовасьць пашыраць дачыненьні з Беларусьсю ў залежнасьці ад разьвіцьця Беларусі ў кірунку да дэмакратыі, павагі да правоў чалавека і вяршэнства закону, а таксама гатовасьць дапамагаць Беларусі ў дасягненьні гэтых мэтаў»,

E. У сувязі з тым, што Рада пасьля ацэнкі прагрэсу ў Беларусі вырашыла падоўжыць абмежавальныя захады супраць пэўных афіцыйных асобаў Беларусі, але прыпыніць ужываньне візавых санкцыяў да 31 кастрычніка 2011 г.,

F. У сувязі з тым, што ў адпаведнасьці з заявамі ПА АБСЕ і Офісу дэмакратычных істытуцыяў і правоў чалавека АБСЕ «Аб папярэдніх высновах адносна прэзідэнцкіх выбараў у Беларусі» пэўны прагрэс можна адзначыць у ходзе выбарчага працэсу, але ён азмрочаны сур’ёзнымі парушэньнямі ў часе галасаваньня і гвалтам у дзень выбараў 19 сьнежня,

G. У сувязі з тым, што больш за 700 чалавек былі зьняволеныя за іх удзел у дэманстрацыі 19 сьнежня ў Менску, бальшыня з іх былі вызваленыя пасьля адбываньня кароткіх тэрмінаў зьняволеньня паводле адміністрацыйных прысудаў, тым часам як 24 апазіцыйныя

журналісты і актывісты, у тым ліку 6 кандыдатаў у прэзідэнты, былі абвінавачаныя «ў арганізацыі масавых беспарадкаў» і ім пагражае да 15 гадоў зьняволеньня, а яшчэ 14 чалавек могуць быць асуджаныя па падобных абвінавачаньнях,

Н. У сувязі з тым, што разгон міліцыяй дэманстрацыі 19 сьнежня 2010 г і далейшыя захады праваахоўных органаў супраць дэмакратычнай апазіцыі, свабоды медыяў і грамадзянскай супольнасьці былі асуджаныя прэзідэнтам Еўрапарламенту, высокімі прадстаўнікамі ЕЗ і генеральным сакратаром ААН,

І. У сувязі з тым, што адвакаты, якія прадстаўляюць дэмакратычных актывістаў, апазіцыянераў і іх родных, не дапускаюцца да зьняволеных,

1. Прызнае, што адпаведна з папярэднімі высновамі ПА АБСЕ і Офісу дэмакратычных інстытуцыяў і правоў чалавека аб тым, што прэзідэнцкія **выбары 19 сьнежня 2010 году не адпавядалі міжнародным стандартам** свабодных, справядлівых і празрыстых выбараў; прызнае, што гэтае галасаваньне сталася страчанай магчымасьцю для дэмакратызацыі Беларусі, і, у сувязі са шматлікімі сур'ёзнымі парушэньнямі, адзначанымі АБСЕ, **заклікае да новых выбараў**, якія б былі праведзеныя адпаведна з свабоднымі і дэмакратычнымі нормамі і стандартамі АБСЕ;

2. **Асуджае ўжываньне супраць пратэстоўцаў грубай сілы** міліцыяй і КДБ у дзень выбараў, асабліва жорсткі напад на Уладзіміра Някляева, парушэньне правоў на свабоду сходаў і выказваньняў, а таксама правоў чалавека, і выказвае заклапочанасьць спробамі ўладаў Беларусі ўзяць пад апеку Данілу Саньнікава, 3-гадовага сына кандыдата ў прэзідэнты Андрэя Саньнікава і журналісткі Ірыны Халіп, якія абое застаюцца зьняволеныя ад 19 сьнежня; асаблівую занепакоенасьць выказвае станам здароўя Мікалая Статкевіча, які ўжо месяц трымае галадоўку;

3. Рэзка **асуджае арышт і затрыманьні мірных дэманстрантаў і бальшыні кандыдатаў у прэзідэнты** (напрыклад, Уладзіміра Някляева, Андрэя Саньнікава, Мікалая Статкевіча, Аляксея Міхалевіча), лідэраў дэмакратычнай апазіцыі (напрыклад, Паўла Севярынца, Анатоля Лябедзькі) і вялікай колькасьці грамадзянскіх актывістаў, журналістаў, настаўнікаў і студэнтаў, якім пагражаюць прысуды да 15 гадоў зняволеньня; заклікае да незалеж-

нага і аб’ектыўнага расьследаваньня пад эгідай АБСЕ; заклікае да неадкладнага спыненьня палітычна матываваных прысудаў;

4. Асуджае рэпрэсіі і заклікае ўлады Беларусі **неадкладна спыніць усе формы гвалту, перасьледу і запалохваньня** актывістаў грамадзянскай супольнасьці, рэйды, ператрусы і канфіскацыю матэрыялаў у прыватных памяшканьнях, рэдакцыях незалежных СМІ і офісах грамадзкіх арганізацыяў, а таксама выключэньні з унівэрсітэтаў і звальненьні з працы;

5. Патрабуе неадкладнага і безумоўнага **вызваленьня ўсіх зьняволеных у дзень выбараў і пасьля выбараў**, у тым ліку і зьняволеных, прызнаных Amnesty International вязьнямі сумленьня; заклікае ўлады Беларусі забясьпечыць неабмежаваны доступ сваякоў, юрыстаў і медыкаў да зьняволеных;

6. Выказвае шкадаваньне ў сувязі з рашэньнем уладаў Беларусі закрыць офіс АБСЕ ў Беларусі і заклікае ўлады Беларусі адмяніць гэтае рашэньне;

7. Асуджае блакаду ў інтэрнэце шэрагу буйных інтэрнэт-старонак, у тым ліку сацыяльных сетак і апазіцыйных вэб-сайтаў у дзень выбараў у Беларусі; падкрэсьлівае, што цяперашні закон аб СМІ ў Беларусі не адпавядае міжнародным стандартам і таму заклікае беларускія ўлады перагледзець і зьмяніць яго;

8. Заклікае Раду, Камісію і высокіх прадстаўнікоў ЕЗ перагледзець палітыку ЕЗ адносна Беларусі, у тым ліку **ўжыць эканамічныя санкцыі і замарозіць усю макрафінансавую дапамогу** праз крэдыты МВФ, аперацыі Еўрапейскага інвестыцыйнага банку і Еўрапейскага банку рэканструкцыі і разьвіцьця; падкрэсьлівае, што арыентацыя на Еўрапейскую палітыку добрасуседзтва і нацыянальную дапамогу для Беларусі павінна быць перанакіраваная і праводзіцца ў сьферы падтрымкі грамадзянскай супольнасьці; нагадвае пра важнасьць эфектыўнага выкарыстаньня Еўрапейскай ініцыятывы для дэмакратыі і правоў чалавека;

9. Заклікае Камісію **падтрымаць усімі фінансавымі і палітычнымі сродкамі высілкі грамадзянскай супольнасьці, незалежных СМІ** (у тым ліку тэлеканалу «Белсат», «Еўрапейскага радыё для Беларусі», «Радыё Рацыя» і іншых) і недзяржаўных арганізацыяў у Беларусі, якія спрыяюць разьвіцьцю дэмакратыі і супрацьстаяць рэжыму; бачыць неабходнасьць актывізаваць і заахвоч-

ваць сувязі беларускіх недзяржаўных арганізацыяў з міжнароднай супольнасьцю; разам з тым заклікае Камісію прыпыніць цяперашняе супрацоўніцтва і **адклікаць дапамогу дзяржаўным СМІ** ў Беларусі; адначасова з гэтым Камісія мусіць прафінансаваць перавыданьне і распаўсюджваньне кніг Уладзіміра Някляева, сканфіскаваных і зьнішчаных беларускімі ўладамі;

10. Заклікае Еўрапейскую камісію разьвіваць механізм рэгістрацыі недзяржаўных арганізацыяў, якім адмоўлена ў рэгістрацыі ў Беларусі з палітычных прычынаў, для таго каб даць ім магчымасьць карыстацца праграмамі ЕЗ;

11. Заклікае Камісію працягваць і павялічваць фінансавую **дапамогу Еўрапейскаму гуманітарнаму ўнівэрсітэту** (ЕГУ), які месьціцца ў Вільні (Літва), павялічыць колькасьць стыпендыяў для беларускіх студэнтаў, рэпрэсаваных за іх грамадзянскую актыўнасьць і выключаных з унівэрсітэтаў і зрабіць унёсак у канферэнцыю донараў «Салідарнасьць з Беларусьсю», запланаваную на 2.02.2011, і наступную канферэнцыю ў Вільні (3-4.02.2011);

12. Заклікае Раду, Камісію і вярхоўную прадстаўніцу ЕЗ неадкладна **аднавіць візавыя санкцыі ў дачыненьні да кіраўнікоў Беларусі** і пашырыць іх на дзяржаўных чыноўнікоў, а таксама супрацоўнікаў праваахоўных органаў і сілаў бясьпекі, якія могуць быць адказнымі за парушэньні ў часе галасаваньня і пасьлявыбарныя жорсткія рэпрэсіі і арышты прадстаўнікоў апазіцыі, а таксама замарозіць іх банкаўскія актывы; зьвяртае ўвагу, што санкцыі павінны заставацца ў сіле як найменей да вызваленьня ўсіх палітычных зьняволеных і поўнага зьняцьця з іх абвінавачаньняў; вітае добрыя прыклады ўраду Польшчы і парламенту Літвы, якія ўвялі ў дзеяньне візавыя абмежаваньні для прадстаўнікоў рэжыму ў Менску і разам з тым аблегчылі паездкі ў Еўрасаюз для беларускіх грамадзянаў;

13. Заклікае Раду разгледзець магчымасьць **прыпыненьня ўдзелу Беларусі ва «Ўсходнім партнёрстве»** на саміце «Ўсходняга партнёрства» ў Будапешце, калі ня будзе прымальнага тлумачэньня і значнага паляпшэньня сітуацыі ў Беларусі, пры гэтым прыпыненьне не распаўсюджваецца на няўрадавыя арганізацыі і грамадзянскую супольнасьць;

14. Заклікае Камісію і Раду актывізаваць перамовы ў справе пагадненьня аб рэадмісіі для **спрашчэньня візавага рэжыму**, у тым

ліку і даступных візавых збораў у мэтах спрашчэньня кантактаў паміж людзьмі;

15. Выказвае спадзяваньне, што краіны-сябры ЕЗ не аслабяць дзеяньняў Еўрасаюзу двухбаковымі кантактамі з беларускім рэжымам, што аслабіла б аўтарытэт і эфектыўнасьць еўрапейскай замежнай палітыкі;

16. Выказвае меркаваньне, што **спартовыя мерапрыемствы, такія як чэмпіянат сьвету па хакеі ў 2014 годзе, ня могуць праводзіцца ў Беларусі**, пакуль у гэтай краіне будуць заставацца палітвязьні;

17. Выказвае **шкадаваньне ў сувязі з крокамі Расійскай Федэрацыі**, якая прызнала выбары і расцаніла рэпрэсіі як «унутраную справу», рэкамендуе Еўракамісіі распачаць дыялог, кансультацыі і палітычную каардынацыю з суседзямі Беларусі, якія не ўваходзяць у ЕЗ, але традыцыйна маюць асаблівыя адносіны з гэтай краінай і адначасна зьяўляюцца партнёрамі ЕЗ — а менавіта Расіяй і Украінай, каб максімальна павысіць эфектыўнасьць палітыкі ЕЗ у дачыненьні да Беларусі, а таксама супрацоўнічаць у справе належнага ўраўнаважаньня рэакцыі на недахоп дэмакратыі і парушэньні правоў чалавека ў Беларусі з неабходнасьцю пазьбегчы яе міжнароднай ізаляцыі.

18. Даручае старшыні накіраваць гэтую рэзалюцыю ў Раду Еўропы, Еўрапейскую камісію, вярхоўнаму прадстаўніку, дзяржавам-сябрам ЕЗ, прэзідэнту, парламенту і ўраду Беларусі, Парламенцкай Асамблеі Рады Еўропы і АБСЕ.

## Рэзалюцыя Парламенцкай Асамблеі Рады Еўропы (ПАРЭ) па сітуацыі ў Беларусі пасьля прэзідэнцкіх выбараў

27.01.2011

1. Парламенцкая Асамблея выказвае шкадаваньне з прычыны беспрэцэдэнтнай хвалі гвалту, запалохваньня, масавых арыштаў і перасьледу палітычных апанентаў, праваабаронцаў, супрацоўнікаў СМІ, студэнтаў і грамадзянаў Беларусі, якія пасьледавалі за абвяшчэньнем вынікаў прэзідэнцкіх выбараў, якія адбыліся ў Беларусі 19 сьнежня 2010 году.

2. Больш за 600 чалавек былі арыштаваныя, у тым ліку кандыдаты ў прэзідэнты, у той час як напады іператрусы праводзіліся ў дамах лідэраў апазыцыі, праваабаронцаў і журналістаў, а таксама ў офісах шэрагу няўрадавых арганізацый і СМІ. У месяц, што пайшоў пасьля выбараў, падаўленьне працягваецца больш мэтанакіравана, і сёньня па-ранейшаму не выяўляецца прыкметаў памякчэньня. Такое гвалтоўнае падаўленьне палітычных пратэстаў і мэтавыя падаўленьні палітычных праціўнікаў, праваабаронцаў і супрацоўнікаў сродкаў масавай інфармацыі ёсьць ня толькі непрапарцыйным адказам на дзеяньні пратэстоўцаў, але і прамым ігнараваньнем асноўных каштоўнасьцяў падтрыманых Радай Еўропы.

3. Вітаючы Рэзалюцыю Еўрапейскага парламенту ад 20 студзеня 2011 году пра сітуацыю ў Беларусі, Асамблея, у прыватнасьці, асуджае затрыманьне сіламі бясьпекі пасьля 19 сьнежня 2010 году Ірыны Халіп, журналісткі расейскай газеты «Новая газета», і жорстка параненага кандыдата ў прэзідэнты Андрэй Саньнікава, а таксама пагрозу ўладаў аддаць іх 3-гадовага сына ў дзіцячы дом. Асамблея таксама асуджае працяг утрыманьня пад вартай Натальлі Радзінай, рэдактара сайту Хартыя-97, якая была затрымана пад часператрусу супрацоўнікамі сілаў бясьпекі ў Менску 20 сьнежня 2010 года.

4. Асамблея зноў заяўляе аб сваёй перакананасьці ў тым, што мусяць цалкам паважацца палітычныя свабоды, і што ўсе асобы і групы павінны быць у стане мірна ажыцьцяўляць свае правы на свабоду выказваньня меркаваньняў і сходаў, у тым ліку пры рэзкай крытыцы на адрас уладаў, і правядзеньня выбараў.

5. Асамблея шкадуе, што, паводле папярэдняй ацэнкі АБСЕ апошніх прэзідэнцкіх выбараў, у Беларусі, нягледзячы на некаторыя канкрэтныя паляпшэньні ў сістэме выбараў і падчас кампаніі, усё яшчэ існуе значны адрыў ад абавязацельстваў АБСЕ, у тым ліку, ад шэрагу ключавых міжнародных стандартаў для дэмакратычных выбараў, такіх, як празрыстасьць і падсправаздачнасьць у падліку галасоў, і якія былі адзначаны адсутнасьцю роўнага доступу да СМІ для ўсіх кандыдатаў і нядобрасумленнага выкарыстаньня дзяржаўных рэсурсаў у падтрымку дзейнага прэзідэнта.

6. Асамблея таксама выказвае шкадаваньне з нагоды рашэньня беларускіх уладаў не падаўжаць мандат офіса АБСЭ ў Менску, якая захоўвае сваю прысутнасьць у Беларусі з 1998 году.

7. У сьвятле вышэй сказанага, Асамблея заклікае беларускія ўлады:

7.1. неадкладна вызваліць усіх апазіцыйных кандыдатаў і іх прыхільнікаў, журналістаў і праваабаронцаў, затрыманых па палітычных матывах;

7.2. спыніць перасьлед і запалохваньне апазіцыйных палітыкаў, СМІ і прадстаўнікоў грамадзянскай супольнасьці;

7.3. правесьці адкрытае расьсьледаваньне злоўжываньняў і непрапарцыйнага ўжываньня сілы з боку міліцыі і сілаў бясьпекі супраць дэманстрантаў;

7.4. спыніць выключэньне студэнтаў з унівэрсітэтаў і звальненьне людзей з працы ў сувязі з іх удзелам у акцыі пратэсту;

7.5. перагледзець сваё рашэньне аб закрыцьці офісу АБСЕ ў Менску і падоўжыць яго мандат ў 2011 годзе і надалей;

7.6. завяршыць працэс рэформаў выбарчага заканадаўства і практыкі з улікам поўнага набору рэкамендацыяў БДІПЧ / АБСЕ ды Еўрапейскай камісіі за дэмакратыю праз закон (Вэнецыянская камісія);

7.7. прыцягнуць да адказнасьці меркаваных вінаватых у зьнікненьні Юрыя Захаранкі, Віктара Ганчара, Анатоля Красоўскага і Дзьмітрыя Завадзкага, у адпаведнасьці з рэзалюцыяй 1371 (2004);

07.08. абʼявіць мараторый на выкананьне сьмяротных прысудаў у якасьці першага кроку да адмены сьмяротнага пакараньня, у адпаведнасьці з рэзалюцыяй 1671 (2009).

8. Асамблея перакананая, што любыя санкцыі і абмежаваньні ў кантактах і ўзаемадзеяньні з асобамі, адказнымі за падзеі, у тым ліку вышэйшымі службовымі асобамі краіны, не павінны прывесьці да далейшай ізаляцыі беларускага народу.

9. Асамблея таксама перакананая ў карысьці санкцыяў у дачыненьні да тых, хто нясе асабістую адказнасьць за самыя абуральныя акты рэпрэсій, пры ўмове што яны адбываюцца праз справядлівыя і празрыстыя працэдуры. Таму яна (Асамблея) прапануе ўсім дзяржавам-членам Еўрасаюзу, у тым ліку тым, якія не зьяўляюцца членамі ЕС, але маюць намер уступіць ў Еўрасаюзу, падтрымаць мэтанакіраваныя санкцыі ў дачыненьні да беларускіх чыноўнікаў.

10. Асамблея пастанаўляе умацоўваць дыялог з дэмакратычнымі сіламі Беларусі, грамадзянскай супольнасьцю, апазіцыйнымі групамі, свабоднымі СМІ і праваабаронцамі. У тым жа ключы, Асамблея заклікае ўсе краіны Еўрасаюзу:

10.1. падтрымаць і разьвіваць дыялог з грамадзянскай супольнасьцю Беларусі і інвеставаць у міжасабовыя кантакты з Беларусьсю на ўсіх узроўнях;

10.2. разгледзець шляхі палягчэньня выдачы віз для звычайных грамадзян Беларусі, а таксама разгледзець магчымасьць стварэньня ўмоваў часовага прытулку тым, хто знаходзіцца пад пагрозай перасьледу як палітычныя апаненты, праваабаронцы і журналісты;

10.3. заахвочваць універсітэты, каб яны адчынілі свае дзьверы для беларускіх студэнтаў, якія былі выгнаныя за палітычную дзейнасьць;

10.4. падтрымаць патрабаваньне працягнуць мандат офісу АБСЕ ў Менску;

10.5. яўна ўстрымацца ад прызнаньня выніку прэзідэнцкіх выбараў у Беларусі;

10.6. заахвочваць і падтрымліваць намаганьні па зборы і захаваньні доказаў у дачыненьні да вінаватых у сур'ёзных парушэньнях правоў чалавека з улікам адрасных санкцый і будучага крымінальнага перасьледу.

11. Што тычыцца ўласных адносін з Беларусьсю, Асамблея нагадвае, што ў сваёй рэзалюцыі 1727 (2010), прынятай у красавіку 2010 году, <...> Асамблея пастанавіла прыпыніць кантакты на высокім узроўні з беларускімі ўладамі, паўтарыўшы, што ня можа быць праграсу ў дыялогу з беларускімі ўладамі без прагрэсу ў дасягненьні стандартаў Рады Эўропы.

12. У сувязі з цяперашнім пагаршэньнем, Асамблея зноў пацьвярджае сваё рашэньне адкласьці кантакты на высокім ўзроўні з беларускімі ўладамі. Яна заклікае Бюро Асамблеі не адмяняць прыпыненьня статусу сьпецыяльна запрошанага для парламенту Беларусі:

12.1. пакуль мараторый на выкананьне сьмяротнага пакараньня ня будзе абвешчаны кампетэнтнымі беларускімі ўладамі;

12.2. пакуль ня выявіцца істотны і магчымы для праверкі прагрэс ў плане павагі да дэмакратычных каштоўнасьцяў і прынцыпаў, падтрыманых Радай Эўропы.

13. Асамблея заклікае ўсе палітычныя бакі Рады Эўропы і Эўрапейскага парламенту прыняць актыўныя меры ў падтрымку іх роднасных партыяў у Беларусі шляхам ўмацаваньня асабістага клопату пра зьняволеных лідэраў і членаў іх сем'яў, прадстаўленьня фінансавай падтрымкі для функцыянаваньня партыяў, і запрашэнь-

ня іх прымаць актыўны ўдзел у пасяджэньнях еўрапейскага боку на ўсіх узроўнях.

### Поўны тэкст заключэньня Савету ЕС па Беларусі

Беларускае прадстаўніцтва ЕС распаўсюдзіла поўны тэкст заключэньня Савету міністраў Еўрасаюзу па Беларусі, прынятага 31 студзеня ў Брусэлі.

Дакумент утрымлівае восем пунктаў:

«1. Беручы пад увагу свае папярэднія заключэньні па Беларусі, прынятыя, у прыватнасьці, у кастрычніку 2010 году, заяву высокага прадстаўніка Еўрапейскага саюзу па замежных справах і палітыцы бясьпекі Кэтрын Эштан ад 20 сьнежня, а таксама іншыя заявы ЕС наконт прэзідэнцкіх выбараў 19 сьнежня 2010 году і сілавога разьвіцьця падзей, якое адбылося пасьля іх, Савет ЕС глыбока шкадуе аб тым, што, згодна з высновамі БДІПЧ АБСЕ, прэзідэнцкія выбары паказалі, што Беларусі яшчэ неабходна прайсьці доўгі шлях для таго, каб адпавядаць абавязацельствам у рамках АБСЕ. У прыватнасьці, выбарчы працэс істотна пагоршыўся падчас падліку галасоў, аслабіўшы прынятыя раней меры па паляпшэньні правядзеньня выбараў.

2. Савет ЕС асабліва шкадуе аб тым, што вечар пасля выбараў быў азмрочаны прымяненьнем сілы з боку беларускіх уладаў. Савет рашуча асуджае арышт некалькіх кандыдатаў у прэзідэнты, соцень актывістаў, журналістаў і прадстаўнікоў грамадзянскай супольнасьці, а таксама наступнае затрыманьне і перасьлед па палітычных матывах прадстаўнікоў апазіцыі, незалежных СМІ і грамадзянскай супольнасьці.

3. Савет зноў заяўляе пра сваё патрабаваньне неадкладна вызваліць і рэабілітаваць усіх арыштаваных па палітычных прычынах пасьля выбараў 19 сьнежня. Савет заклікае Беларусь паважаць правы арыштаваных і членаў іх сем'яў, надаючы асаблівую ўвагу іх дзецям, а таксама праву затрыманых на прававое прадстаўніцтва. Ён таксама падкрэсьлівае неабходнасьць забясьпечыць доступ членаў сям'і да арыштаваных. Савет заклікае беларускія ўлады спыніць перасьлед дэмакратычных сіл, незалежных СМІ, прадстаўнікоў грамадзянскай супольнасьці, студэнтаў, а таксама пакласьці канец пакарань-

ням і дыскрымінацыі тых, хто скарыстаў сваё права на свабоду слова і сходаў, уключаючы і лідараў апазіцыйных партый.

4. ЕС шкадуе пра рашэньне беларускіх уладаў не працягваць мандат офісу АБСЕ ў Менску. ЕС перакананы ў тым, што мандат офісу АБСЕ незавершаны, і таму заклікае беларускія ўлады да тэрміновай адмены свайго рашэньня.

5. Беручы пад увагу гэтае разьвіцьцё сітуацыі ў апошні час і падзеі, што адбыліся, Савет ЕС вырашыў абмежаваць перамяшчэньне і замарозіць актывы асоб, адказных за фальсіфікацыю прэзідэнцкіх выбараў 19 сьнежня 2010 году, а таксама за наступныя гвалтоўныя меры, накіраваныя супраць дэмакратычнай апазіцыі, грамадзянскай супольнасьці і прадстаўнікоў незалежных СМІ. Савет таксама вырашыў аднавіць абмежаваньні адносна перамяшчэньня шэрагу асоб Беларусі ў сувязі з выбарамі 2004 і 2006 гадоў, а таксама ў сувязі з перасьледам грамадзянскай супольнасьці і дэмакратычнай апазіцыі, — абмежаваньні, дзеяньне якіх было прыпыненае з 13 кастрычніка 2008 году ў мэтах спрыяньня прагрэсу ў адносінах ЕС і Беларусі. Гэтыя абмежавальныя меры, а таксама сьпіс асоб, якія пад іх трапляюць, застануцца адкрытымі і будуць пастаянна пераглядацца. Савет падкрэсьлівае, што вызваленьне і рэабілітацыя ўсіх людзей, затрыманых па палітычных прычынах, зьяўляецца ў гэтых адносінах істотным момантам. Гэта, а таксама прасоўваньне да далейшых рэформ Выбарчага кодэксу, забесьпячэньне свабоды слова і СМІ, свабоды сходаў і аб’яднаньняў, магло б прывесьці да зьняцьця абмежавальных мер.

6. Еўрапейскі саюз застаецца верны сваёй рашучасьці ўмацоўваць адносіны з беларускім народам і грамадзянскай супольнасьцю. Таму цяпер ЕС працуе над мерамі, нацэленымі на аказаньне тэрміновай дапамогі рэпрэсаваным і затрыманым па палітычных прычынах, членам іх сем'яў, а таксама грамадзянскай супольнасьці. Ён таксама перагледзіць сваю падтрымку Беларусі, нацэленую на дапамогу насельніцтву. Мэта перагляду заключаецца ў тым, каб яшчэ больш узмацніць падтрымку грамадзянскай супольнасьці, у прыватнасьці, недзяржаўных арганізацый і студэнтаў, у тым ліку ў рамках Міжнароднай донарскай канферэнцыі, якая адбудзецца 2 лютага ў Варшаве.

7. Савет нагадвае пра важнасьць спрашчэньня міжасобасных кантрактаў з Беларусьсю, якое прынясе карысьць беларускаму

насельніцтву ў цэлым. Пасьля прыняцьця адпаведных перамоўных дырэктыў ЕС чакае пачатку перамоў па пагадненьнях аб спрашчэньні візавага рэжыму і рэадмісіі. Да заключэньня гэтых пагадненьняў ЕС будзе падтрымліваць аптымальнае выкарыстанне існуючых гнуткіх механізмаў Візавага кодэксу, у прыватнасьці, магчымасьць краін — членаў ЕС памяншаць або адмяняць плату за візы для пэўных катэгорый грамадзян.

8. ЕС захоўвае прыхільнасьць сваёй палітыцы крытычнага ўзаемадзеяньня з Беларусьсю, у прыватнасьці, шляхам дыялогу і ў рамках Усходняга партнёрства. Ён нагадвае, што неаднаразова прапаноўваў паглыбіць свае адносіны з Беларусьсю. Савет падкрэсьлівае, што падобнае пашырэньне адносінаў залежыць ад прагрэсу беларускіх уладаў у выкананьні прынцыпаў дэмакратыі, вяршэнства права і правоў чалавека. ЕС захоўвае сваю адкрытасьць да разьвіцьця двухбаковых адносінаў з Беларусьсю, пры ўмове, што беларускія ўлады прадэманструюць сваё жаданьне паважаць гэтыя прынцыпы на практыцы. Савет будзе рэгулярна сачыць за сітуацыяй у Беларусі і заяўляе пра сваю гатоўнасьць да прыняцьця новых адрасных мер, у залежнасьці ад сітуацыі, ва ўсіх сьферах супрацоўніцтва».

### Тэрміновы зварот — Абсерваторыя

BLR 001 / 0111 /OBS 004
Вобшук і канфіскацыя / юрыдычны перасьлед
Беларусь
18 студзеня 2011

Абсерваторыя па Абароне Праваабаронцаў, сумесная праграма Міжнароднай Федэрацыі Правоў Чалавека (FIDH) і Сусьветнай Арганізацыі супраць Катаваньняў (OMCT), атрымала новую інфармацыю і просіць вашага неадкладнага ўмяшальніцтва ў наступную сітуацыю ў Беларусі.

**Новая інфармацыя:**

Абсерваторыя атрымала з надзейных крыніц інфармацыю аб тым, што 17 студзеня 2011 сп. Алесь Бяляцкі, старшыня Праваабарончага

Цэнтру «Вясна» і віцэ-Прэзідэнт FIDH, быў адпушчаны дамоў КДБ каля 11 гадзін вечара, пасьля заканчэньня вобшукаў у офісе «Вясны», ягонай кватэры і загарадным доме.

Паводле нашай інфармацыі, пасіля вобшуку ў офісе «Вясны»[1] КДБ правёў два адначасовыя вобшукі. Адзін з іх прайшоў у хаце сп. Бяляцкага ў прысутнасіці ягонай жонкі, а другі — у ягоным загарадным доме ў ягонай прысутнасіці. У 11 гадзін вечара, пасля сканчэніня вобшукаў, сп. Алесю Бяляцкаму дазволілі вярнуцца дамоў.

Абсерваторыя застаецца заклапочанай працягваючымся перасіледам «Вясны» і яе сяброў у рамках расьследваньня крымінальнай справы адносна падзеяў 19 сьнежня 2010, які падаецца скіраваным на ўстанаўленьне кантролю над іхняй праваабарончай дзейнасьцю, і заклікае беларускія ўлады пакласьці гэтаму неадкладны канец.

Больш таго, паводле атрыманай інфармацыі, 14 студзеня 2011 інфармацыйны сайт «Советская Белоруссия» надрукаваў артыкул, у якім беларуская апазіцыя абвінавачвалася ў тым, што яна кантралюецца і фінансуецца ўладамі замежных краінаў. Гэты ж артыкул утрымліваў цытаты з як быццам бы чата па скайпе паміж сп. Бяляцкім і грантадаўцам і нібыта копію кантракта з іншым грантадаўцам. Далей аўтар артыкулу выказваў інсінуацыі наконт таго, што ўзгаданыя сродкі, выдзеленыя на праваабарончую дзейнасьць, выкарыстоўваліся на іншыя патрэбы.

Абсерваторыя заклікае беларускія ўлады ўстрымацца ад перасьледу праваабаронцаў і гарантаваць іхнія правы на свабоду асацыяцыяў і выказваньняў. У больш агульным плане, Абсерваторыя заклікае беларускія ўлады прытрымліваца пры любых абставінах Дэкларацыі ААН аб Праваабаронцах, Сусьветнай Дэкларацыі Правоў Чалавека, а таксама міжнародных і рэгіянальных праваабарончых дакументаў, ратыфікаваных Рэспублікай Беларусь.

Абсерваторыя таксама нагадвае, што ў абзацы 8 Рэзалюцыі Парламенцкай Асамблеі АБСЕ «Аб ўзмацненьні ўзаемадзеяньня АБСЕ з праваабаронцамі і дзяржаўнымі праваабарончымі інстытутамі»[2] заяўляецца, што краіны-удзельніцы АБСЕ прызнаюць «неабходнасьць асаблівай увагі да праваабаронцаў, іх падтрымкі і абароны з боку АБСЕ, ейных інстытутаў і мясцовых місіяў, а таксама з боку краінаў-удзельніц».

[1] Гл. прэс-рэліз Абсерваторыі за 17 студзеня 2011.

[2] Прынятая на Парламенцкай Асамблеі АБСЕ ў Кіеве 10 ліпеня 2007.

**Даведка:**

Каля 3 гадзін ночы 20 студзеня 2010, пасьля дня выбараў, 15 асобаў у цывільным уварваліся ў офіс «Вясны». Паводле надзейнай інфармацыі, гэтыя 15 асобаў былі супрацоўнікамі Камітэту Дзяржаўнай Бясьпекі (КДБ). У 3.45 ночы, дзесяць сяброў «Вясны» былі арыштаваныя і дастаўленыя ў РАУС Першамайскага раёну. Сярод арыштаваных былі юрысты Уладзімір Лабковіч і Валянцін Стэфановіч, а таксама спадары Андрэй Палуда, Зьміцер Салаўёў, Сяржук Сыс, Уладзімір Мікалаеў, Алег Жлутка, Канстанцін Старадубец, Віталь Чарняўскі і спадарыня Наста Лойка. Пасля гэтага сьпецслужбы правялі вобшук у офісе. Усе кампутары і дакументы «Вясны» былі канфіскаваныя.

У момант арышту сябры «Вясны» аналізавалі дадзеныя, атрыманыя ў мінулы дзень ад 600 назіральнікаў за выбарамі па ўсёй краіне, у межах кампаніі праекта па назіраньні «Праваабаронцы за свабодныя выбары», праведзенага сумесна «Вясной» і Беларускім Хельсінскім Камітэтам (БХК).

Падчас апытаньня ў РАУС, ад дзесяці сяброў «Вясны» былі запатрабаваныя тлумачэньні наконт таго, дзе яны дакладна знаходзіліся ў дзень выбараў і ці ўдзельнічалі яны ў дэманстрацыі. Усе яны былі адпушчаныя ў 6 гадзін раніцы таго ж дня. Праз паўгадзіны сьпецслужбы зноў наведалі офіс «Вясны» ў пошуках сп. Лабковіча (які толькі што быў адпушчаны), аднак апошняга не было ў памяшканьні.

Прыкладна ў 3 гадзіны дня 17 студзеня 2011 года тры супрацоўнікі КДБ абшукалі офіс «Вясны» ў Менску ў прысутнасьці двух панятых, згодна з патрабаваньнямі заканадаўства. Як паведамлялася, у міліцыянтаў быў ордэр на вобшук у сувязі з падзеямі 19 студзеня 2010. Супрацоўнікі КДБ папрасілі астатніх супрацоўнікаў «Вясны» пакінуць памяшканьне, канфіскавалі кампутар і прымусілі сп. Алеся Бяляцкага сьледаваць за імі.

**Неабходныя дзеяньні:**

Абсерваторыя заклікае беларускія ўлады:

i. спыніць усе формы перасьледу вышэйузгаданых арганізацый ды іхніх сяброў, у прыватнасьці Алеся Бяляцкага, і забясьпечыць іх сябрам магчымасьць свабодна і беспрашкодна ажыццяўляць сваю дзейнасьць;

ii. спыніць усялякі перасьлед праваабаронцаў у Беларусі;

iii. прытрымліваца палажэньняў Дэкларацыі ААН аб праваабаронцах, у прыватнасьці:

- Артыкула 1, у якім сьцвярджаецца, што «кожны мае права прапагандаваць правы чалавека і асноўныя свабоды, спрыяць іх абароне і рэалізацыі на дзяржаўным і міжнародным узроўні, як адзінаасобна, так і ў аб'яднаньні з іншымі»,

- Артыкула 5 (а) і (б), які прадугледжвае, што «кожны мае права на мірныя сходы на дзяржаўным і міжнародным узроўні дзеля абароны і заахвочваньня правоў чалавека і асноўных свабод, як адзінаасобна, так і ў аб'яднаньні з іншымі; а таксама на ўтварэньне, уступленьне і ўдзел у недзяржаўных арганізацыях, аб'яднаньнях і групах»;

- Артыкула 6 (а) і (б), у якім сьцвярджаецца, што «кожны мае права адзінаасобна і ў аб'яднаньні з іншымі ведаць, шукаць, атрымліваць і захоўваць інфармацыю аб усіх правах чалавека і асноўных свабодах, уключаючы доступ да інфармацыі аб тым, як дадзеныя правы і свабоды выконваюцца ў дзяржаўных заканадаўчай, судовай і адміністратыўнай сістэмах; і, як прадугледжваецца ў праваабарончых ды іншых датычных міжнародных дакументах, свабодна публікаваць, дзяліцца з іншымі і распаўсюджваць меркаваньні, інфармацыю і веды аб усіх правах чалавека і асноўных свабодах»;

- Артыкула 12.2, у якім сьцвярджаецца, што «дзяржава павінна прымаць усе неабходныя меры дзеля забесьпячэньня кампетэнтнымі органамі ўсіх, як адзінаасобна, так і ў аб'яднаньні з іншымі, ад любых праяваў жорсткасьці, пагроз, помсты, дэ факта і дэ юрэ дыскрымінацыі, ціску і любых іншых адвольных дзеяньняў, зьвязаных з законным карыстаньнем імі сваімі правамі, на якія спасылаецца дадзеная Дэкларацыя»;

iv. прытрымліваца палажэньняў Дакумента Капенгагенскай Сустрэчы 2-ой Канферэнцыі па Чалавечым Вымярэньні Канферэнцыі па Супрацоўніцтве і Бясьпецы ў Еўропе (CSCE) (1990), і падтрымліваць пры любых абставінах прынцыпы і палажэньні, замацаваныя ў міжнародных і рэгіянальных праваабарончых дакументах, ратыфікаваных Беларусьсю, якія, у прыватнасьці, гарантуюць свабоду аб'яднаньняў, дэманстрацыяў, самавыражэньня і меркаваньняў, у прыватнасьці, у Еўрапейскай Канвенцыі па Правах Чалавека і Міжнародным Пакце аб Грамадзянскіх і Палітычных Правах;

vi. у больш агульным плане, забясьпечваць пры любых абставінах захаваньне правоў чалавека і асноўных свабод у адпаведнасьці з Міжнароднай

Дэкларацыяй Правоў Чалавека і міжнароднымі і рэгіянальнымі праваабарончымі дакументамі, ратыфікаванымі Беларусьсю.

**Адрасы:**

•Прэзідэнт Аляксандр Лукашэнка, вул. К. Маркса 38, 220016 Менск, Беларусь, факс: +375 172 26 06 10 або + 375 172 22 38 72, Е-мэйл: infogrp@president.gov.by

•Адміністрацыя Прэзідэнта Беларусі

•Старшыня Адміністрацыі Прэзідэнта Беларусі, сп. Уладзімір Уладзіміравіч Макей, вул. К. Маркса 34, 220016 Менск, факс: +375 17 226-06-10

•Генеральны Пракурор, Рыгор Аляксеевіч Васілевіч, вул. Інтэрнацыянальная 22,, 220050 Менск, Беларусь, факс: + 375 17 226 42 52

•Міністр Юстыцыі Беларусі, сп. Віктар Рыгоравіч Галаванаў, вул. Калектарная 10, 220004 Менск, Беларусь, Е-мэйл kanc@minjust.by

•Старшыня Вярхоўнага Суда Беларусі, сп. Валянцін Алегавіч Сукала, вул. Леніна 28, 220030 Мінск, Беларусь, Е-мэйл: scjustrb@pmrb.gov.by

•Пастаянная Місія Беларусі ў ААН у Жэневе, 15 avenue de la paix, 1211 Жэнева 20, Швейцарыя, Факс: +4122 748 24 51. Е-мэйл:mission.belarus@ties.itu.int

•Амбасада Беларусі ў Брусэлі, 192 праспект Мальера, 100 Ixelles, Бельгія, факс: + 322.340.02.87, Е-мэйл: embbel@skynet.be

Калі ласка, напішыце таксама ў дыпламатычныя місіі або амбасады Беларусі ў сваёй краіне.

Парыж-Жэнева, 18 студзеня 2011

# 4. Адміністрацыйны перасьлед

Праваабаронцы цэнтр «Вясна» на працягу сваёй дзейнасьці ажыцьцяўляе маніторынг адміністрацыйнага перасьледу актывістаў дэмакратычнага руху: збірае інфармацыю аб затрыманьнях і пакараньнях, вынесеных судамі альбо адміністрацыйнымі камісіямі, а таксама зьвесткі, калі затрыманых адпусьцілі без складаньня адміністрацыйнага пратаколу.

На сайце ПЦ «Вясна» (www.spring96.org) зьмешчана адмысловая табліца «Сьпіс рэпрэсаваных-2010», куды занесеныя тыя да-

дзеныя, якімі валодаюць праваабаронцы — прозьвішчы асуджаных і прозвішчы судзьдзяў, што выновілі прысуды. Нажаль, гэты сьпіс далёка няпоўны, бо ня ўсе факты перасьледу становяцца вядомымі праваабаронцам па пэўных прычынах. Але тым ня менш, усё зафіксаванае — гэта ўжо частка сучаснай гісторыі, адлюстраваньне рэальнай сітуацыі з правамі чалавека ў Беларусі.

Мы вырашылі ў кнізе зьмясьціць гэтую табліцу, толькі без апошняга слупка, дзе пазначаны падрабязнасьці. З дадатковымі зьвесткамі ахвотныя могуць азнаёміцца на сайце, загрузіўшы «Сьпіс рэпрэсаваных-2010». Калі нехта там не знойдзе сябе ці сваіх знаёмых, якія былі затрыманыя і пакараныя, альбо некаторыя дадзеныя пажадана папрavіць, калі ласка, пішыце на пошту, пазначаную на сайце. ПЦ «Вясна» будзе ўдзячны вашай дапамозе ў зборы больш дакладнай інфармацыі.

Варта дадаць толькі, што сьпіс рэпрэсаваных існуе ня толькі за 2010 год. У табліцы на сайце (http://spring96.org/persecution/) існуюць адмысловыя графы для пошуку, запоўніўшы якія можна знайсьці тыя зьвесткі, якія вас цікавяць — даты, прозьвішчы, вынесенае пакараньне.

| № | Дата затрымання | Імя | Артыкул | Дата суда | Судзьдзя | Суд | Арышт | Штраф |
|---|---|---|---|---|---|---|---|---|
| 1 | 2011-01-30 | Людвіг Кася | 23.34 КаАП — «парушэньне парадку арганізацыі і правядзеньня масавых мерапрыемстваў» | 2011-01-31 | Вайцэховіч Натальля | Менск, Цэнтральны | 10 сут. | |
| 2 | 2011-01-30 | Кур'яновіч Паліна | 23.34 КаАП — «парушэньне парадку арганізацыі і правядзеньня масавых мерапрыемстваў» | 2011-01-31 | Ясеновіч Леанід | Менск, Цэнтральны | 10 сут. | |
| 3 | 2011-01-30 | Вінярскі Максім | 23.34 КаАП — «парушэньне парадку арганізацыі і правядзеньня масавых мерапрыемстваў» | 2011-01-31 | Хадановіч Аляксандр | Менск, Цэнтральны | 10 сут. | |
| 4 | 2011-01-30 | Адамовіч Марына | 23.34 КаАП — «парушэньне парадку арганізацыі і правядзеньня масавых мерапрыемстваў» | 2011-01-31 | Шабуня Вікторыя | Менск, Цэнтральны | | 30 б.в. 1050000 руб. |
| 5 | 2011-01-30 | Бойка Зьміцер | 23.34 КаАП — «парушэньне парадку арганізацыі і правядзеньня масавых мерапрыемстваў» | 2011-01-31 | Бычко Аляксей | Менск, Цэнтральны | | 30 б.в. 1050000 руб. |
| 6 | 2011-01-30 | Іўлеў Аляксандр | 23.34 КаАП — «парушэньне парадку арганізацыі і правядзеньня масавых мерапрыемстваў» | 2011-01-31 | Ясеновіч Леанід | Менск, Цэнтральны | | 30 б.в. 1050000 руб. |
| 7 | 2011-01-30 | Кулакоў Леанід | 23.34 КаАП — «парушэньне парадку арганізацыі і правядзеньня масавых мерапрыемстваў» | 2011-01-31 | Якунчыхін Аляксандр | Менск, Цэнтральны | | 30 б.в. 1050000 руб. |
| 8 | 2011-01-29 | Сяргеенка Аляксандр | 23.34 КаАП — «парушэньне парадку арганізацыі і правядзеньня масавых мерапрыемстваў» | 2011-01-31 | Хаткевіч Яўген | Менск, Маскоўскі | 7 сут. | |

| | | | | | | | | |
|---|---|---|---|---|---|---|---|---|
| 9 | 2011-01-28 | Атрошчанкаў Цімафей | 23.34 КаАП — «парушэньне парадку арганізацыі і правядзеньня масавых мерапрыемстваў» | 2011-01-31 | Матыль Тацяна | Менск, Маскоўскі | 9 сут. | |
| 10 | 2011-01-21 | Каракін Уладзімер | | | | | | |
| 11 | 2011-01-21 | Гайшун Дзьмітрый | | | | | | |
| 12 | 2011-01-21 | Карамалікаў Дзьмітрый | | | | | | |
| 13 | 2011-01-21 | Абразцоў Андрэй | | | | | | |
| 14 | 2011-01-21 | Гайкоў Максім | | | | | | |
| 15 | 2011-01-21 | Недасейкін Сяргей | | | | | | |
| 16 | 2011-01-21 | Вінярскі Максім | | | | | | |
| 17 | 2011-01-21 | Ліхачэўскі Яраслаў | | | | | | |
| 18 | 2011-01-21 | Філіпчык Андрэй | 17.1 КаАП — «дробнае хуліганства» | 2011-01-21 | Хадановіч Аляксандр | Менск, Цэнтральны | | 15 б.в. 525000 руб. |
| 19 | 2011-01-20 | Шашарын Усевалад | 23.34 КаАП — «парушэньне парадку арганізацыі і правядзеньня масавых мерапрыемстваў» | 2011-01-21 | Матыль Тацяна | Менск, Маскоўскі | 9 сут. | |
| 20 | 2011-01-19 | Сядоў Валер | 23.34 КаАП — «парушэньне парадку арганізацыі і правядзеньня масавых мерапрыемстваў» | 2011-01-20 | | | 12 сут. | |
| 21 | 2011-01-19 | Калесьнік Віктар | 23.34 КаАП — «парушэньне парадку арганізацыі і правядзеньня масавых мерапрыемстваў» | 2011-01-20 | Ляўчонак Пётр | Наваполацак | | 20 б.в. 700000 руб. |
| 22 | 2011-01-19 | Калінцаў Аляксандр | 23.34 КаАП — «парушэньне парадку арганізацыі і правядзеньня масавых мерапрыемстваў» | 2011-01-20 | Ляўчонак Пётр | Наваполацак | | 2 б.в. 70000 руб. |
| 23 | 2011-01-19 | Яроменак Уладзімер | 23.34 КаАП — «парушэньне парадку арганізацыі і правядзеньня масавых мерапрыемстваў» | 2011-01-20 | | Менск, Маскоўскі | 7 сут. | |
| 24 | 2011-01-19 | Чудзянцоў Уладзімер | | | | | | |
| 25 | 2011-01-19 | Каменеў Міхаіл | | | | | | |
| 26 | 2011-01-19 | Хлашчанкова Юлія | | | | | | |
| 27 | 2011-01-19 | Дземідзенка Мікалай | | | | | | |

| | | | | | | | | |
|---|---|---|---|---|---|---|---|---|
| 28 | 2011-01-19 | Петравец Ільля | | | | | | |
| 29 | 2011-01-19 | Кудроў Кірыл | 23.34 КаАП — «парушэньне парадку арганізацыі і правядзеньня масавых мерапрыемстваў» | 2011-01-20 | Шабуня Вікторыя | Менск, Цэнтральны | | 30 б.в. 1050000 руб. |
| 30 | 2011-01-17 | Гарэцкі Барыс | 23.34 КаАП — «парушэньне парадку арганізацыі і правядзеньня масавых мерапрыемстваў» | 2011-01-18 | Хаткевіч Яўген | Менск, Маскоўскі | 14 сут. | |
| 31 | 2011-01-17 | Стаюк Іван | | | | | | |
| 32 | 2011-01-17 | Грышанава Вікторыя | | | | | | |
| 33 | 2011-01-17 | Бакур Юрый | | | | | | |
| 34 | 2011-01-14 | Кузьняцоў Пётр | 22.9 КаАП — «парушэньне заканадаўства пра друк і іншыя сродкі масавай інфармацыі» | 2011-01-18 | Доля Мікалай | Рэчыца | | 20 б.в. 700000 руб. |
| 35 | 2011-01-13 | Жукоўскі Кастусь | 17.1 КаАП — «дробнае хуліганства» | 2011-01-13 | Цалкова Алена | Гомель, Цэнтральны | 8 сут. | |
| 36 | 2011-01-13 | Кавалеўскі Валеры | 23.34 КаАП — «парушэньне парадку арганізацыі і правядзеньня масавых мерапрыемстваў» | 2011-01-14 | Казак Віктар | Менск, Маскоўскі | 12 сут. | |
| 37 | 2011-01-06 | Місюкевіч Юльян | 23.34 КаАП — «парушэньне парадку арганізацыі і правядзеньня масавых мерапрыемстваў» | 2011-01-10 | Матыль Тацяна | Менск, Маскоўскі | 12 сут. | |
| 38 | 2010-12-31 | Юхневіч Павал | 23.34 КаАП — «парушэньне парадку арганізацыі і правядзеньня масавых мерапрыемстваў» | 2011-01-03 | | Менск, Маскоўскі | 10 сут. | |
| 39 | 2010-12-29 | Вячорка Франак | 23.34 КаАП — «парушэньне парадку арганізацыі і правядзеньня масавых мерапрыемстваў» | 2010-12-30 | | Менск, Маскоўскі | 12 сут. | |
| 40 | 2010-12-29 | Крэчка Андрусь | 23.34 КаАП — «парушэньне парадку арганізацыі і правядзеньня масавых мерапрыемстваў» | 2010-12-30 | | Менск, Маскоўскі | 12 сут. | |

| | | | | | | | | |
|---|---|---|---|---|---|---|---|---|
| 41 | 2010-12-29 | Койпіш Антон | 23.34 КаАП — «парушэньне парадку арганізацыі і правядзеньня масавых мерапрыемстваў» | 2010-12-30 | | Менск, Маскоўскі | 10 сут. | |
| 42 | 2010-12-27 | Пашкевіч Міхась | 23.34 КаАП — «парушэньне парадку арганізацыі і правядзеньня масавых мерапрыемстваў» | 2010-12-27 | Хаткевіч Яўген | Менск, Маскоўскі | 15 сут. | |
| 43 | 2010-12-26 | Шурхай Зьміцер | 23.34 КаАП — «парушэньне парадку арганізацыі і правядзеньня масавых мерапрыемстваў» | 2010-12-27 | Шылько Алена | Менск, Маскоўскі | 10 сут. | |
| 44 | 2010-12-24 | Дамарад Вольга | 23.34 КаАП — «парушэньне парадку арганізацыі і правядзеньня масавых мерапрыемстваў» | 2010-12-27 | Шастакоў Юры | Менск, Маскоўскі | 10 сут. | |
| 45 | 2010-12-24 | Мацкевіч Міхаіл | 23.34 КаАП — «парушэньне парадку арганізацыі і правядзеньня масавых мерапрыемстваў» | 2010-12-27 | Матыль Тацяна | Менск, Маскоўскі | 10 сут. | |
| 46 | 2010-12-24 | Кіркевіч Алесь | 23.34 КаАП — «парушэньне парадку арганізацыі і правядзеньня масавых мерапрыемстваў» | 2010-12-27 | Казак Віктар | Менск, Маскоўскі | 10 сут. | |
| 47 | 2010-12-21 | Шурхай Зьміцер | 23.4 КаАП — «непадпарадкаваньне законным патрабаваньням службовай асобы» | 2010-12-22 | Ціўнова Іна | Берасьце, Маскоўскі | 5 сут. | |
| 48 | 2010-12-21 | Дубскі Арцём | 23.34 КаАП — «парушэньне парадку арганізацыі і правядзеньня масавых мерапрыемстваў» | 2010-12-22 | Хаткевіч Яўген | Менск, Маскоўскі | 15 сут. | |
| 49 | 2010-12-20 | Баярын Натальля | 23.34 КаАП — «парушэньне парадку арганізацыі і правядзеньня масавых мерапрыемстваў» | 2010-12-21 | Паўлючэнка Дзьмітрый | Менск, Савецкі | | 30 б.в. 1050000 руб. |

| | | | | | | | | |
|---|---|---|---|---|---|---|---|---|
| 50 | 2010-12-20 | Дашкевіч Андрэй | 23.34 КаАП — «парушэньне парадку арганізацыі і правядзеньня масавых мерапрыемстваў» | 2010-12-21 | Семак Алена | Менск, Цэнтральны | 15 сут. | |
| 51 | 2010-12-20 | Нянахаў Андрэй | 23.34 КаАП — «парушэньне парадку арганізацыі і правядзеньня масавых мерапрыемстваў» | 2010-12-21 | Мазоўка Анжаліка | Менск, Савецкі | 15 сут. | |
| 52 | 2010-12-20 | Асманаў Арсэн | 23.34 КаАП — «парушэньне парадку арганізацыі і правядзеньня масавых мерапрыемстваў» | 2010-12-21 | Рэлява Аксана | Менск, Савецкі | 15 сут. | |
| 53 | 2010-12-20 | Дземідзенка Мікалай | 23.34 КаАП — «парушэньне парадку арганізацыі і правядзеньня масавых мерапрыемстваў» | 2010-12-21 | Ясеновіч Леанід | Менск, Цэнтральны | 15 сут. | |
| 54 | 2010-12-20 | Яроменак Уладзімер | 23.34 КаАП — «парушэньне парадку арганізацыі і правядзеньня масавых мерапрыемстваў» | 2010-12-21 | Якунчыхін Аляксандр | Менск, Цэнтральны | 15 сут. | |
| 55 | 2010-12-20 | Адамовіч Славамір | 23.34 КаАП — «парушэньне парадку арганізацыі і правядзеньня масавых мерапрыемстваў» | 2010-12-21 | Вайцэховіч Натальля | Менск, Цэнтральны | 15 сут. | |
| 56 | 2010-12-20 | Лебедзь Міхась | 23.34 КаАП — «парушэньне парадку арганізацыі і правядзеньня масавых мерапрыемстваў» | 2011-02-08 | Хаткевіч Яўген | Менск, Маскоўскі | 12 сут. | |
| 57 | 2010-12-19 | Багінская Ніна | 23.34 КаАП — «парушэньне парадку арганізацыі і правядзеньня масавых мерапрыемстваў» | 2010-12-20 | Пратасавіцкая Натальля | Менск, Кастрычніцкі | | 30 б.в. 1050000 руб. |
| 58 | 2010-12-19 | Бойка Яўген | 23.34 КаАП — «парушэньне парадку арганізацыі і правядзеньня масавых мерапрыемстваў» | 2010-12-20 | Ляўкова Іна | Менск, Савецкі | 15 сут. | |

| | | | | | | | | |
|---|---|---|---|---|---|---|---|---|
| 59 | 2010-12-19 | Грудзінская Ганна | 23.34 КаАП — «парушэньне парадку арганізацыі і правядзеньня масавых мерапрыемстваў» | 2010-12-20 | | Менск, Маскоўскі | 10 сут. | |
| 60 | 2010-12-19 | Грудзінскі Яраслаў | 23.34 КаАП — «парушэньне парадку арганізацыі і правядзеньня масавых мерапрыемстваў» | 2010-12-20 | Раманава Кацярына | Менск, Заводзкі | | 30 б.в. 1050000 руб. |
| 61 | 2010-12-19 | Гудзень Дзіяна | 23.34 КаАП — «парушэньне парадку арганізацыі і правядзеньня масавых мерапрыемстваў» | 2010-12-20 | Ляшкевіч Марыя | Менск, Фрунзенскі | | 25 б.в. 875000 руб. |
| 62 | 2010-12-19 | Гуляк Віталь | 23.34 КаАП — «парушэньне парадку арганізацыі і правядзеньня масавых мерапрыемстваў» | 2010-12-20 | Дубініна Жанна | Менск, Заводзкі | | 30 б.в. 1050000 руб. |
| 63 | 2010-12-19 | Кудлаеў Аляксандр | 23.34 КаАП — «парушэньне парадку арганізацыі і правядзеньня масавых мерапрыемстваў» | 2010-12-20 | Рэлява Аксана | Менск, Савецкі | | 30 б.в. 1050000 руб. |
| 64 | 2010-12-19 | Лепін Георгій | 23.34 КаАП — «парушэньне парадку арганізацыі і правядзеньня масавых мерапрыемстваў» | 2010-12-20 | Палулех Кірыл | Менск, Савецкі | | 30 б.в. 1050000 руб. |
| 65 | 2010-12-19 | Матвееў Ігар | 23.34 КаАП — «парушэньне парадку арганізацыі і правядзеньня масавых мерапрыемстваў» | 2010-12-20 | Раманава Кацярына | Менск, Заводзкі | | 30 б.в. 1050000 руб. |
| 66 | 2010-12-19 | Макарэнка Адам | 23.34 КаАП — «парушэньне парадку арганізацыі і правядзеньня масавых мерапрыемстваў» | 2010-12-20 | Хвайніцкая Жанна | Менск, Заводзкі | 6 сут. | |
| 67 | 2010-12-19 | Сідарэвіч Кацярына | 23.34 КаАП — «парушэньне парадку арганізацыі і правядзеньня масавых мерапрыемстваў» | 2010-12-20 | Германовіч Сяргей | Менск, Кастрычніцкі | | 30 б.в. 1050000 руб. |

| | | | | | | | | |
|---|---|---|---|---|---|---|---|---|
| 68 | 2010-12-19 | Тарноўская Вольга | 23.34 КаАП — «парушэньне парадку арганізацыі і правядзеньня масавых мерапрыемстваў» | 2010-12-20 | Шылько Алена | Менск, Маскоўскі | | 30 б.в. 1050000 руб. |
| 69 | 2010-12-19 | Цяцёркін Мікалай | 23.34 КаАП — «парушэньне парадку арганізацыі і правядзеньня масавых мерапрыемстваў» | 2010-12-20 | Бортнік Валянціна | Менск, Ленінскі | 10 сут. | |
| 70 | 2010-12-19 | Барткевіч Алена | 23.34 КаАП — «парушэньне парадку арганізацыі і правядзеньня масавых мерапрыемстваў» | 2010-12-20 | Жукоўская Жанна | Менск, Фрунзенскі | | 30 б.в. 1050000 руб. |
| 71 | 2010-12-19 | Фурман Валянціна | 23.34 КаАП — «парушэньне парадку арганізацыі і правядзеньня масавых мерапрыемстваў» | 2010-12-20 | Варэнік Натальля | Менск, Фрунзенскі | 10 сут. | |
| 72 | 2010-12-19 | Фурман Віктар | 23.34 КаАП — «парушэньне парадку арганізацыі і правядзеньня масавых мерапрыемстваў» | 2010-12-20 | Валчкова Марыяна | Менск, Партызанскі | 11 сут. | |
| 73 | 2010-12-19 | Сіхарулідзэ Леанід | 23.34 КаАП — «парушэньне парадку арганізацыі і правядзеньня масавых мерапрыемстваў» | 2010-12-20 | Місуно Сьвятлана | Менск, Фрунзенскі | 10 сут. | |
| 74 | 2010-12-19 | Фёдараў Станіслаў | 23.34 КаАП — «парушэньне парадку арганізацыі і правядзеньня масавых мерапрыемстваў» | 2010-12-20 | Ясеновіч Леанід | Менск, Цэнтральны | 10 сут. | |
| 75 | 2010-12-19 | Бусько Валянціна | 23.34 КаАП — «парушэньне парадку арганізацыі і правядзеньня масавых мерапрыемстваў» | 2010-12-20 | Казак Віктар | Менск, Маскоўскі | 10 сут. | |
| 76 | 2010-12-19 | Абражэй Аляксей | 23.34 КаАП — «парушэньне парадку арганізацыі і правядзеньня масавых мерапрыемстваў» | 2010-12-20 | Лапцева Алена | Менск, Заводзкі | | 20 б.в. 700000 руб. |

| | | | | | | | | |
|---|---|---|---|---|---|---|---|---|
| 77 | 2010-12-19 | Краўчук Вольга | 23.34 КаАП — «парушэньне парадку арганізацыі і правядзеньня масавых мерапрыемстваў» | 2010-12-20 | Красоўская Зінаіда | Менск, Ленінскі | | 30 б.в. 1050000 руб. |
| 78 | 2010-12-19 | Васкабовіч Аляксей | 23.34 КаАП — «парушэньне парадку арганізацыі і правядзеньня масавых мерапрыемстваў» | 2010-12-20 | Хадановіч Аляксандр | Менск, Цэнтральны | | 30 б.в. 1050000 руб. |
| 79 | 2010-12-19 | Лазарчык Алена | 23.34 КаАП — «парушэньне парадку арганізацыі і правядзеньня масавых мерапрыемстваў» | 2010-12-20 | Блізьнюк Юлія | Менск, Фрунзенскі | | 30 б.в. 1050000 руб. |
| 80 | 2010-12-19 | Васкабовіч Людміла | 23.34 КаАП — «парушэньне парадку арганізацыі і правядзеньня масавых мерапрыемстваў» | 2010-12-20 | Дубініна Жанна | Менск, Заводзкі | | 30 б.в. 1050000 руб. |
| 81 | 2010-12-19 | Гульнік Мікалай | 23.34 КаАП — «парушэньне парадку арганізацыі і правядзеньня масавых мерапрыемстваў» | 2010-12-20 | Паўлючэнка Дзьмітрый | Менск, Савецкі | 15 сут. | |
| 82 | 2010-12-19 | Хвасьцюк Арцём | 23.34 КаАП — «парушэньне парадку арганізацыі і правядзеньня масавых мерапрыемстваў» | 2010-12-20 | Лухверчык Алена | Менск, Савецкі | 15 сут. | |
| 83 | 2010-12-19 | Каламіец Дар'я | 23.34 КаАП — «парушэньне парадку арганізацыі і правядзеньня масавых мерапрыемстваў» | 2010-12-20 | Балаўнёў Мікалай | Менск, Заводзкі | | 20 б.в. 700000 руб. |
| 84 | 2010-12-19 | Пекарчык Сяргей | 23.34 КаАП — «парушэньне парадку арганізацыі і правядзеньня масавых мерапрыемстваў» | 2010-12-20 | Бараноўскі Андрэй | Менск, Партызанскі | 13 сут. | |
| 85 | 2010-12-19 | Ненахаў Андрэй | 23.34 КаАП — «парушэньне парадку арганізацыі і правядзеньня масавых мерапрыемстваў» | 2010-12-20 | Мазоўка Анжаліка | Менск, Савецкі | 15 сут. | |

| | | | | | | | | |
|---|---|---|---|---|---|---|---|---|
| 86 | 2010-12-19 | Раманюк Аляксандр | 23.34 КаАП — «парушэньне парадку арганізацыі і правядзеньня масавых мерапрыемстваў» | 2010-12-20 | Фёдарава Марына | Менск, Савецкі | 15 сут. | |
| 87 | 2010-12-19 | Жаўняк Ігар | 23.34 КаАП — «парушэньне парадку арганізацыі і правядзеньня масавых мерапрыемстваў» | 2010-12-20 | Барысёнак Анатоль | Менск, Партызанскі | | 30 б.в. 1050000 руб. |
| 88 | 2010-12-19 | Марголенка Ала | 23.34 КаАП — «парушэньне парадку арганізацыі і правядзеньня масавых мерапрыемстваў» | 2010-12-20 | Хрушчэўская Лідзія | Менск, Фрунзенскі | | 25 б.в. 875000 руб. |
| 89 | 2010-12-19 | Бачыла Уладзімер | 23.34 КаАП — «парушэньне парадку арганізацыі і правядзеньня масавых мерапрыемстваў» | 2010-12-20 | Хвайніцкая Жанна | Менск, Заводзкі | | 30 б.в. 1050000 руб. |
| 90 | 2010-12-19 | Дайнэка Зьміцер | 23.34 КаАП — «парушэньне парадку арганізацыі і правядзеньня масавых мерапрыемстваў» | 2010-12-20 | Мілашэўская Натальля | Менск, Заводзкі | | 30 б.в. 1050000 руб. |
| 91 | 2010-12-19 | Чарухін Канстанцін | 23.34 КаАП — «парушэньне парадку арганізацыі і правядзеньня масавых мерапрыемстваў» | 2010-12-20 | Юферыцын Дзьмітрый | Менск, Ленінскі | | 30 б.в. 1050000 руб. |
| 92 | 2010-12-19 | Чарухіна Ганна | 23.34 КаАП — «парушэньне парадку арганізацыі і правядзеньня масавых мерапрыемстваў» | 2010-12-20 | Красоўская Зінаіда | Менск, Ленінскі | | 30 б.в. 1050000 руб. |
| 93 | 2010-12-19 | Піманава Вольга | 23.34 КаАП — «парушэньне парадку арганізацыі і правядзеньня масавых мерапрыемстваў» | 2010-12-20 | Шылько Алена | Менск, Маскоўскі | | 30 б.в. 1050000 руб. |
| 94 | 2010-12-19 | Яўстрацьеў Алег | 23.34 КаАП — «парушэньне парадку арганізацыі і правядзеньня масавых мерапрыемстваў» | 2010-12-20 | Мітраховіч Ірына | Менск, Кастрычніцкі | 15 сут. | |

| | | | | | | | | |
|---|---|---|---|---|---|---|---|---|
| 95 | 2010-12-19 | Мышкавец Ірына | 23.34 КаАП — «парушэньне парадку арганізацыі і правядзеньня масавых мерапрыемстваў» | 2010-12-20 | Рудніцкая Алена | Менск, Маскоўскі | 10 сут. | |
| 96 | 2010-12-19 | Шпак-Рыжкоў Юрый | 23.34 КаАП — «парушэньне парадку арганізацыі і правядзеньня масавых мерапрыемстваў» | 2010-12-20 | Лапцева Алена | Менск, Заводзкі | 10 сут. | |
| 97 | 2010-12-19 | Арлоў Сяргей | 23.34 КаАП — «парушэньне парадку арганізацыі і правядзеньня масавых мерапрыемстваў» | 2010-12-20 | Казак Віктар | Менск, Маскоўскі | 12 сут. | |
| 98 | 2010-12-19 | Дзезідзенка Дзяніс | 23.34 КаАП — «парушэньне парадку арганізацыі і правядзеньня масавых мерапрыемстваў» | 2010-12-20 | Кочык Аляксандр | Менск, Партызанскі | 12 сут. | |
| 99 | 2010-12-19 | Ярмола Мікалай | 23.34 КаАП — «парушэньне парадку арганізацыі і правядзеньня масавых мерапрыемстваў» | 2010-12-20 | Юферыцын Дзьмітрый | Менск, Ленінскі | 15 сут. | |
| 100 | 2010-12-19 | Трыпуцін Вітаўт | 23.34 КаАП — «парушэньне парадку арганізацыі і правядзеньня масавых мерапрыемстваў» | 2010-12-20 | Рэлява Аксана | Менск, Савецкі | 15 сут. | |
| 101 | 2010-12-19 | Мысьлівец Ігар | 23.34 КаАП — «парушэньне парадку арганізацыі і правядзеньня масавых мерапрыемстваў» | 2010-12-20 | Мазоўка Анжаліка | Менск, Савецкі | 15 сут. | |
| 102 | 2010-12-19 | Радзецкая Тацяна | 23.34 КаАП — «парушэньне парадку арганізацыі і правядзеньня масавых мерапрыемстваў» | 2010-12-20 | Шастакоў Юрый | Менск, Маскоўскі | 10 сут. | |
| 103 | 2010-12-19 | Масьленьнікаў Фёдар | 23.34 КаАП — «парушэньне парадку арганізацыі і правядзеньня масавых мерапрыемстваў» | 2010-12-20 | Хаткевіч Яўген | Менск, Маскоўскі | 12 сут. | |

| | | | | | | | | |
|---|---|---|---|---|---|---|---|---|
| 104 | 2010-12-19 | Бельская ганна | 23.34 КаАП — «парушэньне парадку арганізацыі і правядзеньня масавых мерапрыемстваў» | 2010-12-20 | Лапцева Алена | Менск, Заводзкі | 10 сут. | |
| 105 | 2010-12-19 | Царыкаў Яўген | 23.34 КаАП — «парушэньне парадку арганізацыі і правядзеньня масавых мерапрыемстваў» | 2010-12-20 | Някрасава Алена | Менск, Заводзкі | 15 сут. | |
| 106 | 2010-12-19 | Сьмірноў Дзяніс | 23.34 КаАП — «парушэньне парадку арганізацыі і правядзеньня масавых мерапрыемстваў» | 2010-12-20 | Палулех Кірыл | Менск, Савецкі | 12 сут. | |
| 107 | 2010-12-19 | Міронаў Яўген | 23.34 КаАП — «парушэньне парадку арганізацыі і правядзеньня масавых мерапрыемстваў» | 2010-12-20 | Пратасавіцкая Натальля | Менск, Кастрычніцкі | 15 сут. | |
| 108 | 2010-12-19 | Грыбоўская Тацяна | 23.34 КаАП — «парушэньне парадку арганізацыі і правядзеньня масавых мерапрыемстваў» | 2010-12-20 | Ананіч Алена | Менск, Першамайскі | 10 сут. | |
| 109 | 2010-12-19 | Зялёны Андрэй | 23.34 КаАП — «парушэньне парадку арганізацыі і правядзеньня масавых мерапрыемстваў» | 2010-12-20 | Някрасава Алена | Менск, Заводзкі | 15 сут. | |
| 110 | 2010-12-19 | Міхалкін Захар | 23.34 КаАП — «парушэньне парадку арганізацыі і правядзеньня масавых мерапрыемстваў» | 2010-12-20 | Зянькевіч Валянціна | Менск, Ленінскі | 10 сут. | |
| 111 | 2010-12-19 | Чэмісава Аляксандра | 23.34 КаАП — «парушэньне парадку арганізацыі і правядзеньня масавых мерапрыемстваў» | 2010-12-20 | Пратасавіцкая Натальля | Менск, Кастрычніцкі | 10 сут. | |
| 112 | 2010-12-19 | Урыўскі Аляксандр | 23.34 КаАП — «парушэньне парадку арганізацыі і правядзеньня масавых мерапрыемстваў» | 2010-12-20 | Дубініна Жанна | Менск, Заводзкі | 10 сут. | |

| | | | | | | | | |
|---|---|---|---|---|---|---|---|---|
| 113 | 2010-12-19 | Якавенка Ганна | 23.34 КаАП — «парушэньне парадку арганізацыі і правядзеньня масавых мерапрыемстваў» | 2010-12-20 | Чарняк Алена | Менск, Маскоўскі | 11 сут. | |
| 114 | 2010-12-19 | Лугін Максім | 23.34 КаАП — «парушэньне парадку арганізацыі і правядзеньня масавых мерапрыемстваў» | 2010-12-20 | Ляшкевіч Марыя | Менск, Фрунзенскі | 11 сут. | |
| 115 | 2010-12-19 | Чуфістаў Канстанцін | 23.34 КаАП — «парушэньне парадку арганізацыі і правядзеньня масавых мерапрыемстваў» | 2010-12-20 | Шаграй Рыта | Менск, Кастрычніцкі | 10 сут. | |
| 116 | 2010-12-19 | Вайтовіч Тацяна | 23.34 КаАП — «парушэньне парадку арганізацыі і правядзеньня масавых мерапрыемстваў» | 2010-12-20 | Лапцева Алена | Менск, Заводзкі | 10 сут. | |
| 117 | 2010-12-19 | Агрэйцовіч Аляксандр | 23.34 КаАП — «парушэньне парадку арганізацыі і правядзеньня масавых мерапрыемстваў» | 2010-12-20 | Мілашэўская Натальля | Менск, Заводзкі | 10 сут. | |
| 118 | 2010-12-19 | Кузьмін Арцём | 23.34 КаАП — «парушэньне парадку арганізацыі і правядзеньня масавых мерапрыемстваў» | 2010-12-20 | Балаўнёў Мікалай | Менск, Заводзкі | 10 сут. | |
| 119 | 2010-12-19 | Лыскавец Павал | 23.34 КаАП — «парушэньне парадку арганізацыі і правядзеньня масавых мерапрыемстваў» | 2010-12-20 | Германовіч Сяргей | Менск, Кастрычніцкі | 15 сут. | |
| 120 | 2010-12-19 | Саўка Зьміцер | 23.34 КаАП — «парушэньне парадку арганізацыі і правядзеньня масавых мерапрыемстваў» | 2010-12-20 | Фёдарава Марына | Менск, Савецкі | 15 сут. | |
| 121 | 2010-12-19 | Паўлоўская Марыя | 23.34 КаАП — «парушэньне парадку арганізацыі і правядзеньня масавых мерапрыемстваў» | 2010-12-20 | Някрасава Алена | Менск, Заводзкі | 15 сут. | |

| | | | | | | | | |
|---|---|---|---|---|---|---|---|---|
